В. А. Белазаровіч
І. П. Крэнь
Н. М. Ганушчанка

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

## Другая палова XVI — канец XVIII ст.

Вучэбны дапаможнік для 8 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай мовай навучання

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Издательский центр БГУ

Мінск
«Выдавецкі цэнтр БДУ»
2010

Правообладатель Издательский центр БГУ

УДК 94(476)(075.3=161.3)
ББК 63.3(4Беи)я721
Б43

Р э ц э н з е н т ы:
кафедра эканамічнай гісторыі ўстановы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт»
(загадчык кафедры, доктар гістарычных навук *Ю. М. Бохан*);
настаўнік гісторыі і грамадазнаўства вышэйшай катэгорыі
дзяржаўнай установы адукацыі
«Сярэдняя агульнаадукацыйная школа № 160 г. Мінска» *Т. Г. Яшчанка*;
загадчык аддзела гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу
дзяржаўнай навуковай установы
«Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт *А. І. Груша*;
загадчык кафедры гісторыі Беларусі ўстановы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»,
доктар гістарычных навук, прафесар *А. М. Люты*

Издательский центр БГУ

**УДК 94(476)(075.3=161.3)**
**ББК 63.3(4Беи)я721**

**ISBN 978-985-476-806-9**

© Белазаровіч В. А., Крэнь І. П., Ганушчанка Н. М., 2010
© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», 2010

Правообладатель Издательский центр БГУ

## ПРАДМОВА

Паважаныя вучні! Вы ўжо ведаеце, што беларускія землі з XIII ст. знаходзіліся ў складзе Вялікага Княства Літоўскага. У сярэдзіне XVI ст. яны апынуліся ў новай дзяржаве — Рэчы Паспалітай, якая праіснавала да канца XVIII ст.

Гэта складаны і далёка не адназначны перыяд айчыннай гісторыі. Спадзяёмся, што вучэбны дапаможнік дасць вам магчымасць сфарміраваць цэласнае ўяўленне пра эпоху другой паловы XVI — канца XVIII ст., асэнсаваць гісторыю беларускіх зямель як гісторыю свайго народа.

Вы пазнаёміцеся з гістарычнымі і царкоўнымі дзеячамі, выдатнымі палкаводцамі, пісьменнікамі, асветнікамі, якія вызначалі гістарычны лёс беларусаў.

Гісторыя Беларусі другой паловы XVI — канца XVIII ст. цесна звязана з гісторыяй Польшчы, Літвы, Расіі. Таму вам неабходна будзе ўспамінаць падзеі сусветнай гісторыі.

Будзем вельмі рады, калі вучэбны дапаможнік стане той кнігай, якая пашырыць вашы веды па айчыннай гісторыі, дасць магчымасць добра ведаць яе, ганарыцца спадчынай беларускага народа.

Прапанаваны дапаможнік падзяляецца на тры раздзелы. Кожны раздзел, у сваю чаргу, падзяляецца на параграфы. Параграфы складаюцца з пунктаў і абазначаны лічбамі.

У канцы тэксту сустракаецца рубрыка «Матэрыялы гістарычных і літаратурных крыніц», якая ўключае розныя крыніцы ведаў аб нашым мінулым. Адносіцца да іх трэба крытычна, паколькі яны часам адлюстроўваюць думку толькі аднаго чалавека, а яна можа быць памылковай. Сапраўдныя гістарыч-

Правообладатель Издательский центр БГУ

ныя звесткі, якія не выклікаюць пярэчанняў, змяшчаюцца ў рубрыках «Гістарычная асоба», «Гістарычная даведка» і носяць аб'ектыўны характар.

Да кожнага параграфа прадугледжаны пытанні і заданні для вучняў. Адны з іх разлічаны на паўтарэнне і ўзнаўленне вывучанага матэрыялу, другія — на прымяненне атрыманых ведаў.

Раздзелы завяршаюцца ўрокамі абагульнення. Размешчаны ў іх матэрыял прызначаны як для самастойнай працы дома, так і для групавой работы ў класе. Раім вам актыўна ўдзельнічаць у дыскусіі па спрэчных пытаннях.

У канцы кнігі размяшчаецца храналогія асноўных дат па гісторыі Беларусі другой паловы XVI — канца XVIII ст. Таксама прыведзена табліца «Унутраная і знешняя палітыка вялікіх князёў літоўскіх і каралёў польскіх у другой палове XVI — канца XVIII ст.», якая дапаможа вам глыбей асэнсаваць і запомніць вучэбны матэрыял.

Для разумення і правільнай рэканструкцыі гістарычнага мінулага ў вучэбным дапаможніку прадугледжаны тэрміналагічны слоўнік, які складаецца з асноўных паняццяў і тэрмінаў.

Кніга забяспечана спісам літаратуры, што рэкамендуецца вучням для пазакласнага чытання, і гістарычнымі картасхемамі, якія змешчаны ў адпаведных параграфах.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

Раздзел I

# БЕЛАРУСЬ У СЯРЭДЗІНЕ XVI — ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII ст.

## § 1. ЛІВОНСКАЯ ВАЙНА

**Успомніце**

1. Што такое «ордэн» як форма сярэдневяковай дзяржавы?
2. Дзе і калі ўтварыўся Лівонскі ордэн?

**1. Прычыны і пачатак вайны.** У сярэдзіне XVI ст. абвастраюцца ўзаемаадносіны паміж Швецыяй, Даніяй, Польшчай, Вялікім Княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай. Барацьба паміж імі вялася за землі Усходняй Прыбалтыкі, так званую Лівонію, якая знаходзілася пад кантролем Лівонскага ордэна. Рускі цар Іван IV Грозны жадаў атрымаць выхад да Балтыйскага мора. Аслаблены Лівонскі ордэн у сярэдзіне XVI ст. не з'яўляўся сур'ёзным праціўнікам.

Паколькі Ордэн адмовіўся плаціць маскоўскаму цару даніну за эстонскія землі і Юр'еў (Тарту), то цар у студзені **1558 г.** пачаў ваенныя дзеянні. Маскоўскія войскі хутка авалодалі Нарвай, Тарту, наблізіліся да Таліна, сталі пагражаць Рызе. Магістр Ордэна Г. Кетлер папрасіў дапамогі ў еўрапейскіх дзяржаў. Але ні Швецыя, ні Данія не пажадалі ўступаць у канфлікт з Маскоўскім царствам. Толькі Вялікае Княства Літоўскае пагадзілася аказаць падтрымку — у жніўні 1559 г. было падпісана пагадненне аб саюзе паміж ВКЛ і Ордэнам. Лівонскі ордэн пераходзіў пад *пратэктарат* (апеку) вялікага князя ВКЛ Жыгімонта II Аўгуста.

Царскія войскі аднавілі ваенныя дзеянні. Да восені 1560 г. яны разбілі лепшыя сілы Ордэна і авалодалі галоўнымі яго крэпасцямі. Тады Г. Кетлер падпісаў у 1561 г. новы дагавор, які прадугледжваў пераход ордэнскіх зямель пад супольную ўладу ВКЛ і Польшчы. Жыгімонт II Аўгуст прапанаваў Івану IV адвесці войскі, але цар не пагадзіўся. У Лівонію было накіравана вялікa-



Правообладатель Издательский центр БГУ



*Гармата XVI ст.*

княжацкае войска, якое пацярпела паражэнне каля г. Пярну.

У ВКЛ Лівонская вайна атрымала назву «Інфлянцкая», таму што тэрыторыя, за якую вяліся баявыя дзеянні, у Княстве называлі Інфлянтамі.

Ваенныя дзеянні паступова актывізаваліся. Маскоўская дзяржава перанесла іх на беларускія землі. У 1562 г. войскі Івана IV спустошылі Мсціслаў, Шклоў, Копысь, Оршу, Віцебск.

**2. Страта Полацка.** Галоўны ўдар маскоўскага войска рыхтаваўся на Полацк. Туды ў канцы студзеня 1563 г. з-пад Мажайска рушыла 60-тысячная армія на чале з самім царом. Полацк быў абложаны. Войска Княства з-за сваёй нешматлікасці — гетман Мікалай Радзівіл Руды меў толькі 3400 коннікаў — не магло дапамагчы палачанам. Мясцовы гарнізон на чале з ваяводам Станіславам Давойнам мужна абараняў горад. Дапамогу аказвалі шляхта, мяшчане, наёмныя жаўнеры. Абаронцы крэпасці нават задумалі адбіць маскоўскія гарматы і аднойчы ўчынілі вылазку ў варожы лагер.

Два тыдні доўжылася абарона Полацка, але Давойна дапусціў шэраг памылак. Каб прадухіліць пагрозу голаду, ён загадаў выпусціць з астрога дзве тысячы сялян. Ваявода не ўлічыў, што яны адказвалі за ўмацаванне замкавых сцен, а гэта мела важнае значэнне для абароны. Да таго ж царскія жаўнеры прымусілі сялян паказаць лясныя ямы, дзе знаходзіліся гарадскія запасы збожжа.

Другой памылкай стаў загад ваяводы падпаліць полацкі пасад і адысці ў Верхні замак, паколькі маскоўскае войска скарыстала артылерыю. Пад завесай дыму гарматы яшчэ бліжэй былі падцягнуты да сцен, што стала неча-



*Абарона Полацка ў 1563 г. Заходнееўрапейская гравюра*



Правообладатель Издательский центр БГУ

канасцю для абаронцаў горада. Драўляныя ўмацаванні Верхняга замка былі падпалены. Разгарэўся моцны пажар. Абаронцаў душыў дым, канчаліся харчовыя запасы. Пасля сёмага па ліку штурму ваявода Давойна разам з полацкім епіскапам Арсеніем і прадстаўнікамі шляхты выйшлі з замка і папрасілі літасці ў Івана IV. 15 лютага горад быў заняты непрыяцелем. Полацкі ваявода разам з войскам трапіў у палон. Цар адпусціў на радзіму толькі наёмнікаў-палякаў, нават даў ім сабалёвыя футры і залатыя манеты.

Усе палачане былі аб'яўлены палоннымі. Шляхту, мяшчан Іван IV загадаў вывезці ў Маскоўскую дзяржаву. Царскія татары пасеклі ў горадзе ўсіх каталіцкіх манахаў (бернардзінцаў, дамініканцаў), спалілі іх касцёлы. Трагічны лёс напаткаў мясцовых яўрэяў, якія не пажадалі прыняць праваслаўную веру. Іх патапілі ў Заходняй Дзвіне. Горад быў спалены і разрабаваны.

Захоп Полацка стаў цяжкай стратай для Вялікага Княства Літоўскага. Паны-рада вымушана была заключыць перамір'е і пачаць мірныя перагаворы з Іванам IV. Цар настойваў на перадачы яму Полаччыны і Лівоніі. Прадстаўнікі Княства з гэтай умовай не пагаджаліся.

**3. Ход вайны ў 1564—1570 гг.** Ваенныя дзеянні былі адноўлены ў пачатку 1564 г. Іван IV накіраваў дзве арміі на Мінск і Навагрудак. Аднак 26 студзеня **1564 г.** гетман М. Радзівіл Руды нанёс паражэнне ваяводзе Пятру Шуйскаму ў бітве *на рацэ Уле* (каля Чашнікаў). Дзякуючы нечаканаму нападу маскоўская групоўка была разгромлена. У наступныя гады з-за эпідэміі чумы і ўнутраных праблем ваенныя дзеянні набылі лакальны характар. Войскі ВКЛ спрабавалі вызваліць Полацк, рабілі ваенныя рэйды на Вялікія Лукі і Пскоў.

Маскоўская дзяржава, каб умацавацца на занятых землях, пабудавала там свае крэпасці: Казьян, Сокал, Красны, Ула, Усвят. Але яе становішча пагоршылася ў сувязі з працяглай вайной і набегамі крымскага хана. На баку Польшчы і ВКЛ выступіла Швецыя. Мірныя перагаворы паміж дэлегацыямі Княства і Маскоўскай дзяржавы, якія адбыліся ў Маскве і Гродне, не далі станоўчых вынікаў.

Паколькі ў дзяржаўным скарбе Княства адсутнічалі сродкі для далейшых ваенных дзеянняў, яму тэрмінова спатрэбіўся ваенны саюзнік. Ім стала Польскае каралеўства, з якім была падпісана Люблінская унія. Першы этап вайны (1558—1570) скончыўся перамір'ем 1570 г., якое Іван IV заключыў ужо з новай дзяржавай — Рэччу Паспалітай.

**4. Другі этап вайны (1576—1582).** Спусташальную Лівонскую вайну завяршыў кароль Рэчы Паспалітай ***Стафан Баторый***. Ён умацаваў армію, дзеля чаго стварыў пешае войска для аблог і штурмаў крэпасцей. Яно набіралася з замежных жаўнераў-наёмнікаў і дзяржаўных сялян.


Правообладатель Издательский центр БГУ




**Гістарычная асоба**

СТАФАН БАТОРЫЙ (1533–1586) паходзіў з Трансільваніі. Выхоўваўся пры двары Габсбургаў у Вене. Адукацыю атрымаў у Падуанскім універсітэце. У 1576–1586 гг. кароль Рэчы Паспалітай. Пры абранні на трон павінен быў ажаніцца з Ганнай Ягелонкай – дачкой Жыгімонта І Старога. Вядомы як таленавіты палкаводзец, актыўны і энергічны дзяржаўны дзеяч. Памёр Баторый нечакана, і лекары не маглі прыйсці да згоды адносна прычын яго смерці. Таму прыйшлося правесці даследаванне цела нябожчыка. Гэта ўпершыню ў Беларусі ажыццявіў гродзенскі цырульнік Ян Зігуліц.

Іван IV не пагадзіўся на прапановы Стафана Баторыя падпісаць мір. Цар быў асабіста зняважаны: яго не выбралі манархам Рэчы Паспалітай, калі ў Францыю збег першы выбарны кароль Генрык Валезы. Да таго ж у сваім лісце Баторый называў Івана Грознага не царом, а «братам», не прызнаў за ім тытул князя полацкага і смаленскага.

У 1577 г. царскія войскі аднавілі ваенныя дзеянні ў Лівоніі. Яны захапілі большую яе частку, за выключэннем Рыгі і Таліна. Тады Стафан Баторый на чале больш як 40-тысячнага войска рушыў на Полацк. У жніўні 1579 г. маскоўскі гарнізон Полацка капітуляваў. Затым войска Рэчы Паспалітай заняло Вялікія Лукі. Гэта дало магчымасць аддзяліць Лівонію ад Маскоўскага царства. Прапановы Івана IV заключыць перамір'е былі каралём катэгарычна адхілены.



*Баторый пад Псковам. Мастак Я. Матэйка. 1871 г.*


Правообладатель Издательский центр БГУ

Летам 1581 г. войска Рэчы Паспалітай накіравалася пад мацнейшую рускую крэпасць — Пскоў. Горад добра падрыхтаваўся да абароны. Першапачатковы штурм замкавых сцен завяршыўся няўдачай. Тады Баторый пачаў аблогу горада. Восенню 1581 г. сітуацыя рэзка пагоршылася. У войску Рэчы Паспалітай скончыўся порах, катастрафічна не хапала харчавання. Жаўнеры пачалі выказваць незадаволенасць зацяжной аблогай. Раннія маразы вымусілі караля адвесці частку арміі на зімовыя кватэры.




Медаль, выбіты ў гонар здабычы Полацка і Лівоніі. 1582 г.

**5. Ям-Запольскае перамір'е.** Цар Іван IV накіраваў пад Пскоў сваіх паслоў. Пачаліся складаныя перагаворы, пасрэднікам у якіх выступіў прадстаўнік папы рымскага Антоній Пасевіна. Яны завяршыліся ў студзені **1582 г.** падпісаннем *Ям-Запольскага перамір'я* тэрмінам на 10 гадоў.

Стафан Баторый пагадзіўся вывесці войскі з тэрыторыі Маскоўскай дзяржавы, вярнуць ёй Вялікія Лукі і іншыя занятыя гарады. Рэч Паспалітая атрымала Лівонію, Курляндскае герцагства, паўднёвыя землі Эстоніі. Ям-Запольскі мір зафіксаваў буйное паражэнне Масквы ў вайне, ёй жа распачатай. Маскоўская дзяржава не здолела атрымаць выхад да Балтыйскага мора і часова адмовілася ад вырашэння «балтыйскай праблемы».

Лівонская вайна скончылася перамір'ем **1583 г.** паміж Маскоўскай дзяржавай і Швецыяй, паводле якога шведы замацавалі за сабой паўночную частку Эстоніі. У далейшым гэта стала прычынай супярэчнасцей паміж Швецыяй і Рэччу Паспалітай з-за прэтэнзій абедзвюх краін на лівонскія землі.

### МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

**З «Дзесяцігадовай аповесці пра ваенныя справы пана Крыштофа Радзівіла» Андрэя Рымшы (1585 г.)**

...Так кароль разам з войскам да Дзісны дабраўся,
Над Дзвіною ракою трохі затрымаўся.
Раіў спешна ў бяспецы рэчку пераходзіць,
Каб не здолеў ім з лесу вораг перашкодзіць;



Правообладатель Издательский центр БГУ

Весткі мелі, што ў Сокал шмат людзей сабралі,
Да таго ж, дадаткова сілы прыбывалі.
Польны гетман за рэчку мае йсці наперад,
Першы ён пераправіць зброю ды жаўнераў.
Тут кароль і Бекеша з венграмі адправіў,
Каб за гетманам следам вояў пераправіў.
Ваявода віленскі быць наступны мае,
Сын яго маскоўцам шабляй пагражае.
А затым і Стафані за Дзвіну падаўся,
Там пра Полацк і Сокал раіцца сабраўся...

Аб якіх падзеях ідзе гаворка? З дапамогай дадатковай літаратуры даведайцеся, хто такі Каспар Бекеш.

## Пытанні і заданні

1. Чаму пачалася Лівонская вайна?
2. Як складваліся ўзаемаадносіны паміж Лівонскім ордэнам, Маскоўскай дзяржавай і ВКЛ у пачатку вайны?
3. Раскажыце пра аблогу і захоп Полацка царскімі войскамі.
4. Чаму ў 1570 г. было падпісана перамір'е паміж Маскоўскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай?
5. Апішыце ход ваенных дзеянняў на другім этапе вайны.
6. Назавіце галоўныя вынікі Лівонскай вайны.
7. Суаднясіце гістарычных асоб з іх пасадамі: а) Іван IV, Стафан Баторый, Жыгімонт II Аўгуст, Мікалай Радзівіл Руды, Станіслаў Давойна; б) полацкі ваявода, вялікі князь літоўскі, выбарны кароль Рэчы Паспалітай, гетман, рускі цар.
8. Запоўніце табліцу «Лівонская вайна».

| Гады вайны | Варожыя бакі | Прычыны вайны | Вынікі вайны |
|---|---|---|---|
| | | | |

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 2. УТВАРЭННЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

**Успомніце**

1. Што азначае паняцце «унія»?
2. Прывядзіце прыклады дзяржаўных уній у Заходняй Еўропе, заключаных у сярэднія вякі.

**1. Перадумовы аб'яднання Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага.** У сярэдзіне XVI ст. Польшча і Вялікае Княства Літоўскае ўтварылі новую краіну — *Рэч Паспалітую*, якая праіснавала да канца XVIII ст. У перакладзе з польскай мовы «Рэч Паспалітая» азначае «агульная справа», «агульная дзяржава».

Збліжэнне дзвюх краін пачалося з канца XIV ст., калі ў выніку Крэўскай уніі 1385 г. вялікі князь літоўскі Ягайла стаў каралём Польшчы. Склалася




*Рэч Паспалітая ў другой палове XVI ст.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

становішча, калі адзін манарх кіраваў і Княствам, і Польшчай. Персанальную унію ажыццяўлялі прадстаўнікі дынастыі *Ягелонаў*: Казімір Ягелончык, Аляксандр Казіміравіч, Жыгімонт I Стары, Жыгімонт II Аўгуст. Да таго ж неаднаразова заключаліся новыя уніі, напрыклад Віленска-Радамская ў 1401 г., Гарадзельская ў 1413 г. Яны пацвярджалі ўмовы дынастычнага саюзу і садзейнічалі збліжэнню дзвюх краін.

Да сярэдзіны XVI ст. праявілася падабенства дзяржаўнага ладу Вялікага Княства Літоўскага і Польскага каралеўства. У абедзвюх краінах панавала шляхта. Яна рэгулярна збіралася на павятовыя соймікі, выбірала сваіх прадстаўнікоў на вальныя соймы. Вышэйшымі органамі дзяржаўнай улады пасля манарха ў ВКЛ былі паны-рада (Рада), а ў Польшчы — Сенат. Яны мелі аднолькавыя функцыі, якія прадугледжвалі выбары манарха, абарону дзяржавы, заключэнне міжнародных пагадненняў, выданне законаў, разгляд судовых спраў.

У міжнародных справах краіны імкнуліся праводзіць агульную палітыку, дапамагаць адна адной. Самым паказальным прыкладам сумесных дзеянняў стала Вялікая вайна 1409—1411 гг., якую ВКЛ і Польшча вялі супраць Тэўтонскага ордэна. Найбольш вядомай падзеяй вайны была бітва пад Грунвальдам.



*Люблінская унія. Мастак Я. Матэйка. 1869 г.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Не трэба забываць, што з канца XIV ст. у абедзвюх краінах склалася адзіная адміністрацыя каталіцкай царквы. Напрыклад, Віленскае і Жамойцкае біскупствы падпарадкоўваліся арцыбіскупу гнезненскаму, які меў тытул прымаса. *Прымас* — гэта кіраўнік царквы ў каталіцкай краіне. Зразумела, што каталіцкая царква разлічвала праз дзяржаўную унію пашырыць свой уплыў на беларускія, украінскія і нават рускія землі.

**2. Прычыны ўтварэння Рэчы Паспалітай.** Галоўнай прычынай Люблінскай уніі стала цяжкае знешнепалітычнае становішча Вялікага Княства Літоўскага ў Лівонскай вайне. Польскае каралеўства пагаджалася аказаць ваенную дапамогу толькі пры ўмове падпісання дзяржаўнай уніі.

Ідэю аб’яднання з Польшчай падтрымала шматлікая шляхта ВКЛ. Яна імкнулася мець роўныя палітычныя правы з магнатамі, прымаць актыўны ўдзел у кіраванні краінай. У адрозненне ад Польскага каралеўства, дзе шляхта мела **шляхецкія вольнасці**, палітыку Вялікага Княства Літоўскага вызначалі прадстаўнікі магнацкіх родаў. Напрыклад, у 1530-я гг. краінай кіравалі тры асобы: віленскі ваявода Альбрэхт Гаштольд, віленскі кашталян Юрый Радзівіл, жамойцкі староста Ян Радзівіл. Магнаты кантралявалі дзейнасць паноўрады ВКЛ, вальных соймаў і нават уплывалі на пастановы павятовых шляхецкіх соймікаў.

**Гістарычная даведка**

Шляхецкія вольнасці прадугледжвалі роўнасць шляхты перад законам, права выбіраць манарха, права шляхты на адкрыты пратэст, права выбіраць дэпутатаў на сойм, недатыкальнасць асобы шляхціца і яго маёнтка.

Прыклад Польшчы настройваў шляхту Вялікага Княства Літоўскага дабівацца аднолькавых правоў з польскай шляхтай праз заключэнне уніі паміж дзвюма краінамі. Падобным чынам яна ўраўноўвалася ў правах і з магнатамі. Таму шляхта, якая сабралася пад Віцебскам у 1562 г. на палявы сойм, запатрабавала ад караля і вялікага князя Жыгімонта II Аўгуста «ўчыніць супольны сойм з палякамі, каб разам караля выбіраць, мець агульную абарону, супольна соймікаваць і права аднолькавае ўжываць».

З другога боку, колькасна большая польская шляхта імкнулася далучыць Княства ў якасці прыдатку да Польшчы, каб атрымаць для сябе новыя землі і пасады. Нават была прапанова замяніць назву «Літва» на назву «Новая Польшча».

Сам кароль быў занепакоены фактам згасання дынастыі Ягелонаў, паколькі не меў дзяцей. Ён разумеў, што пасля яго смерці Княства можа разарваць дынастычную унію і выбраць сабе манарха, асобнага ад Польшчы.


Правообладатель Издательский центр БГУ



**Гістарычная асоба**

ЖЫГІМОНТ II АЎГУСТ (1520–1572) – вялікі князь літоўскі і кароль польскі. Быў абраны на трон пры жыцці бацькі Жыгімонта I у 1529 г. Меў тры шлюбы. Першая жонка Лізавета Габсбург памерла. Другой была Барбара Радзівіл, супраць якой выступілі маці князя Бона Сфорца і значная частка польскіх магнатаў. Трэці шлюб быў заключаны з Кацярынай Габсбург.

**3. Люблінскі сойм.** Агульны сойм сенатараў Польшчы і паслоў ВКЛ пачаў сваю работу 10 студзеня 1569 г. у Любліне. Спачатку дэлегацыі абедзвюх краін засядалі асобна. Адразу вызначыліся два супрацьлеглыя падыходы. Першы з іх прадугледжваў **інкарпарацыю** (уключэнне, далучэнне) ВКЛ у склад Польшчы. Яго рэалізацыі дабіваўся польскі бок. Другі падыход быў прапанаваны дэлегацыяй Княства на чале з канцлерам ***Мікалаем Радзівілам Рудым***. Яна выступала за заключэнне ваеннага саюзу з Польшчай (*Каронай*), каб праводзіць супольную знешнюю палітыку.



**Гістарычная асоба**

МІКАЛАЙ РАДЗІВІЛ РУДЫ (1512–1584) належаў да біржанска-дубінкаўскай лініі роду Радзівілаў. Атрымаў хатнюю адукацыю. Вядомы як дзяржаўны і ваенны дзеяч. Яго сястра Барбара Радзівіл была другой жонкай вялікага князя Жыгімонта II Аўгуста. Вызнаваў кальвінізм і ўзначальваў пратэстантаў у Княстве.

Польскі бок звярнуўся да Жыгімонта II Аўгуста з патрабаваннем, каб дэлегацыі праводзілі пасяджэнні сойма разам. Той загадаў паслам ВКЛ з'явіцца для сумеснай з палякамі працы і згадзіцца на прапановы Кароны. Гэта было парушэннем абяцанняў, якія вялікі князь даваў ім раней. У знак пратэсту паслы Княства 1 сакавіка 1569 г. ад'ехалі дамоў.

У адсутнасць на сойме дэлегацыі ВКЛ Жыгімонт II Аўгуст прыняў рашэнне ўключыць у склад Польскага каралеўства тэрыторыю Падляшша, Ва-



Правообладатель Издательский центр БГУ

лыні, Кіеўшчыны і Падолля. Далучэнне часткі велікакняжацкіх зямель да Кароны адбылося са згоды мясцовай павятовай шляхты. Рада ВКЛ выказала свой пратэст.

«Дэманстрацыя сілы» польскім бокам сведчыла аб пагрозе тэрытарыяльнаму адзінству ВКЛ. Сталі выказвацца прэтэнзіі Польшчы на Брэст, Пінск і Кобрын. Акрамя таго, працягвалася Лівонская вайна. Усё гэта прымусіла дэлегацыю Княства вярнуцца ў Люблін. Толькі канцлер Мікалай Радзівіл Руды адмовіўся ад удзелу ў супольным сойме. Прадстаўнікоў ВКЛ узначаліў маршалак Ян Хадкевіч, які разам з іншымі магнатамі атрымаў ад караля шчодрыя падарункі.

Зноў разгарнулася абмеркаванне праекта уніі. Палякі настойвалі на сваім і не прыслухоўваліся да пазіцыі Княства. Пасля напружаных спрэчак Ян Хадкевіч быў вымушаны пагадзіцца на унію. Пры гэтым ён з горыччу заявіў: «Нам і нашым унукам будзе вельмі крыўдна, калі на гэту справу з часам прыйдзецца глядзець не з любоўю, а са смуткам...»

**4. Умовы Люблінскай уніі.** Пад актам дзяржаўнай уніі паміж Польшчай і ВКЛ **1 ліпеня 1569 г.** прысягнулі прадстаўнікі абедзвюх краін.

Люблінская унія абвяшчала ўтварэнне Рэчы Паспалітай з агульным для ВКЛ і Польшчы манархам. Асобнае выбранне вялікага князя літоўскага забаранялася. Ствараўся адзіны сойм. Прычым збірацца ён мог толькі на тэрыторыі Польшчы. Абвяшчалася агульная знешняя палітыка. Манета ў абедзвюх краінах павінна была быць аднолькавай вагі, формы і пробы. Цяпер шляхта магла без перашкод атрымліваць уладанні як у Кароне, так і ў ВКЛ: «Дазваляецца набываць маёнткі і валодаць імі паляку ў Літве, а ліцвіну ў Польшчы».

Такім чынам, акт уніі дэклараваў: «З гэтага часу абедзве дзяржавы ўяўляюць сабой адно непадзельнае цэлае, а таксама адну агульную Рэч Паспалітую, у якой абодва гаспадары і абодва народы ўз'ядналіся ў адзіны народ і адзіную дзяржаву».

Далейшае развіццё адносін паміж Каронай і ВКЛ сведчыла аб пэўным адыходзе ад умоў Люблінскага акта. Вялікае Княства захавала за сабой сваю назву, дзяржаўны апарат кіравання, уласнае войска, заканадаўства, судовую сістэму, грашовую адзінку. Сойм прымаў законы, асобныя для Кароны і асобныя для ВКЛ. Большасць беларускіх гісторыкаў лічаць, што Рэч Паспалітая ўяўляла сабой **федэрацыю**.

Відавочна, што Люблінская унія была кампрамісам феадалаў абедзвюх краін. Узмацнілася палітычнае, эканамічнае і культурнае збліжэнне шляхты. Яго вынікам стала шляхецкая шматнацыянальная дзяржава, у складзе якой ВКЛ знаходзілася да канца XVIII ст.

Правообладатель Издательский центр БГУ

## МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

### З верша «Да палякаў і да ліцвінаў» Андрэя Волана (1564—1565 гг.)

Вашых продкаў не варта ганьбіць нараканнем,
Што здумелі галовы доўгім разважаннем,
Як навекі ў дзяржаве ім адной злучыцца
І ўзаемна са згодай брацкаю любіцца...
Роўны з роўным змірыцца здолее заўсёды,
Добры з добрым таксама не мінае згоды...

Якім бачылі ў Вялікім Княстве Літоўскім саюз з Польскім каралеўствам?

## Пытанні і заданні

1. Назавіце перадумовы ўтварэння Рэчы Паспалітай.
2. Якія прычыны прывялі да ўзнікнення Рэчы Паспалітай?
3. Ахарактарызуйце пазіцыю прадстаўнікоў ВКЛ на Люблінскім сойме.
4. Чаму Вялікае Княства Літоўскае не імкнулася да заключэння уніі з Маскоўскай дзяржавай?
5. Чаму паслы ВКЛ пагадзіліся падпісаць акт Люблінскай уніі?
6. Дакажыце, што Рэч Паспалітая з'яўлялася федэратыўнай дзяржавай.
7. Дайце азначэнні паняццяў: *Рэч Паспалітая, шляхецкія вольнасці, інкарпарацыя, федэрацыя*.
8. Складзіце схему «Прычыны заключэння Люблінскай уніі».




9. Запоўніце табліцу «Умовы Люблінскай уніі».

| Умовы Люблінскай уніі | |
|---|---|
| **Агульныя для Кароны і ВКЛ** | **Асобныя для Кароны і ВКЛ** |
| | |

Издательский центр БГУ



Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 3. ДЗЯРЖАЎНЫ ЛАД РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

**Успомніце**

Якія органы дзяржаўнага кіравання дзейнічалі ў Вялікім Княстве Літоўскім у XV — першай палове XVI ст.?

**1. Сойм Рэчы Паспалітай.** Вышэйшым органам дзяржаўнай улады ў Рэчы Паспалітай з'яўляўся агульнадзяржаўны вальны *сойм*. Звычайныя соймы склікаліся каралём адзін раз у два гады. На іх прадстаўнікі шляхты выбіралі караля, аб'яўлялі вайну, заключалі мірныя пагадненні з іншымі краінамі, давалі згоду на збор **паспалітага рушэння** (шляхецкага апалчэння), увядзенне ваеннага падатку, надавалі або скасоўвалі шляхецкае званне.

Сойм складаўся з **Сената** і **Пасольскай Ізбы**. У Сенат уваходзілі прадстаўнікі каталіцкага духавенства, найперш біскупы, вышэйшыя службовыя асобы дзяржавы. Іх колькасць складала каля 140—150 чалавек. Пасольская Ізба фарміравалася з прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя краіны. У кожным павеце шляхта выбірала ў яе склад па два дэпутаты. У сярэдзіне XVIII ст. агульная колькасць шляхецкіх паслоў у Пасольскай Ізбе складала 236 чалавек.

Кожны пасол (дэпутат) валодаў правам **«ліберум вета»**, або правам свабоднай забароны. Згодна з гэтым правам усе рашэнні на вальных соймах Рэчы Паспалітай павінны былі прымацца аднагалосна. Калі хоць адзін з паслоў не быў згодны з пастановай сойма, то яна не прымалася. Выражалася права ў выкрыку дэпутата «не дазваляем», што вяло да спынення пасяджэння сойма і адмены прынятых на ім пастаноў. Шляхта вельмі ганарылася гэтым правам. Яно сведчыла аб шырокіх вольнасцях шляхецкага саслоўя. Але



*Вальны сойм Рэчы Паспалітай. Гравюра Я. Лаўра. 1622 г.*



Издательский центр БГУ
Правообладатель Издательский центр БГУ



*Зала Пасольскай Ізбы ў Каралеўскім замку на Вавелі ў Кракаве*

паступова магнаты сталі выкарыстоўваць гэтае права для вырашэння ўласных мэт, што вельмі аслабіла краіну.

**Гістарычная даведка**

Першы раз сойм Рэчы Паспалітай быў сарваны ў 1652 г. Права «ліберум вета» выкарыстаў шляхціц-пасол ад Упіцкага павета Трокскага ваяводства Уладзіслаў Сіцынскі.




У Рэчы Паспалітай дзейнічалі і надзвычайныя соймы. Іх склікаў прымас. Падставай для надзвычайнага сойма магла быць смерць караля або адмова манарха ад прастола. На надзвычайным сойме прадстаўнікі шляхты абмяр-



Правообладатель Издательский центр БГУ

Издательский центр БГУ

коўвалі кандыдатуры будучага караля. З некалькіх прапанаваных прэтэндэнтаў выбіралі аднаго і ўзводзілі на трон Рэчы Паспалітай.

Каранацыя адбывалася ў Кракаве. Новы кароль урачыста ўязджаў у горад, кіраваў пахаваннем свайго папярэдніка, здзяйсняў паломніцтва да мошчаў Святога Станіслава. Цырымонію завяршаў прымас. Ён апаясваў новага караля мячом, накладаў яму на галаву залатую карону, даваў у рукі скіпетр і яблык (залаты шар з крыжам). Толькі каранацыя апошняга караля Рэчы Паспалітай — Станіслава Аўгуста Панятоўскага — прайшла ў Варшаве.

**2. Кароль Рэчы Паспалітай.** Караля Рэчы Паспалітай шляхта выбірала пажыццёва. Упершыню гэта адбылося пасля смерці Жыгімонта II Аўгуста. У маі 1573 г. на надзвычайным сойме перамогу атрымала кандыдатура французскага герцага ***Генрыка Валезы (Валуа)***. Яго шляхта празвала «Гавэндскім» («гаварлівым»).



**Гістарычная асоба**

ГЕНРЫК ВАЛЕЗЫ (1551—1589) з'яўляўся апошнім прадстаўніком дынастыі Валуа на троне Францыі. Будучы каталікам, ён вёў актыўную барацьбу з пратэстантамі. Атрымаў прапанову ажаніцца з дачкой Жыгімонта I Ганнай Ягелонкай і стаць каралём Рэчы Паспалітай. Генрык Валезы прабыў каралём толькі чатыры месяцы. У ноч на 19 чэрвеня 1574 г. уцёк у Парыж, дзе быў абраны манархам Францыі.

Паўнамоцтвы караля вызначалі наступныя дакументы — **Пакта канвента** і **Генрыкавы артыкулы**. Пакта канвента ўяўляла сабой пагадненне паміж шляхтай і новаабраным каралём, вызначала ўмовы абрання на прастол Рэчы Паспалітай. Дакумент прадугледжваў абавязкі манарха: аказанне фінансавай дапамогі дзяржаве, выплату даўгоў папярэдняга караля, захоўванне шляхецкіх вольнасцей, невыкарыстанне войска супраць шляхты і інш. Пакта канвента складалася асобна для кожнага караля.

Генрыкавы артыкулы прадугледжвалі свабоднае выбранне караля шляхтай, свабоду хрысціянскага веравызнання, абавязак манарха збіраць сойм адзін раз у два гады. Каралю забаранялася без згоды сойма ўводзіць новыя падаткі, склікаць шляхецкае апалчэнне. Кожны новы манарх павінен быў пацвярджаць гэты дакумент.


Правообладатель Издательский центр БГУ

Сойм кантраляваў дзейнасць караля праз савет, які складаўся з 16 членаў Сената. Яны пільна сачылі за выкананнем манархам дазволеных яму функцый і абавязкаў. Калі шляхта не пагаджалася з каралём або імкнулася дасягнуць пэўных палітычных мэт, то яна мела права ствараць **канфедэрацыі** (часовыя ваенна-палітычныя саюзы). Справа часам даходзіла да *рокашу*: шляхта магла адмовіцца ад паслушэнства каралю і са зброяй у руках выступіць супраць яго.



*Шляхціц.*
*З гравюры XVII ст.*

Пасля Генрыка Валезы выбарнымі каралямі Рэчы Паспалітай і адначасова вялікімі князямі літоўскімі былі Стафан Баторый (1576—1586), Жыгімонт III Ваза (1587—1632), Уладзіслаў IV Ваза (1632—1648), Ян II Казімір Ваза (1648—1668), Міхал Вішнявецкі (1669—1673), Ян III Сабескі (1674—1696), Аўгуст II (1697—1706, 1709—1733), Станіслаў Ляшчынскі (1704—1709, 1733), Аўгуст III (1733—1763), Станіслаў Аўгуст Панятоўскі (1764—1795).

**3. Фарміраванне адзінага шляхецкага саслоўя ў Рэчы Паспалітай.** У XVII ст. на пануючае саслоўе Вялікага Княства Літоўскага пашыраюцца вольнасці (правы) польскай шляхты. Менавіта іх дамагалася большая частка шляхты ВКЛ падчас заключэння Люблінскай уніі. У чэрвені **1697 г.** на надзвычайным сойме была прынята пастанова *«Ураўнаванне правоў»*, паводле якой велікакняжацкая шляхта поўнасцю ўраўноўвалася ў правах з польскай. Яна атрымала магчымасць кантраляваць дзейнасць вышэйшых дзяржаўных асоб, такіх як гетман, падскарбі, канцлер. Гэтай жа пастановай сойма замест афіцыйнай беларускай мовы ў дзяржаўных установах ВКЛ уводзілася польская мова.

Адначасова ўплыў Польшчы праявіўся ў *паланізацыі* шляхты Вялікага Княства Літоўскага. Шляхта пераймала ўзоры грамадскага ладу Польшчы, пераходзіла ў каталіцтва, далучалася да польскай культуры, стала размаўляць на польскай мове. Працэс паланізацыі фактычна не закрануў ніжэйшыя слаі грамадства — сялян і мяшчан.

Як вынік, у другой палове XVII ст. у Рэчы Паспалітай пачало фарміравацца адзінае саслоўе, якое называлі *«народ шляхецкі»*. Яго прадстаўнікі супрацьстаялі «люду простаму» — сялянам і гарадскім нізам.



Правообладатель Издательский центр БГУ

### Пытанні і заданні

1. На якія дзве групы падзяляліся соймы Рэчы Паспалітай?
2. Ахарактарызуйце структуру і функцыі соймаў Рэчы Паспалітай.
3. Вызначце правы і абавязкі каралёў Рэчы Паспалітай.
4. Пералічыце выбарных каралёў Рэчы Паспалітай.
5. Параўнайце паўнамоцтвы каралёў Рэчы Паспалітай і вялікіх князёў літоўскіх XIII — першай паловы XVI ст.
6. Што такое рэспубліка? Дайце тлумачэнне з дапамогай дадатковай літаратуры.
7. Дакажыце, што Рэч Паспалітая з'яўлялася «шляхецкай» рэспублікай.
8. Чаму ў XVII ст. у Рэчы Паспалітай фарміруецца адзінае шляхецкае саслоўе?
9. Дайце азначэнні паняццяў: *Сенат, Пасольская Ізба, Пакта канвента, Генрыкавы артыкулы, канфедэрацыя, «ліберум вета», паланізацыя.*

## § 4. ПАЛІТЫЧНАЕ СТАНОВІШЧА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI — ПАЧАТКУ XVII ст.

### Успомніце

Калі і чаму былі ўведзены І і ІІ Статуты Вялікага Княства Літоўскага?

**1. Захаванне самастойнасці ВКЛ у другой палове XVI — пачатку XVII ст.** Люблінскую унію насцярожана і нават варожа сустрэла частка магнатаў Вялікага Княства Літоўскага. Яна пагражала ім стратай палітычнага лідарства ў краіне. У Сенат Рэчы Паспалітай многія з іх проста не трапілі. Ды і ў Пасольскай Ізбе большасць шляхецкіх дэпутатаў прадстаўлялі Карону. Правесці ў сойме пастановы на карысць Княства было вельмі цяжка.

На беларуска-літоўскіх землях пашырыліся незалежніцкія, антыпольскія настроі. Сенатары ад ВКЛ у 1573 г., пры абранні на трон Генрыка Валезы, сталі патрабаваць ад Польшчы вярнуць украінскія землі. У парушэнне ўмоў Люблінскай уніі была ўведзена асобная для Княства прысяга каралю. Манарх павінен быў пацвердзіць правы ВКЛ. Таксама перад соймам сенатары і шляхецкія дэпутаты збіраліся ў Ваўкавыску або ў Слоніме для вызначэння агульнай пазіцыі.

У час другога бескаралеўя велікакняжацкая шляхта адмовілася ад удзелу ў абранні на трон Стафана Баторыя. Дэлегацыя ад ВКЛ з'явілася да яго толькі пасля каранацыі. Таму новы кароль пайшоў на ўступкі і ў 1576 г. выдаў спецыяльны прывілей, які пацвярджаў пэўную самастойнасць Княства ў складзе


Правообладатель Издательский центр БГУ

Рэчы Паспалітай. Ён абавязваўся пашырыць межы ВКЛ, не прызначаць у ім военачальнікамі палякаў. Цікава, што Баторый сваёй рэзідэнцыяй выбраў Гродна. Тут ён прымаў рускае і англійскае пасольствы, правёў пасяджэнне Сената Рэчы Паспалітай. Менавіта ў гэтым горадзе кароль разгледзеў справу жыхароў Рыгі, якія не пажадалі прыняць грыгарыянскі каляндар.

У сярэдзіне XVII ст. разарваць унію з Польшчай спрабавалі магнаты Радзівілы, але няўдала. А ў канцы таго ж стагоддзя аднавіць поўную самастойнасць ВКЛ жадалі магнаты Сапегі. Яны выступілі супраць караля Рэчы Паспалітай. Пасля такіх выступленняў Карона ішла на ўступкі шляхце ВКЛ. Так, у 1673 г. было прынята рашэнне, згодна з якім кожны трэці сойм павінен быў збірацца ў Гродне. Маршалкам пасяджэння выбіраўся прадстаўнік мясцовай шляхты.

**2. Трыбунал Вялікага Княства Літоўскага.** У часы Стафана Баторыя ў **1581 г.** у беларуска-літоўскай дзяржаве быў створаны **Трыбунал Вялікага Княства Літоўскага** — вышэйшая судовая ўстанова краіны. Гэта быў шляхецкі суд, які фарміраваўся з прадстаўнікоў павятовай шляхты (па два суддзі-дэпутаты ад павета). Суддзямі маглі стаць толькі ўраджэнцы Княства. Яны павінны былі мець уласныя маёнткі і быць дасведчанымі ў юрыдычнай справе. Тэрмін дзейнасці суддзяў-дэпутатаў абмяжоўваўся адным годам. Пасяджэнні Трыбунала ВКЛ праходзілі ў розных гарадах: спачатку ў Вільні і Троках, затым — у Мінску і Навагрудку, а ў другой палове XVIII ст. — у Вільні і Гродне.



*Тытульны ліст закона «Трыбунал абывацелям Вялікага Княства Літоўскага», па якім дзейнічаў Трыбунал ВКЛ*

Трыбунал ВКЛ разглядаў апеляцыйныя справы. Да іх адносіліся абскарджанне прыгавораў мясцовых судоў, скаргі на злоўжыванні службовых асоб. Таксама за Трыбуналам захоўваліся натарыяльныя абавязкі.

Судовыя працэсы праходзілі адкрыта з удзелам бакоў, іх адвакатаў і сведкаў. Забаранялася прыходзіць у суд са зброяй, акрамя шаблі, мяча і шпагі. Рашэнні прымаліся большасцю галасоў суддзяў.

**3. Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 г.** Пацвярджэннем дзяржаўнай самастойнасці Вялікага Княства Літоўскага стала прыняцце ў **1588 г.** *III Статута ВКЛ*. Ён быў выдадзены ў віленскай друкарні, якая належала братам Мамонічам. Існуе думка, што тэкст Статута складзены ад імя караля і вялікага князя Стафана Баторыя.


Правообладатель Издательский центр БГУ

Гэты звод законаў быў падрыхтаваны камісіяй пад кіраўніцтвам канцлера ***Астафія Валовіча*** і падканцлера ***Льва Сапегі***.



**Гістарычная асоба**

АСТАФІЙ БАГДАНАВІЧ ВАЛОВІЧ (1520–1587) – дзяржаўны дзеяч ВКЛ. Займаў шэраг пасад мясцовага і вышэйшага кіравання. У 1579 г. стаў канцлерам краіны. Неаднаразова ездзіў паслом у Маскву. Удзельнічаў у Лівонскай вайне. Уваходзіў у склад дэлегацыі ад Княства на Люблінскі сойм. Завяшчаў пасля сваёй смерці вызваліць усіх сваіх падданых ад прыгоннай залежнасці.

III Статут Вялікага Княства Літоўскага ігнараваў акт Люблінскай уніі, замацоўваў незалежнасць Княства. Ён абавязваў урад вярнуць адлучаныя ад ВКЛ землі, забараняў прызначаць на дзяржаўныя пасады і надзяляць зямлёй «чужаземцаў і заграннічнікаў», у тым ліку палякаў, захоўваў адасобленасць дзяржавы. У тэксце ні разу не ўпамінаецца Люблінская унія. Па змесце гэтага дакумента Вялікае Княства Літоўскае выступала самастойнай дзяржавай.

Статут ВКЛ 1588 г. складаўся з 14 раздзелаў і 488 артыкулаў. У ім знайшла адлюстраванне тэорыя падзелу ўлады на заканадаўчую (сойм), выканаўчую (вялікі князь, службовыя асобы) і судовую (Трыбунал ВКЛ, земскія і падкаморскія суды). Ва ўступе падканцлер Леў Сапега сфармуляваў галоўную ідэю прававой дзяржавы — падпарадкаванне ўсіх адзінаму праву.



*Тытульны ліст Статута ВКЛ 1588 г.*

З аднаго боку, артыкулы Статута абавязвалі вялікага князя праводзіць верацярпімую палітыку, забяспечваць спакой усіх жыхароў краіны. Звод законаў прадугледжваў адказнасць шляхты за забойства простага чалавека, забараняў перадачу ў няволю свабоднага чалавека за даўгі або злачынствы, абмяжоўваў пакаранне непаўналетніх да 16 гадоў. З другога боку, Статут абараняў інтарэсы феадалаў, узмацняў іх прывілеяванае становішча, канчаткова запрыгоніў сялян.

Издательский центр БГУ



Правообладатель Издательский центр БГУ

III Статут ВКЛ складзены на старабеларускай мове, якую разумела большасць жыхароў краіны. Леў Сапега з гонарам пісаў: «Не чужой якой моваю, але сваёю ўласнай правы пісаныя маем». Дарэчы, першы артыкул IV раздзела вызначаў дзяржаўны статус старабеларускай мовы.

Пасля смерці Стафана Баторыя новы кандыдат на трон Рэчы Паспалітай шведскі прынц Жыгімонт Ваза хацеў заручыцца падтрымкай на сойме прадстаўнікоў ВКЛ. Таму ён пагадзіўся зацвердзіць Статут, паколькі польскія паслы не жадалі разглядаць гэты дакумент на вальных соймах. На беларускіх землях Статут 1588 г. як звод законаў дзейнічаў аж да 1840 г.

**4. Леў Сапега.** Умацаванне самастойнасці Вялікага Княства Літоўскага звязана з імем вядомага палітычнага, грамадскага і ваеннага дзеяча Льва Іванавіча Сапегі. Ён нарадзіўся ў 1557 г. у вёсцы Астроўна (цяпер Бешанковіцкі раён Віцебскай вобласці). Яго сямейныя карані ўзыходзяць да старажытнага роду смаленскіх баяр. Дзяцінства Льва Сапегі прайшло ў Нясвіжы пры двары Радзівілаў. Вядомы магнат канцлер ВКЛ Мікалай Радзівіл Чорны накіраваў юнака на вучобу ў Лейпцыгскі ўніверсітэт. Пасля ён вярнуўся на радзіму і атрымаў пасаду каралеўскага пісара пры Стафане Баторыі. Кароль заўважыў здольнага да дзяржаўнай службы «ўрадніка» і ў 1585 г. прызначыў Льва Сапегу падканцлерам ВКЛ. А ў 1589 г. Леў Сапега стаў канцлерам краіны. Ён таксама выконваў абавязкі віленскага ваяводы і нават вялікага гетмана Княства. На ўсіх пасадах Леў Сапега паказаў сябе здольным і таленавітым палітыкам, дыпламатам, мудрым дзяржаўным дзеячам.

У перыяд Лівонскай вайны ён на свае сродкі сфарміраваў гусарскі полк і паспяхова ваяваў пад Вялікімі Лукамі і Псковам. Неаднаразова ўзначальваў пасольствы ў Маскоўскую дзяржаву, з якой праводзіў мірныя перагаворы. Леў Сапега выступаў з ідэяй аб'яднання Рэчы Паспалітай і Расіі ў федэратыўную дзяржаву.



*Леў Сапега.*
*Невядомы мастак. 1616 г.*

Апошнія гады жыцця гэты дзяржаўны дзеяч правёў у Вільні, дзе займаўся ўпарадкаваннем дакументаў *Метрыкі* (архіва) ВКЛ. У Ружанах (цяпер гарадскі пасёлак у Пружанскім раёне Брэсцкай вобласці) ён сабраў вялікую бібліятэку. Памёр Леў Іванавіч Сапега ў 1633 г. і быў пахаваны ў касцёле Святога Міхаіла ў Вільні.

Такім чынам, Вялікае Княства Літоўскае захавала ў складзе Рэчы Паспалітай элементы самастойнага развіцця, што дае падставу ўжываць выраз «дзяржава абодвух народаў».


Издательский центр БГУ
Правообладатель Издательский центр БГУ

## МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

**Са Статута ВКЛ 1588 г. Артыкул 10.**

...усё рыцарства, шляхту Вялікага Княства, пры вольнасцях іх звыклых, якія ад нас, гаспадара, і ад продкаў нашых ім нададзены, будзем павінны захоўваць і трымаць...

Як ставілася вышэйшая ўлада да шляхецкага саслоўя ВКЛ?

**Са звароту Льва Сапегі да ўсіх саслоўяў Вялікага Княства Літоўскага**

Галоўнай мэтай законаў ва ўсім свеце з'яўляецца падтрыманне ў грамадстве такога становішча, каб кожны мог захоўваць у непарушнасці добрае імя, здароўе і маёмасць і не цярпець з боку іншых ніякай шкоды.

Як вы ставіцеся да пазіцыі Льва Сапегі?

## Пытанні і заданні

1. Дакажыце, што пасля Люблінскай уніі ВКЛ захоўвала значную палітычную самастойнасць.
2. Вызначце стаўленне да Вялікага Княства Літоўскага караля Стафана Баторыя.
3. Як вы разумееце выраз гісторыка І. Пасторыя: «Баторый быў у касцёле больш чым святар, у рэспубліцы больш чым сенатар, у судзе больш чым адвакат, у войску больш чым гетман, у баі больш чым салдат, а ў пераняссенні непрыемнасцей, у цярплівасці, дабраце і ў прабачэнні асабістых абраз — больш чым чалавек»?
4. Якое значэнне мела ўтварэнне Трыбунала ВКЛ? Вызначце яго функцыі.
5. Ці адрознівалася заканадаўства Вялікага Княства ад польскага?
6. У чым заключаўся прагрэсіўны характар ІІІ Статута ВКЛ?
7. Вызначце ролю Льва Сапегі ў гісторыі Беларусі.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 5. ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII ст.

**Успомніце**

1. Якія краіны ажыццяўлялі кантроль над Усходняй Прыбалтыкай пасля Лівонскай вайны?
2. Калі ў Рускай дзяржаве згасла царская дынастыя Рурыкавічаў?
3. Што такое пратэстантызм?

**1. Барацьба са Швецыяй.** Пасля смерці Стафана Баторыя новым каралём Рэчы Паспалітай у 1587 г. быў абраны шведскі прынц ***Жыгімонт III Ваза***. Яго кандыдатуру падтрымала большая частка шляхты і цётка — дачка Жыгімонта I Старога Ганна Ягелонка. Новы кароль мэтанакіравана абараняў інтарэсы каталіцкай царквы. За гэта яго не любілі ў Швецыі, дзе большасць дваран прытрымліваліся пратэстанцкага веравызнання.

Пасля смерці бацькі Жыгімонт III стаў каралём дзвюх дзяржаў: Рэчы Паспалітай і Швецыі. Праўда, ненадоўга. У 1599 г. шведскія дваране запатрабавалі, каб Жыгімонт жыў у Швецыі і стаў пратэстантам. Паколькі кароль адмовіўся, то яны перасталі яму падпарадкоўвацца. Справа дайшла да таго, што ў Швецыі Жыгімонта III пазбавілі трона. Кароль з гэтым не пагадзіўся і перадаў Рэчы Паспалітай Паўночную Эстонію. Гэта прывяло да *вайны Рэчы Паспалітай са Швецыяй* **1600—1629 гг.**



*Бітва пад Кірхгольмам. 1605 г. Мастак Г. Пілацы*



Правообладатель Издательский центр БГУ




*ВКЛ у першай палове XVII ст.*

Шведы на чале з герцагам Карлам (будучым каралём Карлам IX) у 1601 г. занялі Эстонію і большасць гарадоў Лівоніі, за выключэннем Рыгі. Горад быў аблажаны 14-тысячным войскам. Гетман ВКЛ ***Ян Хадкевіч*** са значна меншымі сіламі нанёс паражэнне шведам у бітве *пад Кірхгольмам*, якая адбылася 27 верасня **1605 г.** У Віцебскім летапісе было занатавана: «У год 1605. Гетман Хадкевіч, маючы толькі 3500 войска, разбіў у Інфлянтах 10 000 войска Карла Гудэрмана; 9000 паклаў трупамі і шмат узяў у палон; харугваў узята 60, гармат — 11; сам Карл быў паранены на моры. Палякаў загінула не больш за 800. Бітва трывала тры гадзіны...» У 1609 г. Ян Хадкевіч заняў г. Пярну і на-

Издательский центр БГУ



Правообладатель Издательский центр БГУ

нёс новае паражэнне шведам пад Рыгай. Але паколькі войску не заплацілі грошай, то жаўнеры разышліся.



**Гістарычная асоба**

ЯН КА́РАЛЬ ХАДКЕВІЧ (1560—1621) — прадстаўнік знакамітага магнацкага роду ВКЛ, выдатны палкаводзец. Вучыўся ў Віленскай і Інгальштацкай (Германія) акадэміях. Часта перамагаў ворага, маючы меншыя сілы.

Бліскучыя перамогі Яна Хадкевіча не паслужылі на карысць Рэчы Паспалітай. Дзяржаве на далейшае вядзенне вайны не хапала грошай. Кароль вёў упартую барацьбу з магнатамі, каб пашырыць свае правы. Адначасова Рэч Паспалітая прымала ўдзел у інтэрвенцыі супраць Расіі і вяла вайну з Турцыяй.

У 1621 г. новы шведскі кароль Густаў II заняў Рыгу, Мітаву, а затым тэрыторыю Прусіі. Абодва бакі былі вельмі стомлены зацяжной вайной. Пры пасрэдніцтве еўрапейскіх краін у *г. Альтмарку* (Польшча) у 1629 г. было падпісана перамір'е. Швецыя ўзмацніла свае пазіцыі на Балтыцы. Яна кантралявала амаль усё ўзбярэжжа і балтыйскі гандаль, атрымала Эстонію і Лівонію да Заходняй Дзвіны. Рэч Паспалітая захавала за сабой Земгальскае і Курляндскае герцагствы.

**2. Інтэрвенцыя ў Расію.** Рэч Паспалітая не губляла надзеі вярнуць ад Расіі Смаленск, Чарнігаў і ноўгарад-северскія землі, страчаныя ў час памежных войнаў у першай палове XVI ст. Дзеля гэтага кароль і вялікі князь Жыгімонт III Ваза скарыстаўся «смутай», якая ахапіла Расійскую дзяржаву.

**Гістарычная даведка**

*«Смутны час»* — гэта дынастычны крызіс у Расіі. У гістарычнай навуцы яго традыцыйна пачынаюць са смерці апошняга маскоўскага Рурыкавіча Фёдара Іванавіча ў 1598 г. і завяршаюць 1613 г., калі Земскі сабор выбраў новым манархам Міхаіла Раманава. У гэты перыяд з'явілася шмат самазванцаў, якія выдавалі сябе за Дзмітрыя — загінуўшага сына Івана IV. «Смутны час» суправаджаўся шырокімі народнымі хваляваннямі, выкліканымі неўраджаем і голадам.



Правообладатель Издательский центр БГУ

У 1601 г. у Кіеве, Астрогу, Брагіне з'явіўся беглы манах Рыгор Атрэп'еў, які называў сябе царэвічам Дзмітрыем (***Ілжэдзмітрый І***). Яго падтрымаў уплывовы магнат князь Адам Вішнявецкі. Самазванец прасіў падтрымкі ў караля Рэчы Паспалітай, за што абяцаў пашырыць каталіцтва сярод насельніцтва Расіі. Жыгімонт III Ваза дазволіў самазванцу сабраць наёмнае войска са шляхты, запарожскіх і данскіх казакоў для паходу на Маскву. У 1604 г. войска Лжэдзмітрыя І уступіла з поўдня ў межы Расіі. Яго руху да расійскай сталіцы спрыялі шырокія выступленні сялян, гараджан, казацтва, іх незадаволенасць палітыкай цара Барыса Гадунова, вера ў «добрага цара», эканамічны крызіс. У чэрвені 1605 г. войска самазванца ўвайшло ў Маскву, а 27 ліпеня ён быў каранаваны як цар Дзмітрый І Іванавіч. Але на троне прабыў нядоўга. У час народнага паўстання маскоўскія баяры яго забілі.



*Ілжэдзмітрый І*



*Жыгімонт III Ваза. Невядомы мастак. 1585 г.*

Чарговы самазванец з'явіўся ў 1607 г. Магчыма, ***Ілжэдзмітрый ІІ*** быў ураджэнцам беларускіх зямель. Зімой наступнага года ён з наёмнымі атрадамі заняў Арол, адтуль рушыў на Маскву. Заняць сталіцу Расіі самазванцу не ўдалося. Яго рэзідэнцыяй стала сяло Тушына, дзе быў сфарміраваны ўрад з рускіх баяр і дваран на чале з мітрапалітам Філарэтам. Цар ***Васіль Шуйскі*** для барацьбы з Ілжэдзмітрыем ІІ заключыў ваенны саюз са Швецыяй. Гэта стала зачэпкай да *вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй* **1609—1618 гг.**

Восенню 1609 г. войска Жыгімонта III Вазы аблажыла Смаленск. Аблога горада зацягнулася на дваццаць месяцаў. Адным з галоўных ініцыятараў ваеннага паходу быў канцлер ВКЛ Леў Сапега. Ён планаваў далучыць Расійскую дзяржаву да Рэчы Паспалітай як трэцюю, пасля ВКЛ, адзінку федэрацыі. Гетман Станіслаў Жалкеўскі нанёс паражэнне расійска-шведскаму войску каля *вёскі Клушына* ў 1610 г. Маскоўскія баяры скінулі свайго цара з трона і перадалі ў палон у Варшаву. Таксама яны ўпусцілі шляхецкае войска ў расійскую сталіцу і абралі царом сына Жыгімонта III Вазы — Уладзіслава. Праўда, кароль, які апасаўся за жыццё сына, не пусціў яго ў Маскву. Уладзіслаў Ваза атрымаў спецыяльныя граматы, якія абвяшчалі яго расійскім царом.



Правообладатель Издательский центр БГУ




*Аблога Смаленска войскамі Рэчы Паспалітай у 1610 г. Гравюра Г. Келера*

Аднак супраць шляхецкіх атрадаў узняліся народныя апалчэнні. Іх фарміраванне адбывалася па закліку праваслаўнай царквы. Другое народнае апалчэнне пад кіраўніцтвам Кузьмы Мініна і Дзмітрыя Пажарскага вызваліла Маскву. У пачатку лістапада 1612 г. пасля штурму Кітай-горада капітуляваў польска-літоўскі гарнізон Крамля.

Каралевіч Уладзіслаў спрабаваў вярнуць расійскі трон. У 1618 г. ён узначаліў паход на Маскву. Войскі размясціліся каля Арбацкай брамы, але штурм вынікаў не даў. У сяле Дэўліна пачаліся перагаворы. Паслы Рэчы Паспалітай, асабліва Леў Сапега, трымаліся катэгарычна і бескампрамісна. Паводле заключанага ў **1618 г.** ***Дэулінскага перамір'я*** тэрмінам на 14,5 года Вялікае Княства Літоўскае атрымала смаленскія землі (за выключэннем Вязьмы). Чарнігаўскія і ноўгарад-северскія землі адышлі да Польшчы.



*Уладзіслаў IV Ваза. Невядомы мастак. Другая палова XVIII ст.*

**3. Смаленская вайна.** Мірныя адносіны паміж Расійскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай былі нядоўгімі. Цар ***Міхаіл Фёдаравіч*** (1613—1645) і яго бацька патрыярх Філарэт выкарысталі перыяд безуладдзя ў Рэчы Паспалітай і накіравалі ў верасні 1632 г. 40-тысячнае расійскае войска на Смаленск. Быў заняты шэраг памежных гарадоў: Се-



Правообладатель Издательский центр БГУ



*Войскі Рэчы Паспалітай пад Смаленскам у час вайны 1632—1634 гг. Фрагмент гравюры В. Гондыуса. 1636 г.*

беж, Невель, Усвяты, Ноўгарад-Северскі, Старадуб. Затым расійскія войскі аблажылі Смаленск, а ў чэрвені 1633 г. авалодалі Полацкам. Шляхта не магла хутка сабраць паспалітае рушэнне, паколькі выбірала новага манарха.

Гетман ВКЛ Караль Радзівіл накіраваў пад Смаленск на падмогу войскі. Падтрымку ім аказалі крымскія татары, арганізаваўшы набег на расійскія землі. Вельмі хутка да Смаленска на чале 25-тысячнай групоўкі рушыў новы кароль Рэчы Паспалітай Уладзіслаў IV Ваза. Пасля некалькіх праведзеных бітваў расійскае войска трапіла ў акружэнне і капітулявала 15 лютага 1634 г.

Вайна **1632—1634 гг.** атрымала назву *«Смаленская»* і завяршылася *Палянаўскім мірам*, падпісаным у вёсцы Сямлёва на рацэ Палянаўка (паміж Дарагабужам і Вязьмай) тэрмінам на 20 гадоў. Расійская дзяржава атрымала г. Сярпейск, крэпасці Трубчэўск, Ахтырку і Лебядзін. Але смаленскія, чарнігаўскія і ноўгарад-северскія землі вярнуць назад не здолела. Уладзіслаў IV афіцыйна адмовіўся ад прэтэнзій на расійскі трон, што для цара Міхаіла Фёдаравіча было самай важнай умовай. Кароль атрымаў за адмову значную суму грошай.

### МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

#### З Баркулабаўскага летапісу (канец XVI — пачатак XVII ст.)

...Таго ж року 607 [1607 г.], месяца мая, ...ішоў са Шклова і з Магілёва нейкі Дзмітрый Іванавіч. Лічыў сябе царом маскоўскім... Бо той Дзмітрый Нагі быў



Правообладатель Издательский центр БГУ

найперш у святара шклоўскага [на службе]..., дзяцей грамаце вучыў, школу трымаў, а потым да Магілёва прыйшоў, таксама ў святара Фёдара Сасіновіча... у вёсцы дзяцей вучыў...

Якой паўстае перад чытачом асоба Лжэдзмітрыя II?

**З Віцебскага летапісу**

...У год 1633. Месяца ліпеня дзявятага дня маскоўцы напалі на горад Полацк і ўвесь выпалілі...

**З граматы караля Уладзіслава IV Вазы жыхарам Полацка (7 лістапада 1633 г.)**

...Дайшлі да нас звесткі, што вы пасля спальвання... [маскоўскім войскам] горада нашага Полацка не толькі не жадаеце адбудоўвацца на папярэдніх сваіх месцах, але і... горад і памежныя крэпасці пакінуўшы, пераходзіце са сваёй маёмасцю ў месцы, якія знаходзяцца ў руках... [маскоўскага войска], і там пасяляецеся, што нам чыніць вялікі клопат...

Прааналізуйце два апошнія фрагменты. Аб чым яны сведчаць?

## Пытанні і заданні

1. Вызначце асноўныя кірункі знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай у першай палове XVII ст.
2. Як вы лічыце, ці меў Жыгімонт III Ваза магчымасць вярнуць сабе шведскі трон?
3. Чаму Рэч Паспалітая не здолела перамагчы ў вайне са Швецыяй 1600—1629 гг.?
4. Ці можна лічыць інтэрвенцыю Рэчы Паспалітай у Расію авантурай?
5. У чым адрозненне паміж двума паходамі самазванцаў на Маскву?
6. Назавіце ўмовы Дэулінскага перамір'я.
7. Чаму вайна 1632—1634 гг. атрымала назву «Смаленская»?
8. Запоўніце табліцу «Войны Рэчы Паспалітай у першай палове XVII ст.».

| Гады вайны | Удзельнікі (краіны) | Прычыны вайны | Ход вайны | Вынікі вайны |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |



Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 6. СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI — ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII ст.

**Успомніце**

Што такое натуральная гаспадарка? У чым яе адрозненне ад таварнай гаспадаркі?

**1. Заняткі сельскіх жыхароў.** Большую частку насельніцтва беларускіх зямель складалі сяляне. Яны займаліся земляробствам, жывёлагадоўляй і промысламі. Дапаможную ролю адыгрывалі бортніцтва, паляванне і рыбалоўства. Сяляне вырошчвалі жыта, авёс, ячмень, проса, грэчку і іншыя культуры. Для апрацоўкі зямлі яны выкарыстоўвалі драўляную саху, зрэдку лёгкі плуг, драўляную плеценую барану. Ураджайнасць заставалася нізкай, а сялянская гаспадарка ў многім захоўвала натуральны характар.

Гаспадарка асобнай сям'і, у якую ўваходзілі ворныя землі, сенажаці, жылыя і гаспадарчыя будынкі, у той час называлася **дымам**. У ім налічвалася ад 5 да 9 чалавек, з якіх было ад трох да сямі працаздольных. Дымы ўтваралі **грамаду** (абшчыну). Яна несла агульную адказнасць за выкананне сялянскіх павіннасцей, рэгулявала сялянскае землекарыстанне перад феадалам. Члены грамады на сваім сходзе выбіралі сельскага войта. Ён наглядаў за працай сялян, быў пасрэднікам паміж феадалам і грамадой, раскладаў павіннасці, адвозіў гаспадару даніну, адказваў за захаванне парадку, стан мастоў і дарог.

Сяляне залежалі ад землеўласнікаў-феадалаў, паколькі толькі шляхта магла валодаць зямлёй у Княстве. Статут 1588 г. забараняў селяніну набываць шляхецкія землі: «Простага стану чалавек, не атрымаўшы раней ад нас, гаспадара, шляхецкай вольнасці, маёнткаў і зямель шляхецкіх ніякім звычаем займець, а ні купляю сваёю трымаць не можа». Таксама зямлёй валодалі дзяржава, вялікі князь, духавенства і царква. Сяляне за карыстанне надзелам павінны былі аддаць феадалу або натуральны аброк, або грашовы аброк, або адпрацаваць паншчыну.



*Сяляне на сенакосе. Гравюра XVI ст.*

**2. Афармленне прыгоннага права.** Пастулова складвалася **прыгоннае права** — асабіста-пазямельная залежнасць сялян ад феадалаў.

Пачатак юрыдычнага афармлення прыгоннага права звязаны з прывілеем Казіміра IV Ягелончыка 1447 г. У ім вялікі князь забараняў прымаць бег-



Правообладатель Издательский центр БГУ
Издательский центр БГУ



*Селянін у калодках. Гравюра XVI ст.*

лых сялян з прыватных уладанняў у дзяржаўныя маёнткі і наадварот. Феадалы атрымалі права вяршыць суд над залежным насельніцтвам.

Затым Статут ВКЛ 1529 г. увёў *«земскую даўніну»*. У адпаведнасці з ёй «пахожы» селянін, які пражыў на зямлі феадала больш за 10 гадоў, станавіўся «непахожым» — гэта значыць прыгонным. Статут 1566 г. дапоўніў «земскую даўніну» 10-гадовым пошукам беглых сялян, а ў Статуце 1588 г. гэты тэрмін быў павялічаны да 20 гадоў.

Адыход ад феадала «пахожых» сялян быў магчымы пры выкананні імі шэрагу ўмоў. Патрабавалася, каб селянін заплаціў землеўласніку за выхад, выплаціў даўгі, вярнуў феадалу атрыманую маёмасць, каб феадал сам даў дазвол на выхад. У Статуце 1588 г. адзначалася, што селянін можа пайсці ад феадала або адпрацаваўшы льготныя гады, або заплаціўшы землеўласніку па 6 грошаў за кожны льготны тыдзень. Гэта былі вялікія грошы, і сяляне фізічна не маглі іх сабраць. Адыход ажыццяўляўся ў розныя тэрміны, якія залежалі ад пэўнага рэгіёна і мясцовага пагаднення феадалаў. Напрыклад, у Падзвінні гэта адбывалася вясной.

**3. Валочная памера.** У другой палове XVI — першай палове XVII ст. сельская гаспадарка беларуска-літоўскіх зямель перажывала ўздым. Ён быў выкліканы пашырэннем абмену таварамі паміж горадам і вёскай, павелічэннем колькасці гарадскога насельніцтва, ростам попыту на збожжа як на ўнутраным рынку, так і ў Заходняй Еўропе.

Феадалам стала выгадна прадаваць сельскагаспадарчую прадукцыю не толькі ўнутры краіны, але і вывозіць яе за мяжу. Каб атрымаць больш збож-



*Шляхецкі двор. Рэканструкцыя*



Правообладатель Издательский центр БГУ

жа, некаторыя землеўласнікі яшчэ ў канцы XV ст. пачалі ствараць **фальваркі**. Фальварак уяўляў сабой двор феадала з жылымі і гаспадарчымі будынкамі і зямлёй, на якой залежныя сяляне адпрацоўвалі паншчыну. Прадукцыя, атрыманая з фальварковай зямлі, ішла на продаж і прыносіла значны прыбытак яе ўладальніку. Такая сістэма вядзення гаспадаркі феадалам называецца *фальваркова-паншчыннай*.

Вялікі князь літоўскі і польскі кароль Жыгімонт II Аўгуст з мэтай павелічэння даходаў дзяржаўнага скарбу вырашыў арганізаваць фальваркі ў дзяржаўных уладаннях. Тым самым ён пачаў першую вядомую на беларускіх землях *аграрную рэформу*.

Прыкладам для Жыгімонта II Аўгуста стала яго маці — каралева ***Бона Сфорца*** (жонка Жыгімонта I Старога). Яшчэ ў 1530-я гг. у Пінскім і Клецкім староствах яна пачала арганізоўваць фальваркі, што мела станоўчыя вынікі.



**Гістарычная асоба**

БОНА СФОРЦА (1494—1557) — каралева польская і вялікая княгіня літоўская, другая жонка Жыгімонта I Старога. Павялічыла зямельныя ўладанні дынастыі Ягелонаў, абараняла дзяржаўныя землі ад незаконнага прысваення іх феадаламі, садзейнічала перасяленню польскіх шляхціцаў у ВКЛ, умацоўвала пазіцыі каталіцкай царквы. У 1556 г. выехала на радзіму ў Італію.

Аграрная рэформа праводзілася на падставе дакумента «Устава на валокі», прынятага 1 красавіка **1557 г.** Адсюль і назва рэформы — **валочная памера**. «Устава» складалася з 49 артыкулаў, дзе вызначаліся правілы вымярэння зямлі, абавязкі сельскай адміністрацыі, сялянскія павіннасці, парадак арганізацыі фальваркаў і інш. Вялікі князь загадаў: «Фальваркі хочам меці, каб паўсюль былі створаны... пры кожным замку і двары нашым».

Для стварэння фальваркаў першапачаткова правялі абмер зямлі. Пасля гэтага яе падзялілі на **валокі**. Адна валока складала надзел у 21,36 гектара, або 30 маргоў (9000 прутоў). Пры гэтым улічвалі якасць зямлі. Яна магла быць добрай, сярэдняй, кепскай і вельмі кепскай. Калі зямлю адносілі да кепскай, то памеры валокі маглі быць павялічаны да 46 маргоў. Самыя лепшыя землі адводзіліся пад фальваркі з тым разлікам, каб на адну фальварковую валоку прыходзілася сем сялянскіх валок.


Правообладатель Издательский центр БГУ

Як правіла, сялянскі двор атрымліваў у карыстанне палову валокі: у XVI—XVIII стст. на адну сялянскую гаспадарку прыпадаў надзел у 10,7 гектара. Калі колькасць працаздольных чалавек у дыме была вялікай, то давалі цэлую валоку.

Рэформа прадугледжвала ўпарадкаванне падаткаў і павіннасцей, якія сяляне выконвалі за магчымасць карыстацца зямлёй. Раней падаткі збіраліся з дыма. Пры гэтым не ўлічвалася колькасць зямлі, замацаванай за ім. Цяпер адзінкай падаткаабкладання стала валока, што прывяло да павелічэння сродкаў у дзяржаўным скарбе.

Аграрная рэформа першапачаткова ахапіла дзяржаўныя землі. Але ў Падзвінні яна не праводзілася, паколькі там ішлі ваенныя дзеянні Лівонскай вайны. На ўсходзе Беларусі, у Падняпроўі, фальваркова-паншчынная сістэма не атрымала пашырэння з-за асаблівых прыродных умоў — малаўрадлівай глебы. Ды і насельніцтва было менш, чым на захадзе беларускіх зямель. Таму большасць сялян плацілі чынш і выконвалі натуральную даніну.

Паступова прыватныя землеўласнікі-шляхціцы сталі ўводзіць валочную памеру ў сваіх уладаннях. Яны рыхтавалі ўласныя дакументы, якія прадугледжвалі стварэнне фальваркаў і ўвядзенне паншчыны як асноўнай павіннасці залежных сялян. Ажыццяўленне рэформы патрабавала значных сродкаў.

У выніку рэформы павялічылася прыбытковасць феадальных маёнткаў. Але пры гэтым пашырылася эксплуатацыя залежных сялян. Яны былі прымацаваны да атрыманых валок. Адбылося зліццё «пахожых» і «непахожых» сялян у адзіны клас прыгонных сялян.




Вясковыя жыхары сталі аказваць супраціўленне аграрнай рэформе. Сяляне адмаўляліся прымаць валокі нават у пачатку XVII ст. У прыватнасці, кароль Рэчы Паспалітай Жыгімонт III Ваза ў 1611 г. загадаў у адносінах да сялян Бабруйскай воласці: «А бунтаўшчыкоў, якія валочнай памеры для прыбыткаў нашай казны і чаму-небудзь іншаму супраціўляліся і далі зачэпку для непаслушэнства, тыя ж нашы рэвізоры павінны караць».


Правообладатель Издательский центр БГУ

**4. Сялянскія павіннасці.** Аграрная рэформа прадугледжвала адзіныя павіннасці для сялян. Галоўнымі з іх былі **паншчына** і **чынш**. Дадатковай павіннасцю лічыліся **згоны** — тэрміновыя сельскагаспадарчыя работы, звязаныя са жнівом, сенакосам, узворваннем глебы. На іх выкананне выходзілі ўсе члены сям'і. У хаце, каб засцерагчыся ад пажару, пакідалі аднаго непрацаздольнага чалавека. **Гвалты** адрозніваліся ад згонаў тым, што былі абумоўлены надзвычайнымі абставінамі — напрыклад, пажарам, паводкай. Дадатковай павіннасцю лічыўся прадуктовы аброк — **дзякла**.

Тыя сяляне, якія за карыстанне зямлёй выконвалі паншчыну, называліся **цяглымі**. З адной валокі яны павінны былі адпрацоўваць два дні ў тыдзень паншчыны, чатыры дні ў год згонаў, плаціць 21 грош чыншу, даваць дзякла ў наступным памеры: дзве бочкі аўса, адзін воз сена, адна гусь, дзве курыцы, 20 яек. Сяляне, якія за карыстанне зямлёй плацілі чынш, называліся **асаднымі (чыншавымі)**. Памер асноўных павіннасцей асадных сялян з адной валокі добрай зямлі складаў 106 грошаў, а з валокі вельмі дрэннай зямлі — 66 грошаў. Акрамя таго яны выконвалі 12 дзён згонаў у год, пастаўлялі дзякла ў тым жа памеры, што і цяглыя двары.

Трэцюю групу сялян складалі *сяляне-слугі.* Яны падзяляліся на вайсковых сялян (баяры панцырныя, путныя баяры, служкі), сельскую адміністрацыю (войты, цівуны), прыслугу (кухары, півавары і інш.), прамысловікоў (асочнікі, баброўнікі, конюхі, рыбаловы і інш.), вясковых рамеснікаў (кавалі, цесляры, ганчары і інш.). Іх павіннасці не былі строга агавораны. Напрыклад, баяры панцырныя за бясплатнае карыстанне зямлёй павінны былі ў час вайны «мець добрага каня казацкага, дзіду, пару пісталетаў... і бандалет на поясе». Путныя баяры з 1557 г. ставілі на вайну аднаго каня



*Паншчына. Гравюра XVI ст.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

з дзвюх валок. Але паступова іх абавязкамі сталі кур'ерская служба і выплата чыншу.

Пасля аграрнай рэформы чэлядзь нявольная была пераведзена ў разрад *сялян-агароднікаў*. Яны атрымалі невялікія надзелы зямлі. За карыстанне ёю агароднікі павінны былі адпрацоўваць адзін дзень паншчыны ў тыдзень у фальварку.




**5. Сацыяльныя канфлікты.** У XVI — першай палове XVII ст. адбываецца нарастанне супярэчнасцей паміж сялянамі і феадаламі-землеўласнікамі. Яны былі выкліканы павелічэннем павіннасцей сялян. У прыватнасці, паншчына ў другой палове XVI ст. складала два дні ў тыдзень, а ў першай палове XVII ст. дасягнула ўжо трох дзён у тыдзень. Працаваць на панскім фальварку неабходна было і мужчынам, і жанчынам з раніцы да вечара. Феадалы накладалі штрафы за спазненне на працу або нявыхад на яе.

Пратэст сялян выражаўся ў скаргах на павелічэнне старых і ўвядзенне новых павіннасцей, на злоўжыванні шляхты, якая арандавала зямлю ў дзяржавы і магнатаў, на кіраўнікоў маёнткаў. Таксама сяляне ўхіляліся ад выканання павіннасцей. Мелі месца парубкі панскага лесу, патравы фальварковых пасеваў і сенажацяў. Частымі былі ўцёкі ад аднаго феадала да другога. А калі жыццё станавілася вельмі цяжкім, то выпраўляліся ва Украіну, да вольных людзей — *казакоў*.

Ужо з канца XVI ст. атрады казакоў сталі сістэматычна з'яўляцца на паўднёвых беларускіх землях. Мазырскія шляхціцы скардзіліся ў 1593 г. на людзей, якія «з гарадоў і вёсак на Ніз (нізоўі Дняпра) ідуць», а потым «назад прыходзяць». Адзін з такіх атрадаў узначальваў ***Северын Налівайка***. Ён нарадзіўся ва Украіне, служыў у князя Астрожскага. У 1595 г. Налівайка арганізаваў паходы казакоў у Малдавію і Трансільванію. Па вяртанні яго войска захапіла Луцк, разграміла шмат шляхецкіх маёнткаў. Канцлер Польшчы Ян


Правообладатель Издательский центр БГУ

Замойскі адправіў супраць Налівайкі атрады казакоў, што знаходзіліся на дзяржаўнай службе. Каб пазбегнуць сутыкнення, Налівайка накіраваў свой атрад у ВКЛ. Яго казакі захапілі Петрыкаў, Слуцк, Магілёў. Але на *Буйніцкім полі* (пад Магілёвам) 25 снежня **1595 г.** пацярпелі паражэнне і адышлі ва Украіну. С. Налівайку напаткаў трагічны лёс. Казацкія старшыні выдалі яго ўраду. Пасля цяжкіх катаванняў ён быў пакараны смерцю ў Варшаве. Тым не менш з канца XVI ст. прысутнасць казакоў на беларускіх землях стала фактарам актывізацыі выступленняў сялян і гарадскіх нізоў супраць шляхты і магнатаў.

Такім чынам, аграрная рэформа прывяла да ўсталявання фальварковапаншчыннай сістэмы гаспадарання ў дзяржаве і феадальных маёнтках, якая праіснавала да сярэдзіны XIX ст.

МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

**З Баркулабаўскага летапісу (канец XVI — пачатак XVII ст.)**

...Лета божага нараджэння 1595... Севярын Налівайка; пры ім казакоў 2000... Места слаўнае Магілёў... дамы, крамы, астрог выпалілі, дамоў усіх з 500, а крамаў з вялікімі скарбамі 400. Мяшчан, баяр, людзей пачцівых... пабілі, пасеклі, паглумілі, скарбаў незлічоных пабралі з крамаў і з дамоў. Тут жа войска літоўскае... да Магілёва ў пагоню за казакамі выправілі люду рыцарскага коннага збройнага, татараў 4000, літвы 14 000. ...А так войска літоўскае на полі Буйніцкім... на войска Налівайкава ўдарылі і кругам абступілі. Там жа з ранку аж да вечара... між сабою бітву мелі...

Як ставіцца аўтар летапісу да дзеянняў казакоў?

## Пытанні і заданні

1. Ахарактарызуйце па плане (прычыны, сутнасць, вынікі) валочную памеру.
2. Дайце ацэнку аграрнай рэформе Жыгімонта II Аўгуста. Ці была яна прагрэсіўнай?
3. Пералічыце катэгорыі сялян, што склаліся пасля аграрнай рэформы.
4. Якія асноўныя павіннасці выконвалі сяляне беларускіх зямель у другой палове XVI — першай палове XVII ст.?
5. Параўнайце павіннасці цяглых і асадных сялян.
6. У чым заключалася прычына сацыяльных канфліктаў у вёсцы?
7. Якія формы сялянскага пратэсту вы ведаеце?
8. Як вы лічыце, ці падтрымалі сяляне беларускіх зямель казакоў Севярына Налівайкі?

Правообладатель Издательский центр БГУ

9. Запоўніце схему «Этапы запрыгоньвання сялянства ў ВКЛ».

**1447 г.**

↓

**1529 г.**

↓

**1557 г.**

↓

**1566 г.**

↓

**1588 г.**

10. Дайце азначэнні паняццяў: *дым, прыгоннае права, валочная памера, фальварак, валока, паншчына, чынш, згоны, гвалты.*

Издательский центр БГУ

## § 7. ГАРАДСКОЕ ЖЫЦЦЁ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI — ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII ст.

**Успомніце**

Што азначае паняцце «ўрбанізацыя»?

**1. Гарады і гандаль.** У другой палове XVI — першай палове XVII ст. на беларускіх землях значна павялічваецца колькасць гарадоў і гарадскога насельніцтва. Калі ў сярэдзіне XVI ст. на тэрыторыі Беларусі было 382 гарады, то ў сярэдзіне XVII ст. — 462. Усе яны падзяляліся на буйныя, сярэднія і мястэчкі. Буйнымі гарадскімі паселішчамі з'яўляліся Магілёў, Полацк, Віцебск, Слуцк, Пінск, Мінск, Брэст. Да сярэдніх гарадоў адносілі Шклоў, Быхаў, Оршу, Навагрудак, Нясвіж, Слонім, Барысаў, Бабруйск, Клецк. Буйныя і сярэднія гарады адрозніваліся колькасцю жыхароў. У буйных пражывала нярэдка больш за 10 тыс. чалавек, а ў сярэдніх насельніцтва вагалася ў межах 2—4 тысяч.

Найбольш хутка павялічвалася колькасць мястэчак. **Мястэчка** — гэта населены пункт, які адрозніваўся ад горада меншай колькасцю насельніцтва, адсутнасцю абарончых збудаванняў, сельскагаспадарчымі заняткамі часткі



Правообладатель Издательский центр БГУ




*Гродна ў 1568 г. Гравюра канца XVI ст.*

жыхароў. Ад вёскі ён адрозніваўся наяўнасцю гандлю і рамяства як сталых заняткаў часткі жыхароў. Мястэчкі сталі фарміравацца з XIV ст. на месцах кірмашоў, на бойкіх гандлёвых скрыжаваннях, каля замкаў, манастыроў, царкоўных прыходаў, з буйных сёл і вёсак.

Гарады і мястэчкі Вялікага Княства Літоўскага падзяляліся на дзяржаўныя, прыватнаўладальніцкія і царкоўныя. Прыватнаўладальніцкія гарады складалі ў XVI ст. да 40 % ад агульнай колькасці. У буйных населеных пунктах меліся **юрыдыкі**. Так называлі асобныя часткі горада, што належалі магнатам, царкве або манастыру. На жыхароў юрыдык не распаўсюджвалася адміністрацыйная і судовая ўлада магістрата.



*Кавалі. Гравюра XVI ст.*

Павелічэнне колькасці гарадскіх жыхароў адбывалася найперш за кошт натуральнага прыросту, але ўсё больш станавілася і прышлых людзей. Найчасцей у гарады перасяляліся сельскія рамеснікі, якія тут маглі прадаць свае вырабы. Таксама



Правообладатель Издательский центр БГУ



*Кафля з Мірскага замка. Першая палова XVII ст.*

ў гістарычных дакументах зафіксаваны факты ўцёкаў у гарады сялян ад феадалаў. У канцы XIV ст. у буйных гарадах з'явіліся яўрэі. Яны атрымлівалі ад вялікіх князёў літоўскіх спецыяльныя граматы, якія дазвалялі ім тут жыць і працаваць. Паступова яўрэі сталі сяліцца ў мястэчках. Там яны арандавалі корчмы, млыны, гандлёвыя мыты.

Змяніўся знешні выгляд гарадскіх паселішчаў. Цяпер ядром горада быў не замак, а гандлёвая плошча. Да яе сыходзілі галоўныя вуліцы, тут узводзіліся мураваныя будынкі. Але жылая забудова заставалася пераважна драўлянай. Магнаты імкнуліся перабудаваць свае гарады ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу і запрашалі для гэтага замежных майстроў. У прыватнасці, Нясвіж, Слуцк, Быхаў набылі рэгулярную сетку вуліц, геаметрычна правільны кампазіцыйны цэнтр, абарончыя збудаванні бастыённага тыпу ў выглядзе круга. Усё гэта адпавядала заходнееўрапейскім уяўленням аб «ідэальным» горадзе. Напрыклад, Гродна ў 1560—1561 гг. мела тры плошчы: Старадаўнюю, Нямецкую і Занёманскую, 32 вуліцы, 5 трактаў. Грамадскі цэнтр з замка быў перанесены на новую плошчу, якая прымала 7 вуліц і мела замкнёную форму. На плошчы знаходзіліся мураваны касцёл, ратуша, прыходская царква, гандлёвыя рады, карчма, дамы заможных гараджан. Вуліцы ў горадзе брукавалі, а з 1541 г. там дзейнічаў водаправод.




**2. Рамяство.** Адным з найбольш пашыраных заняткаў гарадскога насельніцтва з'яўлялася рамяство. У XVI ст. паглыбляецца яго спецыялізацыя. Вучоныя налічылі да 200 прафесій і спецыяльнасцей у дзяржаўных гарадах і 120 — у прыватнаўладальніцкіх. Найбольшае распаўсюджанне мелі кавальства, ганчарства, кравецтва, шавецтва, цяслярства, бондарства. Акрамя рамёстваў у гарадах і мястэчках Беларусі развіваліся промыслы. Будаваліся млыны, рудні, цагельні, піваварні. У буйных гарадах рамеснікі складалі каля паловы жыхароў, у сярэдніх — 40 %, а ў мястэчках — 20 %.



Правообладатель Издательский центр БГУ
Издательский центр БГУ

Новай з'явай у развіцці горадоў стала паступовае афармленне іх гандлёва-рамеснай спецыялізацыі. Напрыклад, у Магілёве было найбольш развіта кушнерскае рамяство, у Слуцку — гарбарнае, у Капылі — ткацкае і выраб адзення, у Гродне — будаўнічыя рамёствы, у Мінску — апрацоўка металаў, у Дзісне — ганчарства.

Гарадскія рамеснікі ствaралі **цэхі**. Гэта былі аб'яднанні ўладальнікаў майстэрань, якія ствараліся з мэтай недапушчэння на гарадскі рынак рамесных вырабаў з іншых гарадоў. Першае ўпамінанне ў пісьмовых крыніцах аб цэхах на тэрыторыі Беларусі адносіцца да 1552 г. (стварэнне цэха ў Мінску). У XVI ст. цэхі мелі мясцовыя назвы: напрыклад, сотні — у Гродна, староствы — у Магілёве, брацтвы — у Полацку і Мінску. Гісторыкі вылучаюць наступныя групы цэхаў: *спецыялізаваныя* (рамеснікі адной прафесіі), *аб'яднаныя* (рамеснікі дзвюх і болей блізкіх па характары прафесій), *зборныя* (рамеснікі розных прафесій). Ужо ў XVII ст. існавала 112 рамесніцкіх аб'яднанняў у 16 беларускіх гарадах. Прымалі туды людзей «дабрачынных ды жанатых», якія не парушалі грамадскі парадак і не злоўжывалі моцнымі напоямі.





*Герб і пячатка шавецкага цэха. Мінск. 1675 г.*

Вытворцаў, якія не ўваходзілі ў цэх, называлі **партачамі**. Яны працавалі нелегальна, за што іх штрафаваў гарадскі суд. Тавары, што выраблялі партачы, часцей за ўсё саступалі цэхавым у якасці.

**3. Гандаль.** Асаблівасцю горада былі таргі, для правядзення якіх адводзілася спецыяльнае месца (рынак). У буйных гарадах таргі збіраліся 1—2 разы ў тыдзень, а ў сярэдніх гарадах і мястэчках — штотыдзень.

Гандлем займаліся купцы. Замежны гандаль вялі вярхі купецтва — **госці**. А мясцовыя купцы, якія ездзілі гандляваць не далей чым за 10 вёрстаў ад горада, называліся **пра́саламі**. Купцы, як і рамеснікі, стваралі свае аб'яднанні-брацтвы, ці *гільдыі*. Напрыклад, у 1636 г. было арганізавана купецкае «брацтва» ў Магілёве. Членам яго мог стаць чалавек, які прысягнуў магістрату, быў унесены ў спіс купцоў і выплаціў грашовы ўзнос. У статуце адзначалася, што «купцом лічыцца той, хто ездзіць з рознымі іншаземнымі і выробленымі ў Кароне ці Вялікім Княстве Літоўскім таварамі, купленымі ў розных гарадах зямель... на кірмашы ў розныя гарады... а таксама прывозіць з чужых мясцін купленыя там тавары і прадае іх...».



Правообладатель Издательский центр БГУ



*Лаўка гандляра. Гравюра XVI ст.*

Некаторыя купцы былі звязаны з магнатамі і выконвалі іх гандлёвыя даручэнні. Напрыклад, у пачатку XVII ст. браты Тышэвічы пастаўлялі тавары Янушу Радзівілу. Яны прывозілі магнату сярэбраныя рэчы, сабалёвыя футры, выдавалі тавары ў крэдыт.

Паміж гарадамі склаліся шляхі зносін — **гасцінцы**, якія звязвалі таргі ўсёй Рэчы Паспалітай. Гісторыкі налічылі да 20 гандлёвых шляхоў на тэрыторыі Беларусі. «Вялікай дарогай» называлі шлях Смаленск — Орша — Барысаў — Мінск — Нясвіж — Слонім — Ваўкавыск — Брэст; «гасцінцам вялікім» лічылася дарога Полацк — Віцебск — Орша — Шклоў — Магілёў.

Тавары перавозілі на фурманках, вазах па сухапутных шляхах, на стругах (рачных суднах) і плытах па рэках. Хуткасць руху залежала ад якасці дарогі: у XVIII ст. для абозаў яна складала 20—30 км за суткі, для асобных экіпажаў — 40—50 км, для верхавых — да 70—80 км за суткі.

З тэрыторыі Беларусі вывозілі ў асноўным прадукты земляробства і лясных промыслаў. У адным з дакументаў адзначалася: «З Літвы вывозяцца цвёрдыя, сплаўленыя агнём кавалкі яловага, вязавага, ліпавага і вербнага попелу (паташу), на які вялікі попыт сярод суконшчыкаў і мылавараў, каровы і добрага вырабу скуры, пшаніца, смала, каноплі, лён, мёд, воск, сала і розныя каштоўныя футры — усё гэта дзеліцца паміж прусакамі, шведамі, датчанамі і немцамі. А прывозіць рака Дзвіна ў Літву і Маскву соль, віно, цэльныя залатыя і сярэбраныя яхімкі». (Яхімкі — гэта руская назва талера — сярэбранай манеты, якую пачалі выпускаць у 1518 г. у Чэхіі.)

**ВКЛ:** скура, мыла, футравыя, рымарскія і ганчарныя вырабы, збожжа, паташ, смала, дзёгаць, каноплі, лён, пянька, мёд, шчаціннe, воск, сала

↓↑

**Прыбалтыка:** соль, віно

**Польшча:** папера, цвікі, косы, сярпы, галантарэя

**Расія:** абутак, рукавіцы, грабяні, ніткі

*Экспарт і імпарт у ВКЛ (XVI — першая палова XVII ст.)*

Аднак у XVI — першай палове XVII ст. яшчэ не склаўся адзіны ўнутраны рынак. Натуральная гаспадарка не садзейнічала развіццю эканамічнай спе-



Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Падарожжа па Усходняй Еўропе. Гравюра з кнігі С. Герберштэйна «Запіскі аб маскоўскіх справах». 1556 г.*

цыялізацыі рэгіёнаў. Гандлю перашкаджалі самавольствы магнатаў і шматлікія мытныя зборы.

**4. Сацыяльныя канфлікты.** Гарадское жыццё першай паловы XVII ст. адзначалася ўзнікненнем сацыяльных канфліктаў. Сацыяльная барацьба ў гарадах разгортвалася паміж ніжэйшымі і вышэйшымі пластамі насельніцтва. Найчасцей выступленні мяшчан былі выкліканы злоўжываннямі членаў магістрата. Буйныя паўстанні гараджан у першай палове XVII ст. адбыліся ў Магілёве.

У 1606 г. супраць гарадскога магістрата выступілі жыхары Магілёва на чале з кіраўніком цэха саладоўнікаў (півавараў) Стахорам Мітковічам. Прычынамі выступлення сталі дзейнасць мясцовых купцоў, распаўсюджанне ліхвярства (дача грошай у пазыку пад вялікі працэнт), павелічэнне ваенных падаткаў на гарады. Бунтаўшчыкі занялі ратушу, знялі з пасад членаў гарадской рады і выбралі новы магістрат. У яго склад увайшлі Стахор Мітковіч, Пётр-каваль, Мікіта-збройнік, Харапон-кравец, Міхайла-ганчар, Ходка Багданавіч — «вандроўны чалавек» (гэта значыць, не аселы жыхар Магілёва) і інш. Праз два гады ў выніку дамовы паміж членамі абодвух складаў магістрата, падпісанай у канцылярыі ВКЛ, быў адноўлены ранейшы склад гарадской рады.

Але супярэчнасці паміж багатымі купецкімі вярхамі і мяшчанамі захоўваліся. У 1610 г. адбылося новае паўстанне. Арганізатары выступлення — Іван Харкавіч, Міхаіл Чабатар, Лаўр Міхайлавіч, Мікіта Мількавіч, Гаўрыла Іванавіч — былі прыцягнуты да суда. Іх абвінавацілі ў тым, што «бунты і разарэнні ў горадзе строілі, чалавека паспалітага ад паслушэнства ўраду адводзілі, на ратушу гвалтоўна нападалі», і прыгаварылі да смяротнага пакарання.

У 1615 г. адбылося выступленне жыхароў горада Мазыра, незадаволеных дзейнасцю мясцовага старосты. Мазырскі староста падпарадкаваў сваёй уладзе частку мяшчан горада, абвясціў іх сваімі падданымі і пазбавіў магдэбургскага права. Паўстанцы напалі на замак, дзе знаходзіліся староста, замкавая адміністрацыя, шляхта. Былі забіты некалькі кіруючых асоб. Жыхары Мазыра выбралі сабе новага войта, забаранілі мясцовай шляхце ўязджаць у горад, а пабора, якія належалі казне, перадалі ў даход горада.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Такім чынам, у сярэдзіне XVI — першай палове XVII ст. на тэрыторыі Беларусі пашыраецца працэс урбанізацыі — павялічваецца колькасць гарадоў і іх жыхароў, фарміруюцца карпаратыўныя аб'яднанні раменнікаў і купцоў, у гарадах узнікаюць сацыяльныя канфлікты.

МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

**Са Статута Мінскага цэха (1591 г.)**

...Арт. 10. Вельмі важна, каб тое, аб чым ішла размова ў цэху, не выносілася за парог і не разносілася. Гэтага аднагалосна патрабуе цэх. Калі хто-небудзь паспрабуе гэтае патрабаванне парушыць і ў яго будзе свярбець язык, то, калі гэта будзе даказана, ён павінен будзе заплаціць у цэх палову каменя воску [адзін камень важыў 36 фунтаў (1 фунт = 493,68 г)] столькі разоў, колькі разоў ім дапушчана парушэнне...

Чаму цэх забараняў перадачу інфармацыі аб сваёй дзейнасці?

**З ведамасці збору пошліны на Віцебскай мытні (1605 г.)**

...Пан Георгій Друцкі Сакалінскі, староста ўсвяцкі... пасылае ў Рыгу праз слугу свайго Мацвея Стратоўскага на 1 плыце і струзе: 17 ластаў і 8 бочак попелу, 15 малых мяхоў чыстай пянькі вагой 195 камянёў, 6 малых мяхоў неачышчанай [пянькі] вагой 78 камянёў, 2,5 меха паклі вагой 38 камянёў, 5 бочак канаплянага семені, 53 бочкі гароху, 10 бочак пшаніцы...

На падставе дакумента вызначце характар экспарту з ВКЛ у XVII ст.

**З рашэння сходу купцоў Магілёва (1623 г.)**

...і брацць дазволілі з купцоў, якія да Польшчы едуць, ...да Любліна, да Торуні, да Гданьска, да Гнезна, да Львова, да Круляўца..., з воза кожнага па 6 асмакоў [грашовая адзінка ў ВКЛ] павінны даць, а да Вільні, да Мінска, да Капыля і да Слуцка едучы, павінны даць з воза кожнага асмакі 3... да Полацка, да Віцебска, да Мсціслава, да Крычава, да Прапоя, да Рэчыцы і да Гомеля едучы, кожны з нас купец мешчанін магілёўскі павінен будзе даць ад воза па 3 асмакі; да Кіева, да Канева і на Падолле, да Чаркас, да Валыні па 6 асмакоў павінны даць...

Вызначце геаграфію гандлёвых сувязей горада Магілёва.



Правообладатель Издательский центр БГУ

## Пытанні і заданні

1. На якія групы падзяляліся гарады Беларусі ў другой палове XVI — першай палове XVII ст.?
2. Якія функцыі выконвалі беларускія гарады?
3. Назавіце крыніцы папаўнення колькасці гарадскіх жыхароў.
4. Якія змены адбыліся ў развіцці рамяства?
5. Параўнайце цэхавую вытворчасць з мануфактурнай (выкарыстайце веды, атрыманыя па сусветнай гісторыі).
6. Раскажыце аб развіцці гандлю ў беларускіх землях у другой палове XVI — першай палове XVII ст.
7. Ахарактарызуйце сацыяльныя канфлікты ў гарадах Беларусі.
8. Дайце азначэнні паняццяў: *мястэчка, юрыдыка, цэх, партачы, госці, прасалы, гасцінцы.*

# § 8. РЭФАРМАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ

## Успомніце

Чаму каталіцкая царква стала аб'ектам шырокай незадаволенасці ў Заходняй Еўропе ў першай палове XVI ст.?

**1. Перадумовы рэфармацыйнага руху.** У XVI ст. Заходнюю Еўропу ахапіў рэфармацыйны рух, які быў накіраваны супраць каталіцкай царквы. Ён пачаўся ў 1517 г. з выступлення прафесара Вітэнбергскага ўніверсітэта *Марціна Лютэра* і завяршыўся афармленнем пратэстантызму. Пад уплывам заходнееўрапейскай **Рэфармацыі** разгарнуўся рэфармацыйны рух і на беларуска-літоўскіх землях. Гэта адбывалася праз суседства з лютэранскай Прусіяй, еўрапейскае кнігадрукаванне, знешні гандаль, вучобу выхадцаў з ВКЛ ва ўніверсітэтах Заходняй і Цэнтральнай Еўропы.

Пашырэнне рэфармацыйных ідэй ускосна было выклікана ўплывам рускага вальнадумства, напрыклад, ідэй *«стрыгольнікаў»* і *«несцяжацеляў»*. Прадстаўнікі гэтых ерасей выступалі супраць царкоўнага кіраўніцтва, манаства, царкоўнага землеўладання. Ратуючыся ад ганенняў царскіх улад, ерэтыкі ўцякалі ў Вялікае Княства Літоўскае, дзе панавала *рэлігійная талерантнасць* — верацярпімасць. Напрыклад, у сярэдзіне XVI ст. у Віцебску з'явіліся тры праваслаўныя манахі з Маскоўскай дзяржавы: Феадосій Касой, Арцемій, Фама. Яны заклікалі людзей «звяртацца да Бога толькі праз Ісуса Хрыста пры дапамозе Святога Духа».

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Былы кальвінісцкі збор у Заслаўі. Сучасны выгляд*

На пашырэнне рэфармацыйных ідэй паўплывала складанае становішча праваслаўнай царквы ў Вялікім Княстве. Вядома, што з канца XIV ст. дзяржаўнай падтрымкай карысталася каталіцкая царква. Праваслаўная канфесія існавала толькі за кошт ахвяраванняў вернікаў і захоўвала свой традыцыйны характар.

Разгортванню рэфармацыйнага руху ў ВКЛ садзейнічалі рост гарадоў, развіццё рамяства і гандлю, абвастрэнне класавых супярэчнасцей, сутыкненне эканамічных і палітычных інтарэсаў розных сацыяльных груп, культурны ўздым. У адрозненне ад Заходняй Еўропы Рэфармацыя на беларуска-літоўскіх землях не была абумоўлена працэсам фарміравання капіталізму. Асноўнымі яе ўдзельнікамі былі шляхта і мяшчане, паколькі буржуазія ў той час яшчэ не сфарміравалася.

**2. Кальвінізм.** Рэфармацыйны рух на тэрыторыі Беларусі шырока разгарнуўся з сярэдзіны XVI ст. Яго вядучым кірункам з'яўляўся **кальвінізм**.

**Гістарычная даведка**

Кальвінізм — плынь пратэстантызму, заснаваная Ж. Кальвінам (1509—1564) у Швейцарыі. Яе прыхільнікі лічылі Біблію адзінай крыніцай веры і прапаведавалі спрадвечнае наканаванне чалавечага лёсу. Паводле кальвінісцкага вучэння, Бог загадзя абраў адных людзей на выратаванне, а іншых — на пагібель. Але чалавек павінен верыць, што Хрыстос выратаваў менавіта яго, і даказваць гэта сваёй працавітасцю. Таму кальвіністы адмоўна ставіліся да марнавання чалавекам часу. З сямі таінстваў яны прызнавалі толькі хрышчэнне і прычасце.

Ідэі кальвінізму актыўна падтрымалі магнаты, частка шляхты, бо гэтае веравучэнне адпавядала іх свабодалюбівым уяўленням. Кальвінізм не дапускаў дзяржаўнага кантролю над царквой. Прымаючы пратэстанцкае веравучэнне, магнаты і шляхта падобным чынам пратэставалі супраць Люблінскай уніі, паколькі каталіцкая царква актыўна падтрымала ідэю ўключэння ВКЛ у склад Польшчы. Трэба ўлічваць і той фактар, што частка шляхты імкнулася абагаціцца за кошт уладанняў царквы.

Лідэрам кальвінізму стаў ***Мікалай Радзівіл Чорны***, а цэнтрамі — Брэст і Нясвіж.



Правообладатель Издательский центр БГУ



**Гістарычная асоба**

МІКАЛАЙ РАДЗІВІЛ ЧОРНЫ (1515—1565) — віленскі ваявода і канцлер ВКЛ. Узначальваў камісію па правядзенні аграрнай рэформы. Быў праціўнікам дзяржаўнай уніі з Польшчай. Адстойваў самастойнасць ВКЛ. Першапачаткова далучыўся да лютэранства, а ў 1553 г. перайшоў у кальвінізм.

Кальвіністы ў ВКЛ утварылі шэсць акруг, якія складаліся з абшчын. Яны ў пісьмовых крыніцах называліся «гельвецкімі зборамі» — гэта значыць, швейцарскімі. Цэнтральным лічыўся Віленскі збор, заснаваны ў 1557 г. А самая першая кальвініская абшчына з'явілася ў 1553 г. у Брэсце. Пры зборах дзейнічалі школы, друкарні і **шпіталі** (прытулкі для хворых і бедных). Усяго ў другой палове XVI ст. у Княстве налічвалася каля 180—200 гельвецкіх абшчын.

**3. Арыянства.** У 1560-я гг. з кальвінізму вылучыўся асобны кірунак Рэфармацыі — *арыянства*, або рух *антытрынітарыяў*. Іх называлі «літоўскімі братамі». Арыяне адмаўлялі догмат пра трыадзінства Бога (Бог-Бацька, Бог-Сын, Бог — Святы Дух), не прызнавалі хрышчэнне немаўлят, лічылі Ісуса Хрыста толькі чалавекам. Найбольш шырока арыянства распаўсюдзілася ў Навагрудскім і Брэсцкім ваяводствах. Арыянскія зборы ў другой палове XVI ст. дзейнічалі ў Навагрудку, Лоску, Клецку, Іўі, Любчы, Нясвіжы і іншых гарадах. Усяго налічвалася каля 20 абшчын.

Антытрынітарызм падзяляўся на дзве плыні: шляхецкую і сялянскую. Прадстаўнікі першай плыні на чале з ***Сымонам Будным*** разгарнулі шырокую рэлігійна-асветніцкую дзейнасць.




**Гістарычная асоба**

СЫМОН БУДНЫ (каля 1530—1593) — дзеяч культуры, гуманіст, філосаф, асветнік. Скончыў Кракаўскі і, магчыма, Базельскі ўніверсітэты. Прапаведаваў кальвінізм у Вільні і Клецку. У Нясвіжы выдаў першую ў межах сучаснай Беларусі друкаваную кнігу на старабеларускай мове — «Катэхізіс» (1562). Затым перайшоў на пазіцыі арыянства.

*Выява Сымона Буднага, зробленая яго ідэйнымі праціўнікамі, дзе ён паказаны ў пекле як грэшнік*

Правообладатель Издательский центр БГУ



*«Катэхізіс» С. Буднага. Нясвіж. 1562 г.*

Сялянскую плынь прадстаўлялі такія ідэолагі, як ***Якуб з Калінаўкі***, ***Павел з Візны***. Яны не толькі крытыкавалі каталіцкую царкву, але выступалі супраць эксплуатацыі сялянства, вярхоўнай улады і дзяржаўных устаноў. «Хіба можна назваць хрысціянскім тое грамадства, дзе людзі валодаюць нявольнікамі», — пісаў Якуб з Калінаўкі. Зразумела, што падобная пазіцыя абумовіла іх канфлікт са шляхтай.

**4. Вынікі і значэнне Рэфармацыі.** Рэфармацыя пакінула глыбокі след у гісторыі Беларусі і мела станоўчыя вынікі. Да яе прымкнулі многія магнаты з беларуска-літоўскіх зямель. Да іх ліку адносяцца Радзівілы, Сапегі, Хадкевічы, Глябовічы і інш. Яны з пазіцый дзяржаўнага патрыятызму імкнуліся захаваць незалежнасць ВКЛ.

Феадалы-пратэстанты («евангелікі») у час уздыму Рэфармацыі займалі многія вышэйшыя дзяржаўныя пасады, пераважалі ў складзе паноў-рады. Па іх ініцыятыве быў выдадзены віленскі прывілей Жыгімонта ІІ Аўгуста **1563 г.** Гэты дакумент ураўноўваў у правах усю шляхту краіны незалежна ад веравызнання: і каталіцкую, і праваслаўную, і пратэстанцкую. А ў **1573 г.** у Рэчы Паспалітай Варшаўская канфедэрацыя прыняла акт аб свабодзе веравызнання. Тэкст яго ўвайшоў у III Статут ВКЛ.

Пратэстанцкія школы, друкарні, шпіталі, пісьменства садзейнічалі пашырэнню асветы ў грамадстве, распаўсюджанню ідэй гуманізму, верацярпімасці, міралюбства. Рэфармацыя спрыяла развіццю публіцыстычнай літаратуры. Яна ствaралася ў выглядзе прадмоў, пасляслоўяў, трактатаў (навуковых твораў). Выдатнымі публіцыстамі былі Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Андрэй Волан, Лаўрэнцій Крышкоўскі. Яны выступалі ў абарону роднай мовы, высмейвалі рэлігійных фанатыкаў, адстойвалі свабоду асобы.




*Васіль Цяпінскі*

Рэфармацыя дазволіла пэўнаму колу насельніцтва беларускіх зямель азнаёміцца са здабыткамі еўрапейскай культуры. Разам з тым Рэфармацыя ў Княстве не дасягнула таго ўзроўню, які яна мела ў заходнееўрапейскіх краінах. На яе спад паўплывала не толькі вузкасць сацыяльнай базы пратэстантызму, але і ўтварэнне Рэчы Паспалітай, дзе вядучыя пазіцыі займалі каталіцкая царква і каталіцкая шляхта.


Правообладатель Издательский центр БГУ

МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

**Са Статута Слуцкай [кальвінісцкай] школы Адама Рэйнальда**

...хай нікога не адштурхне ад нашага парога разыходжанне ў рэлігіі, хай не адарве ад валодання даступным шчасцем з-за беспадстаўнага страху... Мы ўжо даўно навучаны вопытам, што рэлігія — прадмет пераканання, а не насілля...

? Які прынцып Рэфармацыі прадстаўлены ў дакуменце?

## Пытанні і заданні

1. Вызначце прычыны Рэфармацыі ў ВКЛ. Параўнайце іх з прычынамі Рэфармацыі ў Заходняй Еўропе.
2. Запоўніце схему «Перадумовы Рэфармацыі ў ВКЛ».




3. Назавіце і ахарактарызуйце кірункі Рэфармацыі ў ВКЛ.
4. У чым адрозненне паміж кальвінізмам і арыянствам на беларуска-літоўскіх землях?
5. Назавіце галоўныя вынікі Рэфармацыі ў Княстве.
6. Дайце азначэнні паняццяў: *Рэфармацыя, кальвінізм, арыянства*.
7. З дапамогай дадатковай літаратуры падрыхтуйце паведамленні пра прадстаўнікоў рэфармацыйнага руху.
8. Як вы разумееце словы дзеяча Рэфармацыі Лаўрэнція Крышкоўскага: «Бог жалеза стварыў не для таго, каб з яго рабіць мячы і дзіды, а для таго, каб выкоўваць косы, сякеры ды лемяхі»?
9. Запоўніце табліцу «Рэфармацыйны рух у беларускіх землях».

| Кірунак Рэфармацыі | Колькасць абшчын | Прадстаўнікі | Ідэалогія |
|---|---|---|---|
| | | | |

Издательский центр БГУ



Правообладатель Издательский центр БГУ

## § 9. КОНТРРЭФАРМАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ

**Успомніце**

Якое значэнне мае выраз «Варфаламееўская ноч»?

**1. Дзейнасць езуітаў.** З пашырэннем рэфармацыйных ідэй каталіцкая царква пачала з імі актыўную барацьбу. У Заходняй Еўропе дзейнічаў царкоўны суд. Быў выдадзены спіс кніг, забароненых для чытання, таму што іх змест прызнаваўся шкодным для каталіцкай веры. Справа дайшла да фізічнага знішчэння пратэстантаў.

З 1545 па 1563 г. засядаў Трыдэнцкі сабор. На ім кіраўнікі каталіцкай царквы адхілілі магчымасць кампрамісу з пратэстантамі. На царкоўным саборы было адзначана, што крыніцай веры з'яўляецца як Біблія, так і пастановы Усяленскіх сабораў і пасланні рымскіх пап. Каталіцкая царква захавала сем асноўных абрадаў, забарону святарам уступаць у шлюб, лацінскую мову набажэнстваў. Галоўную ролю ў барацьбе з пратэстантамі адыгралі езуіты. «Чортавым семем» называў іх Сымон Будны.

**Гістарычная даведка**

Езуіты — члены каталіцкага манаскага ордэна Таварыства Ісуса, створанага ў 1534 г. іспанскім шляхціцам Ігнаціем Лаёлам для барацьбы з Рэфармацыяй і ўмацавання каталіцтва.



*Валяр'ян Пратасевіч*

У 1569 г. віленскі біскуп Валяр'ян Пратасевіч запрасіў у ВКЛ 13 прадстаўнікоў ордэна **езуітаў**. А ўжо праз год колькасць езуітаў павялічылася да 300 чалавек. Сярод іх былі місіянеры, багасловы, прапаведнікі, пісьменнікі.

Ордэн езуітаў займаўся найперш місіянерска-прапаведніцкай дзейнасцю. Яго прадстаўнікі выступалі на гарадскіх плошчах з пропаведзямі, выкладалі асновы каталіцтва, арганізоўвалі спрэчкі-дыспуты з іншаверцамі, праводзілі дабрачынныя акцыі. Напрыклад, аптэкі езуітаў бясплатна забяспечвалі лекамі мясцовае насельніцтва. Езуіты даглядалі хворых, дапамагалі сялянам, што галадалі.

Шмат увагі ордэн надаваў арганізацыі ўласных навучальных устаноў — **калегіумаў**. У іх моладзь


Правообладатель Издательский центр БГУ



*Калегіум езуітаў у Пінску. Сучасны выгляд*

атрымлівала якасную гуманітарную адукацыю. Прымалі ў калегіумы дзяцей розных веравызнанняў, паколькі схіленне да каталіцтва прадугледжвалася ўсім ходам выхавання.

Галоўнай задачай ордэна з'яўлялася барацьба з рэфармацыйным рухам. Езуіты садзейнічалі закрыццю пратэстанцкіх і праваслаўных школ, друкарняў. Пад іх кіраўніцтвам у гарадах ажыццяўляліся пагромы. Адзін з іх адбыўся ў Вільні. Мясцовыя езуіты 3 красавіка 1682 г. угаварылі віленскага ваяводу Міхала Казіміра Паца зняць крыж з евангелічнага збора ў гарадскім прадмесці. Пасля гэтага прыведзеныя езуітамі студэнты з гараджанамі раптоўна напалі, разбурылі і раскідалі збор. Пастараў, якія ад страху схаваліся пад трунамі памерлых, адтуль павыцягвалі і здзекаваліся з іх.

На плошчах езуіты спальвалі «шкодныя» для каталіцкай царквы кнігі. У 1581 г. віленскі біскуп Юрый Радзівіл загадаў знішчыць кнігі, выдадзеныя мясцовай пратэстанцкай друкарняй. Праз дзесяць гадоў у Вільні спалілі кальвінісцкі збор. Вінаватыя так і не былі пакараны. Аднак на беларускіх землях Контррэфармацыя не набыла такой жорсткасці, якая назіралася ў Заходняй Еўропе.

Езуіты садзейнічалі пашырэнню дзейнасці іншых каталіцкіх манаскіх ордэнаў. Пры іх падтрымцы ў XVI—XVIII стст. францысканцы адкрылі 17 кляштараў (манастыроў), дамініканцы — 41, кармеліты — 16. З'явіліся ў Вялікім Княстве і манахі-бенедыкцінцы, піяры.

**Контррэфармацыя** ў Княстве была скіравана не толькі супраць пратэстантаў, але і супраць праваслаўнай царквы. Рымскія папы разглядалі беларускія землі ў якасці плацдарма для далейшага пранікнення ў Маскоўскую дзяржаву. Гэты план прапанаваў вядомы папскі пасол Антоній Пасевіна ў сваёй кні-

Правообладатель Издательский центр БГУ

зе «Масковія» (1586): «Унія, а за ёй святое веравызнанне каталіцкае прыйдуць на Усход са Львова і Луцка, з Вільні і Полацка».

Езуіты імкнуліся асталявацца ў тых рэгіёнах ВКЛ, дзе пераважала праваслаўнае насельніцтва. Асаблівую ўвагу яны надавалі паўночна-ўсходняй частцы беларускіх зямель. Нездарма ў Полацку і Оршы ордэн адкрыў свае калегіумы.

Ордэн езуітаў карыстаўся падтрымкай каралеўскай улады Рэчы Паспалітай. Шырокую вядомасць атрымалі словы Стафана Баторыя: «Калі б я не быў каралём, то быў бы езуітам». 27 сакавіка 1577 г. ён выдаў грамату, у якой забараняў будаваць у Вільні некаталіцкія храмы і школы. «Езуіцкім каралём» называлі Жыгімонта III Вазу. Ён з дзяцінства быў выхаваны езуітамі ў духу вернасці і адданасці каталіцтву. Жыгімонт III Ваза актыўна падтрымаў Брэсцкую царкоўную унію 1596 г.

**2. Вынікі Контррэфармацыі.** Рэфармацыйны рух ужо з канца XVI ст. стаў паступова згасаць. Контррэфармацыя перамагла, а рэлігійная верацярпімасць была скасавана. Паступова згортвалася дзейнасць пратэстанцкіх збораў, зачыняліся пратэстанцкія друкарні і школы. У 1658 г. сойм Рэчы Паспалітай пастанавіў выгнаць арыян за межы дзяржавы.

Кальвінісцкая шляхта стала пераходзіць у каталіцтва. Сын Мікалая Радзівіла Чорнага Мікалай Крыштоф Радзівіл (Сіротка) зрабіў Нясвіж другім пасля Вільні езуіцкім цэнтрам ВКЛ. Па яго ініцыятыве там быў заснаваны калегіум. Кальвінізм пакінуў і будучы канцлер Княства Леў Сапега. Так зрабілі шматлікія прадстаўнікі магнацкіх родаў Валовічаў, Кішкаў, Пацаў. Вядомы абаронца праваслаўя Мялецій Сматрыцкі ў сваім творы «Трэнас» (1610) пералічыў шмат прозвішчаў буйной шляхты, якая адмовілася ад праваслаўнай веры на карысць «рымскага закону» (каталіцтва).



*Мялецій Сматрыцкі*

Сойм Рэчы Паспалітай у 1668 г. адыход ад каталіцтва прыраўняў да дзяржаўнага злачынства. Пакаранне за яго прадугледжвала канфіскацыю маёмасці і выгнанне з краіны. А паводле рашэння сойма 1764 г. за змену каталіцкага веравызнання пагражала смяротнае пакаранне. Праваслаўнай шляхце і духавенству зноў было забаронена займаць вышэйшыя дзяржаўныя пасады. Вынікам стала павелічэнне колькасці прыходаў каталіцкай царквы. Калі ў 1673 г. іх на тэрыторыі Беларусі было 153, то ў 1790 г. стала 277.

Паралельна ішоў працэс **клерыкалізацыі** культуры: каталіцкая царква брала пад кантроль аду-



Правообладатель Издательский центр БГУ

кацыю, навуку, мастацкую культуру і духоўнае жыццё. Навуковыя веды абвяшчаліся грахоўнымі. У аснову навучання былі пакладзены багаслоўе, лацінская мова. Выдавалася пераважна царкоўная літаратура.

Контррэфармацыя не спрыяла станаўленню ўласна беларускай культуры. Калі першапачаткова, пасля Люблінскай уніі, паланізацыя была добраахвотнай, то з канца XVII ст. яна набыла прымусовы характар. Вядома, што ў справаводстве ВКЛ у гэты перыяд зацвярджаецца польская мова.

МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

**З «Трэнаса» Мялеція Сматрыцкага (1610 г.)**

...Дзе й іншыя дарагія і таксама неацэнныя з той самай кароны каменні — слаўныя дамы рускіх князёў, каштоўныя сапфіры і бясцэнныя дыяменты: князі Слуцкія, Заслаўскія, Збаражскія, Вішнявецкія, Сангушкі, Чартарыйскія, Пронскія, Ружынскія, Саламярэцкія, Галаўчынскія, Масальскія, Горскія, Сакалінскія, Лукомскія, Пузыны й іншыя без ліку, якіх па адным пералічваць была б доўгая справа? Дзе разам з імі й іншыя неацэнныя мае скарбы: ...Хадкевічы, Глябовічы, Кішкі, Сапегі, Дарагастайскія, Войны, Валовічы, Зяновічы, Пацы, Халецкія, Тышкевічы, Корсакі, Храбтовічы, Трызны, Гарнастайскія, Бокіі, Мышкі, Гойскія, Сямашкі, Гулевічы, Ермалінскія, Чалганскія, Каліноўскія, Кірдзяі, Загароўскія, Мялешкі, Багавіціны, Паўловічы, Сасноўскія, Скуміны, Пацеі й іншыя?..

? Аб чым ідзе размова ў гэтым урыўку?

## Пытанні і заданні

1. Якія кірункі барацьбы з Рэфармацыяй прадугледжвала каталіцкая царква ў Заходняй Еўропе?
2. Пералічыце рашэнні Трыдэнцкага сабора.
3. Раскажыце аб разгортванні Контррэфармацыі на тэрыторыі Беларусі.
4. Якія асаблівасці Контррэфармацыі на беларускіх землях вы можаце назваць?
5. Як вы ставіцеся да дзейнасці ордэна езуітаў?
6. Падумайце, чаму езуіты называлі Полаччыну «другой Індыяй».
7. Дакажыце, што Контррэфармацыя ў беларускіх землях мела поспех.
8. Дайце азначэнні паняццяў: *езуіты, калегіум, клерыкалізацыя.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 10. БРЭСЦКАЯ ЦАРКОЎНАЯ УНІЯ

**Успомніце**

Калі і чаму адбыўся раскол хрысціянства на каталіцтва і праваслаўе?

**1. Перадумовы заключэння Брэсцкай уніі.** Пасля царкоўнага расколу 1054 г. рабіліся неаднаразовыя спробы аб'яднаць каталіцтва і праваслаўе ў адзінае цэлае. У 1439 г. адбыўся Фларэнтыйскі Усяленскі сабор (Італія). На ім быў абвешчаны саюз каталіцкай і праваслаўнай цэркваў. Але праваслаўнае насельніцтва і духавенства ВКЛ не падтрымалі Фларэнтыйскую унію.

Ідэю уніі неаднойчы ўзнімалі і вялікія князі літоўскія. Яна набыла важнасць пасля хрышчэння Літвы паводле каталіцкага абраду ў 1387 г. У выніку каталіцкія феадалы і каталіцкае духавенства занялі пануючае становішча ў краіне, што выклікала незадаволенасць праваслаўнага насельніцтва. Таму княжацкая ўлада жадала аб'яднаць феадалаў Княства, пашырыць сувязі з Заходняй Еўропай праз царкоўную унію. Напрыклад, гэтага жадаў Вітаўт. Пры ім кіеўскі мітрапаліт Грыгорый Цамблак на чале пасольства быў накіраваны ў нямецкі горад Канстанц. Там у 1418 г. праходзіў Усяленскі сабор. Але перагаворы аб уніі не мелі поспеху. Новую і таксама няўдалую спробу заключыць царкоўную унію ў канцы XV — пачатку XVI ст. прадпрынялі вялікі князь літоўскі Аляксандр Казіміравіч і мітрапаліт Іосіф Балгарынавіч.

І толькі пасля ўтварэння Рэчы Паспалітай ідэя царкоўнага адзінства зноў набыла актуальнасць. Гэтаму садзейнічаў рэфармацыйны рух. З'яўленне пратэстантызму давала магчымасць сфарміраваць і ўніяцкую (грэка-каталіцкую) царкву. Да таго ж у царкоўным саюзе былі зацікаўлены пэўныя сілы.

У першую чаргу ініцыятарам аб'яднання выступаў каталіцкі Рым. З-пад уплыву рымскіх пап выпалі значныя тэрыторыі Еўропы. Шэраг краін у выніку Рэфармацыі набылі пратэстанцкі характар, а Балканскі паўвостраў захапілі мусульмане-туркі. Каб кампенсаваць гэтыя страты, каталіцкая царква імкнулася пашырыць уплыў на ўсходзе за кошт праваслаўных зямель. Ажыццявіць гэта можна было шляхам пераўтварэння праваслаўнай царквы ВКЛ у грэка-каталіцкую.

Рымскіх пап падтрымаў кароль Рэчы Паспалітай Жыгімонт III Ваза. Ён з дапамогай царкоўнай уніі імкнуўся вывесці праваслаўнае насельніцтва Княства з-пад уплыву Расійскай дзяржавы, паколькі маскоўскія цары лічылі сябе заступнікамі праваслаўных і на беларуска-літоўскіх землях. Нагадаем, што гэты фактар стаў адной з прычын памежных войнаў на мяжы XV—XVI стст.

Жадалі уніі і праваслаўныя епіскапы Вялікага Княства Літоўскага, напрыклад, ***Іпацій Пацей, Кірыла Цярлецкі*** і інш. Яны такім чынам разлічвалі



Правообладатель Издательский центр БГУ

захаваць свае ўладанні, дасягнуць роўнасці праваслаўнай царквы ў правах з каталіцкай, атрымаць правы каталіцкіх біскупаў, займець доступ да дзяржаўнай улады. Іх пазіцыя тлумачыцца і тым, што ў другой палове XVI ст. праваслаўная царква ў ВКЛ пад уплывам рэфармацыйнага руху перажывала крызіс. Многія праваслаўныя магнаты і шляхта сталі пераходзіць у каталіцтва. Таму частка праваслаўных епіскапаў прапанавала склікаць царкоўны сабор, каб стварыць уніяцкую царкву.



*Іпацій Пацей. Невядомы мастак. XVII ст.*

**2. Падрыхтоўка і абвяшчэнне Брэсцкай царкоўнай уніі.** У 1577 г. выйшла кніга ***Пятра Скаргі*** «Пра еднасць царквы Божай...». У ёй знакаміты публіцыст і багаслоў сцвярджаў, што адзіным выйсцем з цяжкага для праваслаўнай царквы ВКЛ становішча з'яўляецца аднаўленне Фларэнтыйскай уніі. Кніга была адрасавана вядомаму абаронцу праваслаўя князю Канстанціну Астрожскаму, ва ўладаннях якога налічвалася каля 600 праваслаўных храмаў.

П. Скарга прапанаваў свой план уніі, які прадугледжваў наступныя палажэнні: залежнасць кіеўскага мітрапаліта ад папы рымскага, прызнанне вяршэнства Рыма над праваслаўнымі вернікамі, захаванне за праваслаўнымі ранейшых абрадаў.



*Пётр Скарга. Невядомы мастак. XVII ст.*

У снежні 1594 г. епіскапы І. Пацей і К. Цярлецкі тайна склалі дэкларацыю уніі, якую абвясцілі вясной наступнага года. Вярхі праваслаўнага духавенства ВКЛ накіравалі Пацея і Цярлецкага да караля Рэчы Паспалітай. Жыгімонт III Ваза падтрымаў царкоўны саюз і звярнуўся з адпаведным заклікам да насельніцтва. 23 снежня 1595 г. папа рымскі ўрачыста абвясціў унію і загадаў выбіць медаль у гонар гэтай падзеі. Цяпер неабходна было зацвердзіць унію ў Вялікім Княстве Літоўскім.

У кастрычніку **1596 г.** у Свята-Мікалаеўскай царкве Брэста засядаў царкоўны сабор. На ім прысутнічалі 200 прадстаўнікоў каталіцкай і праваслаўнай цэркваў ВКЛ. Праціўнікі уніі сабраліся асобна. Перагаворы паміж бакамі вынікаў не далі. Але акт уніі быў зацверджаны.



Правообладатель Издательский центр БГУ







*Медаль у гонар заключэння Брэсцкай уніі 1596 г.*

Брэсцкі сабор прыняў рашэнне аб утварэнні *ўніяцкай царквы*. Веравучэнне новай царквы было каталіцкім, а самі ўніяты падпарадкоўваліся папу рымскаму. Абрады ў новай царкве засталіся ранейшымі, праваслаўнымі. Не змянілася і мова набажэнстваў.

Пасля прыняцця уніі Кіеўская мітраполія выйшла з падпарадкавання канстанцінопальскаму патрыярху. Праваслаўная царква на тэрыторыі ВКЛ была забаронена, а яе прыходы сталі ўніяцкімі.

**3. Пашырэнне ўніяцтва.** Новая царква гвалтоўна насаджалася сярод былых праваслаўных вернікаў. Толькі на працягу 1596—1597 гг. у ВКЛ былі зачынены 20 праваслаўных цэркваў і 12 манастыроў. Гэта выклікала антыўніяцкія настроі ў асяродку праваслаўнай шляхты, мяшчан і сялян. Яны пачалі арганізоўваць у гарадах (Магілёў, Орша, Віцебск, Полацк, Мінск) *праваслаўныя брацтвы*. Іх удзельнікі выступалі супраць каталіцтва, уніяцтва, пратэстантаў, актыўна ўдзельнічалі ў царкоўна-рэлігійных спрэчках.

Справа дайшла да гвалтоўных учынкаў з абодвух бакоў. У 1609 г. віленскі праваслаўны братчык Іван Тупека з шабляй кінуўся на І. Пацея, калі той праходзіў праз мясцовы рынак. А ў **1623 г.** жыхары Віцебска забілі ўніяцкага архіепіскапа ***Іасафата Кунцэвіча***, якога за жорсткасць празвалі «душахватам». Ён гвалтоўна насаджаў унію на тэрыторыі Полацкай епархіі, дзе праваслаўная царква мела глыбокія старажытныя карані. Гараджане скардзіліся на яго: «Той жа епіскап полацкі пяць гадоў трымае ў Оршы і ў Магілёве цэрквы запячатаныя, у Полацку і Віцебску няма ні царквы, ні дома, дзе дазволена ў горадзе набажэнства. Таму гараджане мусяць па нядзелях і на іншыя святы слухаць службу ў полі за горадам і то без святара, бо яму забаронена жыць у горадзе і ваколіцах...» У адказ на расправу папа рымскі запатрабаваў пакараць горад. Віцебск страціў магдэбургскае права. Гарадская ратуша была разбурана, а з усіх храмаў паздымалі званы. Дзевятнаццаць чалавек пакаралі смерцю.

Унія не аб’яднала грамадства, а, наадварот, раз’яднала. Шматлікія народныя выступленні прымусілі караля Рэчы Паспалітай аднавіць праваслаўную царкву ў ВКЛ. Без згоды папы рымскага гэта здзейсніў Уладзіслаў IV Ваза. У 1632 г. кіеўскім мітрапалітам быў прызначаны Пётр Магіла

Издательский центр БГУ



Правообладатель Издательский центр БГУ

(1632—1647) — высокаадукаваны царкоўны і палітычны дзеяч. Праваслаўныя атрымалі тры епархіі (Луцкую, Перамышльскую, Магілёўскую), а ўніяты — чатыры (Уладзіміра-Брэсцкую, Холмскую, Пінска-Тураўскую, Смаленскую) і Полацкае архіепіскапства.



*Абраз Святога Іасафата Кунцэвіча*

У 1630-я гг. уніяцкія мітрапаліты рэфармавалі царкву. Быў створаны манаскі ордэн **базыльян** (Святога Васіля Вялікага), пачалася падрыхтоўка вопытных уніяцкіх святароў, наладжвалася школьная адукацыя. Ужо ў канцы XVIII ст. уніяцкая царква мела на тэрыторыі Беларусі больш за тысячу прыходаў, якія аб'ядноўвалі каля 70 % усяго насельніцтва.

Хуткае распаўсюджанне ўніяцкай царквы тлумачыцца яе падтрымкай з боку вярхоўнай улады краіны. Уніяцкае духавенства прыклала шмат намаганняў, каб грэка-каталіцкая царква была цесна звязана з паўсядзённым жыццём простага народа. У храмавай службе ўніяты карысталіся польскай, царкоўнаславянскай, беларускай і нават лацінскай мовамі. А ў звычайных адносінах з сялянамі і мяшчанамі яны размаўлялі з народам на беларускай «гаворцы».

Праўда, вярхам уніяцкага святарства не ўдалося набыць тых правоў, якімі карысталася каталіцкае духавенства. Амаль да канца існавання Рэчы Паспалітай уніяты так і не былі прадстаўлены ў Сенаце краіны. Дзяржаўная ўлада лічыла грэка-каталіцкую царкву другараднай. Гісторыкі мяркуюць, што ўніяцтва садзейнічала захаванню моўна-культурнай традыцыі беларусаў і перашкаджала паланізацыі горада і вёскі.

МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

**З «Парэнетыкі [напаміну] аднаго да сваёй Русі» Іпація Пацея (1605 г.)**

Не паможа і вера, як ласкі не маеш.
Пахваляешся верай, ды Бога не знаеш...
А ці ж вашыя продкі дрэннае ўчынілі:
З Рымам еднасць каб меці, захады рабілі.
Вось жа ліст, што таму ўжо сто гадоў пісаны
І да Сікста, да Рыму, вашымі пасланы.
Называюць там Папу Пастырам Царкоўным
І Царквы Божай нашай Біскупам вярхоўным...

Правообладатель Издательский центр БГУ

Якое палажэнне ўніяцтва абгрунтоўвае ў сваім творы І. Пацей?

**З «Трэнаса» Мялеція Сматрыцкага (1610 г.)**

Жаль жа мне, беднай, жаль жа няшчаснай! Ах, з усіх бакоў з маёмасцю абрабаванай! Жаль жа мне, на ганьбу свету з шатаў абадранай! Бяда мне, нязносным цяжарам прыгнечанай! Рукі ў кайданах, ярмо на шыі, путы на нагах, ланцуг на клубах, меч над галавою двувостры; вада пад нагамі глыбокая, агонь па баках непагасны, адусюль крыкі, паўсюдна страх, паўсюль пераследы. Бяда ў гарадах і вёсках, бяда ў палях і дубровах, бяда ў гарах і прорвах зямных...

Як характарызуе становішча праваслаўнай царквы аўтар?

## Пытанні і заданні

1. Назавіце дату ўтварэння ўніяцкай царквы ў ВКЛ.
2. Ці былі спробы аб'яднання каталіцкай і праваслаўнай цэркваў да 1596 г.?
3. Як ішла падрыхтоўка царкоўнай уніі?
4. Ахарактарызуйце рашэнні Брэсцкага царкоўнага сабора.
5. Як распаўсюджвалася ўніяцкая царква на тэрыторыі Беларусі?
6. Чаму І. Кунцэвіч стаў першым святым ва ўніяцкай царкве?
7. З дапамогай дадатковай літаратуры падрыхтуйце паведамленне пра дзейнасць праваслаўных брацтваў у ВКЛ.
8. Чаму праваслаўныя брацтвы выступілі супраць уніі, а большасць праваслаўных епіскапаў — за яе?
9. Ці згодны вы з думкай, што ўніяцкая царква садзейнічала захаванню беларускай народнай культуры? (Адказ абгрунтуйце.)
10. Дайце азначэнні паняццяў: *уніяцкая царква, праваслаўныя брацтвы, базыльяне.*
11. Запоўніце табліцу «Уніяцкая царква на беларускіх землях».

| Прычыны ўтварэння | Умовы аб'яднання | Вынікі царкоўнай уніі |
|---|---|---|
| | | |



Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 11. ПАШЫРЭННЕ АДРАДЖЭННЯ Ў БЕЛАРУСІ

**Успомніце**

Чаму ў Заходняй Еўропе пачаўся перыяд Адраджэння?

**1. Асаблівасці Рэнесансу ў Беларусі.** Перыяд XIV — першай паловы XVII ст. у гісторыі Заходняй Еўропы атрымаў назву «Адраджэнне», або «Рэнесанс». Гэта быў час уздыму навукі і мастацтва, распаўсюджання гуманізму.

У сацыяльна-эканамічных адносінах Вялікае Княства Літоўскае з'яўлялася ўскраінай тагачаснай Еўропы. Тут не паспела сфарміравацца буржуазнае грамадства. Свецкая (нецаркоўная) літаратура толькі зараджалася. Грамадская думка яшчэ канчаткова не была аддзелена ад царквы і арыентавалася на Біблію. Тым не менш культура беларускіх зямель XVI — пачатку XVII ст. удала ўпісалася ў тагачасную еўрапейскую культуру.

Гісторыкі лічаць, што рэнесансавая культура ў ВКЛ была блізкай да традыцый Паўночнага Рэнесансу, характэрнага для Германіі, Англіі. Тагачаснае культурнае жыццё мела сувязь з рэфармацыйным рухам, абапіралася на грэка-візантыйскую культуру.

У сучаснай навуцы вылучаюць два этапы ў развіцці рэнесансавай культуры на беларуска-літоўскіх землях. Першы з іх прыпадае на першую палову XVI ст. Ён характарызуецца развіццём кнігадрукавання, з'яўленнем агульнадзяржаўнага заканадаўства, навалацінскай паэзіі. Другі этап ахоплівае сярэдзіну XVI — пачатак XVII ст. У гэты час пашыраецца свецкая культура, адбываюцца глыбокія змены ў духоўным і бытавым жыцці грамадства.

**2. Кнігадрукаванне.** На развіццё кнігадрукавання моцны ўплыў аказаў рэфармацыйны рух. У другой палове XVI ст. на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі шэсць рэфармацыйных друкарняў. Першая з іх была арганізавана ў Брэсце пад апекай Мікалая Радзівіла Чорнага. Яна выпусціла больш за 40 выданняў на польскай і лацінскай мовах рознага зместу. Шэдэўрам кнігадрукарскага мастацтва XVI ст. лічыцца Брэсцкая, або *Радзівілаўская Біблія*, выдадзеная ў 1563 г. Вялікая па сваіх памерах кніга апраўлена ў скураную вокладку, мае два гравіраваныя тытульныя лісты, 14 гравюр-ілюстрацый, своеасаблівыя застаўкі і віньеткі.



*Тытульны ліст Брэсцкай (Радзівілаўскай) Бібліі. 1563 г.*



Правообладатель Издательский центр БГУ



*Разварот «Евангелля вучыцельнага» І. Фёдарава і П. Мсціслаўца. 1569 г.*

З 1560-х гг. дзейнічала Нясвіжская друкарня, заснаваная Сымонам Будным сумесна з нясвіжскім намеснікам Мацеем Кавячынскім і прапаведнікам Лаўрэнціем Крышкоўскім. У ёй карысталіся кірылічнымі шрыфтамі. Менавіта там у 1562 г. выдадзены славуты «Катэхізіс» і кніга «Пра апраўданне грэшнага чалавека перад Богам» С. Буднага.

Друкарні існавалі і ў іншых гарадах і мястэчках Беларусі — Лоску, Любчы, Бялынічах, Ашмянах. У маёнтку Цяпіне (цяпер Чашніцкі раён Віцебскай вобласці) паслядоўнік Ф. Скарыны ***Васіль Цяпінскі*** (1530-я гг. — каля 1600) у 1570-я гг. пераклаў і выдаў «Евангелле» на дзвюх мовах: царкоўнаславянскай і беларускай. Прадмова да гэтага выдання стала лепшым узорам патрыятычнай публіцыстыкі. В. Цяпінскі выступаў за ўмацаванне грамадскіх пазіцый беларускай мовы, павелічэнне колькасці школ, пашырэнне пісьменства, развіваў ідэю служэння радзіме.

Вядомым кнігавыдаўцом-асветнікам быў ***Іван Фёдараў*** (каля 1510—1583). Яго месца нараджэння невядома. Магчыма, ён паходзіў з беларускага роду Рагозаў. Адукацыю І. Фёдараў атрымаў у Кракаўскім універсітэце, які скончыў у 1532 г. са ступенню бакалаўра. Лёс накіраваў яго ў Маскву. Там разам з Пятром Мсціслаўцам ён выдаў першую дакладна датаваную рускую друкаваную кнігу — «Апостал» (1564). Пасля па запрашэнні магната Рыгора Хадкевіча друкары арганізавалі выданне кніг для праваслаўных цэркваў у Заблудаве (Польшча). Тут у 1569 г. выйшла «Евангелле вучыцельнае». У канцы 1572 г. Іван Фёдараў пераехаў у Львоў, дзе паклаў пачатак украінскаму кнігадрукаванню.


Правообладатель Издательский центр БГУ

А ўраджэнец Мсціслава ***Пётр Цімафеевіч Мсціславец*** быў запрошаны ў Вільню купцамі Мамонічамі. На іх сродкі ён адкрыў знакамітую друкарню, у якой быў выдадзены Статут ВКЛ 1588 г., а таксама «Евангелле» і «Псалтыр».

У 1619 г. у мястэчку Еўе каля Вільні ***Мялецій Сматрыцкі*** выдаў кнігу «Граматыкі славенскія...», якая на працягу двух стагоддзяў служыла падручнікам па славянскім мовазнаўстве. Па ёй, у прыватнасці, вучыўся М. Ламаносаў.

Кнігавыдавецкую справу Скарыны развіваў ураджэнец Магілёва ***Спірыдон Собаль*** (? — каля 1645). Спачатку ў Кіеве, а затым у Куцеінскім манастыры пад Оршай і Буйніцкай друкарні пад Магілёвам ён выдаваў кнігі маральна-павучальнага і рэлігійнага зместу. Сярод іх — «Псалтыр», «Буквар», «Часаслоў». Напісаны і выдадзены ім «Буквар» стаў вядомы не толькі беларусам, украінцам, рускім, але і замежнаму чытачу. Спірыдон Собаль упершыню ўжыў слова «буквар».

Таксама ў Вільні дзейнічала друкарня Васіля Галабурды. Шмат выданняў было выпушчана Святадухаўскім праваслаўным манастыром і Віленскай езуіцкай акадэміяй.

**3. Літаратура.** З новых жанраў літаратуры XVI — першай паловы XVII ст. можна вылучыць *гістарычныя хронікі*, напрыклад, «Хроніку польскую, літоўскую, жамойцкую і ўсяе Русі» (1582) ***Мацея Стрыйкоўскага***. Гэта адна з першых аўтарскіх прац, прысвечаных мінуламу Княства. Нездарма М. Стрыйкоўскага лічаць пачынальнікам гістарычнай навукі на тэрыторыі Беларусі і Літвы. Змест хронікі прасякнуты патрыятызмам аўтара, яго адданасцю ВКЛ.



Тытульны ліст «Хронікі польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсяе Русі» М. Стрыйкоўскага. 1582 г.

У шляхецкім асяродку папулярнасцю карысталася свецкая перакладная літаратура («Александрыя», «Аповесць пра Трышчана», «Траянская гісторыя»).

Шырокае развіццё атрымала рыцарская (гераічная) паэзія. Былі створаны лацінамоўная паэма ***Яна Радвана*** «Радзівіліяда», польскамоўная паэма ***Андрэя Рымшы*** «Дзесяцігадовая аповесць пра ваенныя справы пана Крыштофа Радзівіла». ***Гальяш Пельгрымоўскі*** ў сваіх паэтычных творах «Гутарка аднаго Паляка з Маскалём» і «Пасольства Льва Сапегі да вялікага князя маскоўскага» адлюстраваў узаемаадносіны ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы ў канцы XVI — пачатку XVII ст.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ




*Старонка кнігі «Перагрынацыя» М. К. Радзівіла (Сіроткі). 1601 г.*

Заснавальнікам падарожніцкай літаратуры з'яўляецца ***Мікалай Крыштоф Радзівіл (Сіротка)***. У 1601 г. у Прусіі выйшаў яго падарожны дзённік «Перагрынацыя», складзены на лацінскай мове ў час паломніцтва ў Святую Зямлю. Кніга стала першым у Беларусі навукова-геаграфічным выданнем.

**4. Архітэктура.** У архітэктуры XVI ст. набіраў моц стыль рэнесанс. Ён вылучаўся кампактнасцю аб'ёмаў і сціпласцю дэкору. Прыкладам з'яўляецца кальвінісцкая царква ў Смаргоні, пабудаваная на сродкі Зяновічаў.

Рэнесансавыя будынкі часта захоўвалі ранейшыя абарончыя элементы. У прыватнасці, Заслаўскі кальвінісцкі збор размешчаны на месцы старажытнага замка — на высокім узгорку, акружаным ровам і валам з чатырма землянымі бастыёнамі.

У гэтым стылі ў канцы XVI ст. пад кіраўніцтвам М. Забароўскага быў перабудаваны замак у мястэчку Мір. Мірскі палацава-замкавы комплекс пачалі ўзводзіць магнаты Іллінічы яшчэ ў 1520-я гг. Яго абарончая сістэма з трыма ўзроўнямі для вядзення бою была прыстасавана ўжо да агнястрэльнай зброі і гармат. Асабліва ўражвае яго святочна-ўрачыстае дэкаратыўнае афармленне, пабудаванае на кантрасце чырвонага колеру сцен і белых атынкаваных ніш. Знешне падобныя, усе пяць вежаў замка маюць індывідуальнае вырашэнне.



*Нясвіжскі касцёл Божага Цела*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Таксама рэнесансавым характарам вызначаўся палацава-замкавы комплекс у Смалянах (Аршанскі раён Віцебскай вобласці). Яго называлі «Белы Ковель», таму што ён быў узведзены з белай цэглы і невялікіх камянёў. Замак быў пабудаваны князем Сангушкам-Ковельскім да 1626 г. на правым беразе ракі Дзярноўка.



*Абраз Параскевы. Сярэдзіна — другая палова XVI ст.*

Пад уплывам Контррэфармацыі на беларускіх землях пачаў распаўсюджвацца новы архітэктурны стыль — **барока**. Першым яго ўзорам стаў *Нясвіжскі касцёл Божага Цела*, пабудаваны італьянскім архітэктарам ***Янам (Джавані) Марыяй Бернардоні*** ў 1587—1593 гг. Пры складанні праекта храма былі ўлічаны патрабаванні мясцовых езуітаў. Касцёл павінен быў сведчыць пра магутнасць каталіцкай царквы. Адначасова ён стаў фамільнай пахавальняй для магнатаў Радзівілаў.

Архітэктурныя формы барока, запазычаныя з Італіі, былі дапоўнены мясцовымі будаўнічымі прыёмамі. Склалася своеасаблівае беларускае барока. Прыкладам таму з'яўляецца касцёл брыгіцкага манастыра ў Гродне. Храм быў пабудаваны ў 1634—1642 гг. на сродкі магнатаў Весялоўскіх. Будынак, размешчаны на ўзгорку, фарміраваў панараму старажытнага горада. Яго маляўнічы сілуэт і дэталёва распрацаваны фасад уражваюць нас і сёння.

**5. Мастацтва.** У канцы XVI ст. у іканапісе і алтарным жывапісе прыкметным становіцца ўплыў рэнесансавага мастацтва. Традыцыйная кампазіцыя захоўвалася, але вобразы ўжо надзяляліся індывідуальнасцю і аб'ёмнасцю, а фон абразоў стаў аздабляцца рэнесансавым арнаментам. Прыкладам з'яўляюцца абразы «Параскева» са Случчыны, «Спас» з Быценя.

Скарынаўскую традыцыю кніжнай гравюры працягвалі Брэсцкія, Нясвіжская, Заблудаўская і іншыя друкарні. Багата былі ўпрыгожаны гравюрамі «Радзівілаўская біблія», «Евангелле вучыцельнае» І. Фёдарава і П. Мсціслаўца.



*Надмагілле Льва Сапегі і яго жонак у Вільні*

У канцы XVI — пачатку XVII ст. атрымала развіццё мемарыяльная скульптура. Яна была прад-



Правообладатель Издательский центр БГУ

стаўлена надмагіллямі Радзівілаў у Нясвіжы, Сапегаў у Вільні, Агінскіх у Кронях.

Выяўленчае мастацтва набывала свецкі характар. Пад уплывам Рэнесансу з'явіўся новы жанр — *рэалістычны партрэт*, што было выклікана ўзмацненнем цікавасці да ўласнага роду, сям'і, асобы. Лепшыя творы — гэта партрэты князя Аляксандра Хадкевіча, мітрапаліта Іосіфа Солтана. Яны вылучаліся глыбінёй псіхалагічнай характарыстыкі, падкрэсленым пачуццём чалавечай годнасці.

Эпоха Адраджэння ў Беларусі завяршылася па сутнасці ў канцы XVI — пачатку XVII ст. На гэта паўплывала Контррэфармацыя, а таксама змены ў грамадска-палітычным становішчы ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай, размежаванне шляхты па культурна-канфесійнай прыкмеце, пашырэнне каталіцтва.

МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

**З «Хронікі польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсяе Русі» Мацея Стрыйкоўскага (1582 г.)**

...Глінскі Міхал, як бачыў — мост ужо гатовы,
Да літвы сваёй мовіў гэтакія словы:
Каб за маці-айчыну мужна ваявалі,
Ад пагібелі лютай мужна ратавалі;
Прыгадаў ім пачцівасць, вольнасці ды славу,
Жонак, дзетак, багацці, іхнія па праву.
Так казаў, каб адважна ворага змагалі
Ды братам, што ў няволі, жыцці ратавалі...

Аб якой бітве ідзе гаворка? Вызначце пазіцыю аўтара.

**З «Перагрынацыі» Мікалая Крыштофа Радзівіла (1601 г.)**

...А адтуль ужо да каплічкі Святога Гроба падыходзім, вакол якой шэсце тройчы абыходзіць, перад дзвярыма ўсе апускаюцца на калені, святар законнік адзін (бо цесна там) уваходзіць, кажа казанне, і за ім паломнікі, таксама па адным, праз дзверцы вельмі нізкія па чарзе заходзяць, там унутры з правага боку ёсць месца вышынёю на паўтара локця, плоскае, як лава, дзе Найсвяцейшае Цела Гасподняе пакладзенае было...

Куды здзейсніў паломніцтва Мікалай Крыштоф Радзівіл?


Правообладатель Издательский центр БГУ

### Пытанні і заданні

1. Што такое Адраджэнне?
2. Назавіце асаблівасці Рэнесансу на беларускіх землях.
3. Раскажыце аб развіцці кнігадрукавання ў ВКЛ у XVI — першай палове XVII ст.
4. Як паўплывалі ідэі Рэнесансу на развіццё літаратуры Беларусі?
5. Ахарактарызуйце ўплыў Адраджэння на мастацтва Беларусі.
6. Падрыхтуйце паведамленні аб прадстаўніках эпохі Адраджэння ў беларускай культуры.
7. На падставе дадатковай літаратуры пакажыце сувязь Паўночнага Рэнесансу з культурай ВКЛ XVI — першай паловы XVII ст.

## УРОК АБАГУЛЬНЕННЯ ДА РАЗДЗЕЛА I

**1.** Складзіце тэзісны план ці план-канспект адказу па адным з наступных пытанняў з выкарыстаннем тэарэтычнага і фактагалічнага матэрыялу:

а) утварэнне і палітычная эвалюцыя Рэчы Паспалітай;
б) усталяванне фальваркова-паншчыннай сістэмы;
в) фарміраванне адзінага шляхецкага саслоўя;
г) уплыў Рэфармацыі на духоўнае развіццё беларускіх зямель;
д) усталяванне ўніяцтва на беларускіх землях;
е) развіццё кнігадрукавання на беларускіх землях.

**2.** Пакажыце на карце тэрыторыі, якія Рэч Паспалітая атрымала паводле:

а) Ям-Запольскага перамір’я;
б) Дэулінскага перамір’я;
в) Палянаўскага міру.

**3.** Вызначце гістарычныя падзеі па наступных датах:

1557 г., 1558—1583 гг., 1569 г., 1579 г., 1581 г., 1588 г., 1596 г., 1600—1629 гг., 1609—1618 гг., 1632—1634 гг.

**4.** Параўнайце дзяржаваўтваральныя працэсы ў сярэдзіне XVI ст. на тэрыторыі Беларусі і Польшчы.

| Прычыны і наступствы падпісання Люблінскай уніі | Вялікае Княства Літоўскае | Польшча |
|---|---|---|
| | | |

Правообладатель Издательский центр БГУ

**5.** Суаднясіце ў табліцы знешнепалітычныя адносіны беларускіх зямель у сярэдзіне XVI — першай палове XVII ст. і зрабіце выснову аб месцы і ролі ВКЛ ва Усходняй Еўропе.

| Узаемаадносіны ВКЛ з Польшчай | Узаемаадносіны ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай | Узаемаадносіны ВКЛ са Швецыяй |
|---|---|---|
| | | |

**6.** Правядзіце сістэматызацыю наступных тэрмінаў і паняццяў і занясіце іх у адпаведныя слупкі табліцы.

| Палітычныя працэсы на тэрыторыі Беларусі | Сацыяльна-эканамічныя працэсы на тэрыторыі Беларусі | Рэлігійныя працэсы на тэрыторыі Беларусі | Культурныя працэсы на тэрыторыі Беларусі |
|---|---|---|---|
| | | | |

Рэч Паспалітая, аграрная рэформа, шляхецкія вольнасці, гвалты, інкарпарацыя, федэрацыя, Сенат, госці, Пасольская Ізба, арыянства, Пакта канвента, Генрыкавы артыкулы, канфедэрацыя, «ліберум вета», рокаш, фальварак, валока, новалацінская паэзія, мястэчка, юрыдыка, цэх, партачы, гасцінцы, Рэфармацыя, кальвінізм, базыльяне, калегіум, клерыкалізацыя, езуіты, уніяцтва, прасалы.

**7.** Вызначце прычыны і наступствы адной з гістарычных з'яў:

а) заключэнне Люблінскай уніі;
б) барацьба за самастойнасць ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай;
в) правядзенне аграрнай рэформы Жыгімонтам II Аўгустам;
г) рэфармацыйны рух у ВКЛ;
д) станаўленне ўніяцкай царквы на беларускіх землях.

**8.** Растлумачце падыходы навукоўцаў да адной з наступных праблем:

а) характар дзяржаўнага аб'яднання ВКЛ і Польшчы ў Рэч Паспалітую;
б) уплыў «шляхецкай дэмакратыі» на стан дзяржаўнага кіравання;
в) нацыянальны характар уніяцкай царквы.

**9.** Правядзіце краязнаўчыя даследаванні па адной з наступных тэм:

а) «Развіццё вашага горада (вёскі) у сярэдзіне XVI — першай палове XVII ст.»;
б) «Мясцовыя помнікі эпохі Рэфармацыі»;
в) «Мясцовыя помнікі архітэктуры сярэдзіны XVI — першай паловы XVII ст.».


Правообладатель Издательский центр БГУ

Раздзел II

# БЕЛАРУСЬ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVII — ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVIII ст.

## § 12. КАЗАЦКА-СЯЛЯНСКАЯ ВАЙНА 1648—1651 гг. НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ

**Успомніце**

1. Калі на беларускіх землях з'явіліся казацкія атрады з Украіны?
2. Чым завяршылася Буйніцкая бітва 1595 г.?

**1. Разгортванне казацка-сялянскага руху.** У першай палове XVII ст. ускладніліся ўзаемаадносіны Рэчы Паспалітай з паўднёвымі суседкамі — Аўстрыяй і Малдавіяй. Таксама межы краіны пастаянна парушалі крымскія татары, залежныя ад Асманскай імперыі. Для абароны ад набегаў крымчакоў і туркаў каралі Рэчы Паспалітай сталі выкарыстоўваць украінскіх *казакоў*.

**Гістарычная даведка**
Казакі — вольныя людзі, якія паходзілі ад цюркаў і славян. У XVI ст. яны сталі асобным саслоўем. Іх вылучалі дзве адметнасці: праваслаўная вера і двухмоўе. Жыгімонт I Стары загадаў запісаць казакоў у спецыяльнае войска (рэестр) з цэнтрам у Запарожскай Сечы для абароны краіны. З-за недахопу грошай у дзяржаўным скарбе рэестр пастаянна распадаўся. Стафан Баторый у 1582 г. вызваліў казакоў ад падаткаў, падначаліў іх толькі каралеўскай уладзе, дазволіў мець уласны суд. З 1628 г. казакі сталі выбіраць у Запарожскай Сечы свайго гетмана.

Напрыканцы жыцця кароль Уладзіслаў IV Ваза задумаў план вялікай вайны з Турцыяй. Важная роля ў ёй адводзілася ўкраінскім казакам. Кароль абяцаў ім даць асобную тэрыторыю для казацкай дзяржавы і павялічыць рэестр

Правообладатель Издательский центр БГУ

да 20 тыс. чалавек. Супраць планаў манарха выступілі магнаты і заможная шляхта. На сойме 1646 г. шляхецкія паслы абвінавацілі Уладзіслава IV у намеры ўсталяваць абсалютную манархію і сталі пагражаць яму рокашам. Кароль вымушаны быў адмовіцца ад сваіх планаў.

Аднак украінскія казакі працягвалі рыхтавацца да вайны, накіраванай ужо не супраць Турцыі і Крымскага ханства, а супраць польскай шляхты, каталіцкага духавенства і яўрэяў. У гэтым казакоў падтрымалі шырокія пласты ўкраінскага насельніцтва, найперш сяляне і мяшчане. Яны былі незадаволены распаўсюджаннем польскага землеўладання, павелічэннем феадальных павіннасцей, насаджэннем каталіцтва. Ужо ў першай палове XVII ст. Украіну скаланулі народныя паўстанні. Яны перараслі ў нацыянальна-вызваленчую казацка-сялянскую вайну пад кіраўніцтвам ***Багдана Хмяльніцкага***. Сучасныя ўкраінскія гісторыкі называюць гэтыя падзеі «вызваленчай вайной украінскага народа супраць польскага панавання».



**Гістарычная асоба**

БАГДАН ХМЯЛЬНІЦКІ (1595—1657) паходзіў з дробнай праваслаўнай шляхты. Адукацыю атрымаў у езуіцкім калегіуме ў Львове. У 1647 г. быў арыштаваны за падрыхтоўку паўстання супраць Польшчы. У 1648 г. уцёк у Запарожскую Сеч, дзе быў абраны казацкім гетманам.

Ужо ў маі **1648 г.** запарожскія казакі пры падтрымцы крымскага хана нанеслі паражэнне польскім войскам на тэрыторыі Украіны ў бітвах каля Жоўтых Вод і пад Корсунем.

**2. Пачатак барацьбы з казацкімі загонамі.** На тэрыторыю Вялікага Княства Б. Хмяльніцкі стаў адсылаць універсалы да мясцовага насельніцтва з заклікам выступіць супраць магнатаў і шляхты. Існуе думка, што ў будучым ён разлічваў далучыць беларускія землі да ўкраінскай казацкай дзяржавы. Хмяльніцкі ўлічыў шырокую незадаволенасць народных нізоў праведзенай аграрнай рэформай, пагаршэннем іх сацыяльнага становішча, насаджэннем уніяцтва.

Затым Хмяльніцкі накіраваў у беларускія землі казацкія *загоны* (атрады) на чале з Я. Галавацкім, А. Нябабам, Крывашапкам, Міхненкам, І. Гаркушам



Правообладатель Издательский центр БГУ

і інш. Многія з палкоўнікаў з'яўляліся ўраджэнцамі беларускіх зямель. Казакоў падтрымалі мясцовыя сяляне і мяшчане, якія выступілі супраць улады. У дакументах таго часу адзначалася: «Беларусы ўсякія, чорны люд усіх гарадоў і паветаў стаяць супраць ляхаў з казакамі заадно». На поўдні беларускіх зямель разгарнуўся шырокі антыфеадальны рух. Да восені жыхары Гомеля, Мазыра, Лоева, Рэчыцы, Турава «ўсе паказачыліся і пакляліся адзін другому стаяць да апошняга».

Кароль Рэчы Паспалітай Ян II Казімір Ваза даручыў задушыць антыфеадальныя выступленні гетману ***Янушу Радзівілу***. Той за ўласны кошт наняў шляхецкія атрады і ў ліпені 1648 г. накіраваў іх на паўднёвы захад Беларусі. Але пад Рэчыцай паўстанцы разам з казакамі разбілі харугвы Валовіча, а пад Горвалем — Мірскага.

З дапамогай казакоў былі ўзняты паўстанні мяшчан у Гомелі, Мазыры, Лоеве, Рэчыцы, Тураве, Брагіне, Чэрыкаве, Бабруйску. Шляхта і духавенства ратаваліся ўцёкамі ў цэнтральныя паветы Княства. Як і ва Украіне, антыфеадальны рух набыў антыпольскую накіраванасць, бязлітасна праследаваліся жыхары каталіцкага веравызнання і яўрэі.

У пачатку восені Я. Радзівіл сабраў шляхецкае рушэнне і каля 4 тыс. наёмных жаўнераў. Трагічны лёс напаткаў Пінск. Пасля штурму войскам ВКЛ у кастрычніку 1648 г. горад на два дні быў аддадзены «на агонь і рабунак» — з 6 тыс. дамоў згарэла 5 тысяч. У пачатку студзеня 1649 г. шляхецкае войска рушыла з Брэста да Рэчыцы, каб перарэзаць шлях казацкім загонам у цэнтральныя раёны ВКЛ. Жорсткія пакаранні абрынуліся на ўдзельнікаў выступленняў і казакоў. У Тураве шляхціцы перабілі ўсіх жыхароў, якія засталіся ў горадзе пасля адыходу паўстанцаў. Разгромлены быў Мазыр. Шмат



*Казацкі загон*



Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

казакоў загінула пры абароне Бабруйска. Бязлітасна абышоўся гетман з жыхарамі гэтага горада. У тагачасным дакуменце было адзначана: «Мяшчан усіх, якія нават гарадскую браму яму адчынілі, катаваў... Рукі адсек 800 чалавекам, галовы паздымаў 50 чалавекам, пасадзіў на пáлі 100 чалавек. Нявінную кроў праліў, а без ніякага розуму, дзеля сваёй карысці». Вясной 1649 г. паспалітае рушэнне каля Рэчыцы разбіла 3-тысячны загон Ільі Галоты. Шляхецкая конніца вымусіла казакоў адступіць у балота, дзе большая частка паўстанцаў загінула.

**3. Лоеўская бітва.** Януш Радзівіл прывёў свае войска пад Лоеў, дзе знаходзіліся пераправы праз Дняпро. Іх называлі *«Лоеўская брама»*. Агульная колькасць коннікаў і жаўнераў складала больш за 7 тыс. чалавек. Каб не дапусціць шляхецкае войска і наёмнікаў ва Украіну, Б. Хмяльніцкі накіраваў туды загон на чале з ***Міхайлам Крычэўскім***. Казакі мелі колькасную перавагу, але саступалі ў падрыхтоўцы і ўзбраенні. Раніцай 31 ліпеня **1649 г.** Крычэўскі рушыў коннай атакай на лагер Радзівіла. Ён не паслухаў сваіх старшынь — не дачакаўся абозу і пяхоты, не злучыўся з атрадам Сцяпана Падбайлы, які стаяў лагерам у сутоках Дняпра і Сажа насупраць Лоева. Магчыма, нечаканая атака магла мець поспех, калі б у тыл казакам не ўдарылі шляхціцы, якія вярталіся з дазору з-пад Брагіна. Войска Крычэўскага было рассечана напалам, левае крыло разбіта, правае адступіла ў даліну Дняпра. Януш Радзівіл рушыў да Татарскага броду. Там ён разбіў казакоў Падбайлы, якія пераправляліся праз раку. Затым шляхецкае войска перахапіла абоз і рассеяла пяхоту Крычэўскага. Казакі адступілі ў свой лагер (засеку). Тройчы войска Радзівіла ішло на штурм, але кожны раз вымушана было адступаць з вялікімі стратамі. Ноччу пад покрывам цемры казакі накіраваліся ва Украіну.



*Абоз гетмана Я. Радзівіла пад Лоевам. З гравюры XVII ст.*

Казакі пацярпелі паражэнне і страцілі больш за 10 тыс. чалавек. Палкоўнік М. Крычэўскі быў паранены і захоплены ў палон. Радзівіл разлічваў атрымаць ад яго звесткі пра ваенныя планы Хмяльніцкага. Але Крычэўскі не выдаў таямніцы і памёр ад ран. Шляхецкае войска недалічылася 1700 чалавек. Пахаваўшы забітых на ўскраіне Лоева, Радзівіл адышоў пад ахову Рэчыцкага замка. Войска ВКЛ святкавала перамогу.

**4. Завяршэнне ваеннай кампаніі.** У 1650 г. назіраліся толькі невялікія ачагі сялянскіх выступленняў у раёне Чэрыкава, Гомеля і Чачэрска. Летам



Правообладатель Издательский центр БГУ

наступнага года Б. Хмяльніцкі разгарнуў новае наступленне па тэрыторыі Украіны. Наперарэз яму з ВКЛ рушыла амаль 30-тысячнае шляхецкае войска. Падмануўшы казакоў, Януш Радзівіл пасля гадзіннага бою 6 ліпеня зноў заняў лоеўскія пераправы. Загон ***Марціна Нябабы*** (15 тыс. чалавек) быў разбіты. Радзівіл накіраваўся да Кіева і 8 жніўня ўвайшоў у горад, пакінуты паўстанцамі.




*Пасмяротны партрэт Міхайлы Крычэўскага*

У **1651 г.** быў падпісаны *Белацаркоўскі дагавор* (Украіна) паміж казакамі і Рэччу Паспалітай. Згодна з яго ўмовамі пад кантролем Хмяльніцкага засталося толькі Кіеўскае ваяводства, а колькасць казацкага войска скарацілася да 20 тыс. чалавек. Ваенныя няўдачы прымусілі ўкраінскага гетмана звярнуцца за дапамогай да расійскага цара. Земскі сабор у 1653 г. прыняў рашэнне ўключыць Левабярэжную Украіну ў склад Расіі. Затым адбылася *Пераяслаўская рада*. У прысутнасці вялікага пасольства Расіі 8 студзеня 1654 г. казакі прынялі рашэнне аб пераходзе Украіны пад царскую «высокую руку».

Жорсткая вайна завяршылася паражэннем не толькі казакоў, але і сялянства, і гарадскіх нізоў. Паўднёвая частка Беларусі ўяўляла сабой зруйнаваныя гарады і спаленыя вёскі. Дзясяткі тысяч людзей загінулі або ад рук паўстанцаў, або ад шляхецкага войска. Казацка-сялянская вайна стала пачаткам *«разбуральнага стагоддзя»* ў беларускай гісторыі, якое суправаджалася новымі ваеннымі выпрабаваннямі.

МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

**З успамінаў французскага пісьменніка Шэвалье (1649 г.)**

...Кн. Радзівіл... уціхамірыў узбунтаваныя гарады, Тураў і Гомель, і стаў лагерам з войскам пад гор. Мазыром, які праз многія дні так з вялікім намаганнем бараніў сябе, што потым сам не здаўся, пакуль узяты не быў, нарэшце, штурмам, з-за майстэрства аднаго падпалкоўніка палка радзівілаўскага. У тым горадзе Міхненка, адзін з бунтаўшчыцкіх начальнікаў, злоўлены па княжацкім загадзе, пакараны смерцю праз адсячэнне галавы, якая пасля была ўваткнутая на замкавай вежы...

? Вызначце з урыўка адносіны аўтара да апісанай падзеі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

## Пытанні і заданні

1. Хто такія казакі?
2. Чаму ва Украіне пачаўся шырокі нацыянальна-вызваленчы рух?
3. Дайце ацэнку асобе Багдана Хмяльніцкага.
4. З якой мэтай Б. Хмяльніцкі дасылаў казацкія атрады ў ВКЛ?
5. Раскажыце аб ваенных падзеях 1648 — першай паловы 1649 г.
6. Апішыце Лоеўскую бітву 1649 г.
7. Як разгортваліся ваенныя дзеянні на беларускіх землях у 1650—1651 гг.?
8. Ахарактарызуйце вынікі казацка-сялянскай вайны.
9. Дайце азначэнні паняццяў: *казакі, загон, «Лоеўская брама», «разбуральнае стагоддзе»*.

# § 13. ВАЙНА РАСІІ З РЭЧЧУ ПАСПАЛІТАЙ 1654—1667 гг.

## Успомніце

Ці атрымала Расія выхад у Балтыйскае мора ў Лівонскай вайне?

**1. Прычыны вайны і суадносіны сіл.** Жаданне Расіі ўключыць Украіну і казакоў у свой склад стала зачэпкай да вайны з Рэччу Паспалітай. Кароль Ян II Казімір не пагадзіўся з пастановай Пераяслаўскай рады і не жадаў аддаваць украінскія землі.

Расійскі бок рыхтаваўся да ваенных дзеянняў. Цар ***Аляксей Міхайлавіч*** (мянушка Цішайшы) імкнуўся вярнуць смаленскія, чарнігаўскія і ноўгарад-северскія землі, страчаныя ў пачатку XVII ст. Для Расіі заставалася нявырашанай «балтыйская праблема». Успомнім, што калісьці Іван IV распачаў няўдалую Лівонскую вайну, каб атрымаць выхад у Балтыйскае мора.

Важную ролю адыграў канфесійна-рэлігійны фактар. Расійскія цары лічылі сябе абаронцамі праваслаўнага насельніцтва не толькі на тэрыторыі Расіі, але і на беларуска-літоўскіх землях. Праваслаўныя вернікі ВКЛ былі незадаволены гвалтоўным насаджэннем уніяцтва. Аляксей Міхайлавіч яшчэ да пачатку вайны абяцаў ім спакойнае, заможнае жыццё пад «царскаю рукою». Расійскаму войску ён загадаў: «Чтоб они белорусцев хрестьянское веры, которые противны не будут, и их жон и детей не побивали, и в полон не имали, и никакова дурна над ними не делали...»

Шляхце ВКЛ Аляксей Міхайлавіч абяцаў захаваць усе зямельныя ўладанні і правы. Заахвочваўся іх пераход у расійскае падданства. Жыхарам бела-


Правообладатель Издательский центр БГУ

рускіх гарадоў цар прапанаваў вольны гандаль з расійскімі гарадамі і пацвярджэнне правоў. Падобная палітыка першапачаткова мела поспех.

Суадносіны сіл былі не на карысць Рэчы Паспалітай. Войска расійскага цара налічвала каля 80 тыс. чалавек і складалася з трох груповак. Армія князя В. Шарамецева павінна была наступаць на ВКЛ з поўначы, армія князя А. Трубяцкога — ад Бранска на Мсціслаў. Асноўная частка войска на чале з царом рухалася на Смаленск. Падтрымаць Аляксея Міхайлавіча абяцалі ўкраінскія казакі пад кіраўніцтвам гетмана Івана Залатарэнкі.

Ваенныя сілы Княства не былі падрыхтаваны да шырокамаштабнай вайны. Вялікі гетман Януш Радзівіл сабраў прыкладна 20 тыс. чалавек шляхецкага апалчэння, што было яўна недастаткова.



*Мушкецёр наёмнай пяхоты Рэчы Паспалітай. XVII ст.*

**2. Ваенныя дзеянні ў 1654—1656 гг.** У маі **1654 г.** расійскія войскі пачалі ваенныя дзеянні, а ўжо ў канцы чэрвеня быў захоплены Полацк. Царскія войскі занялі Друю, Глыбокае, Віцебск. Упарта змагаўся Мсціслаў, за што амаль усе яго жыхары былі перабіты: «Шляхты, поляков и литвы, и иных служилых людей... побито больши десяти тысяч человек». Такі ж лёс напаткаў і Гомель. Украінскія казакі занялі шэраг паўднёвабеларускіх гарадоў. Толькі Быхаўская крэпасць — цвярдыня Сапегаў — вытрымала 11-месячную аблогу. Цяжкія баі ішлі за Слуцк.

Януш Радзівіл з-за нешматлікасці войска нападаў толькі на невялікія атрады расійскай арміі. Паспяхова завяршыліся баі пад Оршай, Шкловам. Але каля мястэчка Шапялевічы (Круглянскі раён Магілёўскай вобласці) гетман пацярпеў паражэнне і паранены адступіў да Мінска. Расійскае войска пачало аблогу Смаленска. На сценах горада стаялі як жаўнеры, так і мяшчане агульнай колькасцю да 7 тыс. чалавек. Ім на дапамогу прарываліся войскі Радзівіла, але няўдала. У выніку пасля 2-месячнай аблогі смаленскі ваявода Піліп Абуховіч



*Гусар. XVII ст.*



Правообладатель Издательский центр БГУ



*Кароль Рэчы Паспалітай Ян II Казімір Ваза. Мастак Д. Шульц*

здаў горад. За гэта сойм абвінавацію яго ў здрадніцтве. 23 верасня Аляксей Міхайлавіч урачыста ўвайшоў у Смаленск. Расія да канца 1654 г. заняла беларускія землі на ўсход ад Дняпра, на якіх было 33 гарады.

Летняя кампанія 1655 г. для цара аказалася вельмі ўдалай. Расійскае войска заняло Мінск, Клецк, Ляхавічы, Ліду, Слонім, Навагрудак і іншыя гарады. 8 жніўня штурмам была ўзята сталіца ВКЛ — Вільня. Аляксей Міхайлавіч прыняў тытул самадзержца «всея Великия и Малыя и Белыя России». Амаль уся тэрыторыя Беларусі апынулася пад уладай расійскага цара. На вернасць яму прысягалі не толькі праваслаўныя сяляне, мяшчане, а нават каталіцкая шляхта.

Польшча ў той час не магла аказаць дапамогу Вялікаму Княству Літоўскаму, паколькі вяла *Паўночную вайну* **1655—1660 гг.** са Швецыяй.




*ВКЛ у другой палове XVII ст.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Гістарычная даведка**

Паўночная вайна (1655—1660) была выклікана імкненнем Швецыі замацаваць сваё лідарства ў Прыбалтыцы. Кароль Карл X Густаў восенню 1655 г. заняў амаль усю тэрыторыю Кароны. Яго падтрымала пратэстанцкая шляхта і Прускае каралеўства. Ян II Казімір заклікаў шляхту да ўзброенага выступлення супраць захопнікаў-шведаў. Актыўныя ваенныя дзеянні разгарнуліся пад Варшавай, Варкай, Брэстам. Вайна завяршылася *Аліўскім мірам*. Ян II Казімір адмовіўся ад прэтэнзій на шведскі трон, а Швецыя захавала за сабой прыбалтыйскія землі на поўнач ад Заходняй Дзвіны.

У гэтых цяжкіх умовах стрыечныя браты кальвіністы Януш і Багуслаў Радзівілы прапанавалі заключыць унію са шведскім каралём. Яна прадугледжвала аўтаномію Княства пад кантролем Швецыі. Унію ў кастрычніку **1655 г.** у Кейданах падпісалі 1172 асобы, у асноўным прадстаўнікі шляхты і каталіцкага духавенства. Януша Радзівіла шведы ўзнагародзілі ордэнам «Імя Ісуса».



**Гістарычная асоба**

ЯНУШ РАДЗІВІЛ (1612—1655) скончыў кальвіністкую гімназію ў Слуцку. Вучыўся ў Лейпцыгскім, Альтдорфскім і Лейдэнскім універсітэтах. У 1654 г. быў абраны вялікім гетманам ВКЛ. З-за рознагалосся з каралём Янам II Казімірам упершыню ў гісторыі Рэчы Паспалітай сарваў сойм, даручыўшы свайму прыхільніку паслу Сіцынскаму выкарыстаць права «ліберум вета». Змагаўся з казацкімі загонамі Хмяльніцкага, з якім вёў асабістую перапіску. Існуе версія пра жаданне Я. Радзівіла стварыць разам з украінскімі казакамі антыпольскі саюз.

*Вялікі гетман ВКЛ Януш Радзівіл. Мастак Д. Шульц. Каля 1652 г.*

Але большасць шляхты і магнатаў ВКЛ захавалі вернасць каралю Рэчы Паспалітай і не прынялі Кейданскую унію. Апазіцыю Радзівілам узначаліў віцебскі ваявода Павел Сапега. Барацьба з Радзівіламі завяршылася скасаваннем уніі і вывадам шведскіх войскаў. Расія, якая рыхтавалася да вайны са Швецыяй, прапанавала Рэчы Паспалітай падпісаць перамір'е. Яно было заключана пад Вільняй у лістападзе 1656 г. Дагавор прадугледжваў двухгадо-



Правообладатель Издательский центр БГУ



*Аблога Брэста шведамі ў 1657 г. Гравюра Э. Дальберга*

вае прыпыненне вайны і супольныя дзеянні супраць Швецыі. Пасля гэтага ваяводы Аляксея Міхайлавіча пачалі актыўна дзейнічаць на тэрыторыі Прыбалтыкі.

На беларускіх землях засталіся толькі расійскія гарнізоны і царская ваенная адміністрацыя. Усіх, хто змагаўся супраць расійскіх войскаў, прымусова высялялі ў глыб Расіі. Грабяжы і самавольствы расійскай адміністрацыі, вываз насельніцтва ў палон выклікалі масавае супраціўленне. Паводле сведчанняў патрыярха Нікана, Аляксей Міхайлавіч планаваў вывесці каля 300 тыс. чалавек з беларускіх зямель. Найчасцей забіралі жанчын і дзяцей. Асобную групу палонных складалі рамеснікі. Так у Маскве з'явіліся кавалі, збройнікі, замочнікі і іншыя майстры з беларускіх гарадоў. Гісторык Л. Абэцэдарскі падлічыў, што ў сталіцы Расіі ў апошняй трэці XVII ст. беларусы складалі каля 20 % насельніцтва.

На занятай расійскай арміяй тэрыторыі Беларусі барацьбу разгарнулі сялянскія атрады самаабароны. Іх удзельнікаў у расійскіх дакументах таго часу называлі **шышамі**. Асабліва ўпарты характар набыло народнае супраціўленне ў Барысаўскім, Мінскім, Навагрудскім і Віцебскім паветах. Ужо ў 1657 г. атрады самаабароны ўзялі пад кантроль большую частку Магілёўшчыны. Да іх далучаліся мяшчане і шляхта, якая мела ваенны вопыт. Антырасійскія выступленні былі выкліканы расчараваннем насельніцтва ВКЛ у царскай па-

Издательский центр БГУ



Правообладатель Издательский центр БГУ

літыцы. Шляхта была пазбаўлена многіх сваіх прывілеяў — напрыклад, выбіраць манарха, склікаць соймы і соймікі; сяляне абцяжараны новымі падаткамі.

Паўставалі супраць царскіх прадстаўнікоў і гараджане. Жыхары Магілёва, Шклова, Крычава, Мсціслава, Дзісны і іншых гарадоў самастойна знішчалі або выганялі расійскія гарнізоны.

У выніку баявых дзеянняў, голаду і хвароб тэрыторыя Беларусі была ператворана ў пустэчу. Ад непахаваных трупаў людзей і жывёл пачалася эпідэмія чумы (*паморак*). Увесну 1656 г. адбылося нашэсце палявых мышэй, якія сапсавалі шмат збожжа. Гэта выклікала страшэнны голад. Людзі елі сабак і катоў. Вядомы выпадкі канібалізму. У 1658 г. эпідэмія настолькі пашырылася, што царскі ўрад вымушаны быў увесці на дарогах заслоны.

З 1660 г. ход вайны змяніўся на карысць Рэчы Паспалітай. Гэтаму садзейнічала не толькі моцнае народнае супраціўленне, але і заканчэнне Паўночнай вайны 1655—1660 гг., непаразуменні, якія ўзніклі паміж расійскімі ваяводамі і казакамі. Пасля смерці Хмяльніцкага новы ўкраінскі гетман Іван Выгоўскі пайшоў на зблiжэнне з Рэччу Паспалітай.

У 1660 г. расійскія войскі на чале з ваяводам І. Хаванскім пацярпелі паражэнне ў *Палонкаўскай бітве* (пад Ляхавічамі), армія ваяводы Ю. Далгарукага — на *рацэ Басі* (пад Чавусамі). Затым у лістападзе 1661 г. войска Хаванскага было разбіта ў бітве *пад Кушлікамі* (каля Полацка). А ў снежні капітуляваў расійскі гарнізон, размешчаны ў Віленскім замку. Пасля гэтага вайна прыняла пазіцыйны характар, бо ніводны бок не меў ні сіл, ні сродкаў для яе далейшага вядзення.

**3. Вынікі і наступствы вайны.** Мірныя перагаворы пачаліся ў вёсцы Андросава на мяжы Мсціслаўскага і Смаленскага ваяводстваў. Яны цягнуліся амаль чатыры гады. Дэлегацыю Расіі прадстаўляў пасол А. Ардын-Нашчокін, Рэчы Паспалітай — жамойцкі староста Ю. Глябовіч. Адбылося 39 сустрэч-пасяджэнняў паміж бакамі.

У выніку 30 студзеня **1667 г.** было падпісана *Андросаўскае перамір'е* тэрмінам на 13,5 года. Расія атрымала Смаленшчыну, Чарнігаўшчыну, Левабярэжную Украіну і Кіеў. Землі Беларускага Падзвіння, а гэта Віцебшчына і Полаччына, вярталіся назад у склад ВКЛ. Тэрыторыя Княства паменшылася з 370 да 312 тыс. км$^2$.

| **Да Расіі** | ← **Андросаўскае перамір'е 1667 г.** → | **Да Рэчы Паспалітай** |
|---|---|---|
| • Смаленшчына<br>• Чарнігаўшчына<br>• Левабярэжная Украіна<br>• Кіеў | | • Віцебшчына<br>• Полаччына |



Правообладатель Издательский центр БГУ

Войны мелі драматычныя вынікі для ВКЛ. Беларускія землі знаходзіліся ў стане эканамічнай разрухі, колькасць насельніцтва скарацілася ў 2 разы, аслабла каралеўская ўлада, значна пашырыліся правы магнатаў. У Рэчы Паспалітай узмацніліся ганенні супраць пратэстантаў, арыян, праваслаўных, што прывяло да скасавання рэлігійнай талерантнасці. Дзяржава ўступіла ў паласу працяглага крызісу.

МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

**З граматы цара Аляксея Міхайлавіча жыхарам Магілёва (15 верасня 1654 г.)**

...яны, магілёўцы, нашай гасударскай міласці ўзрадаваліся і нашай гасударскай літасці да сябе пажадалі, гор. Магілёў здалі і сталіся пад нашаю гасударскаю высокаю рукою і веру згодна са святым евангельскім і беззаганным запаветам нам, вялікаму гасудару... учынілі, не чакаўшы прыходу пад Магілёў... баяр і ваявод... ратнымі людзьмі, на тым, што быці ім пад... высокаю рукой навек неадступным...

**З Магілёўскай хронікі**

...У год 1661. Месяца лютага, 1 дня, на святога Трыфана, высеклі ў Магілёве гараджане-магілёўцы маскоўскі гарнізон... За такую значную паслугу і адвагу для ўсёй Рэчы Паспалітай і пячатку вялікую гораду зацвердзілі... Аднак была тады і таемная змова паміж гараджанамі, што кожны гаспадар ноччу... выкруціць салдату з ружжа крэмень. І калі ўжо надыходзілі час і гадзіна, Пора, бурмістр, меў схаваны пад адзеннем... палаш, а калі ўбачыў, што маскалі гвалтам адбіраюць пірагі ў гарадскіх пякарак, перахрысціўся і пачаў маскоўцаў секчы, а гэтым часам на гвалт у брацкі звон ударылі, стаў галас, разруха, бойка, вайна...

Параўнайце два дакументы. Чаму змянілася стаўленне жыхароў Магілёва да расійскага войска?

## Пытанні і заданні

1. Чаму ў 1654 г. пачалася вайна паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай?
2. Што паслужыла зачэпкай да вайны?
3. Як разгортваліся ваенныя дзеянні ў 1654 г.?
4. Растлумачце прычыны поспеху расійскіх войскаў у 1655 г.


Правообладатель Издательский центр БГУ

5. Чаму Радзівілы прапанавалі унію са Швецыяй?
6. Як ставілася Польшча да вайны ВКЛ з Расіяй?
7. Раскажыце аб ваенных дзеяннях 1660—1661 гг.
8. Пералічыце вынікі і наступствы вайны.
9. Ці апраўдана мянушка Цішайшы цара Аляксея Міхайлавіча?
10. Дайце азначэнне паняцця *шышы*.
11. Запоўніце табліцу «Войны другой паловы XVII ст. на тэрыторыі Беларусі».

| Гады вайны | Удзельнікі (краіны) | Прычыны вайны | Ход вайны | Вынікі вайны |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

## § 14. БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ПАЎНОЧНАЙ ВАЙНЫ 1700—1721 гг.

**Успомніце**

Паміж якімі краінамі адбылася Паўночная вайна 1655—1660 гг.?

**1. Прычыны і пачатак вайны.** У канцы XVII ст. у Еўропе склаўся ваенны саюз, накіраваны супраць Швецыі. У яго першапачаткова ўвайшлі Данія і Расія. Затым да іх далучылася Саксонія. Яе манарх *Аўгуст II* адначасова з'яўляўся каралём Рэчы Паспалітай. У 1699 г. ён падпісаў з Расіяй тайны *Праабражэнскі дагавор*. Краіны, якія выступілі супраць Швецыі, склалі так званы «Паўночны саюз».

| | |
|---|---|
| **Паўночны саюз:** Расія, Данія, Саксонія, Рэч Паспалітая | **Швецыя** |

Удзельнікі **кааліцыі** імкнуліся не дапусціць далейшага ўзвышэння Швецыі ў Паўночнай Еўропе, ліквідаваць яе лідарства на Балтыйскім моры. Да таго ж Саксонія, а разам з ёй і Рэч Паспалітая прэтэндавалі на частку лівонскіх зямель. Расія ў Паўночным саюзе жадала атрымаць для сябе Балтыйскае ўзбярэжжа, каб мець выхад у Балтыйскае мора.



*Кароль Рэчы Паспалітай Аўгуст II Моцны. Мастак Л. дэ Сільвестр. Пасля 1720 г.*

У пачатку **1700 г.** саксонскае войска ўзяло ў аблогу Рыгу, а дацкая армія заняла герцагства Гольштэйн. У адказ шведскі кароль ***Карл XII***, якому



Издательский центр БГУ
Правообладатель Издательский центр БГУ



Шведскі кароль Карл XII

споўнілася толькі 18 гадоў, пры дапамозе англічан і галандцаў аблажыў Капенгаген. Данія была вымушана выйсці з вайны. Няўдала пачалася вайна і для Расіі. Цар Пётр I атрымаў цяжкае паражэнне ад шведаў у бітве *пад Нарвай*. Затым Карл XII вырашыў вывесці з вайны Саксонію і Рэч Паспалітую. У 1701 г. саксонскае войска Аўгуста II было разбіта *пад Рыгай*. Шведскія войскі рушылі на тэрыторыю Рэчы Паспалітай. Карл XII у пачатку 1702 г. заняў Вільню, Гродна, Варшаву. Саксонцы прайгралі шведам яшчэ некалькі бітваў. Беларускія землі сталі арэнай ваенных дзеянняў.

**2. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі.** З прыходам шведскіх войскаў шляхта Рэчы Паспалітай раскалолася на два варожыя лагеры. Вакол Сапегаў аб'ядналіся прыхільнікі Карла XII, а вакол Вішнявецкіх і Агінскіх — прыхільнікі Аўгуста II і Расіі. Кожная з груповак утварыла канфедэрацыі.

*Варшаўская канфедэрацыя*, арганізаваная ў ліпені 1704 г., выбрала каралём Рэчы Паспалітай ***Станіслава Ляшчынскага*** (1704—1709, 1733).



**Гістарычная асоба**

СТАНІСЛАЎ ЛЯШЧЫНСКІ паходзіў са старажытнага шляхецкага роду. У юнацтве аб'ехаў шмат краін Еўропы. З 1699 г. займаў пасаду пазнанскага ваяводы. Выступаў за саюз са Швецыяй. Быў ініцыятарам стварэння Варшаўскай канфедэрацыі.

У адказ прыхільнікі Аўгуста II, аб'яднаныя з 1704 г. у *Сандамірскую канфедэрацыю*, выказаліся за працяг вайны са Швецыяй. Яе прадстаўнікі падпісалі ў жніўні 1704 г. *Нарвенскі саюз* з Расіяй, войскі якой атрымалі права весці ваенныя дзеянні на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Дагавор прадугледжваў сумесную барацьбу супраць Карла XII, грашовую дапамогу ад Расіі на ўтрыманне войска.

З Полацка расійская армія А. Рапніна рушыла на Вільню, у 1705 г. яна заняла Гродна. Шведы ў студзені 1706 г. блакіравалі Гродна. Войскі пад каман-



Правообладатель Издательский центр БГУ

даваннем фельдмаршала Г. Агільві апынуліся ў цяжкім становішчы, не хапала правіянту і фуражу. Расійскім войскам прыйшлося здзейсніць рызыкоўны манеўр: перад пачаткам крыгаходу па падталым лёдзе яны перайшлі Нёман і рушылі ва Украіну.

У лютым — маі 1706 г. шведы спалілі Карэлічы і Мір, разрабавалі Навагрудак, Слонім, Клецк, Слуцк, Пінск, Кобрын, пасля аблог занялі Ляхавічы і Нясвіж.

Летам Карл XII нанёс удар непасрэдна па Саксоніі. Аўгуст II быў вымушаны падпісаць Альтранштацкі мір (1706). Ён адмовіўся ад кароны Рэчы Паспалітай і ад саюзу з Расіяй, абавязаўся выплаціць шведам вялікую **кантрыбуцыю**. Але гэтую дамову не падтрымала Сандамірская канфедэрацыя. Яе лідары на сустрэчы з Пятром І пацвердзілі саюз з Расіяй. Расійскі цар быў названы абаронцам незалежнасці ВКЛ.

У пачатку 1708 г. армія Карла XII выступіла з Польшчы ў напрамку Гродна — Мінск. Пад *мястэчкам Галоўчын* (Бялыніцкі раён Магілёўскай вобласці) 3 ліпеня 1708 г. яна разбіла корпус Рапніна. Агульныя страты расіян склалі больш за тысячу чалавек. Шведы захапілі 10 гармат і вялікую колькасць боепрыпасаў. Пасля заняцця Магілёва Карл XII планаваў накіравацца ў Расію. Але ў дзвюх бітвах каля вёсак Добрае і Раеўка авангард шведскага войска панёс значныя страты, узніклі цяжкасці з забеспячэннем шведскай арміі харчам і фуражом. Вось што пісаў шведскі жаўнер на радзіму: «Наш шлях да месца быў вельмі цяжкі. Дождж ішоў болей за 6 тыдняў, дарогі ўлетку былі горшыя, чым у лістападзе. Адзін Бог ведае, колькі мы намучыліся. Па дарозе не сустрэлі аніводнага чалавека. Я сведчу, што ніхто з нас не змог купіць ані хлеба, ані піва». Карл XII у Магілёве чакаў ваенны абоз з Рыгі, але той рухаўся вельмі марудна. З мэтай далейшага паспяховага наступлення Карл XII вырашыў скарыстаць дапамогу, якую абяцаў украінскі гетман Іван Мазепа, і павярнуў ва Украіну.

Пётр І прыняў рашэнне не прапусціць ваенны абоз да шведскага лагера. 28 верасня **1708 г.** каля *вёскі Лясная* (Слаўгарадскі раён Магілёўскай вобласці) 16-тысячны корпус Адама Левенгаўпта быў разгромлены. Перамога дазволіла расійскаму войску нанесці сакрушальнае паражэнне шведам пад Палтавай (1709). Паранены Карл XII разам з Мазепам уцёк у Турцыю.

Атрымаўшы звесткі пра Палтаўскую бітву, гетман ВКЛ Казімір Сапега, які ваяваў на баку шведаў, загадаў спыніць ваенныя дзеянні. За гэта ён атрымаў амністыю ад расійскага цара. 15-тысячнае войска Сапегаў капітулявала ў лістападзе 1709 г. Шведскі стаўленік Станіслаў Ляшчынскі ўцёк у Памеранію. Затым ён эмігрыраваў у Францыю, дзе атрымаў пенсію ад свайго зяця французскага караля Людовіка XV.

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Бітва каля вёскі Лясная. Гравюра Н. Лармесена з карціны Д. Мартэна-малодшага. 1722—1724 гг.*

Данія, Саксонія і Расія аднавілі Паўночны саюз, а ў 1710 г. Аўгуст II Моцны вярнуўся на трон Рэчы Паспалітай. Але з прычыны шматлікіх супярэчнасцей з Расіяй, асабліва па пытанні кантролю над Ліфляндыяй, Рэч Паспалітая выйшла з вайны. Ваенныя дзеянні перамясціліся на Балтыйскае мора, а свайго флоту ў Рэчы Паспалітай не было.

**3. Бедствы насельніцтва Беларусі.** Паўночная вайна 1700—1721 гг. прынесла жыхарам беларускіх зямель вялікія страты. Знаходжанне замежных войскаў цяжарам лягло на мясцовае насельніцтва. Напрыклад, Віцебскі летапіс паведамляў: «У год 1701. ...У маі... камісар Рыбінскі прыехаў у Віцебск другі раз, а з ім і 1000 саксонскіх рэйтараў [конных воінаў]. Стаяў па мяшчанах у Віцебску дзён 14; вялікая была ад іх гораду шкода, жывадзёрства і самавольства... У год 1708. Барыс Пятровіч Шарамецеў выбраў з віцебскіх мяшчан на сваё войска сем тысяч чвэрцяў збожжа. Капітан Салаўёў з 2500 конных казакоў і калмыкаў месяца верасня, 28 дня выпаліў увесь Віцебск, замкі і горад, ратушу і крамы, Узгор'е, Заручаўе і Задунаўе, чатыры касцёлы і дваццаць цэркваў, а за Заручаўем узяў адкупнога 600 талераў бітых...»


Правообладатель Издательский центр БГУ

Цяжкі лёс напаткаў і Магілёў. У ліпені 1708 г. горад быў заняты войскамі Карла XII. Шведы абрабавалі горад, саджалі мяшчан «у скляпы, марылі голадам, у халодную ваду голых кідалі, на бэльках пад столлю падвешвалі». А ў верасні прыйшлі расійскія войскі. Па загадзе Пятра I Магілёў быў зруйнаваны і спалены, хаця ваеннай патрэбы ў гэтым не было.

Салдаты абедзвюх армій чынілі гвалт і разбой. З гарадоў зноў пачаўся вываз рамеснікаў у Расію. Тысячы беларускіх сялян былі прыцягнуты да будаўніцтва абарончых збудаванняў.

Насельніцтва рабавалі не толькі замежныя арміі, але і войскі Рэчы Паспалітай. Часта наёмныя жаўнеры такім спосабам атрымлівалі сродкі на сваё існаванне. Пачасціліся наезды шляхты на суседнія ўладанні. У іх амаль заўсёды прымалі ўдзел як шведскія, так і расійскія вайскоўцы.

У краіне ўскладнілася рэлігійнае пытанне. Шведы-пратэстанты падтрымлівалі сваіх аднаверцаў і варожа ставіліся да іншых веравызнанняў. Храмы ў Лідзе, Вілейцы, Докшыцах, Магілёве былі спалены і разрабаваны. У адказ сойм Рэчы Паспалітай 1717 г. значна абмежаваў правы пратэстантаў.

Расія, наадварот, выступала ў абарону праваслаўных, а ўніятаў разглядала як здраднікаў веры. Расійскія войскі спустошалі базыльянскія манастыры, гвалтоўна вывозілі манахаў, замест уніяцкіх прызначалі праваслаўных святароў. Улетку 1705 г. у Полацкім Сафійскім саборы пры непасрэдным удзеле Пятра I было забіта некалькі манахаў базыльянскага ордэна. Па загадзе цара целы забітых манахаў спалілі, а попел кінулі ў Дзвіну. Полацкі базыльянскі манастыр быў закрыты, а Сафійскі саборператвораны ў вайсковы склад. У 1710 г. у выніку выбуху пораху гэты храм быў амаль цалкам знішчаны.

**4. Вынікі і наступствы вайны.** У **1721 г.** на тэрыторыі Фінляндыі быў падпісаны *Ніштацкі мір*. Расія далучыла да сябе Ліфляндыю, Эстляндыю, Інгрыю, частку Карэліі. Пётр I атрымаў для сваёй краіны выхад у Балтыйскае мора. Рэч Паспалітую нават не запрасілі на перагаворы, што сведчыла аб яе нямдольнасці праводзіць самастойную знешнюю палітыку. Швецыя заключыла мір з Саксоніяй толькі ў 1729 г., а з Рэччу Паспалітай яшчэ пазней — у 1733 г.

Гэта быў пачатак канца. З гэтага часу Рэч Паспалітая, па словах сучаснікаў, ператварылася ў заезны двор і карчму для іншаземных войскаў, дзе «яны, як правіла, забываліся пра плату».

Вынікі вайны для беларускіх зямель мелі трагічны характар. Насельніцтва скарацілася на 700 тыс. чалавек, а гэта амаль кожны трэці жыхар. З аднаго боку, шведы «катавалі, палілі і вешалі мужыкоў», з другога боку, бясчынствавала царскае войска. Асабліва сяляне і мяшчане былі незадаволены пастоем казакоў і калмыкаў.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Паўсюдна панавалі разбурэнні, галеча і голад. У такіх умовах пачалася эпідэмія чумы, ад якой памерла каля 34 тыс. чалавек. Палеткі былі не апрацаваны, сядзібы і вёскі пакінуты мясцовымі жыхарамі. Напрыклад, на Гродзеншчыне пуставала 3/4 сялянскай ворнай зямлі. Шклоўскае графства страціла каля 90 % жыхароў. Зноў перад народнымі нізамі паўстала цяжкая задача адраджэння гаспадаркі.

МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

**З Магілёўскай хронікі**

...У год 1708... Шведскі кароль, не задаволіўшыся такімі правіянтамі і кантрыбуцыйнымі грашыма, сам аб'ехаў найлепшыя цэрквы, але мала ўбачыў у іх серабра (бо лепшае было пахавана ў зямлю)... загадаў, каб тут жа выдалі ад царквы некалькі соцень фунтаў серабра (бо ў шведскім лагеры заўсёды чаканілася шведская манета), і прыгразіў, што, калі не выдасць, загадае ўсё зрабаваць, а горад спаліць. І так гараджане, застаючыся ў руках суровага непрыяцеля, мусілі выдаць царкоўнага серабра...

? Аб чым сведчыць прапанаваны фрагмент?

## Пытанні і заданні

1. Чаму пачалася Паўночная вайна 1700—1721 гг.?
2. Якія краіны ўвайшлі ў антышведскі саюз?
3. Вызначце мэты ўдзельнікаў вайны.
4. Раскажыце аб адносінах шляхты да Паўночнай вайны.
5. Чаму Пётр І назваў бітву пад Лясной «маці Палтаўскай баталіі»?
6. Як паўплывалі ваенныя дзеянні на мясцовае насельніцтва?
7. Пералічыце вынікі і наступствы вайны.
8. Прапануйце верагодны варыянт развіцця падзей на выпадак паражэння Паўночнага саюза ў вайне.
9. Дайце азначэнні паняццяў: *кааліцыя, кантрыбуцыя*.
10. Запоўніце табліцу «Паўночная вайна 1700—1721 гг. на тэрыторыі Беларусі».

| Удзельнікі (краіны) | Прычыны вайны | Ход вайны | Вынікі вайны |
|---|---|---|---|
| | | | |

Издательский центр БГУ



Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 15. БАРАЦЬБА МАГНАЦКІХ ГРУПОВАК

**Успомніце**

Хто такія магнаты? Чым яны адрозніваліся ад іншых груп шляхты?

**1. Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай.** Шырокія правы шляхецкага саслоўя былі спецыфічнай, своеасаблівай з'явай у еўрапейскай гісторыі. Шляхта лічыла, што палітычны лад Рэчы Паспалітай самы лепшы і дасканалы ў параўнанні з іншымі краінамі, і гэтым вельмі ганарылася. Любая спроба рэформ або імкненне караля ўзмацніць сваю ўладу ўспрымаліся як замах на шляхецкія вольнасці. Таму на сойме 1669 г. была прынята пастанова, якая забараняла ў краіне новаўвядзенні. У ёй гаварылася: «Усялякае новаўвядзенне ў Рэчы Паспалітай можа быць небяспечным і прывядзе да вялікіх хваляванняў. Неабходна сойму сачыць за тым, каб нічога не падвяргалася змяненням».

Агульнадзяржаўны сойм паступова страчваў сваё значэнне. Выкарыстоўваючы права «ліберум вета», шляхецкія паслы пастаянна зрывалі яго пасяджэнні. За 1652—1764 гг. з 55 соймаў Рэчы Паспалітай 48 скончылі сваю працу безвынікова. У кіраванні ўнутранымі справамі Рэчы Паспалітай вырасла



*Соймік перад касцёлам. Малюнак Я. П. Норбліна*

Правообладатель Издательский центр БГУ

значэнне павятовых шляхецкіх соймікаў, якім было перададзена права збіраць падаткі і распараджацца імі. Ва ўмовах частага зрыву соймаў, асабліва ў XVIII ст., соймікі прысвойвалі сабе функцыі заканадаўчай і судовай улады, не лічыліся з пастановамі сойма. Рэч Паспалітую ахапіў палітычны крызіс.

Перадумовы палітычнага крызісу Рэчы Паспалітай

- Права «ліберум вета»
- Выбары караля
- Шляхецкія вольнасці

Улада паступова пераходзіла да магнатаў, якія падпарадкоўвалі сабе збяднелую шляхту. Магнаты стваралі ўласныя войскі (так званую *надворную міліцыю*), будавалі крэпасці. Па колькасці жаўнераў і зброі іх арміі нават пераўзыходзілі дзяржаўнае войска. Войны Рэчы Паспалітай з Расіяй і Швецыяй пашырылі залежнасць каралёў ад магнатаў. А сваркі і сутычкі паміж магнатамі сталі звычайнай з'явай.

У сярэдзіне XVII ст. узвысіўся магнацкі род Радзівілаў. Аб гэтым сведчыць Кейданская унія, заключаная імі са Швецыяй. Ім супрацьстаялі Сапегі і Пацы. Затым, у другой палове 1670-х — першай палове 1680-х гг., сталі дамінаваць Пацы, якія занялі ў ВКЛ вышэйшыя дзяржаўныя пасады і валодалі вялікай колькасцю зямлі. З імі канфліктавалі Сапегі і Агінскія.

**2. Феадальная вайна 1697—1702 гг.** Ужо з другой паловы 1680-х гг. у ВКЛ узвышаецца магнацкі род Сапегаў. Пасаду вялікага гетмана заняў Казімір Сапега, а падскарбіем быў яго брат Бенядзікт, празваны «літоўскім Макіявелі». Сапегаў першапачаткова падтрымаў кароль Рэчы Паспалітай ***Ян III Сабескі***. Яму на той час патрэбна была палітычная процівага магнацкаму роду Пацаў.



**Гістарычная асоба**

ЯН III САБЕСКІ (1629—1696) скончыў Кракаўскі універсітэт, шмат падарожнічаў па Еўропе. Мецэнат, апякун навукі і мастацтва. Ён вядомы сваімі ваеннымі поспехамі — перамог туркаў і татар у Хацінскай бітве 1673 г., разграміў войска Асманскай імперыі ў бітве пад Венай 1683 г. Яго называлі «каралём-сарматам».



Правообладатель Издательский центр БГУ

Сапегі, атрымаўшы ад Яна III Сабескага высокія пасады, умацавалі сваё становішча і выступілі супраць караля, маючы намер узначаліць самастойнае Княства. Сваю палітыку яны праводзілі гвалтоўна, з задушэннем апазіцыі. Гэта выклікала незадаволенасць большасці шляхты краіны. Галоўным патрабаваннем праціўнікаў Сапегаў было ўраўнаванне правоў шляхты ВКЛ з правамі польскай шляхты. Але гэта прадугледжвала абмежаванне паўнамоцтваў гетмана, падскарбія і іншых міністраў ВКЛ, што непасрэдна закранала Сапегаў. У **1697 г.** супрацьстаянне перарасло ў сапраўдную вайну. Паколькі яна адбывалася ўнутры краіны, то яе называлі «хатняй» вайной.



*Вялікі гетман ВКЛ Казімір Сапега. Невядомы мастак. XVIII ст.*

Падчас вайны рабаваліся вёскі, разбураліся гарады. Зыход вайны вырашыла паражэнне Сапегаў у бітве *пад Алькенікамі* (каля Вільні) 18 лістапада 1700 г. Сапегі тады стварылі казацка-сялянскія атрады з падуладнага насельніцтва. У 1701—1702 гг. баі паміж імі і шляхецкімі войскамі адбыліся ў раёне Дуброўна, Старога Быхава, Галоўчына. Але ранейшая магутнасць магнацкага роду Сапегаў была падарвана.



*Герб «Ліс», якім карыстаўся род Сапегаў*

**3. Нарастанне расійскага ўплыву ў Рэчы Паспалітай.** У 1697 г. новым каралём Рэчы Паспалітай быў выбраны саксонскі (нямецкі) манарх Аўгуст II Моцны. Для яго Паўночная вайна 1700—1721 гг. была сродкам вырашэння асабістых памкненняў. Ён жадаў ператварыць Рэч Паспалітую ў спадчыннае ўладанне Саксоніі. Дзякуючы падтрымцы Расіі Аўгуст II паспрабаваў надаць сваёй уладзе неабмежаваны характар. Для гэтага на тэрыторыю Рэчы Паспалітай ён увёў саксонскае войска. Польская шляхта, незадаволеная ваенным пастоем, грабяжамі, а таксама забойствам немцамі двух палякаў, узнялася супраць караля. У ВКЛ яе падтрымалі магнаты Пацы і Агінскія. На баку караля выступіў гетман Станіслаў Дэнгаф. У 1716 г. на з'ездзе шляхты Княства была ўтворана *Віленская*



*Герб «Газдава», якім карыстаўся род Пацаў*



Правообладатель Издательский центр БГУ

*канфедэрацыя*. Атрады канфедэратаў змагаліся з каралеўскімі і саксонскімі войскамі на ўсёй тэрыторыі Рэчы Паспалітай.

У канфлікт умяшалася Расія, якая ўвяла ў Рэч Паспалітую свае войскі. Каб прымірыць варожыя бакі, расійскі пасол князь Рыгор Далгарукі выступіў пасрэднікам у перамовах паміж каралём і шляхтай. У выніку ў Варшаве было падпісана пагадненне, якое зацвердзіў сойм **1717 г.** Паколькі паслы на працягу шасці гадзін моўчкі слухалі ўмовы замірэння і пагадзіліся з імі, то ў гісторыі яго называюць *першым «нямым» соймам*. Кароль павінен быў вывесці з Рэчы Паспалітай саксонскае войска, а шляхта — распусціць канфедэрацыі. Колькасць войска скарачалася ў ВКЛ да 6 тыс. жаўнераў, а ў Польшчы — да 18 тыс. жаўнераў. Зразумела, што абараніць незалежнасць дзяржавы гэтае войска не магло.

**4. Вайна за «Польскую спадчыну» (1733—1739).** Пасля смерці Аўгуста II Францыя, Іспанія і Сардзінія прапанавалі на трон Рэчы Паспалітай кандыдатуру былога караля Станіслава Ляшчынскага. Унутры Рэчы Паспалітай яго падтрымалі магнаты Патоцкія, Браніцкія, Радзівілы. На Варшаўскім сойме ў верасні 1733 г. большасцю шляхты Станіслаў Ляшчынскі быў абраны каралём. Але супраць выступілі Расія і Аўстрыя. Гэтыя краіны хацелі бачыць манархам Рэчы Паспалітай сына Аўгуста II Фрыдрыха Аўгуста. Таго ж жадала і магнацкая групоўка пад назвай *«фамілія»*, утвораная магнатамі Чартарыйскімі і Масальскімі.



*Кароль Рэчы Паспалітай Аўгуст III. Мастак Л. дэ Сільвестр. 1737 г.*

Расія накіравала ў Варшаву 70-тысячнае войска. Кароль Станіслаў Ляшчынскі ўцёк у Гданьск, які быў абложаны расійскімі войскамі і хутка капітуляваў. Затым асноўныя ваенныя дзеянні разгарнуліся на тэрыторыі Польшчы, Германіі, Аўстрыі і Італіі. Выкарыстоўваючы сілу, Расія прымусіла шляхту ў 1733 г. абраць каралём Фрыдрыха Аўгуста. Ён увайшоў у гісторыю Рэчы Паспалітай як ***Аўгуст III***.

Вайна за «Польскую спадчыну» завяршылася падпісаннем у 1738 г. *Венскага міру* паміж Аўстрыяй і Францыяй, да якога ў наступным годзе далучыліся Расія і Рэч Паспалітая. Станіслаў Ляшчынскі ў другі раз адмовіўся ад трона і зноў выехаў у Францыю, дзе атрымаў у пажыццёвае ўладанне Латарынгію. Там Ляшчынскі разгарнуў шырокае будаўніцтва, адкрыў вайсковую школу для выхадцаў з Рэчы Паспалітай, займаўся філасофіяй, пісаў навуковыя працы.


Правообладатель Издательский центр БГУ



*Аблога Гданьска расійскім войскам у 1734 г. Невядомы мастак*

Вайна паказала знешнепалітычную слабасць Рэчы Паспалітай і сведчыла пра дыпламатычны поспех Расійскай імперыі. Але трэба ўлічыць і тое, што панаванне шляхты дазволіла пазбегнуць усталявання ў Вялікім Княстве Літоўскім дэспатычнай улады.

Пры Аўгусце III спачатку змагалася кааліцыя Чартарыйскіх, Сапегаў, Масальскіх, Салагубаў супраць дамінавання Радзівілаў, а потым Чартарыйскія з Радзівіламі. Усе соймы, за выключэннем сойма 1736 г., былі сарваны. На павятовых сойміках звычайнай з'явай сталі бойкі і ўзброеныя сутычкі паміж шляхтай, забойствы палітычных праціўнікаў. Сам кароль большую частку жыцця праводзіў у Саксоніі, дзе бавіў час паляваннем. Ён кіраваў краінай з дапамогай фаварытаў, у прыватнасці непапулярнага сярод палякаў Генрыха Бруля. У знешняй палітыцы Аўгуст III абапіраўся на Расію.

Такім чынам, да сярэдзіны XVIII ст. Рэч Паспалітая захавала сваю тэрытарыяльную цэласнасць — межы яе засталіся незакранутымі. Але рэальны *суверэнітэт* краіны (незалежнасць у знешняй і ўнутранай палітыцы) быў моцна падарваны. У дзяржаве паглыбляўся палітычны крызіс, соймы пастаянна зрываліся, што паралізавала дзейнасць цэнтральнай улады.

МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

**З «Кароткага нарыса гісторыі Беларусі» У. М. Ігнатоўскага (1919 г.)**

...На Беларусь прыйшла рэспубліка паноў, якіх ніхто не мог утрымаць. Уся ўлада была ў іх руках. Яны мелі ў сваіх руках сойм, соймікі, караля, цэнтральную і мясцовую адміністрацыю і ўзброеную сілу...

Як вы разумееце выказванне вядомага беларускага гісторыка?

Правообладатель Издательский центр БГУ

## Пытанні і заданні

1. Чаму з другой паловы XVII ст. Рэч Паспалітая апынулася ў стане палітычнага крызісу?
2. Хто фактычна кіраваў краінай пры аслабленні каралеўскай улады?
3. Што вы ведаеце пра «хатнюю» вайну?
4. Ці ўдалося Аўгусту II усталяваць абсалютную каралеўскую ўладу ў Рэчы Паспалітай? Чаму?
5. Раскажыце аб вайне за «Польскую спадчыну». Аб чым сведчаць вынікі гэтай вайны?
6. Ахарактарызуйце караля Аўгуста III як палітыка і чалавека.
7. Дайце азначэнні паняццяў: *«нямы» сойм, суверэнітэт*.
8. Запоўніце табліцу «Супрацьстаянне магнацкіх груповак у ВКЛ».

| Перыяд барацьбы | Дамінуючая групоўка | Апазіцыйная групоўка |
|---|---|---|
| | | |

# § 16. БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVII — ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVIII ст.

## Успомніце

Якія былі асноўныя і дадатковыя павіннасці сялян пасля валочнай памеры?

**1. Заняпад вёскі.** Шматлікія войны, якія адбыліся на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVII ст., прынеслі велізарныя разбурэнні і знішчылі значную частку насельніцтва. Колькасць жыхароў у беларускіх землях скарацілася амаль у 2 разы. (Прааналізуйце статыстычныя звесткі, прыведзеныя ў табліцы.)

*Табліца*

**Змяншэнне насельніцтва ў Беларусі за 1648—1667 гг.**

| Ваяводствы | Колькасць жыхароў да вайны | Колькасць жыхароў пасля вайны | Змяншэнне насельніцтва | % |
|---|---|---|---|---|
| Навагрудскае | 499 112 | 322 429 | 176 683 | 35,4 |
| Брэсцкае | 509 736 | 276 016 | 233 720 | 45,8 |
| Мінскае | 284 080 | 108 548 | 175 532 | 61,8 |
| Полацкае | 185 632 | 51 953 | 133 679 | 72 |


Правообладатель Издательский центр БГУ
Издательский центр БГУ

*Заканчэнне табл.*

| Ваяводствы | Колькасць жыхароў да вайны | Колькасць жыхароў пасля вайны | Змяншэнне насельніцтва | % |
|---|---|---|---|---|
| Віцебскае | 621 080 | 198 045 | 423 035 | 68,1 |
| Мсціслаўскае | 110 152 | 31 778 | 78 374 | 71,1 |
| ***Усяго:*** | 2 209 792 | 988 769 | 1 221 023 | 55,2 |

На сойме Рэчы Паспалітай 1661 г. адзначалася, што разбурэнні ахапілі амаль усю тэрыторыю Беларусі. Напрыклад, Гродзенскі павет быў «ператвораны ў руіны і пераважная частка яго спалена». Ашмянскі і Браслаўскі паветы «ўшчэнт разбураны ворагам». Найбольш пацярпелі ад ваенных дзеянняў вёскі і сяляне каля Полацка, Мсціслава, Оршы, Мінска, Рэчыцы. Адносна меншыя разбурэнні зазналі заходнія паветы, у прыватнасці Лідскі, Слонімскі і Ваўкавыскі.

Да 1700 г. колькасць жыхароў Беларусі павялічылася да 2,2 млн чалавек, але новыя людскія страты прынесла Паўночная вайна 1700—1721 гг. Колькасць насельніцтва зноў скарацілася да 1,5 млн чалавек. У прыватнасці, на Магілёўшчыне вёска моцна абязлюдзела. У некаторых паселішчах засталося па тры-чатыры чалавекі.

Ваенныя дзеянні і змяншэнне колькасці насельніцтва прывялі да павелічэння *пусташаў* (неапрацаванайворнай зямлі). Толькі ў раёне Крычава ў 1712 г. з 279 валок стаялі недагледжанымі 204. У сялян скарачалася колькасць свойскай жывёлы. Напрыклад, у Копыскім графстве ў 1710 г. засталося толькі 279 коней. Тое ж было характэрна і для заходняй часткі беларускіх зямель. Так, на Кобрыншчыне не мела коней і валоў $^1/_3$ частка сялянскіх двароў.

**2. Аднаўленне сельскай гаспадаркі.** Аднаўленне разбуранай вайной гаспадаркі ішло марудна. Феадалы (паны) імкнуліся захаваць фальваркова-паншчынную сістэму ў тых месцах, дзе засталося больш насельніцтва. Гэта адбывалася ў заходняй і цэнтральнай частках Беларусі. Там засталіся зручныя гандлёвыя шляхі ў Заходнюю Еўропу.



*Ворыва, сяўба, баранаванне. Малюнкі з інвентара Бранчыцкага ключа Слуцкага княства. 1682 г.*

Издательский центр БГУ



Правообладатель Издательский центр БГУ

На ўсходзе беларускіх зямель, дзе разбурэнні былі большымі і катастрафічна не хапала рабочых рук, феадалы сталі пераводзіць сялян на чынш. Гэта давала селяніну большую самастойнасць і прываблівала новых пасяленцаў на пусташы. Увядзенне чыншу пачалося з каралеўскіх эканомій. **Эканоміяй** называлі землі, прыбыткі з якіх ішлі на патрэбы манарха Рэчы Паспалітай і дзяржаўнага скарбу. На беларускіх землях іх налічвалася пяць: Брэсцкая, Віцебская, Гродзенская, Кобрынская, Магілёўская эканоміі.

Затым на чынш сталі пераводзіць сялян у староствах, царкоўных і прыватных уладаннях. *Староствамі* лічыліся дзяржаўныя землі, якія даваліся феадалам за службу ў часовае карыстанне. Трымальнікі староств павінны былі $^{1}/_{4}$ частку прыбытку аддаваць на ўтрыманне войска. Аднак перавод сялян на чынш меў часовы характар. З паступовым аднаўленнем гаспадаркі феадалы сталі зноў пераводзіць іх на паншчыну.

Вялікая колькасць неапрацаванай зямлі прымушала паноў у часы ваенных разарэнняў даваць сялянам дадатковую да асноўнага надзелу зямлю. Яе называлі па-рознаму: «прыёмная», «лазовая», «бакавая». Павіннасці з дадатковай зямлі выконваліся ў меншым памеры. У мірныя гады доля прыёмнай зямлі памяншалася.

Пашырэнне пасяўных плошчаў ажыццяўлялася за кошт пусташаў і лясоў. Высечка лесу пад ворыва тлумачыцца тым, што новыя землі давалі лепшы ўраджай, чым старыя надзелы. Сяляне пры гэтым атрымлівалі лес на ўзвядзенне жылых і гаспадарчых будынкаў, а таксама на дровы.

З 1720-х гг. паляпшаецца гаспадарчае становішча сялян. Павялічваецца колькасць двароў у вёсках. Нават з'явіліся новыя населеныя пункты. Гаспадары абзаваліся неабходнымі прыладамі працы, свойскай жывёлай. Але сустракаліся на вёсках *бабылі*, *халупнікі*, якія не мелі зямлі, гаспадаркі і маёмасці. Яны былі вымушаны наймацца на працу да багацейшых.



*Уборка збожжа, малацьба, веянне. Малюнкі А. Даманскага ў інвентары Брэсцкай эканоміі. 1742 г.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

**3. Сялянскія павіннасці.** За кошт сялян карміліся дзяржава, шляхта, войска і царква. На іх карысць прыгонныя выконвалі шматлікія павіннасці. Да галоўных з іх адносіліся паншчына, чынш і дзякла. Па меры аднаўлення гаспадаркі феадалы сталі павялічваць адпрацовачную павіннасць за карыстанне зямельным надзелам. Да сярэдзіны XVIII ст. паншчына дасягнула 12 і болей дзён на тыдзень з валокі. А ў маёнтку Блювенічы Лідскага павета, які належаў Радзівілам, паншчына складала аж 24 дні на тыдзень з валокі.

Грашовы аброк быў распаўсюджаны на ўсходзе Беларусі і ў каралеўскіх эканоміях. Натуральны аброк, які аддавалі сяляне, па-ранейшаму складаўся з жыта, аўса, гусей, курэй, сена, пражы і інш.

Да дадатковых павіннасцей адносіліся ўжо вядомыя вам згоны. Таксама на сялян ускладалася падводная павіннасць. Сваім канём і падводай неабходна было перавезці панскі груз да рачных прыстаней або ў горад. Да адпрацовачных павіннасцей адносілася *старажоўшчына*. На яе выходзілі па чарзе 2—4 чалавекі з вёскі на цэлы тыдзень, каб выканаць гаспадарчыя работы ў маёнтку. *Начную варту* (ахову маёнтка) прыгонныя выконвалі па чарзе. Сяляне рамантавалі і будавалі дарогі, масты, рачныя грэблі, фальварковыя будынкі. Падобная павіннасць атрымала назву *шарваркаў*.

Уладальнікі маёнткаў прымушалі сялян сплаўляць лес і іншыя грузы ў прыбалтыйскія парты, удзельнічаць у аблавах падчас панскага палявання, у лоўлі рыбы для панскага стала, у раскарчоўцы лесу. Сельская грамада вылучала пастуха для памешчыцкага статка. Жанчыны працавалі на панскіх агародах, мылі бялізну для двара, ткалі.

Сяляне выконвалі і грашовыя плацяжы. За права карыстацца зямлёй яны плацілі чынш. Яго памер таксама павялічыўся. Сяляне на захадзе Беларусі плацілі прыкладна 150 грошаў з валокі, а на ўсходзе — 480 грошаў. Да грашовых падаткаў адносіліся наступныя: *жарнавое* — за права мець свае жорны для памолу збожжа; *угайнае* (ялавічнае, вепраўшчызна) — за карыстанне лесам феадала; *чопавае* — за дазвол на выраб алкагольных напояў; *куніца* — за права выйсці замуж у іншую валасць. З 1649 г. кожны сялянскі двор, а таксама мяшчане і дробная шляхта плацілі дзяржаве **падымнае**. Памер гэтага падатку ўстанаўліваўся соймам штогадова. Ён складаў 0,5 злотага (15 грошаў) у год. Напрыклад, у 1650 г. з дыма плацілі 8 злотых, а ў 1653 г. — 6 злотых.

На ўтрыманне войска дзяржаўныя сяляне плацілі *гіберну*, а прыватнаўласніцкія — *рэйтаршчыну*. За перыяд з 1676 да 1775 г. ваенны падатак на тэрыторыі Княства збіраўся штогод.

Практычна існавала каля 120—140 сялянскіх павіннасцей. Яны былі запісаны ў **інвентарах** — апісаннях феадальных уладанняў. Гэта не значыць,


Правообладатель Издательский центр БГУ

што ўсе павіннасці прыходзіліся на кожны маёнтак. Але арандатары, зазвычай прадстаўнікі беззямельнай шляхты, і адміністрацыя маёнткаў (**цівуны**) парушалі інвентарныя нормы, што выклікала незадаволенасць сялян.

Такім чынам, у другой палове XVII — пачатку XVIII ст. у выніку шматлікіх войнаў адбыўся заняпад беларускай вёскі. Паступовае адраджэнне сельскай гаспадаркі беларускіх зямель пачалося з 1720-х гг. і было абумоўлена самаадданай працай сялянства.

МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

**З інвентара маёнтка Харошчы Слонімскага павета (1631 г.)**

З кожнай паўвалокі аселай аднаму чалавеку 3 дні на тыдзень працаваць, але падчас жніва з паўвалокі службовай павінны працаваць 4 дні па 2 чалавекі, а 2 свабодных дні ім захоўваюцца. ...яны павінны несці старажоўшчыну на гаспадарскім двары па аднаму чалавеку на тыдзень з аселай валокі. Жонкі іх павінны працаваць на ўсякай праполцы, на зборы гародніны, а таксама прасці панскі лён і воўну. Палову мёду з вулляў сялянскіх, палявых і лясных борцей яны павінны здаваць пану...

? Якія павіннасці выконвалі сяляне маёнтка Харошчы? Да якой катэгорыі яны адносіліся?

## Пытанні і заданні

1. Дакажыце, што ў другой палове XVII — пачатку XVIII ст. на беларускіх землях назіраўся эканамічны заняпад.
2. Якія фактары выклікалі рэзкае скарачэнне колькасці насельніцтва?
3. Якім чынам феадалы выходзілі з эканамічных цяжкасцей?
4. Параўнайце працэс аднаўлення сельскай гаспадаркі на захадзе і на ўсходзе Беларусі.
5. Ахарактарызуйце асноўныя і дадатковыя павіннасці сялян.
6. Дайце азначэнні паняццяў: *пусташы, эканомія, староства, старажоўшчына, начная варта, шарваркі, жарнавое, угайнае, чопавае, куніца, падымнае, гіберна, рэйтаршчына, інвентары.*
7. Запоўніце табліцу «Сялянскія павіннасці ў другой палове XVII — пачатку XVIII ст.».

| Павіннасць | Сутнасць павіннасці | Памер павіннасці | Форма выканання павіннасці |
|---|---|---|---|
| | | | |



Правообладатель Издательский центр БГУ

Издательский центр БГУ

# § 17. СЯЛЯНСКІ РУХ

**Успомніце**

Што такое эканомія і староства?

**1. Формы антыфеадальнай барацьбы.** Цяжкія ўмовы жыцця выклікалі ўзброеныя выступленні сялян супраць феадалаў, арандатараў маёнткаў і войскаў, якія размяшчаліся на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Прыгонныя, даведзеныя да галечы, імкнуліся абараніць свой дабрабыт і жыццё. Праяўлялася гэта ў скаргах, уцёках, адмове ад выканання павіннасцей, у адкрытых выступленнях.

Сяляне нападалі на панскія маёнткі, падпальвалі іх, самавольна высякалі лес, палявалі ў ім, хаця гэта было строга забаронена. Такія выступленні часам завяршаліся забойствам шляхціца, панскага цівуна ці арандатара. Напрыклад, у 1661 г. адбыўся сялянскі бунт ва ўладаннях езуіцкага калегіума ў Брэсцкім ваяводстве. Прыгонныя сяляне напалі на маёнтак Шчытнікі, спалілі ўсе фальварковыя будынкі, высеклі панскі лес і звезлі яго да сваіх хат. Пры гэтым яны забілі мясцовага войта.

Падобныя падзеі назіраліся ў Гродзенскай каралеўскай эканоміі. Варшаўскі сойм 1662 г. нават прыняў спецыяльную пастанову, якая патрабавала прыгаворваць сялян-бунтаўшчыкоў да смяротнага пакарання. Але гэта не дапамагло. У 1670-я гг. сялянскія хваляванні былі адзначаны на Полаччыне, Віцебшчыне і Аршаншчыне.

Жорсткія сутычкі адбываліся ў канцы XVII ст. на Крычаўшчыне. У 1690 г. узброенае выступленне ахапіла вёскі Дубейцы і Крывая Ніва. Сяляне ўзняліся супраць жаўнераў гетманскага войска, якое знаходзілася на пастоі ў Дубейцах. Ноччу сяляне напалі на салдат, якія спалі ў пуні. Кіраваў атрадам прыгонных селянін Макар Арцюхоў з сынамі. Жаўнераў лупцавалі дубовымі каламі, ручніцамі, прыгаворваючы пры гэтым: «Навошта да нас прыехалі, хопіць кроў нашу піць». Салдат звязалі і зачынілі на ноч у лазні. Раніцай яны з ганьбаю былі выгнаны з Дубейцаў. Намер шляхты пакараць сялян правапіўся. Дубейцаўцы аб'ядналіся з сялянамі суседняй вёскі Крывая Ніва і далі адпор коннаму атраду. Жаўнеры не пасмелі больш наведвацца ў гэтыя вёскі.

Больш значнае выступленне ў Крычаўскім старостве адбылося ў 1696 г. Яно таксама было выклікана самавольствам з боку жаўнераў магната Рыгора Агінскага. Даведзеныя да адчаю мяшчане і сяляне са зброяй у руках выйшлі на барацьбу супраць салдат. Выступленне адбылося ў самім Крычаве. На цэнтральнай плошчы і каля замка разгарнулася сапраўдная бітва. Пасля яе засталіся дзясяткі забітых і параненых з абодвух бакоў.

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Скарга сялян Крычаўскага старостава, адрасаваная Г. Радзівілу*

У снежні 1747 г. са зброяй у руках супраць феадалаў выступілі сяляне Гомельскага староства. Гетман Міхал Казімір Радзівіл у спешным парадку накіраваў туды свае войскі. Каб задушыць сялянскія хваляванні ў Чачэрскім староства, у жніўні 1748 г. таксама была выкарыстана ваенная сіла.

**2. Крычаўскае паўстанне (1740—1744).** У другой палове XVII ст. Крычаўскае староства было падаравана каралём магнатам Радзівілам. Тыя здалі яго ў арэнду часовым трымальнікам. Арандатары за кароткі тэрмін імкнуліся сабраць з сялян як мага больш грошай. Для гэтага яны спаганялі чынш большы, чым прадугледжвалася інвентарамі, абкладвалі сялян рознымі грашовымі падаткамі, прымушалі працаваць без аплаты, патрабавалі натуральны аброк звыш усталяванага, чынілі перашкоды сялянскаму гандлю, рабавалі і знявечвалі сялян. Справа дайшла да таго, што арандатары забралі ў сялян восенню 1739 г. усё насенне. Большасць двароў не маглі пасеяць азімае жыта. Паўстала пагроза голаду.

Вясной 1740 г. сяляне адмовіліся выконваць распараджэнні арандатараў. Іх падтрымаў войт вёскі Селішча ***Васіль Вашчыла***. На чале сялянскага атрада ён выгнаў найбольш жорсткіх арандатараў. Галоўныя з іх, браты Гдаль і Шмуйла Іцкавічы, калі зразумелі, што сялянскі рух набірае моц, уцяклі з Крычава.

**Гістарычная асоба**

ВАСІЛЬ МАЦВЕЕВІЧ ВАШЧЫЛА (1690—1744) паходзіў з сялян вёскі Лобжа на Крычаўшчыне. Неаднаразова прыносіў Гераніму Радзівілу ў Варшаву скаргі сялян на мясцовых арандатараў, за што быў зняволены. Кіраваў паўстаннем. Пасля паражэння ад шляхецкіх войскаў збег у Расійскую імперыю, дзе неўзабаве памёр.

Многія пытанні кіравання староствам Васіль Вашчыла вырашаў са сваімі паплечнікамі. Яны здавалі ў арэнду, як і раней, прамысловыя прадпрыемствы і корчмы. Новых арандатараў шукалі сярод гараджан, дробнай шляхты, заможных сялян. Захавалася звыш 20 новых арэндных дагавораў. Арандатарам прадпісвалася пад пагрозай пакарання не займацца вымаганнем.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Сяляне па-ранейшаму плацілі падаткі Гераніму Радзівілу. Грошы ад арэнды таксама перадаваліся магнату. Гэта сведчыць аб рамантычных уяўленнях беларускіх сялян пра «добрага» пана. Але новыя арандатары, на сумленнасць якіх разлічваў Вашчыла, аказаліся таксама жорсткімі прыгнятальнікамі працоўнага люду. Радзівіл, які ў вачах сялян паўставаў нейкім панам-дабрадзеем, раздзяляць уладу з «халопамі» не збіраўся.



*Геранім Радзівіл. Мастак Я. Весель. Каля 1746 г.*

У канцы 1743 г. Крычаўскае староства знаходзілася пад кантролем сялян. Іх войска вырасла да 2 тыс. чалавек. Гэта напалохала Гераніма Радзівіла. У пачатку студзеня 1744 г. ён загадаў падавіць выступленне. Некалькі соцень салдат з гарматамі і казацкая конніца ўвайшлі ў Крычаў. 15 студзеня 1744 г. горад быў няўдала атакаваны паўстанцамі на чале з Вашчылам. Але сяляне не змірыліся. Каля вёскі Царковішча яны збіралі сілы. Васіль Вашчыла і яго паплечнікі — Іван Карпач, Стэсь Бачко, Васіль Вецер — выпрацавалі план будучых баявых аперацый. Паўстанцы вырашылі ў другі раз атакаваць Крычаў. Пра такія намеры дазналіся карнікі. У ноч на 26 студзеня княжацкі атрад наблізіўся да лагера паўстанцаў. Калі пачало віднець, радзівілаўскае войска навалілася на сялян, якія нават не змаглі арганізаваць абарону. Шмат іх загінула на полі бою, частка трапіла ў палон, 16 паўстанцкіх кіраўнікоў прыгаварылі да пакарання смерцю.

Вынікам барацьбы прыгонных стала паслабленне феадальнага прыгнёту ў старостве. Уладальнік Крычаўшчыны замяніў цяжкія работы на лясных промыслах грашовым падаткам, зняў шэраг абмежаванняў на сялянскі гандаль, адмовіўся ад здачы староства ў арэнду.

**3. Паўстанне на Каменшчыне (1754—1756).** Буйное ўзброенае выступленне сялян у 1750-я гг. адбылося ва ўладаннях каталіцкай царквы на Каменшчыне (Мазырскі павет). Хваляванні тут пачаліся яшчэ ў 1736 г. і працягваліся з перапынкамі больш за два дзесяцігоддзі. Прычынай іх быў непасільны прыгнёт, які доўгі час цярпелі сяляне ад мясцовай адміністрацыі.

У 1754 г. сялянскія хваляванні перараслі ва ўзброенае выступленне. Немалую ролю ў гэтым адыграў гайдамацкі рух. *Гайдамакі* выступалі супраць прыгнёту феадалаў у Правабярэжнай Украіне, выкарыстоўваючы партызанскую тактыку. Кіравалі імі запарожскія казакі. Сярод гайдамакаў было шмат выхадцаў з беларускіх земель. Атрады паўстанцаў даходзілі да Лоева, Мазы-



Правообладатель Издательский центр БГУ



*Фрагмент прысуду кіраўнікам Крычаўскага паўстання*

ра, Нароўлі, Горваля. Былі яны і ў вёсках Каменшчыны.

Гетман ВКЛ Міхал Казімір Радзівіл накіраваў у Камянецкую воласць войскі для падаўлення сялянскага выступлення. Гэта ўдалося, і ў снежні жаўнераў адазвалі назад. Аднак барацьба не спынілася. У кастрычніку 1755 г. сяляне зноў узяліся за зброю. Паўстала ўся Камянецкая воласць, у якой налічвалася звыш 700 двароў.

Сяляне пры падыходзе войскаў пакідалі свае вёскі і накіроўваліся да мястэчка Славечна, дзе мелі намер аб'яднацца і аказаць узброенае супраціўленне. Так і адбылося. Сялянскі атрад пераняў карнікаў яшчэ перад Славечнам. Нечакана для шляхецкага войска прыгонныя пасля абстрэлу коннікаў перайшлі ў атаку. Карнікі пачалі адступаць, а затым кінуліся наўцёкі.

Паўстанцы стварылі каля Славечна ўмацаваны лагер. Іх налічвалася некалькі тысяч чалавек. Яны далі клятву «змагацца да апошняга».

У пачатку 1756 г. шляхецкае войска атрымала падмацаванне і склала каля 400 чалавек. У ім былі і гусары, і лёгкая конніца, і пяхота з артылерыяй. Паўстанцам была прапанавана капітуляцыя. Але тыя адмовіліся. Тады войскі пайшлі на штурм лагера. Атака была вельмі моцнай, і паўстаўшыя сяляне не вытрымалі націску. Лагер быў захоплены, прычым без страт з боку нападаючых. Паўстанцы згубілі 60 чалавек, шмат іх патанула ў балотах.

Пачалася жорсткая расправа. Усё дарослае насельніцтва Камянецкай воласці сагналі ў адно месца і пачалі выконваць прыгаворы: адных каралі смерцю, іншых білі бізунамі.

Паўстанне на Каменшчыне пацярпела паражэнне. Але назваць сялянскае выступленне безвыніковым нельга, бо пасля яго становішча сялян на некаторы час палепшылася. Павіннасці былі паслаблены.



*Фрагмент шпалеры «Уціхамірванне бунтаў пад Славечнам». Карэліцкая мануфактура. Другая палова XVIII ст.*



Издательский центр БГУ
Правообладатель Издательский центр БГУ

Сялянскі пратэст прымусіў сойм Рэчы Паспалітай у 1768 г. увесці смяротнае пакаранне за забойства селяніна. Але найчасцей гэта пастанова не выконвалася і парушалася. Сялянства заставалася самым прыгнечаным саслоўем у Рэчы Паспалітай.

МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

**З наказу прадстаўнікоў шляхты Старадубскага павета паслам на сойм (1766 г.)**

Не толькі ў Літве, але нават па ўсім Польскім каралеўстве разнеслася вестка... быццам... падданыя простага стану... на бліжэйшым сойме павінны дабіцца вызвалення, і тым самым шляхецкаму саслоўю пачынае пагражаць канчатковае разарэнне і галеча. Таму катэгарычна абавязваем паслоў у выпадку ўнясення гэтага шкоднага праекта не пагаджацца з ім, карыстаючыся правам «вета»... не даваць сялянам свабоды, хоць бы ў самым невялікім пункце. Наадварот... паслы... павінны настойваць на тым, каб падданыя былі прымацаваны як мага мацней...

Пра што сведчыць гэты дакумент?

## Пытанні і заданні

1. Чаму ў другой палове XVII — першай палове XVIII ст. нарастае сялянскі пратэст?
2. Пералічыце формы антыфеадальнага руху.
3. Прывядзіце прыклады выступленняў сялян у другой палове XVII — першай палове XVIII ст.
4. Як ставіліся ўлада і феадалы да сялянскіх хваляванняў?
5. Раскажыце пра Крычаўскае паўстанне 1740—1744 гг.
6. Чаму яно пацярпела паражэнне?
7. Ахарактарызуйце паўстанне на Каменшчыне ў 1754—1756 гг.
8. Суаднясіце элементы двух мностваў: а) браты Іцкавічы, Міхал Казімір Радзівіл, Геранім Радзівіл, Васіль Вашчыла; б) кіраўнік паўстання, арандатар, гетман ВКЛ, уладальнік Крычаўскага староства.
9. Запоўніце табліцу «Сялянскія паўстанні ў Беларусі ў другой палове XVII—XVIII ст.».

| Прычыны паўстання | Ход паўстання | Вынікі паўстання |
|---|---|---|
| | | |

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 18. ГАРАДЫ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVII — ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVIII ст.

**Успомніце**

Калі ў Заходняй Еўропе пачынае фарміравацца капіталізм? Назавіце яго асноўныя рысы.

**1. Заняпад гарадоў.** Ваенныя падзеі сярэдзіны і другой паловы XVII ст. прывялі да спусташэння большасці беларускіх гарадоў і мястэчак. У часы казацка-сялянскай вайны моцна пацярпелі гарады Брэст, Пінск, Тураў, Мазыр, Рэчыца, Бабруйск, Чэрыкаў, Лоеў, Брагін, Гомель.

У вайну 1654—1667 гг. амаль цалкам былі знішчаны Мсціслаў, Віцебск, Дуброўна, Орша, Ляхавічы. З буйных гарадоў выстаяў толькі Слуцк. Асабліва моцным разбурэнням падверглíся гарады на ўсходзе беларускіх зямель. Магілёў страціў 1790 гарадскіх сядзіб, Полацк — 1398, Быхаў — 1296, Віцебск — 925. Была знішчана большая частка Шклова. Вялікія разбурэнні зазналі гарады на поўдні беларускіх зямель. Пасля захопу расійскім войскам Брэста ў студзені 1660 г. «горад быў ушчэнт разбураны і спалены, жыхароў амаль не засталося». Колькасць сядзіб у Пінску, Тураве, Кобрыне, Пружанах зменшылася больш чым напалову.

Заняпад гарадоў праявіўся ў рэзкім скарачэнні колькасці іх жыхароў, памяншэнні колькасці рамесных спецыяльнасцей, галечы мяшчан. Напрыклад, у Шклове ў сярэдзіне XVII ст. налічвалася 288 рамеснікаў 47 прафесій, а ў 1661 г. засталося толькі 120 рамеснікаў 18 прафесій. У Копысі за гэты ж час колькасць рамесных прафесій скарацілася з 37 да 10, у Клецку — з 41 да 25.

Пажары, ваенныя рабаванні і голад суправаджаліся эпідэміямі, прыроднымі катаклізмамі. У снежні 1649 г. бранскі ваявода даносіў у Разрадны прыказ: «Вядома табе... што ў Літоўскім баку хлебны неўраджай і голад вялікі, з Літоўскага боку палякі і чаркасы і ўсякіх чыноў людзі і... мужыкі ад голаду ідуць у твой царскі бок... без жонак, без дзяцей, для таго, каб ім... пракармíцца. А іншыя, накупіўшы хлеба, адвозяць у Літоўскі бок...»

Улічваючы цяжкі стан гарадоў, сойм Рэчы Паспалітай у 1760-я гг. вызваліў 22 гарады ад выплаты падаткаў у дзяржаўны скарб на чатыры гады. Ляхавічам далі адтэрміноўку на 9 гадоў, а Быхаву — на 20 гадоў.

**2. Гарады ў першай палове XVIII ст.** У гады Паўночнай вайны 1700—1721 гг. беларускія землі сталі тэрыторыяй баявых дзеянняў паміж шведскімі і расійскімі войскамі. Зноў руйнаваліся гарады, вынішчалася насельніцтва. Двойчы праз Беларусь праходзілі войскі Карла XII. Гарады і маёнткі пры-



Правообладатель Издательский центр БГУ

хільнікаў Аўгуста II мэтанакіравана разбураліся і спусташаліся. Шведы спалілі Мір і Карэлічы, разрабавалі Гродна, Слонім, Клецк, Пінск, Навагрудак, Нясвіж, Ліду, Мінск, Магілёў. У 1708 г. асабліва пацярпела тэрыторыя Усходняй Беларусі. У верасні па загадзе Пятра I расійскія войскі спалілі Мсціслаў, Оршу, Дуброўна, Віцебск, Магілёў. Значна былі разбураны Крычаў і Шклоў.

Працяглыя баявыя дзеянні паміж расійскімі і шведскімі войскамі, масавыя рэквізіцыі правіянту, коней, фурманак, а таксама голад і эпідэміі прывялі да значных страт сярод мірнага насельніцтва і запусцення цэлых рэгіёнаў Беларусі. У інвентары 1712 г. Брэсцкай і Кобрынскай эканомій адзначалася: «Гарады Брэст, Кобрын, Гарадзец цалкам разбураны, дамы спалены, людзі вымерлі, іншыя разышліся».

Эпідэмія чумы, што адбылася ў пачатку XVIII ст., стала прычынай значнага змяншэння насельніцтва на Гродзеншчыне. «Паморак» у Гродне лютаваў у жніўні — верасні 1710 г. У выніку «ўвесь горад апусцеў». У Навагрудку пасля эпідэміі 1708 г. засталася толькі палова жыхароў. Адам Кіркор у кнізе «Жывапісная Расія» апісаў становішча ў Вільні, якое назіралася вясной 1708 г.: «Зноў голад, маравая пошасць, пажары! Адных езуітаў загінула 117 чалавек. Налічваюць да 34 000 загінуўшых жыхароў. Людзі елі сабак, катоў, мышэй...». 1710 год стаў жахлівым для жыхароў Віцебска, бо «цэлы год лютаваў... паморак».

З аднаўленнем вёскі паступова, але вельмі марудна адраджаліся беларускія гарады. Але вярнуць былую прыгажосць шэрагу гарадоў так і не ўдалося. У занядбаным стане заставаўся Мінск. У каралеўскай грамаце 1744 г.



*Магілёў. Гравюра XVIII ст.*



Правообладатель Издательский центр БГУ



*Солід. 1666 г.*

адзначалася: «Разбурэнне Мінска з прычыны варожых нашэсцяў, рабаванняў, праходаў і пастояў войскаў... неаднаразовыя пажары, эпідэміі, голад і іншыя беды... давялі гэты горад да поўнага заняпаду». Смецце з вуліц тут не прыбіралася. Вуліцы практычна не брукаваліся. Рыначная плошча зарастала пустазеллем. Ноччу горад не асвятляўся.

Найхутчэй узнімаліся з руін Магілёў, Нясвіж, Навагрудак. У прыватнасці, Нясвіж у 1720-я гг. поўнасцю адбудаваў магнат Міхал Казімір Радзівіл (Рыбанька).

**3. Гандаль у першай палове XVIII ст.** Адраджэнне гарадскога жыцця было паскорана пашырэннем гандлю. Яго асноўнай формай становіцца **кірмаш**. Напрыклад, у Бешанковічах на Віцебшчыне рэгулярна збіраўся Петрапаўлаўскі кірмаш. Ён пачынаўся з 29 чэрвеня, у дзень Святых Пятра і Паўла, і працягваўся чатыры тыдні. На яго з'язджалася да пяці тысяч чалавек.

Зэльвенскі кірмаш на Гродзеншчыне быў заснаваны ў 1721 г. уладальнікамі мястэчка магнатамі Сапегамі. Праводзіўся ён штогод з 25 ліпеня да 25 жніўня. У кірмашы прымалі ўдзел да чатырох тысяч чалавек — гандляры і пакупнікі з Рэчы Паспалітай, Аўстрыі, Прусіі і іншых краін.

Паколькі асноўная частка насельніцтва збяднела, развіваўся ў асноўным замежны гандаль. Замежныя купцы прывозілі тканіны, металічныя вырабы, галантарэю. З беларускіх зямель па-ранейшаму вывозілі прадукцыю сельскай гаспадаркі і лясных промыслаў.

На гаспадарчае жыццё негатыўны ўплыў аказала нестабільная грашовая сістэма. Манетныя двары ў Брэсце, Вільні і Коўне (Літва) выпускалі медныя, сярэбраныя і залатыя манеты. Самай распаўсюджанай грашовай адзінкай быў медны солід. Чатыры соліды складалі 1 грош, а 30 грошаў раўняліся аднаму злотаму. Недахоп фінансавых сродкаў на вядзенне ваенных дзеянняў прымушаў каралёў Рэчы Паспалітай памяншаць масу манет і выпускаць іх у неабмежаванай колькасці. Гэта пагаршала эканамічнае становішча беларускіх зямель.

**4. Узнікненне мануфактур.** У першай палове XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі пад уплывам таварна-грашовых адносін узнікае *мануфактурная вытворчасць*,



Правообладатель Издательский центр БГУ



*Шпалера. Карэліцкая мануфактура. Другая палова XVIII ст.*

што сведчыла аб фарміраванні капіталістычных адносін. **Мануфактурамі** лічыліся прадпрыемствы, заснаваныя на падзеле працы і ручной рамесніцкай тэхніцы. Яны з'яўляліся пераходнай формай вытворчасці паміж рамяством і капіталістычнай фабрыкай і складалі альтэрнатыву гарадскім цэхам.

Рамяство
↓
Мануфактура
↓
Фабрыка

*Эвалюцыя таварнай вытворчасці*

Першыя мануфактуры на беларускіх землях з'явіліся ў першай трэці XVIII ст. ва ўладаннях ***Ганны Радзівіл***. Гэта былі *гуты* (прадпрыемствы па вырабе шкла) у Налібаках (Стаўбцоўскі раён) і Урэччы (Любанскі раён). Для іх арганізацыі Ганна Радзівіл запрасіла замежных майстроў.

Издательский центр

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Гістарычная асоба**

ГАННА КАЦЯРЫНА РАДЗІВІЛ (1676—1746) атрымала выхаванне ў Варшаве пры двары каралевы Марыі Казіміры Сабескай. Выйшла замуж за будучага канцлера ВКЛ Ка́раля Станіслава Радзівіла. Пасля смерці мужа занялася гаспадаркай. Арганізавала вытворчасць дываноў і шпалер у Карэлічах і Нясвіжы. Адкрыла майстэрню ў Янкавічах Ашмянскага павета па шліфаванні вырабных камянёў, дзе рабіліся табакеркі, жэтоны для гульні, вазы. На яе прадпрыемствах выпускалі мэблю, гадзіннікі, карэты, парасоны, фарфоравы посуд, гузікі і іншую прадукцыю.

Налібоцкая мануфактура пачала дзейнічаць з 1717 г. Яна вырабляла люстэркі, люстры для сцен і столі, падсвечнікі, шмат посуду. Тэхналагічным узорам стала Дрэздэнская мануфактура. У Налібаках варылі рэдкае рубінавае шкло, якое афарбоўвалі золатам, распісвалі і гравіравалі посуд.

Урэцкая мануфактура была заснавана ў 1737 г. і напачатку называлася люстэркавай. Гэта было першае прадпрыемства па вырабе люстэркаў у Рэчы Паспалітай. Тут выраблялі аконнае шкло, хрусталёвыя люстры, падсвечнікі, люстэркі, посуд і інш. Замежны майстар Т. Шэрбер, які кіраваў мануфактурай, укараняў тэхналогію вытворчасці французскіх, багемскіх і англійскіх люстэркаў. На згаданых мануфактурах працавалі дынастыі мясцовых майстроў Кахановічаў, Дубіцкіх, Бялькевічаў, Галубовічаў.

У Нясвіжы ў 1752 г. віленскі ваявода Міхал Казімір Радзівіл (Рыбанька) адкрыў суконную мануфактуру для вытворчасці шарсцяных тканін. Прадпрыемства мела тры будынкі для ткання сукна, пастрыгальню, валюшню ў вадзяным млыне, фарбавальню, склад для гатовай прадукцыі і сыравіны.



*Келіх з накрыўкай і кварта. Налібоцкая мануфактура. XVIII ст.*



*Шкляныя кубкі. Урэцкая мануфактура. 1770—1780-я гг.*



Издательский центр БГУ
Правообладатель Издательский центр БГУ

Напачатку працавала шэсць майстроў-ткачоў, фарбавальшчык, пастрыгач. Ім дапамагалі хлопцы, набраныя з мяшчан. Дзяўчаты-прадзільшчыцы прымусова набіраліся з княжацкіх уладанняў. Іх працоўны дзень працягваўся да 15 гадзін.

Да найбольш вядомых належала Слуцкая мануфактура шаўковых паясоў, якую называлі *персіярняй*. Там выраблялі знакамітыя слуцкія паясы, дываны, «персідскую», «кітайскую» і іншыя тканіны. Гэту мануфактуру М. К. Радзівіл адкрыў у пачатку 1760-х гг. Для арганізацыі вытворчасці ён запрасіў з Украіны майстра-армяніна Аванеса Маджарскага. Пры вырабе паясоў выкарыстоўваліся беларускія народныя ўзоры, нацыянальны арнамент. Даўжыня пояса складала прыблізна 2—4,5 м.

Такім чынам, з адраджэннем гарадоў і гандлю да сярэдзіны XVIII ст. узнікаюць новыя, капіталістычныя адносіны.



*Шаўковы пояс Слуцкай мануфактуры*

МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

**З падарожных нататак П. А. Талстога (1697 г.)**

...Гор. Магілёў вялікі, і каля горада пасады вялікія, шмат у пасадах садоў. Той гор. Магілёў значна большы за Смаленск... Верхні горад ... вельмі высокі; у горадзе двое праезджых варот мураваных ды двое драўляных, вежаў кругам няма. У Магілёве жывуць купецкія людзі. Той горад мураваны... Жыхары Магілёва мяшчане, усе... грэчаскай веры... У тым горадзе вуліцы выбрукаваны... каменем, радоў [гандлёвых] у Магілёве шмат...

На падставе дакумента вызначце характэрныя рысы г. Магілёва ў другой палове XVII ст.

### Пытанні і заданні

1. Чаму ў другой палове XVII ст. гарады Беларусі перажывалі заняпад?
2. Дакажыце, абапіраючыся на факты, цяжкі стан гарадоў у другой палове XVII ст.
3. Як паўплывала Паўночная вайна 1700—1721 гг. на беларускія гарады?
4. Раскажыце пра развіццё гандлю ў першай палове XVIII ст.

Правообладатель Издательский центр БГУ

5. Што перашкаджала стабільнасці ў гаспадарцы на беларускіх землях?

6. Якая новая з'ява ў гаспадарчым жыцці першай паловы XVIII ст. сведчыць пра пачатак капіталізму?

7. Раскажыце пра дзейнасць першых мануфактур на тэрыторыі Беларусі.

8. Як вы лічыце, на якія пласты насельніцтва была разлічана мануфактурная прадукцыя?

9. Дайце азначэнні паняццяў: *кірмаш, мануфактура, гута, персіярня.*

## § 19. АДУКАЦЫЯ І НАВУКА

**Успомніце**

Чаму езуіцкая сістэма адукацыі лічылася ўніверсальнай?

**1. Адукацыя.** Пад уплывам Контррэфармацыі адукацыя і выхаванне моладзі строга кантраляваліся каталіцкай царквой. Яе школы ў другой палове XVII — першай палове XVIII ст. падзяляліся на езуіцкія і піярскія калегіумы. Таксама дзейнічалі арыянскія і брацкія (праваслаўныя) школы. У школах вучыліся толькі хлопчыкі. Дзяўчынкі атрымлівалі хатнюю адукацыю. Спасцігалі навуку ў школах пераважна шляхецкія дзеці. Прычым шляхта лічыла асвету шкоднай для народных нізоў.

Вядучае месца ў навучанні належала ордэну езуітаў. На тэрыторыі Беларусі езуіцкія школы былі арганізаваны ў Брэсце, Віцебску, Гродне, Жодзішках, Мінску, Навагрудку, Новай Мышы, Нясвіжы, Оршы, Пінску, Полацку, Слуцку. Прымалі туды не толькі католікаў, але і іншых вернікаў (пратэстантаў, праваслаўных). Гэта адпавядала задачы ордэна езуітаў — пашыраць уплыў каталіцтва.

Вучэбны працэс складаўся з пяці класаў. Навучэнцы вывучалі лацінскую мову, якая лічылася мовай навукі, старажытнагрэчаскую мову і літаратуру, рыторыку, паэтыку, геаметрыю, астраномію, філасофію, музыку. Вялікае значэнне надавалася ўменню весці дыспуты, арганізоўваліся тэатральныя пастаноўкі. Адукацыя ў калегіумах адпавядала заходнееўрапейскаму ўзору.

**Гістарычная даведка**

Асноўным стымулам у навучанні езуіты лічылі спаборніцтва. Кожны вучань меў свайго саперніка, і вялікім гонарам лічылася пераўзысці ў ведах равеснікаў. Пераможцы атрымлівалі ўзнагароды, напрыклад, ганаровыя месцы ў класным пакоі. А вось тыя, хто адставаў у навучанні, насілі спецыяльны



Правообладатель Издательский центр БГУ

знак «асліныя вушы». Настаўнікі карысталіся аўтарытэтам з-за багатых ведаў і эрудыцыі, педагагічнага таленту і строгасці. Фізічныя пакаранні выкарыстоўваліся зрэдку, і выконваў іх не настаўнік, а спецыяльны чалавек — карэктар.

З 1720-х гг. на тэрыторыі Беларусі пашырыліся піярскія школы. Іх таксама называлі калегіумамі. Яны з'явіліся ў Шчучыне, Воранаве, Геранёнах, Зэльве, Віцебску, Лідзе і іншых мястэчках і гарадах. **Піяры** («айцы набожных школ») належалі да каталіцкага манаскага ордэна, заснаванага ў 1597 г. іспанскім святаром Іосіфам Каласанцам. У адрозненне ад езуітаў піяры сваю галоўную задачу бачылі ў навучанні і выхаванні моладзі, а не ў місіянерскай і палітычнай дзейнасці.

У піярскіх калегіумах вывучалі тыя ж прадметы, што і ў езуіцкіх. Але дысцыпліна была менш строгай. Таму гэтыя школы карысталіся большай папулярнасцю ў юнакоў. Прычым вучні — дзеці збяднелых бацькоў — утрымліваліся за кошт ордэна. За гэта яны павінны былі працаваць на школьнай гаспадарцы.

У другой палове XVI — пачатку XVII ст. у Іўі, Клецку, Любчы, Лоску, Нясвіжы, Навагрудку дзейнічалі арыянскія школы. Працэс навучання ўключаў ад 3 да 5 класаў. Вучні апрача багаслоўя вывучалі творы старажытных мысліцеляў, грэчаскую, лацінскую, польскую і старабеларускую мовы, рыторыку, этыку, логіку, музыку, медыцыну. У дзяцей выхоўвалі павагу да чалавека і яго розуму, вучылі самастойна мысліць. Самай вядомай лічылася школа ў Іўі (Гродзенская вобласць), заснаваная магнатам Янам Кішкам. Рэктар школы ***Ян Намыслоўскі*** распрацаваў спецыяльную праграму навучання для дзяцей і напісаў некалькі падручнікаў. Сярод іх першы ў Беларусі дапаможнік па замежных мовах, складзены ў 1589 г. на лацінскай, польскай і нямецкай мовах.

**Гістарычная асоба**

ЯН ЛІЦЫНІЙ НАМЫСЛОЎСКІ (пачатак 1560-х гг. — паміж 1633—1636) паходзіў з Сілезіі. Скончыў Кракаўскі ўніверсітэт. Прапаведаваў арыянства ў Навагрудку. Вядомы як таленавіты пісьменнік і прамоўца.

Таксама ў Віцебску, Глыбокім, Заслаўі, Івянцы, Мінску, Оршы, Свіслачы, Магілёве і іншых гарадах і мястэчках былі адкрыты кальвінісцкія школы. Тэрмін навучання ў іх складаў ад 6 да 10 гадоў. Лепшыя выхаванцы атрымлівалі магчымасць прадоўжыць вучобу ва ўніверсітэтах Англіі і Германіі. Асноўная ўвага ў гэтых школах надавалася багаслоўю, фізічнаму выхаванню. Так-


Правообладатель Издательский центр БГУ


*Стафан Баторый засноўвае Віленскую акадэмію. Мастак В. Смакоўскі*

сама вывучаліся старажытнагрэчаская, лацінская, старабеларуская, польская мовы, рыторыка, гісторыя, матэматыка, антычная паэзія. Самай вядомай стала кальвінісцкая гімназія ў Слуцку, заснаваная ў 1617 г. князем Янушам Радзівілам. Яна праіснавала аж да 1918 г.

З 1580-х гг. ствараліся школы і пры праваслаўных брацтвах. Да ліку першых адносяцца школы ў Вільні, Магілёве, Брэсце. Пасля пачатковай адукацыі ў іх вывучалі *«трывіум»*: граматыку, рыторыку, дыялектыку, затым — *«квадрывіум»*: арыфметыку, геаметрыю, астраномію, музыку. Асаблівая ўвага надавалася вывучэнню царкоўнаславянскай мовы, у якой бачылі сродак процістаяння каталіцтву. Вучняў набіралі ўасноўным з непрывілеяваных саслоўяў: мяшчан і сялян. Плата за навучанне складала 12 грошаў.

**2. Віленскі ўніверсітэт.** Прывілеем караля Рэчы Паспалітай Стафана Баторыя езуіцкі калегіум у Вільні быў пераўтвораны ў вышэйшую навучальную ўстанову — акадэмію (універсітэт). Гэтае рашэнне ў **1579 г.** зацвердзіў рымскі папа. Першым рэктарам акадэміі стаў вядомы езуіт Пётр Скарга. Спачатку навучанне вялося на філасофскім і багаслоўскім факультэтах, пазней — на прававым і медыцынскім. Колькасць студэнтаў ужо ў хуткім часе дасягнула больш чым тысячы чалавек.

Сярод першых выкладчыкаў акадэміі быў філосаф ***Марцін Смігледкі*** (1563—1618). На падставе лекцый, прачытаных выхаванцам акадэміі, ён у 1618 г. выдаў кнігу «Логіка». Гэты трактат лічыўся самым папулярным падручнікам у Заходняй Еўропе аж да сярэдзіны XIX ст.


Правообладатель Издательский центр БГУ
Издательский центр БГУ

Адным з першых пачаў знаёміць студэнтаў з геліяцэнтрычнай сістэмай Каперніка прафесар матэматыкі ***Освальд Кругер*** (1598—1655). Шырокую вядомасць набылі яго працы па матэматыцы, астраноміі, ваеннай інжынерыі, оптыцы і метралогіі. Кругер быў архітэктарам адбудовы Нясвіжскага замка пасля пажару. Пазней кароль Рэчы Паспалітай прызначыў яго інжынерам, адказным за пабудову ваенных машын у Гродне.



*Тытульны ліст «Гісторыі Літвы» В. Каяловіча. 1650 г.*

Славу акадэміі прынёс гісторык ***Войцех Каяловіч*** (1609—1677). Яму належыць першы сістэматызаваны курс гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. У 1650—1669 гг. ён апублікаваў на лацінскай мове двухтомную «Гісторыю Літвы». Выдадзеная за мяжой, кніга пазнаёміла жыхароў Заходняй Еўропы з гісторыяй Княства.

Акадэмію падтрымлівалі каралі Рэчы Паспалітай, каталіцкае духавенства, магнаты, шляхта. Вядома, што абсталяванне для акадэмічнай друкарні перавёз з Брэста ў Вільню Мікалай Крыштоф Радзівіл (Сіротка). Сын Льва Сапегі — Казімір Сапега — перадаў акадэміі каштоўную бібліятэку. Ён жа стаў фундатарам прававога факультэта, адкрытага ў 1641 г. На сродкі Казіміра Сапегі ўтрымлівалі чатырох прафесараў-юрыстаў. З моманту заснавання ў акадэміі дзейнічаў тэатр, публічная аптэка, а ў сярэдзіне XVIII ст. была адкрыта астранамічная абсерваторыя. Сродкі на яе арганізацыю выдаткавала шляхцянка з Мсціслаўшчыны Лізавета Пузына.


*Віленская акадэмія*



Правообладатель Издательский центр БГУ



*Малюнак з кнігі К. Семяновіча «Вялікае мастацтва артылерыі» з выявай канструкцыі шматступеньчатай ракеты*

**3. Навука.** У сярэдзіне XVII — пачатку XVIII ст. па прычыне войнаў і разгрому рэфармацыйнага руху склаліся неспрыяльныя ўмовы для навуковай дзейнасці. Тагачасныя мысліцелі даказвалі праўдзівасць хрысціянскай веры. Яны сцвярджалі, што свет, створаны Богам, кіруецца ім з дапамогай анёлаў, што вера ў Бога даступна чалавечаму розуму і падтрымліваецца лагічнымі доказамі.

Матэматыка і медыцына не атрымалі значнага развіцця. Тым не менш многія навуковыя адкрыцці пастулова прабівалі сабе дарогу, у прыватнасці ў школах. Цікавы агляд па гісторыі астраноміі і каляндарных сістэм апублікаваў уніяцкі пісьменнік ***Ян Дубовіч*** (?—1646) у кнізе «Каляндар праўдзівы царквы Хрыстовай» (1644). Ён абараняў увядзенне грыгарыянскага календара, высока ацэньваў вучэнне Каперніка, але адмаўляў яго геліяцэнтрычную тэорыю.

Выдатным навуковым творам стала манументальная праца ***Казіміра Семяновіча*** (каля 1600 — пасля 1651) «Вялікае мастацтва артылерыі», якая выйшла ў 1650 г. У гэтай кнізе ён апісаў мноства канструкцый гармат і ракет, у тым ліку шматступеньчатай ракеты. Трактат быў пераведзены на французскую, нямецкую, англійскую, галандскую і іншыя мовы, што сведчыла аб яго папулярнасці ў Еўропе.

Лепшую ў Еўропе карту ВКЛ, якая была надрукавана ў Амстэрдаме ў 1613 г. (першае выданне каля 1603 г. не захавалася), падрыхтаваў ***Тамаш Макоўскі*** (1562 або 1575—1630). Ён быў на службе ў Мікалая Крыштофа Радзівіла (Сіроткі), жыў у Нясвіжы. Справу Макоўскага працягваў картограф і матэматык ***Юзаф Наронскі***. У сярэдзіне XVII ст. ён таксама працаваў у Радзівілаў і напісаў вялікую кнігу з чарцяжамі «Геаметрыя, або Трактаванне і майстэрства ўсякага вымярэння».

Перадавым прадстаўніком свайго часу з'яўляўся ўраджэнец Беларусі ***Ілья Капіевіч*** (1651—1714), які жыў у Амстэрдаме, Гданьску і Маскве. Ён быў прыхільнікам расійскага цара Пятра I і прапагандыстам свецкіх ведаў. Капіевіч напісаў больш за 20 кніг і падручнікаў. Сярод іх працы па гісторыі, арыфметыцы, граматыцы, астраноміі, навігацыі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

**З наказу гродзенскай шляхты паслам на Варшаўскі сойм (1733 г.)**

Хадайнічаць аб выданні цвёрдага закона, каб нікога з сялянскіх дзяцей не прымалі ў школы для навучання грамаце... Згодна старой прымаўцы, сялянскі род добры, калі ён у самоце, але дрэнны, калі ён у радасці ці калі адукаваны школьнымі навукамі.

Вызначце пазіцыю шляхты ў адносінах да асветы народных нізоў.

**Пытанні і заданні**

1. Якія навучальныя ўстановы дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVI — першай палове XVIII ст.?
2. Параўнайце школы ордэнаў езуітаў і піяраў.
3. Дакажыце, што адукацыя знаходзілася пад кантролем царквы.
4. Раскрыйце ролю Віленскай акадэміі ў развіцці культуры беларускіх зямель.
5. Назавіце вядомых выкладчыкаў акадэміі.
6. Як развівалася навука на беларускіх землях у другой палове XVI — першай палове XVIII ст.?
7. Дайце гістарычную ацэнку вынаходніцтвам К. Семяновіча.
8. Дайце азначэнні паняццяў: *піяры*, *«трывіум»*, *«квадрывіум»*.
9. У форме табліцы «Адукацыя на беларускіх землях у другой палове XVI — першай палове XVIII ст.» параўнайце асноўныя тыпы школ.

| Тып школ | Месца знаходжання | Асаблівасці навучання |
|---|---|---|
| | | |

## § 20. ЛІТАРАТУРА І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ДУМКА

**Успомніце**

Што такое барока?

**1. Літаратура.** Ва ўмовах Контррэфармацыі пануючым стылем у літаратуры беларуска-літоўскіх зямель становіцца барока. Яно спалучала традыцыі сярэдневякоўя і Рэнесансу, пісьмовай літаратуры і фальклору. Асаблівае развіццё атрымала лацінамоўная паэзія.

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Мацей Казімір Сарбеўскі*

Тэарэтыкам барока ў літаратуры лічыўся ***Мацей Казімір Сарбеўскі*** (1595—1640). Ён выкладаў у Полацкім езуіцкім калегіуме рыторыку, паэтыку і тэорыю літаратуры. Пасля вучобы ў Рыме Сарбеўскі стаў прафесарам красамоўства, філалогіі і багаслоўя ў Віленскай акадэміі. Пры жыцці паэта выйшлі пяць выданняў яго вершаў, складзеных на лацінскай мове. Літаратурную спадчыну Сарбеўскага вывучалі студэнты ў еўрапейскіх універсітэтах. Таксама паэт стаў вядомы сваімі тэкстамі лекцый для навучэнцаў школ і акадэмій — напрыклад, «Пра дасканалую паэзію...», «Лекцыі па паэтыцы», «Багі язычнікаў». Яны выкарыстоўваліся ў якасці падручнікаў у каталіцкіх калегіумах.

У стылі барока былі напісаны творы паэта і ўрача ***Данілы Набароўскага*** (1573—1640). Ён атрымаў выдатную адукацыю ў Еўропе, валодаў шасцю мовамі. Яго вершы характарызуюцца вобразнасцю, «гульнёй слоў». У іх паэт высмейваў шляхту, езуітаў, духавенства.

Узорам грамадзянскай патрыятычнай лірыкі з'яўляецца верш ***Яна Пашкевіча*** «Польска квітнет лаціною...» (1621). У ім паэт адзначаў ролю беларускай мовы ў грамадскім і культурным жыцці, ганарыўся славай свайго народа.



*Тытульны ліст «Вершаў» М. К. Сарбеўскага. Гравюра П. Рубенса. Антверпен. 1632 г.*

Шырокую вядомасць набыла паэма магілёўскага пісьменніка і педагога ***Тамаша Яўлевіча*** «Лабірынт, або Заблытаныя шляхі Мудрасці» (1625), напісаная на польскай мове. Галоўнай тэмай, якую ўзняў аўтар, была роля навукі і мастацтва ў жыцці людзей. Ён верыў у неабмежаваныя магчымасці чалавечага розуму, услаўляў Мудрасць:

*...Так, Мудрасць над усім, бо ўсім жывым кіруе.*
*Багаты самы той, хто з Мудрасцю сябруе.*
*І хто з людзей сабе тым скарбам запаможа,*
*Пакуль ёсць белы свет, субожыцца не можа...*

Значную частку паэмы аўтар прысвяціў крытыцы чалавечых заган, асабліва п'янства як «найвялікшага грамадскага зла».

Далейшае развіццё атрымала гісторыка-дакументальная літаратура. У XVII—XVIII стст. гэты



Правообладатель Издательский центр БГУ

жанр быў прадстаўлены мясцовымі летапісамі і мемуарамі. Сярод іх вылучаецца *Баркулабаўскі летапіс*, складзены ў мястэчку Баркулабава (Быхаўскі раён Магілёўскай вобласці). Ён змяшчае каштоўныя звесткі па гісторыі Усходняй Беларусі, а таксама Літвы, Польшчы, Расіі, нават інфармацыю пра двух Ілжэдзмітрыяў. Разгорнута апісаны Брэсцкі царкоўны сабор 1596 г., удзельнікам якога быў сам аўтар. Летапісец асвятляў падзеі з патрыятычных пазіцый. У прыватнасці, ён асуджаў дзеянні ўкраінскіх казакоў, якія «вялікую шкоду чынілі... горш, чым злыя непрыяцелі».

Да мясцовых летапісаў адносіцца і *Магілёўская хроніка*. Яна складалася з канца XVII ст. купецкім старастам Трафімам Суртам і рэгентам гарадской канцылярыі Юрыем Трубніцкім. Хроніка ўсебакова адлюстроўвае жыццё Магілёва. У цэнтры ўвагі аўтараў — справы і клопаты гараджан. Запісы аб Паўночнай вайне 1700—1721 гг. паказваюць цяжкае становішча мяшчан. Створаны цікавыя вобразы Пятра І, Карла XII, Мазепы.

Мемуары на тэрыторыі Беларусі былі прадстаўлены ў асноўным дзённікамі (*дыярыушамі*). Іх стваралі выхадцы са шляхецкага саслоўя. Яны адлюстроўвалі факты асабістага жыцця, а таксама найбольш важныя палітычныя падзеі.

Адзін з першых дыярыушаў на беларускай мове стварыў навагрудскі шляхціц, удзельнік Лівонскай вайны ***Фёдар Еўлашоўскі*** ў пачатку XVII ст.

Найбольшую вядомасць атрымаў «Дыярыуш» ***Самуіла Маскевіча***, удзельніка вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй 1609—1618 гг. Аўтар аднолькава праўдзіва характарызаваў і сваіх сяброў, і сваіх ворагаў. У «Дыярыушы» падрабязна раскрыты побыт маскоўскіх баяр, майстэрства рамеснікаў. Аўтару імпанавалі меркаванні расіян наконт шляхецкіх вольнасцей як шляхецкага самавольства. Значнае месца ў творы адведзена паказу некаторых рыс жыцця рускага сялянства і яго адносін да войска Рэчы Паспалітай. Паколькі Маскевіч быў кальвіністам, то ўсе падзеі ён апісаў аб'ектыўна, без палітычнай і рэлігійнай прадузятасці.

Аўтарам палемічна-публіцыстычнага «Дыярыуша» (1646) быў пісьменнік-публіцыст, праваслаўны і палітычны дзеяч ***Афанасій Філіповіч***.



*Сімяон Полацкі. Гравюра XIX ст.*

**2. Сімяон Полацкі (1629—1680).** Свецкі пачатак у беларускай літаратуры развіваў ***Сімяон Полацкі***. Прозвішча гэтага вядомага беларускага паэта, перакладчыка і педагога да прыняцця манаства —



Правообладатель Издательский центр БГУ

Самуіл Гаўрылавіч Пятроўскі-Сітняновіч. Ён нарадзіўся ў Полацку. Спачатку скончыў Кіева-Магілянскі калегіум, затым вучыўся ў Віленскай акадэміі. У 1656 г. стаў манахам уніяцкага ордэна базыльян пад імем Сімяон. Сімяон Полацкі выступаў з ідэяй аб'яднання хрысціян пад уладай рымскага папы і расійскага цара.

Падчас вайны 1654—1667 гг. паэт вітаў расійскага цара Аляксея Міхайлавіча пры ўзяцці Полацка, складаў у яго гонар вершы. Напрыклад:

*...Витаем тя, православный царю, праведное солнце,*
*Здавна бовем прагнули тебе души наши и сердце.*
*Витаем тя, царю, от востока к нам пришедшаго,*
*Белорусский же от нужды народ весь освобождшаго.*
*Не бойся, земле Российская, и не устрашайся,*
*Дедич с востока пришол, ему низко поклоняйся,*
*Алексей Михайлович всех россов царь и государь*
*И иных народов великий князь, так теж и владарь,*
*Дабы во русийской земли оттряс ереси всюды...*




*Тытульны ліст кнігі «Рыфмалагіён, ці Вершаслоў» Сімяона Полацкага*

Паколькі заставацца ў Рэчы Паспалітай Сімяону Полацкаму было небяспечна, ён у 1664 г. перасяліўся ў Маскву. У расійскай сталіцы паэт заснаваў «лацінскую» школу пры Заіконаспаскім манастыры, друкарню. Ён быў першым прыдворным паэтам расійскіх цароў, выхоўваў дзяцей Аляксея Міхайлавіча, у тым ліку будучага першага імператара Расіі Пятра I.

Сімяон Полацкі свае творы пісаў на старабеларускай, польскай і лацінскай мовах. Да нашчадкаў дайшлі два вялікія зборнікі вершаў Сімяона Полацкага: «Вертаград мнагацветны» і «Рыфмалагіён, ці Вершаслоў». Першы зборнік называлі энцыклапедыяй, з якой чэрпалі веды па самых разнастайных пытаннях жыцця. У другім зборніку былі змешчаны драматычныя п'есы, якія ставіліся ў прыдворных тэатрах Масквы. Сваю бібліятэку Сімяон Полацкі завяшчаў манастырам у Полацку, Маскве, Кіеве.

**3. Грамадска-палітычная думка.** Грамадска-палітычная думка ў другой палове XVI—XVII ст.


Правообладатель Издательский центр БГУ
Издательский центр БГУ

была прадстаўлена *рэлігійнай палемікай*, якая закранала праблемы каталіцкай і праваслаўнай цэркваў. У прыватнасці, спрэчкі ўзнікалі па пытаннях улады епіскапаў, сувязей царкоўнай уніі з палітычнымі планамі Польшчы, Ватыкана, Расіі, перадумоў уніі, становішча праваслаўнага насельніцтва ў Рэчы Паспалітай. У палеміцы ўдзельнічалі вядомыя рэлігійныя і палітычныя дзеячы. З праваслаўнага боку выступалі Стафан і Лаўрэнцій Зізаніі, Мялецій Сматрыцкі, Лявонцій Карповіч, з каталіцкага і ўніяцкага — Пётр Скарга, Іпацій Пацей, Леў Крэўза.



*Казімір Лышчынскі*

Другім кірункам грамадска-палітычнага жыцця можна лічыць дзяржаўна-прававую думку. У XVII ст. з'явіліся творы, у якіх усхваляўся палітычны лад Рэчы Паспалітай, заснаваны на шырокіх правах шляхты. Вядомым ідэолагам шляхецкіх вольнасцей быў львоўскі кашталян ***Анджэй Фрэдра*** (1620—1679). Ён напісаў трактаты, у якіх абгрунтоўваў вяршэнства права «ліберум вета».

У навукова-прававой літаратуры ВКЛ прыкметнае месца належыць прафесару права Віленскай акадэміі ***Аарону Алізароўскаму*** (1610—1659). Ён з'яўляецца аўтарам працы «Аб палітычнай супольнасці людзей», выдадзенай у Гданьску ў 1651 г. Алізароўскі лічыў грамадзянамі дзяржавы не толькі шляхту, але і астатняе насельніцтва, акрамя іншаземцаў. Ён выступаў за ўраўнаванне правоў сялян з правамі іншых саслоўяў Рэчы Паспалітай, асуджаў прыгоннае права.

Новай з'явай у грамадска-палітычнай і філасофскай думцы сталі атэістычныя погляды ***Казіміра Лышчынскага*** (1634—1689). Ён працаваў падсудкам брэсцкага земскага суда. У працы «Аб неіснаванні Бога», створанай на лацінскай мове, Лышчынскі пісаў: «1. Заклінаем вас, о багасловы, імем вашага бога; няўжо вы гэтым не гасіце святло розуму, не адымаеце сонца ў свету, не перакульваеце з нябёс вашага бога, калі вы прыпісваеце богу немагчымае, супярэчлівыя рысы і ўласцівасці бога?..

7. Чалавек — тварэц бога, а бог — стварэнне чалавека. Такім чынам — людзі — творцы і стваральнікі бога і бог з'яўляецца не сапраўднай сутнасцю, а (тварэннем) розуму і да таго ж хімерычным; таму бог і хімера — адно і тое ж.

8. Рэлігія ўстаноўлена людзьмі няверуючымі, каб ім аддавалася пашана... Вера ў бога ўведзена бязбожнікамі. Страх божы ўсяляецца тымі, хто, не маючы страху, усё робіць для таго, каб (іх) баяліся».



Правообладатель Издательский центр БГУ

Рукапіс кнігі выкраў агент езуітаў Ян Бжоска. У 1687 г. царкоўны суд зняволіў Лышчынскага і прызнаў *атэістам*, гэта значыць бязбожнікам. Па прыгаворы соймавага суда ён быў абезгалоўлены і спалены на кастры ў Варшаве.

МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

**З трактата «Аб палітычнай супольнасці людзей» Аарона Алізароўскага (1651 г.)**

Закон, як яго вызначае Саламон, ёсць святло і шлях жыцця.
...закон з'яўляецца рупліўцам найвышэйшай мудрасці, ахоўнікам сумленнасці, крыніцай выхавання, тварцом правасуддзя..., настаўнікам жыцця і душой усёй дзяржавы...

Ці падзяляеце вы пазіцыю аўтара?

## Пытанні і заданні

1. Які стыль панаваў у літаратуры беларускіх зямель XVII — першай паловы XVIII ст.?
2. На якіх мовах ствараліся літаратурныя творы таго часу?
3. Раскажыце аб развіцці паэзіі.
4. Ахарактарызуйце гісторыка-дакументальную літаратуру.
5. Які ўклад у развіццё беларускай літаратуры ўнёс Сімяон Полацкі?
6. Прааналізуйце асноўныя кірункі грамадска-палітычнай думкі XVII — першай паловы XVIII ст.
7. Ахарактарызуйце погляды Казіміра Лышчынскага.
8. Дайце азначэнні паняццяў: *дыярыуш, рэлігійная палеміка, атэізм*.
9. Запоўніце табліцу «Літаратура і грамадска-палітычная думка на беларускіх землях у XVII — першай палове XVIII ст.».

| Крытэрыі | Літаратура | Грамадска-палітычная думка |
|---|---|---|
| Прадстаўнікі | | |
| Творы | | |
| Асноўная ідэя твораў | | |


Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 21. АРХІТЭКТУРА І МАСТАЦТВА

**Успомніце**

Якія рысы былі характэрны для заходнееўрапейскай і візантыйскай культур у пачатку Новага часу?

**1. Архітэктура.** Вядучым архітэктурным стылем ва ўмовах Контррэфармацыі з'яўлялася барока. У сваім развіцці яно прайшло тры этапы: ранняе, высокае (сталае), позняе. На другую палову XVII — пачатак XVIII ст. прыпадае сталае барока. Каталіцкія храмы будавалі з дзвюма вежамі. Павялічылася колькасць ярусаў вежаў. Фасады набылі большую пластыку. Прыкладам з'яўляецца Андрэеўскі касцёл у Слоніме.



*Слонімскі Андрэеўскі касцёл*

У 1730-я гг. у царкоўным дойлідстве сфарміраваўся своеасаблівы архітэктурны стыль — *віленскае барока*. Яго распрацаваў архітэктар ***Ян Глаўбіц***.

**Гістарычная асоба**

ЯН (ІАГАН) КРЫШТОФ ГЛАЎБІЦ (1700—1767) працаваў у Вільні, дзе аднавіў мясцовыя храмы пасля пажару 1737 г. Ён пабудаваў у сталіцы ВКЛ касцёлы святых Яна, Казіміра, Кацярыны, Рафала, візітак, а таксама ў Беларусі касцёл Яна Хрысціцеля ў Сталавічах Навагрудскага павета, царкву Магілёўскага Спаскага манастыра і інш.

Віленскаму барока былі ўласцівыя вытанчанасць прапорцый, лёгкасць і ажурнасць пабудоў, пышны дэкор фасада, разнастайнасць аздобы інтэр'ераў. Усё гэта можна ўбачыць на прыкладзе Полацкага Сафійскага сабора. У 1738—1750 гг. храм быў перабудаваны Глаўбіцам пасля разбурэнняў, выкліканых выбухам пораху.



*Гальшанскі замак у першай палове XVII ст. Рэканструкцыя Д. С. Бубноўскага*

Працягвалі будавацца палацава-замкавыя комплексы. Сярод іх вылучаліся замак у Гальшанах (Ашмянскі раён Гродзенскай вобласці), Гродзенскі Новы замак, Нясвіжскі палац Радзівілаў (Мінская вобласць).



Правообладатель Издательский центр БГУ



*Магілёўская Спаская царква. Архітэктар Я. Глаўбіц. 1762 г. Фотаздымак пачатку XX ст.*

Гальшанскі мураваны замак быў узведзены ў першай палове XVII ст. і па сваёй кампазіцыі нагадваў Мірскі замак: прамавугольны будынак з замкнёным дваром. Аднак у Гальшанах ужо адсутнічалі магутныя абарончыя сцены. Яны саступілі месца фасаду жылога дома. Вежы замка яшчэ не страцілі свайго абарончага значэння, аднак аснова абароны перамясцілася на земляныя валы і равы, запоўненыя вадой. Па знешнім выглядзе Гальшанскі замак нагадваў галандскія будынкі таго часу.

У 1726 г. сойм прыняў рашэнне аб будаўніцтве Гродзенскага Новага замка — каралеўскай рэзідэнцыі і месца пасяджэння соймаў Рэчы Паспалітай. Каралеўскі палац быў пабудаваны да 1744 г. у стылі позняга барока.

У стылі барока пасля 1726 г. быў перабудаваны Нясвіжскі палац Радзівілаў. Кіраваў работамі архітэктар *К. Ждановіч*. Пасля яго ў будаўніцтве палаца прымалі ўдзел італьянскія майстры. Замак уключаў палац і дапаможныя карпусы абапал уязной брамы.

На час войнаў сярэдзіны XVII ст. прыпадае ўздым гарадскога абарончага будаўніцтва. Найбольш трывалыя ўмацаванні ў гэты час меў Віцебск. Верхні, Ніжні і Узгорскі замкі абаранялі горад ад ворагаў.

Гандлёвыя плошчы гарадоў упрыгожвалі **ратушы**. Сваёй арыгінальнасцю прываблівае будынак гарадскога магістрата ў Магілёве, узведзены ў канцы XVII ст. Каля ратуш і пры іх узнікалі гандлёвыя рады, гасціныя двары для купцоў, *корчмы*, *шынкі*, *аўстэрыі*.



*Гродзенскі Новы замак*



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Гістарычная даведка**

Карчма – гэта комплекс будынкаў, дзе спыняліся, харчаваліся і начавалі падарожнікі. Вялікія корчмы называліся аўстэрыямі. У шынках гандлявалі гарэлкай, віном і півам.

**2. Выяўленчае мастацтва.** Прынцыпы барока паступова пранікалі ў выяўленчае мастацтва. Гэты стыль ярка праявіўся ў фрэскавым роспісе касцёлаў, драўлянай скульптуры амбонаў і фасадаў каталіцкіх храмаў. Сапраўдны росквіт у другой палове XVII ст. перажываў манументальны жывапіс, прадстаўлены ў інтэр'ерах касцёлаў. У Княства быў запрошаны італьянец *М. Палоні*, які размалёўваў каталіцкія храмы ў Літве. Шырокае распаўсюджанне атрымалі панарамныя роспісы ў форме перспектывы. Прыкладам могуць быць фрэскі касцёла Францыска Ксаверыя ў Гродне. Іх, магчыма, выканаў мастак *І. Дарэці* ў сярэдзіне XVIII ст. Ён намаляваў 14 кампазіцый з жыцця гэтага вядомага каталіцкага місіянера. Прыдворнымі мастакамі князёў Радзівілаў былі *Ф. К.* і *Ю. К. Ляскія* (бацька і сын), якія выканалі размалёўку Нясвіжскага касцёла Божага Цела, упрыгожвалі інтэр'еры палацаў, замкаў і храмаў у радзівілаўскіх уладаннях.



*Саламон і царыца Саўская. Размалёўка касцёла Божага Цела ў Нясвіжы. Мастак Ф. К. Ляскі. Сярэдзіна XVIII ст.*

Прыватныя мастацкія галерэі магнатаў уражвалі багатым падборам фамільных партрэтаў. Іх малявалі як замежныя мастакі, так і мясцовыя. У ВКЛ працавалі мастакі *П. Данкерс дэ Рэй* з Галандыі, *Д. Шульц* з Гданьска, *Б. Стробель* з Вроцлава і інш.

Асаблівую папулярнасць набыў партрэт сармацкага тыпу. Сарматызм стаў асаблівасцю шляхецкай культуры Рэчы Паспалітай. У яго аснову быў пакладзены міф аб паходжанні польскай



*Сцэна з жыцця Святога Францыска Ксаверыя. Фрэска ў Гродзенскім касцёле Францыска Ксаверыя. Мастак І. Дарэці (?). Сярэдзіна XVIII ст.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

шляхты ад старажытных сармацкіх плямён. «Шляхціц-сармат» — гэта патрыёт сваёй Радзімы, абаронца свабоды, узор гасціннасці, шчырасці, годнасці, абаронца каталіцкай веры.

**Гістарычная даведка**
Сармацкі партрэт прыйшоў з Польшчы. Малявалі магнатаў, дзяржаўных дзеячаў у поўны рост з атрыбутамі ўлады і ў парадным адзенні. Стваральнікамі сармацкага партрэта былі пераважна ананімныя мастакі (напрыклад, партрэты прадстаўнікоў роду Весялоўскіх, Завішаў і інш.).

У жанры сармацкага партрэта плённа працаваў у Вільні, Гродне і Нясвіжы нямецкі майстар ***Іаган Шрэтэр***. Ён у 1646 г. намаляваў партрэты жонак магната Януша Радзівіла — Катажыны і Марыі. Партрэт самога Януша Радзівіла выканаў мастак Д. Шульц.

На мяжы XVI—XVII стст. фарміравалася беларуская іканапісная школа. У іканапісе з'явілася імкненне да перадачы прасторы, натуральных прапорцый, асобныя персанажы сталі падавацца ў свецкім убранні. Для абразоў «Святая Параскева» з-пад Мастоў, «Замілаванне», «Пакроў», «Успенне» з Брэстчыны быў характэрны аптымізм, светлы настрой, вера ў вышэйшую справядлівасць.

Шэдэўрам лічыцца ікона ***Пятра Яўсеевіча*** з Галынца «Нараджэнне Багародзіцы», створаная ў 1649 г. Гэта адзіная ікона, аўтар якой вядомы, бо пакінуў на ёй сваё прозвішча. Да нашых дзён дайшлі іконы «Тройца старазапаветная» (Брэстчына), «Сашэсце ў пекла» з Чачэрска.

**3. Музыка і тэатр.** Музычнае мастацтва было прадстаўлена царкоўнай і касцёльнай музыкай. Музычнае суправаджэнне таксама выкарыстоўвалі выхаванцы калегіумаў для пастаноўкі драматычных твораў у школьных тэатрах.

У праваслаўных цэрквах традыцыйна карысталіся спецыяльнымі пісьмовымі зборнікамі песнапенняў. Яны прызначаліся для аднагалосага спеву і *знаменнага распеву*.

**Гістарычная даведка**
Знаменны распеў склаўся ў XI—XII стст. Яго назва паходзіць ад старaславянскага слова «знамя», што азначала знак напеву ў форме рысак, кропак, косак, арабскіх літар.

Першыя спробы друкавання пяцілінейных еўрапейскіх нот на тэрыторыі Беларусі адносяцца да другой паловы XVI ст. У беларускіх літургічных кнігах


Правообладатель Издательский центр БГУ

яны ўпершыню былі выкарыстаны ў зборніку «Супрасльскі ірмалагіён», які стварыў ***Багдан Анісімовіч*** з Пінска.

У гэтыя ж часы ў Беларусі распаўсюджваюцца і шматгалосыя спевы (па партыях). Вялікімі майстрамі выканання падобных спеваў на візантыйскія царкоўныя тэксты былі брацкія праваслаўныя хары. Вядомым помнікам беларускай музыкі XVII ст. стаў *«Полацкі сшытак»*, запісаны круглымі «італьянскімі нотамі», якіяляглі ў аснову сучаснай нотнай граматы.



*Іаган Шрэтэр. Партрэт Катажыны і Марыі Радзівіл. 1646 г.*

У касцёлах атрымала распаўсюджанне арганная музыка, для якой патрабаваліся высокі ўзровень рамесніцкай тэхнікі і адпаведная акустыка. Звычайныя арганы і малыя арганныя інструменты гучалі ў залах каралеўскага палаца ў Гродне. У 1611—1615 гг. на сродкі шляхціца Андрэя Скарульскага быў пабудаваны вялікі арган для Нясвіжскага касцёла Божага Цела.

Пры дварах магнатаў дзейнічалі прыгонныя аркестры і капэлы. Аркестравая музыка суправаджала спектаклі, балы, паляванні, ваенныя парады і рэлігійныя службы. Кіравалі аркестрамі знакамітыя еўрапейскія музыканты. Прыдворных аркестрантаў і спевакоў рыхтавалі ў прыватных школах. Такія навучальныя ўстановы былі ў Слуцку, Нясвіжы, Гродне, Паставах, Слоніме.

Пры езуіцкіх калегіумах і акадэміях, брацкіх школах у Вільні, Мінску, Магілёве, Гродне, Віцебску, Нясвіжы, Полацку і іншых гарадах дзейнічалі *школьныя тэатры*. Езуіты выкарыстоўвалі тэатральныя пастаноўкі не толькі для ўдасканалення ведання моў, але і для барацьбы з Рэфармацыяй. П'есы драматычнага характару па сваёй структуры адпавядалі заходнееўрапейскаму тэатру. Тэатр меў адукацыйную, выхаваўчую і прапагандысцкую функцыі. Сюжэты запазычвалі з Бібліі, антычнай міфалогіі, гісторыі краін, бытавога жыцця. Ролі выконвалі самі навучэнцы, а акцёрскае майстэрства ім выкладаў настаўнік рыторыкі.



*Пётр Яўсеевіч з Галынца. Нараджэнне Багародзіцы. 1649 г.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

У гарадах таго часу адсутнічалі развітыя традыцыі тэатральнага мастацтва. Гледачы не ўспрымалі падзеі на сцэне як адлюстраванне рэальнасці. Таму, каб «наблізіць» тэатр да гледача, устанавіць сувязь паміж сцэнай і залай, замест антрактаў ставілі *інтэрмеды* (невялікія камічныя сцэнкі) з паўсядзённага жыцця.

Тэатральнае мастацтва з XVI ст. было прадстаўлена *батлейкай* (лялечным народным тэатрам). Слова «батлейка» паходзіць ад польскай назвы горада Віфлеема — месца нараджэння Ісуса Хрыста. Лялечны тэатр уяўляў сабой скрыню ў выглядзе хаткі або царквы, якая была падзелена на ярусы-сцэны. Лялькі рабіліся з дрэва, каляровай паперы, тканіны. Спецыялісты налічылі ў батлеечных пастаноўках да 40 персанажаў. Рэпертуар лялечнага тэатра быў як рэлігійным, так і свецкім: «Цар Ірад», «Вольскі — купец польскі», «Цыган і цыганка» і інш.

Такім чынам, культура беларускіх зямель у XVII — першай палове XVIII ст. ва ўмовах распаўсюджання Контррэфармацыі развівалася на аснове спалучэння заходнееўрапейскай (каталіцкай) і візантыйскай (праваслаўнай) культур.

### Пытанні і заданні

1. Раскрыйце эвалюцыю барочнай архітэктуры на беларускіх землях.
2. У чым заключаецца своеасаблівасць віленскага барока?
3. Прывядзіце прыклады абарончага дойлідства XVII — першай паловы XVIII ст.
4. Як праявілася барока ў выяўленчым мастацтве беларускіх зямель?
5. Што такое сармацкі партрэт?
6. Чаму ў XVII — першай палове XVIII ст. найбольшае пашырэнне атрымаў партрэтны жанр?
7. Вызначце спецыфічныя рысы беларускай іканапіснай школы.
8. Раскажыце аб развіцці музычнага мастацтва на тэрыторыі Беларусі.
9. Ахарактарызуйце развіццё тэатральнага мастацтва ў XVII — першай палове XVIII ст.
10. Дайце азначэнні паняццяў: *віленскае барока, знаменны распеў, школьны тэатр, інтэрмеды, батлейка.*

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

# УРОК АБАГУЛЬНЕННЯ ДА РАЗДЗЕЛА II

**1.** Складзіце тэзісны план ці план-канспект адказу па адным з наступных пытанняў з выкарыстаннем тэарэтычнага і фактАлагічнага матэрыялу:

а) казацка-сялянская вайна 1648—1651 гг. на тэрыторыі Беларусі;

б) наступствы вайны 1654—1667 гг. для беларускіх зямель;

в) роля беларускіх зямель у ваенных падзеях Паўночнай вайны 1700—1721 гг.;

г) эканамічны заняпад сярэдзіны XVII — пачатку XVIII ст.;

д) арганізацыя мануфактурнай вытворчасці на беларускіх землях;

е) барока ў культуры беларускіх зямель сярэдзіны XVII — першай паловы XVIII ст.

**2.** Пакажыце на карце:

а) паход Януша Радзівіла ў 1649 г.;

б) месцы асноўных бітваў у вайну 1654—1667 гг.;

в) тэрыторыі, якія атрымала Расія паводле Андросаўскага перамір'я;

г) паход Карла XII у 1708 г.

**3.** Вызначце гістарычныя падзеі па наступных датах:

1648—1651 гг., 1649 г., 1654—1667 гг., 1655—1660 гг., 1655 г., 1697 г., 1700—1721 гг., 1708 г., 1717 г., 1733—1739 гг., 1740—1744 гг., 1754—1756 гг.

**4.** Параўнайце развіццё беларускіх зямель у другой палове XVII — першай палове XVIII ст.

| Крытэрыі для параўнання | Перыяды | |
|---|---|---|
| | Другая палова XVII ст. | Першая палова XVIII ст. |
| Палітычнае становішча | | |
| Сацыяльна-эканамічнае становішча | | |
| Духоўныя працэсы | | |

**5.** Суаднясіце ў табліцы знешнепалітычныя адносіны беларускіх зямель у сярэдзіне XVII — першай палове XVIII ст. і зрабіце выснову аб месцы і ролі Рэчы Паспалітай ва Усходняй Еўропе.

| Узаемаадносіны з Расіяй | Узаемаадносіны са Швецыяй | Узаемаадносіны з Турцыяй |
|---|---|---|
| | | |

Правообладатель Издательский центр БГУ



Издательский центр БГУ

**6.** Правядзіце сістэматызацыю наступных тэрмінаў і паняццяў і занясіце іх у адпаведныя слупкі табліцы.

| **Палітычныя працэсы на тэрыторыі Беларусі** | **Сацыяльна-эканамічныя працэсы на тэрыторыі Беларусі** | **Культурныя працэсы на тэрыторыі Беларусі** |
|---|---|---|
| | | |

Староства, школьны тэатр, казакі, чопавае, знаменны распеў, «разбуральнае стагоддзе», шышы, рэйтаршчына, кантрыбуцыя, «хатняя» вайна, «нямы» сойм, «фамілія», пусташы, шарваркі, «Лоеўская брама», жарнавое, барока, куніца, падымнае, гіберна, інтэрмедыі, цівун, эканомія, загоны, старажоўшчына, начная варта, гайдамакі, мануфактура, батлейка, гута, персіярня, піяры, акадэмія, інвентары, угайнае, рэлігійная палеміка, атэізм, віленскае барока, кірмаш, «Полацкі сшытак», сармацкі партрэт.

**7.** Вызначце прычыны і наступствы адной з гістарычных з'яў:

а) казацкі рух у Беларусі;
б) вайна 1654—1667 гг.;
в) Кейданская унія 1655 г.;
г) Паўночная вайна 1700—1721 гг. на тэрыторыі Беларусі;
д) эканамічны заняпад у другой палове XVII — пачатку XVIII ст.;
е) барока ў культуры Беларусі.

**8.** Растлумачце падыходы навукоўцаў да адной з наступных праблем:

а) уплыў «шляхецкай дэмакратыі» на стан дзяржаўнага кіравання;
б) пачатак капіталізму ў Беларусі.

**9.** Правядзіце краязнаўчыя даследаванні па адной з наступных тэм:

а) «Развіццё вашага горада (вёскі) у сярэдзіне XVII — першай палове XVIII ст.»;

б) «Мясцовыя помнікі архітэктуры і мастацтва сярэдзіны XVII — першай паловы XVIII ст.».

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

Раздзел III

# БЕЛАРУСЬ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII ст.

## § 22. ЭКАНАМІЧНАЯ СТАБІЛІЗАЦЫЯ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII ст.

**Успомніце**

1. Што такое рэформа?
2. Якія перашкоды існавалі ў Рэчы Паспалітай для правядзення рэформ?

**1. Пачатак эканамічных рэформ.** Пасля смерці караля Аўгуста III у Рэчы Паспалітай пачалося апошняе бескаралеўе. Да ўлады імкнуліся дзве групоўкі магнатаў — «рэспубліка» і «фамілія». Апошнюю ўзначальвалі Чартарыйскія. На сойм **1764 г.**, які быў прызначаны для выбрання караля, яны запрасілі расійскае войска. Яно садзейнічала абранню каралём Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

Сойм прыняў рашэнне не выкарыстоўваць «ліберум вета» пры разглядзе эканамічных пытанняў. Цяпер для гэтага патрабавалася большасць галасоў шляхецкіх паслоў. Таксама была створана *Скарбовая камісія ВКЛ*, якая кантралявала фінансы краіны. Сойм ліквідаваў прыватныя пошліны і ўвёў адзіную мытную пошліну: сухапутную і рачную. На яўрэяў быў уведзены пагалоўны падатак у памеры двух злотых у год з чалавека. Прынятыя меры садзейнічалі ўмацаванню дзяржаўнай казны.



*Ратуша і гандлёвыя рады ў Гродне. Канец XVIII ст. Рэканструкцыя*

Далейшыя рэформы ў краіне праводзіліся па ініцыятыве самога караля.



Правообладатель Издательский центр БГУ



**Гістарычная асоба**

СТАНІСЛАЎ АЎГУСТ ПАНЯТОЎСКІ (1732—1798) нарадзіўся ў вёсцы Воўчын (каля Брэста). Паходзіў са знакамітага шляхецкага роду. Атрымаў добрую адукацыю. Шмат вандраваў па еўрапейскіх краінах. У 1755—1758 гг. ён займаў пасаду сакратара англійскага пасольства ў Пецярбургу, быў паслом ад Саксоніі і Рэчы Паспалітай. Там зблізіўся з імператрыцай Кацярынай II, якая аказала яму падтрымку. Апошні кароль Рэчы Паспалітай (1764—1795).

*Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Мастак Ю. К. Гескі. 1783 г.*

З **1766 г.** у Рэчы Паспалітай былі ўведзены адзіныя меры вымярэння даўжыні, вагі, аб'ёму. Гэта садзейнічала актывізацыі гандлю. Асаблівая ўвага надавалася паляпшэнню шляхоў зносін. У другой палове XVIII ст. былі пабудаваны новыя сухапутныя *тракты*, у прыватнасці, пінска-слонімскі і пінска-валынскі. Праводзілася работа па ачышчэнні руслаў рэк, будаўніцтве мастоў, прычалаў. У 1775—1784 гг. ішло будаўніцтва Каралеўскага (Дняпроўска-Бугскага) канала, які злучыў Прыпяць з Заходнім Бугам. Яго даўжыня склала 110 км. Адкрыў суднаходства па канале сам кароль. Разам са світай у сорак чалавек ён праплыў на судне, якое было выдзеўбана з цэльнага дубовага ствала.

**2. Гарады Беларусі.** Аслабленне гарадоў выкарысталі буйныя феадалы і каралеўскія чыноўнікі. Яны пачалі ўводзіць незаконныя паборы і павіннасці, пашыраць свае юрыдыкі. Гэта занепакоіла вярхоўную ўладу. Каралі Рэчы Паспалітай былі вымушаны пацвярджаць выдадзеныя раней правы гарадам.

У 1764 г. у гарадах была адменена кватэрная павіннасць, якой карысталіся шляхецкія паслы ў час соймаў. Манастырам забаранялася мець корчмы і гандляваць, што падрывала мяшчанскі гандаль. Жыхары юрыдык сталі падпарадкоўвацца магістратам, а яўрэі — ваяводам і старостам. Рамеснікі пачалі вырабляць тавары для продажу на рынку, павялічылася колькасць партачоў.

Паступова адраджалася гарадское жыццё. У канцы XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі налічвалася 389 гарадскіх паселішчаў, у якіх пражывала каля


Правообладатель Издательский центр БГУ

250 тыс. чалавек. Буйнымі гарадамі з’яўляліся Віцебск, Гродна, Магілёў, Мінск. У гарадах і мястэчках павялічылася колькасць яўрэяў. Іх доля дасягнула 30—40 %.

З канца XVIII ст. у гарадскім жыцці пашырылася роля шляхты. Гэтаму садзейнічала пастанова сойма 1775 г., якая дазваляла шляхецкаму саслоўю мяшчанскія заняткі.

Па-ранейшаму з тэрыторыі Беларусі вывозілі ў асноўным прадукты земляробства і лясных промыслаў, напрыклад, дрэва і паташ. Сярод імпарту пераважалі гатовыя вырабы прамысловасці. Унутраны гандаль захоўваў кірмашовы характар. Найбольш буйныя кірмашы праводзіліся ў Мінску, Шклове, Бешанковічах, Зэльве.

**3. Сельская гаспадарка.** Развіццё таварна-грашовых адносін спрыяла росту феадальнай гаспадаркі. Асноўнай яе формай заставаўся фальварак. Прычым у другой палове XVIII ст. ён пашырыўся і ва ўсходняй частцы Беларусі. Праўда, тут высокую ролю традыцыйна захоўвалі *промыслы*, напрыклад, вытворчасць спірту, нарыхтоўка лесу, паташу. Паны ў сваіх маёнтках пачалі бу-




*Гаспадарка ВКЛ*

Издательский центр БГУ



Правообладатель Издательский центр БГУ

даваць *алейні* (маслабойні), *рудні* (дробныя металургічныя прадпрыемствы), *фолюшы* (сукнавальні), *бровары* (вінакурні).

У земляробстве па-ранейшаму выкарыстоўвалася трохполле. Аднак у асобных маёнтках з'явіўся чатырохпольны севазварот. Вырошчвалі ўасноўным збожжавыя культуры. Але традыцыйна пашыранае азімае жыта саступіла месца яравым культурам. Значна больш сталі вырошчваць лёну і каноплі. З 1780-х гг. у некаторых маёнтках з'явілася бульба. За яе вырошчванне нават прызначалі для сялян прэміі — да 20 злотых.

Развіццё таварна-грашовых адносін прывяло да з'яўлення «багатых», «заможных», «сярэдніх» і «ўбогіх» сялян. Ужо ў другой палове XVIII ст. каля 10 % сялян засталіся без зямлі. Яны былі вымушаны наймацца на працу да багатых суседзяў, на мануфактурныя прадпрыемствы.

**4. Аграрная рэформа А. Тызенгаўза.** Змяніліся адносіны дзяржавы да эканомій. Вядома, што шляхта брала іх у арэнду і аддавала за гэта дзяржаве $^1/_4$ частку прыбыткаў. Але на сойме 1764 г. было прынята рашэнне перадаць каралеўскія эканоміі ў дзяржаўнае кіраванне. Падскарбі ВКЛ ***Антоній Тызенгаўз*** у **1765 г.** правёў у іх аграрную рэформу.



**Гістарычная асоба**

АНТОНІЙ ТЫЗЕНГАЎЗ (1733—1785) паходзіў са шляхецкага роду, які меў нямецкія карані. Займаў пасады падскарбія ВКЛ, гродзенскага старосты, адміністратара каралеўскіх эканомій. Цэнтрам дзейнасці Тызенгаўза былі гарады Гродна і Паставы. Правал «эканамічнага цуду» Тызенгаўза прывёў да адхілення яго ад кіравання эканоміямі ў 1780 г.

На беларускіх землях рэформа праводзілася ў Гродзенскай, Брэсцкай, Кобрынскай, Магілёўскай эканоміях. Яна прадугледжвала аднаўленне фальваркаў і паляпшэнне тэхналогіі апрацоўкі зямлі. Прапаноўвалася ўвядзенне чатырохпольнага севазвароту за кошт пашырэння пасеваў шматгадовых траў. Гэтыя мерапрыемствы павінны былі павялічыць дзяржаўныя прыбыткі, якія планавалася пусціць на арганізацыю мануфактур.

Рэформа пачалася з рэвізіі дзяржаўных зямель. У залежнасці ад якасці глебы яе падзялілі на добрую, сярэднюю, дрэнную і вельмі дрэнную. Пасля



Правообладатель Издательский центр БГУ

былі арганізаваны фальваркі. Селянін з асноўнага надзелу ($^1/_4$ валокі) выконваў 2 дні паншчыны (на тыдзень), 4 згоны (на год), шарваркі, рабіў грашовыя выплаты, пастаўляў натуральную даніну. Сельскім гаспадарам дазвалялася браць прыёмную зямлю пры ўмове выплаты дадатковага чыншу.

У вёсках ствараліся *«камунальныя магазіны»* — агульныя запасы збожжа для членаў грамады. Яны фарміраваліся шляхам збору ад кожнага гаспадара розных відаў збожжа. «Камунальны магазін» дазваляў сялянам атрымліваць дапамогу падчас неўраджаю, стыхійнага бедства або збяднеласці.

Таксама ў эканоміях былі арганізаваны *«камунальныя касы»*. Грошы, сабраныя з кожнага дыма, ішлі на агульныя патрэбы, напрыклад, на добраўпарадкаванне вёскі, аплату працы фельчара, доктара і г. д.

Уведзеныя правілы ўнутранага распарадку забаранялі сялянам прымаць у сваіх хатах бадзяг, гультаёў, заразных хворых. Ім неабходна было засцерагаць уласную жывёлу ад эпідэмічных захворванняў. Гандляваць сялянам дазвалялася толькі ў дзяржаўных гарадах і мястэчках.

У выніку рэформы ў эканоміях павялічылася колькасць сялян, якія адбывалі паншчыну. Цяпер селянін меў права перадаваць свой надзел у спадчыну. Спыніліся злоўжыванні з боку арандатараў дзяржаўных маёнткаў.

З другога боку, большасць сялян не прыняла рэформу, паколькі павялічыліся іх павіннасці перад дзяржавай. Аб гэтым сведчаць шматлікія сялянскія скаргі, іх нежаданне выконваць паншчыну. Напрыклад, сяляне Гродзенскай эканоміі ў 1777 г. скардзіліся каралю на рабаванні іх гаспадарак кіраўнікамі маёнткаў.

**5. Магнацкае прадпрымальніцтва.** Пад уплывам Асветніцтва на тэрыторыі Беларусі распаўсюджваліся ліберальныя ідэі. Іх прапагандавала частка магнатаў, якія традыцыйна падтрымлівалі цесныя сувязі з Заходняй Еўропай. У магнацкім асяродку з'явіліся прыхільнікі ідэй французскіх *фізіякратаў*. Фізіякраты лічылі, што зямля і земляробства ёсць асноўная крыніца багацця, а сельскагаспадарчая праца — адзіная вытворчая праца. Адным з першых у Беларусі пачаў крытыку прыгоннага права, выступіў супраць жорсткага абыходжання паноў з сялянамі прыхільнік фізіякратаў Міхал Карповіч. Ён прапанаваў перавесці сялян на чынш, адкрыць у вёсках школы.


*Іахім Храптовіч*

З ліквідацыяй забароны займацца гаспадарчай дзейнасцю магнаты сталі актыўна ўключацца ў эканамічнае жыццё. Граф Іахім Храптовіч у маёнтках



Правообладатель Издательский центр БГУ

Шчорсы (Навагрудскі павет) і Вішнева (Ашмянскі павет) практыкаваў прагрэсіўныя метады вядзення сельскай гаспадаркі. Ён заключыў з кожным сялянскім дваром дагавор, па ўмовах якога прыгонным было выгадна мець як мага большыя ўраджаі. Таму ўраджайнасць збожжавых была вельмі высокай. Атрыманую прадукцыю магнат адпраўляў у горад Каралявец (Кёнігсберг).

Храптовіч замяніў паншчыну на чынш. За трэць валокі зямлі сяляне аддавалі грашыма кошт $^1/_3$ часткі ўраджаю і паловы сена. За карыстанне лесам яны плацілі грошы або дастаўлялі на панскі двор дровы, аддавалі палову сабраных ягад, грыбоў. У цэлым прыбыткі з маёнткаў павялічыліся ў 3 разы.

Таксама Храптовіч арганізаваў у Вішневе металургічныя мануфактуры. Яны працавалі на мясцовай балотнай рудзе, а драўняны вугаль нарыхтоўваўся ў навакольных лясах. Тут упершыню на тэрыторыі Беларусі была пабудавана доменная печ. Мануфактуры давалі каля 22—23 тыс. пудоў жалеза ў год.

У Гродне ў 1760—1780-я гг. дзейнічала 21 каралеўская мануфактура. Іх заснаваў А. Тызенгаўз. Акрамя мануфактур граф адкрыў школы, у якіх рыхтавалі мернікаў, бухгалтараў, будаўнікоў. Пад яго кіраўніцтвам праводзілася ачышчэнне русла Нёмана. Тызенгаўз таксама ініцыяваў развядзенне мясамалочных парод жывёлы, племянных жарабцоў, выкарыстанне парнікова-цяплічнай сістэмы.

Грандыёзныя праекты па асушэнні палескіх балот і пракладцы праз іх дарог прапанаваў адміністратар графа Міхала Казіміра Агінскага ***Мацей Бутрымовіч***. Слонімскі магнат пагадзіўся і ў 1765 г. пачаў будаўніцтва канала, які павінен быў звязаць басейны Дняпра і Нёмана праз рэкі Шчару і Ясельду. У 1783 г. канал пачаў дзейнічаць. Яго даўжыня склала 54 км. Канал меў



*Вырабы гродзенскіх каралеўскіх мануфактур: габелен з гербам Рэчы Паспалітай, шаўковы пояс*



Правообладатель Издательский центр БГУ

10 шлюзаў. Буксіравалі судны коні, для чаго берагі былі добраўпарадкаваны. Таксама ў Слоніме М. Агінскі адкрыў ткацкія мануфактуры па вырабе шаўковых тканін, шпалер, ворсавых дываноў.

Дзве мануфактуры ў Ружанах арганізавалі магнаты Сапегі. Першае прадпрыемства дзейнічала з 1780 г. і выпускала сукно. Другая мануфактура вырабляла шоўк, паясы, сукно, байку, атлас, сталовыя абрусы.

Не цураўся новаўвядзенняў і Міхал Казімір Радзівіл (Рыбанька). У сярэдзіне XVIII ст. ён заснаваў у Нясвіжы дывановую і суконную мануфактуры, а ў прыгарадзе Нясвіжа — Альбе — шаўкаткацкую.

Усяго ў другой палове XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі існавала 53 мануфактуры, на якіх працавала каля 2,5 тыс. рабочых. Але гэта былі прыгонныя работнікі. Толькі ў гарадах на цагельных і гарбарных мануфактурах выкарыстоўвалася вольнанаёмная праца.

Магнацкае прадпрымальніцтва мела часовы характар. Новыя прадпрыемствы дзейнічалі, як правіла, толькі на працягу жыцця іх заснавальнікаў. Прадукцыя мануфактур была арыентавана на арыстакратычнага пакупніка. Кошт тавараў быў вельмі высокім. Гэта выклікала складанасці з іх продажам. Да таго ж на мануфактурах неэканомна выкарыстоўвалася сыравіна.

Не ўсе магнаты падтрымалі новаўвядзенні. У часы праўлення Станіслава Аўгуста Панятоўскага шляхецкая апазіцыя на чале з Ка́ралем Станіславам Радзівілам (мянушка Пане Каханку) разгарнула *«вайну фрака і жупана»*. Іх не задавальнялі еўрапейскія ідэі і еўрапейская культура. А за імі пайшла большая частка шляхты.

### МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

**З інвентара маёнткаў Шчорсы і Нягневічы**

...Маёнткі Шчорсы і Нягневічы з фальваркамі і населенымі вёскамі здаўна належаць роду графаў Храптовічаў... Сяляне гэтых маёнткаў яшчэ пры жыцці... літоўскага канцлера, графа Іахіма Храптовіча, у 1790 г. атрымалі ад яго асобыя для сябе правы... У выніку чаго з іх згоды скасавана паншчына...

2. Ворныя, сенакосныя, пашавыя і прысядзібныя землі, што знаходзяцца ў іх [сялян], аддадзены ім... у арэнду па існуючых тут... цэнах, як бы свабодным людзям...

3. ...Яны [сяляне] вызвалены ад падарожчыны, шарваркаў, начной старожы, даніны і дзякла, але за ўсё гэта маёнтак... плаціць наяўнымі грашыма па найме...

7. Выплата дзяржаўных падаткаў і збораў, здача рэкрутаў, утрыманне шпіталя, лекара і аптэкі, засыпка страхавога сялянскага магазіна, рамонт дарог,

Правообладатель Издательский центр БГУ

перавозка ваенных камандаў і грузаў, перавозка арыштантаў... дастаўка земскай пошты павінны выконвацца самімі сялянамі ва ўсталяваны тэрмін і па кожным патрабаванні ўлад...

Вызначце элементы капіталістычнага гаспадарання ў маёнтках Храптовіча.

### Пытанні і заданні

1. Чаму ў 1760-я гг. у Рэчы Паспалітай пачаліся эканамічныя рэформы?
2. Што прадугледжвалі новаўвядзенні?
3. Назавіце новыя рысы ў развіцці гарадоў і мястэчак Беларусі.
4. Вызначце асаблівасці працэсу аднаўлення сельскай гаспадаркі.
5. Ахарактарызуйце рэформу А. Тызенгаўза.
6. Хто такія фізіякраты?
7. Дайце ацэнку сельскагаспадарчым эксперыментам І. Храптовіча.
8. Раскажыце аб развіцці магнацкага прадпрымальніцтва.
9. Чаму мануфактуры не сталі пануючай формай арганізацыі вытворчасці ў другой палове XVIII ст.?
10. Як вы лічыце, ці было прагрэсіўнай з'явай тое, што на мануфактурах працавалі прыгонныя?
11. Дайце азначэнні паняццяў: *Скарбовая камісія ВКЛ, промыслы, алейня, рудня, фолюш, бровар, тракт, фізіякраты, «камунальны магазін», «камунальная каса», «вайна фрака і жупана».*

## § 23. ПАЛІТЫЧНЫ КРЫЗІС РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

### Успомніце

Прадстаўнікі якой канфесіі складалі большую частку насельніцтва Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст.?

**1. Дысідэнцкае пытанне.** Вывесці Рэч Паспалітую з палітычнага крызісу магла толькі поўная цэнтралізацыя краіны. Гэта разумеў кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Ён выступаў за працяг рэформ, пачатых на сойме 1764 г. Неабходна было скасаваць права «ліберум вета», увесці спадчынную каралеўскую ўладу, павялічыць армію. Пры гэтым кароль спадзяваўся на падтрымку Расіі і Прусіі. Але суседнія краіны хацелі бачыць слабую Рэч Паспалітую. Так, расійска-прускі дагавор 1764 г. меў сакрэтны артыкул, паводле



Правообладатель Издательский центр БГУ

якога манархі абавязваліся захоўваць права «ліберум вета», выбарнасць караля, шырокія шляхецкія правы.

Прычынай умяшальніцтва замежных краін ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай стала дысідэнцкае пытанне. **Дысідэнтамі** называлі шляхту некаталіцкага веравызнання, гэта значыць праваслаўную і пратэстанцкую. Яны не маглі займаць дзяржаўныя пасады, выбірацца пасламі на агульнадзяржаўны сойм і мясцовыя соймікі. Ім нават забаранялася будаваць новыя храмы.

Расійская імперыя праз свайго пасла Мікалая Рапніна патрабавала ад караля Рэчы Паспалітай ураўнавання ў правах дысідэнтаў з католікамі. Таго ж пажадалі Прусія, Англія, Данія і Швецыя. Кароль пагаджаўся выканаць патрабаванне пры ўмове папярэдняга скасавання «ліберум вета». Але супраць выступілі магнаты Чартарыйскія, якія імкнуліся захаваць папулярнасць сярод большасці шляхты.

Сойм 1766 г., нягледзячы на пагрозы М. Рапніна, адмовіўся выканаць патрабаванне Расіі. Тады імператрыца Кацярына II прапанавала стварыць шляхецкія канфедэрацыі, на што выдаткавала 335 тыс. злотых. У **1767 г.** у Слуцку была арганізавана праваслаўна-пратэстанцкая канфедэрацыя, а ў Торуні — пратэстанцкая. Але яны былі нешматлікімі. У спіс шляхты Слуцкай канфедэрацыі нават упісалі дзяцей. Таму яе называлі «цыганскай».

Паколькі канфедэрацыі не знайшлі падтрымкі сярод большасці шляхты Рэчы Паспалітай, М. Рапнін прапанаваў магнатам-«рэспубліканцам» падтрымаць расійскі праект. Ён абяцаў садзейнічаць у спыненні рэформ, што праводзіліся, і ў адхіленні ад трона Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

Новая прарасійская канфедэрацыя ўтварылася ў 1767 г. у г. Радаме. Яе ўзначаліў знакаміты нясвіжскі магнат ***Ка́раль Станіслаў Радзівіл*** (мянушка Пане Каханку).



**Гістарычная асоба**

КАРАЛЬ СТАНІСЛАЎ РАДЗІВІЛ (1734—1790) вучыўся ў Нясвіжскім езуіцкім калегіуме. Займаў пасады маршалка Трыбунала ВКЛ, віленскага ваяводы. Валодаў вялікімі маёнткамі ў ВКЛ, Польшчы, Літве, Украіне. Увайшоў у гісторыю як легкадумны палітык і абмежаваны сваавольны чалавек. Быў вельмі папулярны сярод шляхты.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Канфедэраты звярнуліся да Кацярыны II, каб яна дапамагла вярнуць ім былыя правы і вольнасці. У іх падтрымку з Расіі ў Рэч Паспалітую было накіравана 40-тысячнае войска.

Варшаўскі сойм у **1768 г.** задаволіў патрабаванні дысідэнтаў. Ім былі дадзены роўныя правы з каталікамі. Таксама было адменена папярэдняе рашэнне аб абмежаванні права «ліберум вета». Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай зацвярджаўся ў форме так званых **Кардынальных правоў**. Яны прадугледжвалі «ліберум вета», свабодны выбар караля, права на ўтварэнне шляхецкіх канфедэрацый, права шляхты займаць дзяржаўныя пасады, валодаць зямлёй і сялянамі. Пастанова сойма адзначала: «...усе гэтыя Кардынальныя правы ніколі, нікім... не могуць быць адменены і парушаны, а кожны, хто супраць гэтых правоў... выступіць, той за непрыяцеля Айчыны павінен лічыцца...» Гарантаваць выкананне Кардынальных правоў павінна была Расійская імперыя.

**2. Барацьба з Барскай канфедэрацыяй.** Моцны расійскі ўплыў і ўзвышэнне дысідэнтаў прывялі да незадаволенасці каталіцкай шляхты. Яна ў лютым **1768 г.** стварыла канфедэрацыю ў мястэчку Бар на тэрыторыі Украіны. Канфедэраты выступілі ў абарону каталіцкай веры і суверэнітэту Рэчы Паспалітай. Яны жадалі, каб кароль пакінуў трон, і спадзяваліся на дапамогу Францыі і Аўстрыі. Гэта прымусіла караля і Сенат краіны звярнуцца за дапамогай да Расіі.

На тэрыторыі Беларусі першыя канфедэрацкія атрады з'явіліся ў Браслаўскім, Ашмянскім, Навагрудскім, Брэсцкім, Рэчыцкім паветах. Яны спадзяваліся на падтрымку Караля Радзівіла. Але Пане Каханку пайшоў на саюз з Расіяй і распусціў уласнае войска. За гэта яму было дазволена захаваць за сабой велізарныя зямельныя ўладанні і крэпасці ў Нясвіжы і Слуцку. Расійская армія ўзяла пад кантроль такія буйныя гарады, як Мінск, Пінск, Брэст, Слонім.



*Крыж барскіх канфедэратаў*

У 1769 г. па тэрыторыі Беларусі ваенныя рэйды ажыццявілі канфедэрацкія атрады братоў Пуласкіх з Польшчы. Баі адбыліся пад Слонімам і Кобрынам. Перамогу атрымалі расійскія войскі.

Тады Францыя вырашыла аказаць падтрымку Барскай канфедэрацыі праз накіраванне ваенных інструктараў, прадастаўленне грошай і зброі. Канфедэраты аб'явілі Станіслава Панятоўскага «ўзурпатарам і тыранам» і заклікалі пазбавіць яго жыцця. Кароль звярнуўся за дапамогай да Расіі, і зноў у Рэчы Паспалітай з'явіліся замежныя войскі.


Правообладатель Издательский центр БГУ

На бок канфедэратаў перайшоў гетман ВКЛ ***Міхал Казімір Агінскі***, які выставіў двухтысячны атрад. Штурм Нясвіжа і Слуцка аказаўся няўдалым. А ў верасні 1771 г. Міхал Казімір Агінскі пацярпеў паражэнне каля мястэчка Сталавічы ад расійскага войска пад камандаваннем Аляксандра Суворава. Такім чынам, на працягу 1768—1771 гг. атрады Барскай канфедэрацыі былі разбіты.



**Гістарычная асоба**

МІХАЛ КАЗІМІР АГІНСКІ (1730—1800) — прадстаўнік магнацкага роду герба «Агінец». Гетман вялікі ВКЛ, кампазітар, паэт, мецэнат. Некаторы час жыў у Францыі, затым у Расіі. Ад Кацярыны II атрымаў ордэн Андрэя Першазваннага. Падтрымаў Барскую канфедэрацыю. Пасля яе разгрому выехаў у Еўропу. Затым вярнуўся ў Слонім, дзе заснаваў мануфактуры, друкарню, тэатр.

**3. Першы падзел Рэчы Паспалітай.** Разгром барскіх канфедэратаў даў магчымасць суседнім дзяржавам ажыццявіць першы падзел Рэчы Паспалітай. Яшчэ ў 1769—1770 гг. Аўстрыя і Прусія занялі частку паўднёвых і паўночных зямель Польшчы. Яны заклікалі далучыцца да іх Кацярыну II.

Перагаворы ў Пецярбургу завяршыліся падпісаннем 5 жніўня **1772 г.** трохбаковага дагавора. Расія атрымала Усходнюю Беларусь і частку Прыбалтыкі (Інфлянты). Да Прусіі адышла паўночна-заходняя частка Польшчы, Аўстрыя захапіла частку Заходняй Украіны і паўднёвую частку Польшчы.

Сойм Рэчы Паспалітай павінен быў зацвердзіць падпісаны акт. Гэтага патрабавалі Расія, Прусія і Аўстрыя, каб надаць «законнасць» сваім дзеянням. Трохгадовы сойм 1773—1775 гг. быў скліканы пад націскам расійскага пасла, які пагражаў шляхце новай вайной і спусташэннем краіны.

Супраць выступіла частка шляхецкіх паслоў з беларускіх зямель. Іх прадстаўлялі ***Тадэвуш Рэйтан, Самуэль Корсак*** і ***Станіслаў Багушэвіч***. Дэпутат ад Навагрудскага ваяводства Рэйтан у знак пратэсту лёг перад пасламі ў дзвярах. Але гэты



*Карыкатура на першы падзел Рэчы Паспалітай. 1772 г.*



Правообладатель Издательский центр БГУ



*Тадэвуш Рэйтан на сойме 1773 г. Мастак Я. Матэйка. 1866 г.*

ўчынак не аказаў маральнага ўздзеяння на пазіцыю шляхецкай большасці сойма. Яны пераступілі цераз яго і падпісалі пагадненні з замежнымі краінамі. З мэтай замацавання расійскага ўплыву на ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай на сойме ў 1775 г. была створана **Пастаянная Рада**. Гэта быў першы пастаянна дзеючы ўрад Рэчы Паспалітай.

Такім чынам, палітычны крызіс Рэчы Паспалітай прывёў да падзелаў гэтай краіны замежнымі дзяржавамі.

МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

**З кнігі М. І. Кастамарава «Апошнія гады Рэчы Паспалітай» (1869 г.)**

...першы падзел Польшчы неабходна было зацвердзіць на сойме, быццам бы ён быў ажыццёўлены з добраахвотнай згоды палякаў. Штакельберг [расійскі пасол] ... лёгка гэта ўладкаваў. Большая частка паслоў былі на жалаванні ў краін, якія задумалі падзел, і атрымлівалі па 300 і болей чырвонцаў у месяц, а... маршалку, Адаму Панінскаму, было прызначана 3000 чырвонцаў у месяц. Сойм адкрыўся ў 1773 г. у форме канфедэрацыі і падпісаў усе ўмовы падзелу.

Пра што сведчыць прыведзены ўрывак?

## Пытанні і заданні

1. Хто такія дысідэнты?
2. У чым сутнасць дысідэнцкага пытання?
3. Ці сапраўды Расія была зацікаўлена ў раўнапраўі шляхты Рэчы Паспалітай?



Правообладатель Издательский центр БГУ

4. Чаму сфарміравалася Барская канфедэрацыя?
5. Дзе адбыліся ваенныя дзеянні супраць канфедэратаў?
6. Да якіх наступстваў прывяло паражэнне «барычан»?
7. Якія краіны ініцыявалі першы падзел Рэчы Паспалітай? Пералічыце і пакажыце на карце тэрыторыі Рэчы Паспалітай, атрыманыя замежнымі краінамі.
8. Чаму сойм 1773—1775 гг. зацвердзіў першы падзел краіны?
9. Дайце азначэнні паняццяў: *дысідэнты, Кардынальныя правы, Пастаянная Рада*.
10. Чаму Францыя падтрымала Барскую канфедэрацыю?

## § 24. СПРОБЫ РЭФАРМАВАННЯ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

**Успомніце**

Дзе і калі былі прыняты Дэкларацыя незалежнасці і Дэкларацыя правоў чалавека і грамадзяніна?

**1. Чатырохгадовы сойм (1788—1792).** Пасля першага падзелу ў Рэчы Паспалітай актывізаваўся рух за ліквідацыю яе залежнасці ад Расіі. Гэта магло быць дасягнута толькі праз далейшыя рэформы палітычнага ладу краіны. За іх правядзенне выступаў кароль і яго прыхільнікі. Сярод іх быў маршалак ВКЛ ***Ігнацы Патоцкі***, князь ***Адам Чартарыйскі, Станіслаў Малахоўскі***. Праект рэформы падрыхтаваў вядомы дзеяч ***Гуга Калантай***.

Ажыццяўленню пераўтварэнняў садзейнічала міжнародная сітуацыя. Расія і Аўстрыя ў той час вялі вайну з Турцыяй. Адначасова разгарнулася расійска-шведская вайна. На бок Швецыі сталі Прусія, Англія і Галандыя. Паколькі адносіны паміж Расіяй і Прусіяй пагоршыліся, то склалася спрыяльная сітуацыя, каб пазбавіцца ад расійскага ўплыву.



*Ігнацы Патоцкі. Мастак М. Такарскі*

Новыя рэформы ў Рэчы Паспалітай адобрыў Чатырохгадовы сойм, які ўвайшоў у гісторыю як *«Вялікі сойм»*.

Усе паслы жадалі павялічыць войска краіны. Таму яны аб’явілі сойм канфедэрацыяй. Гэта дало магчымасць прымаць рашэнні большасцю галасоў. Адпадала пагроза зрыву сойма з-за выкарыстання «ліберум вета». Вялікае ўражанне на паслоў зрабіў



Правообладатель Издательский центр БГУ



*Адам Чартарыйскі. Мастак Ю. Пешка*







*Медаль, выбіты ў гонар пастановы Чатырохгадовага сойма пра павелічэнне войска*

зварот прускага караля Фрыдрыха II. Ён прапанаваў Рэчы Паспалітай саюз, накіраваны супраць Расіі. Таму першым рашэннем сойма стала павелічэнне рэгулярнага войска да 100 тыс. чалавек.

Паўстала пытанне аб сродках на ўтрыманне арміі. Паслы вырашылі павялічыць у 2 разы арэндную плату з уладальнікаў старостваў, у 3,5 раза — з былых езуіцкіх маёнткаў. Прыватныя землеўласнікі павінны былі штогод аддаваць на войска 10 % прыбытку. Але і гэтых сродкаў не хапала. Таму колькасць пастаяннай арміі скарацілі да 65 тыс. чалавек.

Новай з'явай у соймавай практыцы стала *«чорная працэсія»*. Прадстаўнікі 141 горада Рэчы Паспалітай, апранутыя ў чорнае адзенне, накіраваліся ў каралеўскі замак і падалі *петыцыю*. Прадстаўнікі мяшчан дамагаліся права набываць ва ўласнасць зямлю, займаць дзяржаўныя пасады, выбіраць сваіх паслоў на соймы.

У кожным ваяводстве і павеце ствараліся спецыяльныя камісіі з прадстаўнікоў шляхты і мяшчан. Яны павінны былі займацца пытаннямі набору, размяшчэння і забеспячэння арміі. Таксама камісіі адказвалі за збор падаткаў, будаўніцтва дарог і мастоў, ажыццяўлялі нагляд за мясцовымі школамі.

У 1790 г. беззямельная шляхта страціла права выбіраць на павятовых сойміках паслоў на агульнадзяржаўны сойм. Гэтае рашэнне было скіравана супраць уплыву і самавольства магнатаў, таму што беззямельная шляхта была сродкам рэалізацыі іх амбіцый. Таксама былі пашыраны правы мяшчан. Жыхары гарадоў атрымалі права на асабістую недатыкальнасць без рашэння суда. Цяпер яны маглі дасылаць сваіх прадстаўнікоў на соймы, набываць ва ўласнасць маёнткі. Да таго ж мешчанін мог атрымаць шляхецкае званне.

**2. Канстытуцыя Рэчы Паспалітай.** Галоўным вынікам дзейнасці «Вялікага сойма» стала Канстытуцыя, прынятая **3 мая 1791 г.** Яе тэкст падрыхтавалі Ігнацы Патоцкі і Гуга Калантай. Дакумент



Правообладатель Издательский центр БГУ

складаўся з уводзін і 11 раздзелаў. Канстытуцыя абвясціла незалежнасць і суверэнітэт Рэчы Паспалітай.

Усім жыхарам Рэчы Паспалітай прадастаўлялася свабода веравызнання. Але каталіцтва заставалася пануючай канфесіяй. За шляхтай замацоўваліся ўсе правы і свабоды, а за гарадамі — новыя паўнамоцтвы мяшчан.

Асобны раздзел быў прысвечаны сялянскаму саслоўю. Праца сялян лічылася галоўнай крыніцай багацця дзяржавы, а само сялянства — самай вялікай часткай насельніцтва. Але прыгоннае права скасавана не было.

Новы ўрад краіны стаў называцца *«Стража правоў»*. Ён складаўся з караля, прымаса, 5 міністраў: паліцыі, унутраных спраў, замежных спраў, вайсковага і фінансаў. Канстытуцыя адмяняла «ліберум вета», выбарнасць каралеўскай улады. Прадугледжвалася стварэнне судоў, незалежных ад адміністрацыі.


USTAWA
RZĄDOWA.
PRAWO UCHWALONE.
Dnia 3. Maia, Roku 1791.
w WARSZAWIE,
w Drukarni Uprzywileiowaney M. GRÖLLA,
Księgarza Nadwornego J. K. Mci.

*Тытульны ліст Канстытуцыі 3 мая 1791 г.*



*Абвяшчэнне Канстытуцыі 3 мая 1791 г. Мастак Я. Матэйка. 1891 г.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Канстытуцыя 3 мая не ўпаміналa Вялікае Княства Літоўскае, што выклікала занепакоенасць паслоў ад Княства. Вынікам спрэчак стаў дакумент, прыняты соймам у кастрычніку **1791 г.**, — *«Узаемнае заручэнне абодвух народаў»*. Паводле дакумента прадугледжваліся агульныя дзяржаўныя органы кіравання, аб'яднанне войска і фінансаў. Ва ўрадзе павінна была быць аднолькавая колькасць прадстаўнікоў ВКЛ і Польшчы. Гродна разам з Варшавай захавала статус горада, дзе збіраліся соймы. Відавочна, што кампраміс значна абмежаваў самастойнасць Княства ў Рэчы Паспалітай.

Канстытуцыя 3 мая 1791 г.
- Адзіны ўрад «Стража правоў»
- Агульнае войска і фінансы
- Незалежныя ад адміністрацыі суды
- «Узаемнае заручэнне абодвух народаў»

Канстытуцыя дазваляла пераадолець палітычны крызіс у Рэчы Паспалітай, вывесці краіну на шлях буржуазнага развіцця. Яна была прынята грамадствам, таму што большасць (90 %) павятовых соймікаў станоўча аднесліся да гэтага дакумента. Канстытуцыя 3 мая лічыцца першай буржуазнай канстытуцыяй, прынятай у Еўропе.

**3. Таргавіцкая канфедэрацыя. Вайна 1792 г.** Паколькі Канстытуцыя 1791 г. скасавала шматлікія шляхецкія правы, то свой пратэст выказалі кансерватыўна настроеныя колы шляхты і магнатаў. Ксаверый Браніцкі, Станіслаў Патоцкі і Севярын Ржавускі накіраваліся ў Расію і папрасілі ваеннай і палітычнай падтрымкі ў Кацярыны II, каб адмяніць канстытуцыю. Тая з радасцю пагадзілася, бо не прыняла змен, якія адбыліся ў Рэчы Паспалітай. Была ўтворана шляхецкая канфедэрацыя. «Акт канфедэрацыі» яе лідары склалі ў Пецярбургу і абвясцілі 14 мая **1792 г.** у мястэчку Таргавіца (ва Украіне). Таргавіцкая канфедэрацыя патрабавала вярнуць шляхце ўсе яе былыя правы і свабоды.



*Манета (талер) Таргавіцкай канфедэрацыі. Адчаканена ў Гродне. 1793 г.*

Расійская імперыя накіравала на падтрымку таргавічан амаль 100-тысячнае войска. Адна яго частка пад камандаваннем М. Кахоўскага рушыла ва Украіну, а другая пад камандаваннем М. Крачэтнікава — у беларускія землі. Ім супрацьстаяла падначаленая каралю армія Рэчы Паспалітай. Яна саступала расійскаму войску па колькасці салдат і афіцэраў.


Правообладатель Издательский центр БГУ

У маі — ліпені 1792 г. расійскае войска заняло большую частку тэрыторыі Беларусі. Садзеянне яму аказала беззямельная шляхта, якая арганізавала павятовыя канфедэрацыі ў падтрымку таргавічан. Беззямельная шляхта жадала вярнуць свае правы, страчаныя па Канстытуцыі 3 мая.

Станіслаў Панятоўскі прапанаваў Расіі заключыць перамір'е. Кацярына II настойвала, каб кароль далучыўся да Таргавіцкай канфедэрацыі. 24 ліпеня 1792 г. Станіслаў Аўгуст Панятоўскі перайшоў на бок апазіцыі і загадаў спыніць ваенныя дзеянні. У знак пратэсту шмат патрыятычна настроеных афіцэраў пакінулі Рэч Паспалітую, выехаўшы за мяжу. Шляхецкія правы былі адноўлены, але суседнія краіны ажыццявілі другі падзел Рэчы Паспалітай.

**4. Другі падзел Рэчы Паспалітай.** Расія і Прусія 23 студзеня **1793 г.** падпісалі дагавор аб другім падзеле Рэчы Паспалітай. Свае дзеянні яны апраўдвалі дрэнным уплывам на караля і сойм Французскай рэвалюцыі, так званай «якабінскай заразы».

Расійская імперыя атрымала цэнтральную частку Беларусі з гарадамі Мінск, Нясвіж, Слуцк, Пінск, Мазыр і частку Правабярэжнай Украіны. Дзяржаўная мяжа прайшла па лініі Друя — Пінск. Прускае каралеўства заняло Гданьск, Познань і Торунь з часткай паўночных польскіх зямель.

Лідары Таргавіцкай канфедэрацыі былі падмануты, паколькі была парушана цэласнасць краіны. Адны выехалі ў свае маёнткі, іншыя эмігрыравалі. Кароль нават хацеў адмовіцца ад трона, але Кацярына II забараніла. Ёй Станіслаў Аўгуст Панятоўскі быў патрэбны для правядзення сойма, які б зацвердзіў другі падзел краіны.

Апошні сойм Рэчы Паспалітай адбыўся ў чэрвені — лістападзе **1793 г.** у Гродне. Яго называюць *другім «нямым» соймам*. Выбары паслоў прайшлі пад кантролем расійскага пасла барона Я. Сіверса. На сойм не дапусцілі прыхільнікаў Канстытуцыі 3 мая 1791 г.

Шляхецкія паслы падпісалі дагавор з Расіяй без абмеркавання. Але моцны пратэст выклікаў праект дамовы з Прусіяй. 23 верасня гродзенскі каралеўскі замак быў акружаны двума батальёнамі салдат. Расійскі афіцэр нават сеў у крэсле побач з каралём. Каля ўваходу ў замак былі пастаўлены гарматы. Шляхецкія паслы 24 верасня маўчалі да чацвёртай гадзіны раніцы. Падобным чынам яны выказвалі свой пратэст і нежаданне падпісваць





*Медаль, прысвечаны далучэнню беларускіх зямель да Расіі. 1793 г.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

дагавор з Прусіяй. Маршалак сойма Станіслаў Бялінскі тройчы запрошваў у паслоў іх рашэння. У адказ — маўчанне. Тады кракаўскі пасол Іосіф Анквіч заявіў, што маўчанне трэба разумець як згоду з умовамі польска-прускага пагаднення.

Другі падзел краіны паставіў яе на край гібелі. Гэта добра ўсведамлялі патрыятычныя колы Рэчы Паспалітай. Паўстанне 1794 г. на чале з Тадэвушам Касцюшкам давала апошні шанс, каб захаваць дзяржаву.

МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

**З Канстытуцыі 3 мая 1791 г.**

Усякая ўлада ў чалавечым грамадстве бярэ свой пачатак у волі народа. І каб цэласнасць дзяржавы, свабода грамадзян і грамадскі парадак заставаліся заўжды ў раўнавазе, урад народа польскага павінен складацца, і па волі гэтага закона заўжды будзе складацца, з трох улад, гэта значыць заканадаўчай улады ў злучаных станаў, вышэйшай выканаўчай улады ў караля і стражы і ўлады судовай...

На падставе дакумента вызначце, чаму Кацярына II назвала Канстытуцыю 1791 г. «увасабленнем якабінскіх правіл».

**З кнігі М. І. Кастамарава «Апошнія гады Рэчы Паспалітай» (1869 г.)**

«Пагодзімся, — гаварыў ён [пасол Нарбут], — што ў Расіі ёсць прычыны скардзіцца на Польшчу. На апошнім сойме [«Вялікім»] да Расіі было мала павагі, разарваны быў трактат і гарантыі, мы прадпрымалі супраць яе вайну. Усё гэта заслугоўвае, каб Рэч Паспалітая цяпер скарысталася такімі сродкамі, якія б прымусілі Расію забыць усё, што адбылося, і прывялі да замірэння з... імператрыцай, сяброўства якой яшчэ адновіць для Польшчы шчаслівыя дні».

Ці магла разлічваць Кацярына II на паспяховае вырашэнне пытання аб другім падзеле Рэчы Паспалітай?

**З кнігі В. І. Вадавозава «Нарысы з рускай гісторыі XVIII ст.» (1904 г.)**

...кароль ужо пагаджаўся з канфедэратамі [таргавіцкімі]. Даведаўшыся, што яны ўладкаваліся ў Брэст-Літоўску, ён сказаў: «Шкада, там месца такое нездаровае». Але яму прыйшлося вынесці шмат зняваг. Ш. Патоцкі абыходзіўся з ім ганарыста, рабіў яму натацыі, як школьніку, за папярэднюю адданасць


Правообладатель Издательский центр БГУ

патрыётам. Ад яго патрабавалі, каб... ён асудзіў як здраднікаў папярэдніх сяброў сваіх. Кароль плакаў, даходзячы амаль да вар'яцтва...

Якой выглядае асоба апошняга караля Рэчы Паспалітай?

### Пытанні і заданні

1. Чаму ў канцы XVIII ст. узнікла неабходнасць у рэфармаванні палітычнага ладу Рэчы Паспалітай?
2. Раскажыце аб Чатырохгадовым сойме. Чаму яго назвалі «Вялікім соймам»?
3. Ахарактарызуйце Канстытуцыю 3 мая 1791 г.
4. Дакажыце, што Канстытуцыя 3 мая мела буржуазны характар.
5. Калі і чаму ўзнікла Таргавіцкая канфедэрацыя?
6. Якую ацэнку можна даць паводзінам лідараў таргавічан?
7. Чаму адбыўся другі падзел Рэчы Паспалітай?
8. Назавіце і пакажыце на карце тэрыторыі, атрыманыя Расіяй і Прусіяй.
9. Параўнайце «нямыя» соймы 1717 і 1793 гг.
10. Дайце азначэнні паняццяў: *«чорная працэсія», петыцыя, Стража правоў, «Узаемнае заручэнне абодвух народаў».*

## § 25. ПАЎСТАННЕ 1794 г. У БЕЛАРУСІ

### Успомніце

Як аднеслася шляхта Рэчы Паспалітай да першага і другога падзелаў сваёй краіны?


*Тадэвуш Касцюшка*

**1. Тадэвуш Касцюшка.** Пасля Гродзенскага сойма кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі вярнуўся ў Варшаву. За ім прыбыў новы расійскі пасол барон Ігельстром. Ён камандаваў амаль 30-тысячным войскам, якое пастаянна знаходзілася на тэрыторыі Рэчы Паспалітай.

Прысутнасць замежнай арміі выклікала незадаволенасць патрыятычна настроеных колаў грамадства, найперш шляхты, мяшчан і духавенства. Яны імкнуліся захаваць дзяржаўную самастойнасць Рэчы Паспалітай, пазбавіцца ад уплыву замежных краін, вярнуць Канстытуцыю 3 мая.

Издательский центр БГУ


Правообладатель Издательский центр БГУ



*Паўстанцы-касінеры*

У **1794 г.** адбылося паўстанне, характар якога вызначаецца як нацыянальна-вызваленчы і буржуазна-дэмакратычны.

Кіраўніком паўстання з'яўляўся генерал ***Тадэвуш Касцюшка*** (1746—1817). Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка нарадзіўся ў фальварку Мерачоўшчына каля мястэчка Косава Слонімскага павета ў шляхецкай сям'і Людвіка Тадэвуша і Тэклі Касцюшкаў. На думку беларускіх гісторыкаў, нованароджанае дзіця хрысцілі спачатку ва ўніяцкай царкве (па жаданні маці) і назвалі Андрэем у гонар апостала Андрэя Першазваннага. Польскія вучоныя мяркуюць, што маленькага Касцюшку назвалі ў гонар Святога Андрэя Карсіні, дзень нараджэння якога выпадае на 4 лютага. Два іншых імені Касцюшку далі па патрабаванні бацькі ў гонар Святога Тадэвуша і Святога Банавентуры, глыбока шанаваных каталіцкай царквой.

У дзевяць гадоў хлопчыка аддалі ў школу ордэна піяраў, дзе ён навучаўся на працягу пяці гадоў. Пасля яе заканчэння Касцюшка вярнуўся дамоў і наступныя пяць гадоў дапамагаў маці весці гаспадарку, бо бацьку забілі мясцовыя сяляне.

У 1765 г. юнака прынялі ў Варшаўскае ваеннае вучылішча. Выдатныя здольнасці і ўпартыя заняткі дазволілі яму стаць адным з лепшых кадэтаў. Закончыў навучанне Касцюшка ў чыне капітана. З мэтай удасканалення ведаў у ваенных навуках у другой палове 1769 г. Тадэвуш Касцюшка адправіўся на вучобу ў Францыю. Там ён пазнаёміўся з ідэямі французскіх асветнікаў.

У 1776 г. Т. Касцюшка выехаў у Амерыку, дзе прыняў актыўны ўдзел у Вайне за незалежнасць ЗША. Ён ваяваў на баку рэспубліканцаў супраць англійскага ўладарніцтва. На пасадзе галоўнага вайсковага інжынера арміі Поўначы Касцюшка ўдзельнічаў у будаўніцтве фартыфікацый пад Саратогай. У далейшым ён кіраваў будаўніцтвам найвялікшай цытадэлі ЗША ў Вест-Пойнце. У 1783 г. Кангрэс ЗША надаў Касцюшку званне брыгаднага генерала. Ён быў удастоены вышэйшай узнагароды — ордэна Цынцыната, атрымаў пажыццёвую пенсію і зямельны надзел.

По вяртанні на радзіму Т. Касцюшка далучыўся да патрыятычнага руху.

**2. Ход паўстання.** Паўстанне пачалося з абвяшчэння Касцюшкам *«Акта паўстання»* ў Кракаве. Дакумент вызначаў мэту выступлення — аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Рэалізацыя «Акта паўстання» патрабавала



Правообладатель Издательский центр БГУ

вываду замежных войскаў, вяртання адабраных зямель, ажыццяўлення рэформ. Лозунгам паўстанцаў у Польшчы стаў дэвіз: «Вольнасць, цэласнасць, незалежнасць».

Паўстанне ахапіла тэрыторыю Літвы і заходняй часткі Беларусі ў другой палове красавіка 1794 г. Агульная колькасць яго ўдзельнікаў на тэрыторыі Беларусі складала каля 25 тыс. чалавек. Сярод іх былі шляхціцы, духавенства, мяшчане, сустракаліся і **касінеры**. Так называлі сялян, узброеных косамі. Яны прымалі ўдзел у бітвах пад вёскамі Паляны, Ліпнішкі, Солы, Крупчыцы.



*Якуб Ясінскі. Невядомы мастак. Каля 1794 г.*

*Паланецкі ўніверсал*, абвешчаны 7 мая, дазваляў сялянам атрымаць асабістую свабоду пры ўмове, што яны разлічацца з панамі і заплацяць дзяржаўныя падаткі. Аднак гэты дакумент сустрэў процідзеянне шляхты.

Цэнтрам паўстання на беларуска-літоўскіх землях стала Вільня. У ноч на 23 красавіка горад апынуўся ў руках паўстанцаў. Імі кіраваў інжынер-палкоўнік, паэт ***Якуб Ясінскі*** (1761—1794). Ён прадстаўляў *«якабінскую»* плынь у паўстанні.



*Прысяга Т. Касцюшкі на Кракаўскім рынку. Мастак Ф. Смуглевіч. 1797 г.*



Издательский центр БГУ
Правообладатель Издательский центр БГУ

**Гістарычная даведка**

«Віленскімі якабінцамі» называлі частку ўдзельнікаў паўстання 1794 г. у Літве і Беларусі. У асноўным гэта былі шляхціцы-афіцэры. Яны выступалі за скасаванне паншчыны, паступовую адмену прыгоннага права, адмену саслоўных абмежаванняў для мяшчан. «Віленскія якабінцы» адкрыта падтрымлівалі Французскую рэвалюцыю, якая пачалася ў 1789 г., выказвалі надзею на дапамогу з боку рэвалюцыйнай Францыі.



Пячатка Найвышэйшай літоўскай рады



Тамаш Ваўжэцкі

У Вільні быў створаны самастойны орган кіравання паўстаннем — *Найвышэйшая літоўская рада*. Але начальнікам паўстання прызнавалі Тадэвуша Касцюшку. Рада 30 красавіка, раней, чым у Польшчы, прыняла зварот «Да земляробаў і люду вясковага». У ім згадвалася «воля перад законам і свабода...», аднаўлялася Канстытуцыя 3 мая. Да таго ж на тэрыторыі Беларусі ў паўстанні прымалі ўдзел прадстаўнікі розных рэлігійных канфесій.

Буйныя паўстанцкія атрады ўзначальвалі Міхал Клеафас Агінскі, Стафан Грабоўскі, Ка́раль Серакоўскі. Яны ажыццяўлялі хуткія пераходы, глыбокія рэйды ў тыл праціўніка, засады. Паўстанцы занялі Гродна, Брэст, Навагрудак, Слонім, Ваўкавыск, Ліду, Ашмяны, Кобрын, Браслаў.

Падаўленнем паўстання займаліся асабіста Кацярына II і прускі кароль Фрыдрых II. Пасля бою каля *вёскі Крупчыцы* (пад Кобрынам), які адбыўся 17 верасня 1794 г., атрады Караля Серакоўскага вымушаны былі адступіць. Потым мяцежнае войска было разгромлена пад Брэстам. 10 кастрычніка 1794 г. *пад Мацяёвіцамі* (недалёка ад Варшавы) каля 15 тыс. паўстанцаў далі бой колькасна большаму корпусу генерала І. Ферзена. Бітва скончылася перамогай расійскіх войскаў. Тысячы паўстанцаў загінулі або трапілі ў палон. Цяжкапаранены Т. Касцюшка быў вывезены ў Петрапаўлаўскую крэпасць Пецярбурга.

Начальнікам узброеных сіл паўстання 12 кастрычніка Найвышэйшая нацыянальная рада ў Варшаве прызначыла ўраджэнца Беларусі ***Тама-***



Правообладатель Издательский центр БГУ



*Узяцце Прагі. Мастак А. Арлоўскі. 1797 г.*

***ша Ваўжэцкага***. 4 лістапада расійскія войскі пад камандаваннем А. Суворава авалодалі ўмацаваным прадмесцем Варшавы — Прагай. Толькі пасля гэтага было прынята рашэнне аб капітуляцыі горада. Штурм прадмесця расійскім войскам увайшоў у гісторыю як *«пражская разня»*. Падчас яго загінулі тысячы мірных жыхароў і каля 10 тыс. паўстанцаў. На барыкадах Прагі загінуў і легендарны Якуб Ясінскі. Варшава капітулявала 6 лістапада. Паўстанне было падаўлена.

Менавіта за жорсткае задушэнне паўстання А. Сувораў атрымаў ад Кацярыны II званне фельдмаршала, а таксама больш за 13 тыс. прыгонных сялян Кобрынскага павета. Усяго ж расійскім вайскоўцам і грамадзянскім чыноўнікам было раздадзена больш за 80 тыс. прыгонных сялян беларускіх зямель.

Шансаў на перамогу ў паўстанні 1794 г. было няшмат. Яго не падтрымала асноўная маса сялян, гараджан, а шляхта імкнулася да таго, каб не дапусціць шырокага выступлення гарадскіх нізоў і сялянства. Акрамя таго, невыкананне распараджэнняў Т. Касцюшкі, а часам і адкрытая здрада падрывалі сілы паўстанцаў.

**3. Трэці падзел Рэчы Паспалітай.** Ініцыятарам новага падзелу Рэчы Паспалітай стала Аўстрыя. 24 кастрычніка **1795 г.** Расія, Прусія і Аўстрыя падпісалі дагавор аб канчатковай ліквідацыі гэтай краіны. Расійская імперыя атрымала землі Заходняй Беларусі, частку Літвы, Курляндыю, Заходнюю Валынь і частку Холмскай зямлі з насельніцтвам каля 1 млн 200 тыс. чалавек. Колькасць жыхароў уласна беларускіх зямель у складзе Віленскага, Навагрудскага, Гродзенскага і часткі Брэсцкага ваяводстваў складала да 840 тыс. чалавек.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Да Прусіі адышлі большая частка Мазавецкага ваяводства разам з Варшавай, часткі Падляшскага, Гродзенскага, Трокскага ваяводстваў і Жамойці з насельніцтвам каля 1 млн чалавек.

Аўстрыя атрымала Малую Польшчу з Кракавам і Люблінам, паўднёвую частку Падляшша і заходнюю частку Брэсцкага ваяводства з насельніцтвам 1 млн 500 тыс. чалавек.

Ліквідацыя Рэчы Паспалітай была парушэннем усіх міжнародных правоў. Еўрапейскія краіны, занятыя вайной з рэвалюцыйнай Францыяй, не




*Падзелы Рэчы Паспалітай*



Правообладатель Издательский центр БГУ

аказалі ёй дапамогі. У нябыт адышла старая феадальная Рэч Паспалітая, а новая, рэфармаваная, не паспела ўсталявацца. У гэтым была віна не толькі суседніх дзяржаў, але і кансерватыўнай шляхты самой Рэчы Паспалітай.

Пасля паражэння паўстання кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі выехаў у Гродна. Тут ён даведаўся пра апошні падзел краіны і 25 лістапада 1795 г. добраахвотна адмовіўся ад трона. Апошнія гады жыцця ён правёў у Пецярбургу, дзе памёр, пакінуўшы шматлікія даўгі.

### Пытанні і заданні

1. Чаму ў 1794 г. Рэч Паспалітую ахапіла паўстанне?
2. Ахарактарызуйце гістарычную асобу кіраўніка паўстання Тадэвуша Касцюшкі.
3. Раскрыйце ход паўстання.
4. Вызначце асаблівасці паўстання на тэрыторыі Польшчы і на тэрыторыі ВКЛ.
5. Чаму паўстанне пацярпела паражэнне?
6. Назавіце прычыну трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай.
7. Якія землі Рэчы Паспалітай атрымалі Расія, Прусія і Аўстрыя?
8. Хто вінаваты ў падзелах Рэчы Паспалітай?
9. Падрыхтуйце заданне на тэму: «Ці былі альтэрнатывы падзелам Рэчы Паспалітай?».
10. Дайце азначэнні паняццяў: *«Акт паўстання», Паланецкі ўніверсал, касінеры, «віленскія якабінцы», Найвышэйшая літоўская рада, «пражская разня»*.

## § 26. АДУКАЦЫЯ І НАВУКА

### Успомніце

Чаму ў Заходняй Еўропе з канца XVII ст. пачала фарміравацца новая культурна-гістарычная эпоха — Асветніцтва?

**1. Асаблівасці Асветніцтва на беларускіх землях.** Моцны ўплыў на культуру беларускіх зямель другой паловы XVIII ст. аказалі ідэі **Асветніцтва**. Гэты грамадска-палітычны і культурны рух, які ў канцы XVII—XVIII ст. ахапіў усю Еўропу, быў накіраваны на ўсталяванне буржуазнай культуры і ліквідацыю феадальнага ладу.

На тэрыторыі Беларусі і Літвы Асветніцтва не набыло рэвалюцыйнага характару, як у Францыі. Новыя ідэі ўкараняліся шляхам рэформ. Праваднікамі перадавой ідэалогіі сталі прагрэсіўныя колы шляхты і духавенства.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Асветніцтва ў ВКЛ было арыентавана на вырашэнне сялянскага пытання. Вядомыя грамадскія дзеячы таго часу імкнуліся да таго, каб сяляне мелі роўныя правы з іншымі саслоўямі. Яны патрабавалі арганізаваць сістэму адукацыі ў вёсцы.

Вядомым прадстаўніком Асветніцтва з'яўляўся магнат ***Іахім Храптовіч*** (1729—1812). Ён займаў пасаду маршалка, а затым канцлера ВКЛ. Пісаў вершы на польскай мове, заснаваў у Варшаве «Таварыства сяброў навук». У сваім маёнтку Шчорсы пад Навагрудкам Іахім Храптовіч арганізаваў узорную сельскагаспадарчую абшчыну, якая стала вядома далёка за межамі Рэчы Паспалітай.

Першым «шляхецкім рэвалюцыянерам» гісторыкі лічаць выхадца са збяднелай шляхецкай сям'і ***Іосіфа Яленскага*** (1756—1813). Пасля заканчэння Гродзенскай землямернай школы ён працаваў пісарам, бухгалтарам. У 1794 г. І. Яленскі быў арыштаваны расійскім урадам за свае рэвалюцыйныя творы. У іх ён крытыкаваў прыгоннае права, выступаў за роўнасць саслоўяў і дэмакратычную рэспубліку.

Ідэі Асветніцтва сталі асновай для выпрацоўкі актуальных палітычных праектаў, якія былі накіраваны на ліквідацыю ў краіне магнацка-шляхецкай анархіі, права «ліберум вета», саслоўнай нераўнапраўнасці. Такія асветнікі XVIII ст., як Адам Нарушэвіч, Тамаш Гусаржэўскі, Тадэвуш Млоцкі, выступалі за манархічны лад дзяржавы з моцнай цэнтральнай уладай. Некаторыя асветнікі падтрымлівалі ідэі еўрапейскага парламентарызму з яго падзелам улады на выканаўчую, судовую і заканадаўчую.

**2. Адукацыя.** Другая палова XVIII ст. характарызуецца паступовым выхадам грамадскай думкі і адукацыі з-пад уплыву царквы. Сведчаннем новых тэндэнцый стала рэформа піярскіх школ. У 1741 г. кіраўніком правінцыі ордэна піяраў у Рэчы Паспалітай быў прызначаны ***Станіслаў Канарскі*** (1700—1773). Ён унёс змены ў працэс навучання дзяцей і моладзі. У прыватнасці, вялікае значэнне стала надавацца вывучэнню польскай мовы і прыродазнаўства. С. Канарскі абгрунтоўваў неабходнасць эстэтычнага і фізічнага выхавання дзяцей.



*Станіслаў Канарскі*

У **1773 г.** загадам рымскага папы была забаронена дзейнасць езуітаў. Маёмасць ордэна перайшла да **Адукацыйнай камісіі**, якая лічыцца першай у Еўропе свецкай установай у галіне асветы. Школьная адукацыя набыла нецаркоўны характар. Акрамя асноўных прадметаў дзеці сталі вывучаць агарод-



Правообладатель Издательский центр БГУ

ніцтва, земляробства, ахову здароўя, архітэктуру, мастацтва. Ім выкладалася нават маральнасць — навука аб дрэнных і добрых учынках чалавека. У першым класе вывучаліся абавязкі дзяцей, у другім — адносіны слуг да паноў, у трэцім — асабістыя ўчынкі чалавека. Вялікая ўвага надавалася фізічнаму выхаванню. Вучні гулялі ў мяч, кідалі каменні ў ваду, вымяралі палі і агароды, бегалі.




*Тытульны ліст падручніка па алгебры, выдадзенага Адукацыйнай камісіяй*

Адукацыйная камісія ў 1783 г. зацвердзіла адзіны для ўсіх школ краіны статут навучання. Ён прадугледжваў стварэнне сістэмы адукацыі з трох тыпаў школ: пачатковых (*парафіяльных*), сярэдніх (*акруговых* і *падакруговых*), вышэйшых (*Галоўнай школы ВКЛ*). На тэрыторыі Беларусі Адукацыйная камісія адкрыла 20 сярэдніх і каля 200 пачатковых школ. У іх навучаліся 2500 вучняў, пры гэтым амаль трэцюю частку іх складалі дзеці сялян. Падобным чынам забяспечвалася *ўсесаслоўнасць навучання*, калі ў школах вучыліся дзеці як прывілеяваных, так і непрывілеяваных саслоўяў.

Вышэйшая адукацыя
**Галоўная школа ВКЛ**

↑

Сярэдняя адукацыя
**20 акруговых і падакруговых школ**

↑

Ніжэйшая адукацыя
**200 пачатковых школ**

*Сістэма адукацыі на беларускіх землях у XVIII ст.*

Новай з'явай у развіцці адукацыі стала арганізацыя прафесійных навучальных устаноў. Дзякуючы намаганням А. Тызенгаўза ў Гродне і Паставах былі адкрыты медыцынская, акушэрская, ветэрынарная, фінансавая, чарцёжная і рысавальная школы. Найбольшую вядомасць атрымала медыцынская школа ў Гродне. Ёю кіраваў француз ***Жан Эмануэль Жылібер*** (1741—



Правообладатель Издательский центр БГУ



*Будынак Гродзенскай медыцынскай школы. Сучасны выгляд*

1814). У школе дзейнічалі шпіталь, анатамічны кабінет, заалагічны сад, музей, бібліятэка. Былі падрыхтаваны тры выпускі ўрачоў.

Такім чынам, Адукацыйная камісія вырашыла дзве важныя задачы. У навучанні дзяцей сталі пераважаць прыродазнаўчыя і грамадскія навукі. Адбыўся пераход да метадаў развіваючага навучання. Матэрыял урокаў вучні ўжо не завучвалі на памяць, а вучыліся разважаць.

**3. Навука.** У пашырэнне Асветніцтва на беларускіх землях вялікі ўклад зрабіў праваслаўны дзеяч ***Георгій Каніскі*** (1717—1795). Яго погляды былі глыбока рэлігійнымі. Разам з тым ён паважліва ставіўся да поглядаў Каперніка і Галілея. Каніскі збіраў архіўныя крыніцы па гісторыі праваслаўнай царквы ў Беларусі, выступаў супраць усеўладдзя магнатаў, за моцную цэнтральную ўладу. Прамова Каніскага ў абарону правоў дысідэнтаў была перакладзена на еўрапейскія мовы як узор абароны верацярпімасці.



*Георгій Каніскі. Партрэт канца XVIII ст.*

Філасофскую думку прадстаўляў віленскі прафесар ***Казімір Нарбут*** (1738—1807). Першапачатковую адукацыю ён атрымаў у піярскай школе. Затым вучыўся ў піярскім вучылішчы ў Рыме. Казімір Нарбут лічыў, што філасофія павінна служыць грамадству. Ён падтрымліваў рэформы, якія праводзіліся ў Рэчы Паспалітай, у прыватнасці, выказваў сваё захапленне будаўніцтвам Дняпроўска-Бугскага канала, развіццём мануфактур.

Еўрапейскую папулярнасць сваімі філасофскімі працамі здабыў ***Саламон Майман*** (каля 1753—1800). Нарадзіўся ён каля мястэчка Мір. Адукацыю атрымаў у галоўнага рабіна Слуцка. Ва ўзросце дваццаці пяці гадоў Майман адправіўся



Правообладатель Издательский центр БГУ

ў Германію, дзе вывучаў філасофію, фізіку, матэматыку і французскую мову. Ён быў першым каментатарам і крытыкам вядомага нямецкага філосафа Імануіла Канта.

Прыхільнікам фізіякратаў быў ураджэнец Брэстчыны ***Міхал Карповіч*** (1744—1803). Ён атрымаў адукацыю ў езуіцкім калегіуме, затым выкладаў багаслоўе і царкоўную гісторыю. Міхал Карповіч адзін з першых у ВКЛ пачаў крытыкаваць прыгоннае права.

Папулярнасць сярод вучняў школ набылі кнігі ***Ка́раля Вырвіча*** (1717—1793) у якасці падручнікаў па ўсеагульнай гісторыі. Вырвіч лічыў, што гісторыя — гэта сукупнасць змен у палітычным жыцці, звычаях, рэлігіі, навуцы, мастацтве. Важнае месца ён адводзіў ролі эканомікі ў грамадскім жыцці, а галоўнай крыніцай багацця краіны лічыў гандаль.



*Адам Нарушэвіч*

Развіццё гістарычнай навукі звязана з імем ***Мацея Догеля*** (1715—1760). Ён нарадзіўся ў вёсцы Гембулы Лідскага павета, скончыў піярскую школу ў Шчучыне. З 1748 г. як пасол Рэчы Паспалітай Мацей Догель атрымаў магчымасць працаваць у бібліятэках Германіі, Францыі, Галандыі. Ён меў доступ да каралеўскіх архіваў Кракава і Нясвіжа. Гэта дазволіла апублікаваць зборнік дакументаў «Дыпламатычны кодэкс Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага». Сабраныя ім матэрыялы раскрывалі гісторыю знешняй палітыкі Польшчы, Літвы і Беларусі ў XIII—XVIII стст.

По прапанове караля вядомы польскі паэт, ураджэнец Піншчыны ***Адам Нарушэвіч*** (1733—1796) падрыхтаваў «Гісторыю польскага народа». Для напісання кнігі ён арганізаваў групу капіравальшчыкаў. Іх накіравалі ў Германію, Італію, Швейцарыю для перапіскі гістарычных дакументаў. Даследчык цікавіўся ўзаемаадносінамі царквы і дзяржавы, паходжаннем прыгоннага права, шляхамі пераадолення заняпаду краіны. Яго ідэалам была моцная каралеўская ўлада.



*Марцін Пачобут-Адляніцкі. Мастак Ю. Аляшкевіч*

Значны ўклад у развіццё навукі ўнёс ураджэнец Гродзеншчыны ***Марцін Пачобут-Адляніцкі*** (1728—1810). Будучы студэнтам Віленскай акадэ-



Правообладатель Издательский центр БГУ

міі, ён зацікавіўся астраноміяй. Каб пашырыць свае веды, накіраваўся ў Пражскі ўніверсітэт. Затым у Вільні даследчык арганізаваў астранамічную абсерваторыю. Ён вывучаў планеты Сонечнай сістэмы, адкрыў невядомае сузор'е, вызначыў геаграфічныя каардынаты многіх населеных пунктаў Беларусі. На працягу 23 гадоў Пачобут-Адляніцкі кіраваў Галоўнай школай ВКЛ. Ён запрасіў на працу ў Вільню аўстрыйскага прыродазнаўца Г. Форстэра, італьянскага хіміка Дж. Сарторыуса, фізіёлага С. Бізіа, а з Гродна — Ж. Жылібера. Апошні заснаваў у Гродне першы ў Беларусі батанічны сад. Калекцыя складалася з раслін, атрыманых са Страсбургскага і Эдынбургскага садоў, падараванняў вядомых батанікаў. У батанічным садзе былі экзатычныя і мясцовыя расліны — больш за 2000 відаў. Таксама ў Гродне Жылібер апублікаваў першыя два тамы сваёй кнігі «Флора Літвы».

МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

**З «Логікі...» Казіміра Нарбута**

Логіка — гэта навука, якая вучыць, як спасцігнуць і спазнаць ісціну, або, што адно і тое ж: гэта мастацтва правільнага мыслення... Яна абавязана даць абгрунтаваныя правілы... і паказаць, што яны прыводзяць наш розум да пазнання ісціны і перасцерагаюць яго ад памылак...

? У чым заключаецца прызначэнне логікі як навукі?

## Пытанні і заданні

1. Назавіце асаблівасці эпохі Асветніцтва ў ВКЛ.
2. Дакажыце, што магната Іахіма Храптовіча можна лічыць прадстаўніком Асветніцтва.
3. Каго называюць першым «шляхецкім рэвалюцыянерам»? Чаму?
4. Якім чынам ідэі Асветніцтва паўплывалі на развіццё адукацыі?
5. Раскрыйце ўклад Адукацыйнай камісіі ў развіццё свецкага навучання.
6. Як вы разумееце прынцып усесаслоўнасці адукацыі?
7. Ахарактарызуйце развіццё навукі ў другой палове XVIII ст.
8. Падрыхтуйце паведамленні аб вядомых прадстаўніках навукі беларускіх зямель другой паловы XVIII ст.

Издательский центр БГУ
Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 27. ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

**Успомніце**

Які статус мела беларуская мова ў Рэчы Паспалітай з канца XVII ст.?

**1. Літаратурнае жыццё.** У XVIII ст. у літаратуры беларускіх зямель шырока замацавалася польская мова. Пад уплывам Асветніцтва з'яўляюцца творы класічнага і сентыментальнага характару. Зварот да народнай гутаркі назіраўся ў так званых «нізкіх» драматургічных жанрах. Напрыклад, у пастаноўках ***Каятана Марашэўскага*** і ***Міхала Цяцерскага*** выкарыстоўвалася беларуская мова. У Забельскім калегіуме на Віцебшчыне яны арганізавалі школьны тэатр. У беларуска-польскай «Камедыі» К. Марашэўскі паказаў цяжкае жыццё прыгоннага селяніна Дзёмкі. М. Цяцерскі ў камедыі «Доктар па прымусу» стварыў цікавыя вобразы беларускіх сялян Хведара і Апанаса.

Пачатак перыядычнаму друку ў Беларусі і Літве паклаў ***Ян Пашакоўскі*** (1684—1757). Ён выкладаў філасофію, граматыку і багаслоўе ў Коўне, Вільні, Нясвіжы, выхоўваў сыноў магната Міхала Казіміра Радзівіла (Рыбанькі). Галоўнай справай жыцця Яна Пашакоўскага стала выданне календароў. Толькі ў Вільні на працягу 1737—1749 гг. ён апублікаваў дваццаць «Палітычных каляндарыкаў». Адзін з іх прызначаўся для жанчын, што не было ўласціва гэтаму часу. У календарах крытыкавалася геліяцэнтрычная сістэма М. Каперніка, пералічваліся астранамічныя з'явы, называліся найважнейшыя падзеі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы. У другой палове XVIII ст. выданне «Палітычных каляндарыкаў» працягнуў у Вільні ***Францішак Папроцкі*** (1723—1805). Ён таксама выдаваў і рэдагаваў штотыднёвік на польскай мове *«Кур'ер Літэўскі»*, у якім змяшчаў шмат матэрыялаў з Беларусі. У гэтым выданні Папроцкі надрукаваў невялікую кнігу К. Галоўкі «Хатнія звесткі пра Вялікае Княства Літоўскае». Яна стала першай энцыклапедыяй, паколькі давала інфармацыю па геаграфіі, прыродзе, гісторыі беларуска-літоўскіх зямель.

Першым перыядычным выданнем на тэрыторыі Беларусі лічыцца польскамоўная *«Газэта Гродзеньска»*. Яе першы нумар выйшаў у маі 1776 г. На дзвюх старонках змяшчалася інфармацыя пра найбольш значныя падзеі ў Рэчы Паспалітай і свеце, асвятлялася мясцовае жыццё, друкаваліся аб'явы. Кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі ўвёў


GAZETA GRODZIENSKA

*«Газэта Гродзеньска». 1776 г. № 1*

Издательский центр БГУ



Правообладатель Издательский центр БГУ

пасаду цэнзара, які замяняў «ненадзейныя» для ўрада артыкулы паведамленнямі з іншых выданняў.

**2. Архітэктура і выяўленчае мастацтва.** У другой палове XVIII ст. паралельна з познім барока развіваўся **класіцызм**, з канца XVIII ст. гэты стыль стаў вызначальным у мастацтве. Шырокае развіццё атрымала горадабудаўніцтва. Для класіцызму характэрны сіметрычнасць пабудоў, дакладнасць і строгасць формаў, гармонія архітэктуры і навакольнага прыроднага ландшафту.

Пад уплывам французскіх узораў магнаты і шляхта пачалі ствараць у сваіх маёнтках палацава-паркавыя ансамблі. Для гэтага імі былі запрошаны знакамітыя дойліды *Я. Бекер, Дж. Сака, К. Спампані*. Пабудовы гэтых архітэктараў адрознівае спалучэнне элементаў класіцызму і традыцый архітэктуры барока. У гэтым стылі пабудаваны Ружанскі і Свяцкі палацы.

Рысы класіцызму паступова пранікалі і ў выяўленчае мастацтва. У іканапісе новым стала тое, што абразы пачалі пісаць не толькі на дрэве, але і на палатне. Акрамя таго, усё больш адчуваўся ўплыў свецкага жывапісу Заходняй Еўропы і беларускага народнага мастацтва.

У свецкім жывапісе па-ранейшаму дамінавалі партрэтны і гістарычны жанры. Цэнтрам падрыхтоўкі мастакоў стала Віленская мастацкая школа. Так называлі кафедру малюнка і жывапісу, створаную ў 1797 г. у Віленскім універсітэце. Вядомымі яе выкладчыкамі былі ***Францішак Смуглевіч*** і ***Ян Ру-***



*Ружанскі палац. Гравюра паводле малюнка Н. Орды*



Правообладатель Издательский центр БГУ



*Францішак Смуглевіч. Бітва пры Хаціне ў 1673. Да 1797 г.*

***стэм***. Смуглевіч распрацаваў першую праграму навучання жывапісу. Яна ўключала капіраванне ўзораў антычнага мастацтва, маляванне з гіпсавых фігур, маляванне з жывой мадэлі (уведзена Я. Рустэмам). Вядомы мастацкія палотны Смуглевіча на гістарычную тэматыку: «Бітва каля Берасцечка ў 1651», «Бітва пры Хаціне ў 1673», «Прысяга Т. Касцюшкі на Кракаўскім рынку». Рустэму належыць шэраг партрэтаў вядомых дзеячаў Беларусі, у тым ліку Т. Касцюшкі.

**3. Музыка і прыгонны тэатр.** У другой палове XVII—XVIII ст. існавалі прыгонныя капэлы, якія выступалі на сямейных і вялікіх публічных святах, і прыгонныя аркестры ў Нясвіжы, Слоніме, Гродне, Шклове, Магілёве, Ружанах, Дзярэчыне. З іх вылучаліся аркестры змешанага складу, камерныя струнныя аркестры («хатняя музыка»), духавыя («музыка шклоўскага корпуса»), рогавыя, ударных, народных інструментаў («янычарская музыка», «літоўская музыка»). Шырокую вядомасць атрымаў прыгонны аркестр у Нясвіжы. Мясцовыя магнаты запрасілі туды першакласных музыкантаў: капельмайстра Дж. Альберціні, скрыпача Дж. Канстанціні, віяланчэліста Я. Фляйшмана. «Паўночнымі Афінамі» называлі маёнтак Залессе *Міхала Клеафаса Агінскага* — аўтара славутага паланэза «Развітанне з Радзімай», актыўнага ўдзельніка паўстання 1794 г. Найбольш папулярным музычным творам у шляхты з'яўлялася опера з сюжэтам з жыцця сялян ці самой шляхты. Так, ініцыятарам стварэння оперы «Агатка» на вершы Мацея Радзівіла і музыку *Яна Давіда Голанда* быў вядомы Пане Каханку.

З сярэдзіны XVIII ст. аматарскія акцёрскія трупы ў прыватных маёнтках магнатаў ператвараюцца ў прафесійныя прыгонныя тэатры. Росквіт прыгоннага тэатра быў абумоўлены ўплывам Асветніцтва. Тэатр з'яўляўся моцным сродкам выхавання і паляпшэння нораваў грамадства. Развіццю тэат-



Правообладатель Издательский центр БГУ

ральнага мастацтва садзейнічалі не толькі каралі Рэчы Паспалітай (Аўгуст II, Аўгуст III), але і магнаты. Для апошніх грамадска-палітычная дзейнасць спалучалася з забаўляльнымі формамі побыту. У час агульнага пагаршэння жыцця яны імкнуліся да вычварнага ўпрыгожання свайго быту, што праяўлялася ў выкананні бессэнсоўных рытуалаў, у цікавасці да моды ў адзенні — напрыклад, парыкі, абутак з чырвонымі абцасамі. Усё гэта адпавядала **ракако** — стылю, які тэатралізаваў побыт. Напрыклад, у Гераніма Радзівіла адстрэл звяроў на паляванні адбываўся ў спецыяльным бутафорскім лесе. А Пане Каханку ператварыў у тэатр касцёльнае набажэнства: на імшы ў Нясвіжы спявалі яўрэі, апранутыя ў турэцкія касцюмы. Каля Нясвіжа была пабудавана «ідэальная» вёска, якую ён засяліў збяднелай шляхтай. Яе жыхароў называлі «альбанская банда». Само жыццё насельнікаў гэтай вёскі было тэатралізаваным і бутафорскім. Яны хадзілі «ўзброеныя» турэцкімі мушкетамі і ўсходнімі музычнымі інструментамі. Такім чынам, тэатр з'яўляўся часткай побыту.

Абсалютна ўнікальнай з'явай можна лічыць Нясвіжскі тэатр ***Францішкі Уршулі Радзівіл***, жонкі магната Міхала Казіміра Радзівіла (Рыбанькі). Спачатку палацавыя прадстаўленні павінны былі «ўпрыгожваць» жыццё. Так, першая п'еса «Дасціпнае каханне» (1746) ставілася з нагоды дня нараджэння Міхала Казіміра. Аднак паступова ў тэатральнае жыццё ўцягнуліся многія прыдворныя Радзівілаў, шляхта, духавенства, багатыя мяшчане.

Сюжэты твораў Францішкі Радзівіл не былі арыгінальнымі, але і не з'яўляліся прамым пераказам на польскую мову заходнееўрапейскіх твораў. Яна



*Паланэз пад адкрытым небам. Мастак К. Шлегель*



Правообладатель Издательский центр БГУ

напаўняла свае п'есы мясцовым каларытам, фальклорам, фактамі з жыцця Нясвіжа. Пры тэатры дзейнічалі балетная, музычная і тэатральная школы.

Еўрапейскую славу набыў Слонімскі тэатр, які стварыў Міхал Казімір Агінскі, незвычайна разнастайная і таленавітая асоба. Ён быў і оперным кампазітарам (аўтар опер «Елісейскія палі», «Сілы свету», «Становішча саслоўяў»), і музыкантам-віртуозам, і паэтам. Тэатр быў заснаваны ў 1771 г. У ім працавалі прафесійныя акцёры з Польшчы, Германіі, Італіі, дзейнічалі хор, балет, музычная школа. Тут наладжваліся грандыёзныя прадстаўленні. Сцэна тэатра была настолькі велізарная, што акцёры маглі заязджаць на яе на конях. Калі ўзнікала неабходнасць, то на сцэне мог з'явіцца басейн, які быў размешчаны пад падлогай. Тады можна было назіраць сапраўдныя марскія баі.



*Сцэна са спектакля «Каханне — зацікаўлены суддзя» Францішкі Уршулі Радзівіл. Гравюра. 1754 г.*

Акрамя Нясвіжа і Слоніма прыгонныя тэатры дзейнічалі ў Гродне (Тызенгаўза), Ружанах (Сапегаў), Свіслачы (Тышкевіча). Акцёраў для іх рыхтавалі з мяшчанскіх і прыгонных хлопчыкаў і дзяўчынак. Аб узроўні іх прафесійнай адукацыі сведчыць той факт, што прыгонныя артысты Тызенгаўза з Гродна былі прыняты ў Варшаўскі каралеўскі тэатр.

На сцэнах магнацкіх тэатраў Беларусі ставіліся ў асноўным французскія і італьянскія оперы, балеты. Драматычныя пастаноўкі наладжвалі, як правіла, прафесійныя вандроўныя трупы. У ліку драматычных прадстаўленняў варта згадаць пастаноўку ў гродзенскім тэатры камедыі П. Бамаршэ «Севільскі цырульнік».

Такім чынам, культура беларускіх зямель у другой палове XVIII ст. дасягнула значных поспехаў і развівалася ў рэчышчы ідэй Асветніцтва.

### Пытанні і заданні

1. Чаму беларуская мова выкарыстоўвалася толькі ў «нізкіх» драматургічных творах?
2. Раскажыце пра пачатак выдання календароў у ВКЛ.
3. Дзе і калі выходзіла першая газета на тэрыторыі Беларусі?
4. Што такое класіцызм? Прывядзіце прыклады архітэктурных помнікаў, у якіх сумяшчаліся рысы позняга барока і класіцызму.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Издательский центр БГУ

5. Раскрыйце дзейнасць Віленскай мастацкай школы.
6. Вызначце асаблівасці музычнага мастацтва.
7. Прааналізуйце развіццё прыгоннага тэатра ў другой палове XVIII ст.
8. Чым можна растлумачыць росквіт прыгоннага тэатра?
9. Дайце азначэнні паняццяў: *класіцызм, ракако*.

## § 28. НАРОДНАЯ КУЛЬТУРА

**Успомніце**

Якое саслоўе ў Рэчы Паспалітай захоўвала нацыянальныя беларускія традыцыі?

**1. Сялянскі побыт.** Важнейшай часткай беларускай культуры з'яўлялася багатая і самабытная народная культура. Яна адлюстроўвала адносіны сялян і мяшчан да жыцця, іх інтарэсы. Фальклор у другой палове XVIII ст. аказваў уплыў на духоўнае жыццё ўсяго грамадства. Ва ўмовах, калі шляхта і вярхі мяшчан пераймалі польскую мову і культуру, народная культура заставалася беларускамоўнай.

Сярод вышэйшых станаў грамадства панавала думка, што селянін патрэбны толькі для працы. Ён успрымаўся як ніжэйшая істота. Шляхта сфарміравала вобраз лянівага мужыка. Але гэта не адпавядала сапраўднасці. Вучоны А. Меер пісаў, што беларускія сяляне ціхія, цярплівыя, гасцінныя, сарамлівыя, але вельмі бедныя і неадукаваныя.

У другой палове XVIII ст. беларуская вёска складалася з двух радоў драўляных, крытых саломай хат, пабудаваных уздоўж вуліцы. Сялянская сядзіба



*Беларуская вёска. Гравюра XVIII ст.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

ўключала хату, хлеў і гумно. Бедныя сяляне злучалі жылую пабудову з гаспадарчай пад адным дахам, а заможныя гаспадары ставілі іх асобна.

Хата мела жылую частку, сенцы і камору. Жылое памяшканне было даволі цёмным, паколькі маленькія акенцы ў сцяне давалі мала святла. У холад сяляне затыкалі іх анучамі, саломай або закрывалі драўлянай заслонкай. З сярэдзіны XVIII ст. у вокнах з'явілася шкло. Асвятлялася хата лучынай. У сцюдзёны час у адным памяшканні з людзьмі знаходзіліся маладняк свойскай жывёлы і птушка. Коміна звычайна не было — дым выходзіў праз адтуліну ў столі. Два разы ў год сцены ў хаце бялілі вапнай, але яны хутка зноў чарнелі ад дыму. Падлога была земляная або гліняная.

У сялянскай хаце мелася нешматлікая самаробная мэбля: драўляныя лавы, стол, куфар для адзення, кухонная паліца. Каля ўваходу знаходзілася печ. Ложкаў сяляне тады не ведалі. Яны спалі на кулі саломы на падлозе, на печы, летам — на сене ў гумне.

**2. Сялянскае адзенне і ежа.** Жыхары вёскі пераважна апраналіся ў вопратку дамашняга вырабу. Кожная сялянка ўмела прасці і ткаць. Тканіны аздабляліся арнаментам, які перадаваўся ад бабуль і маці дочкам. Мужчынскі ўбор складаўся з палатняных нагавіц, кашулі, перавязанай рэменем ці поясам, і світы. На галаве насілі магерку ці капялюш. Абуваліся ў скураныя пасталы або лапці з лыка, падвязаныя аборамі да ног.

Жаночы строй складаўся з кашулі, спадніцы, фартуха, світы паверх, хусткі на галаве. У царкву і на свята апраналі больш дарагое і яркае адзенне, вышытае народным арнаментам. У святы мужчыны з заможных сем'яў насілі боты, а жанчыны — чаравікі.

Асабістая гігіена сялян прадугледжвала мыццё рук і твару вадой, пераважна без мыла. Штодзённае адзенне насілася без змены і хутка пакрывалася брудам.

У выніку нізкага ўзроўню гігіены, дрэннага харчавання, шматлікіх хвароб працягласць жыцця была невялікай (каля 30 гадоў). Селянін жыў сціпла, нярэдка на мяжы галечы. Прыгонная вёска хранічна недаядала, а ў неўрадлівыя гады галадала.

Асноўнымі ў харчовым рацыёне былі прадукты расліннага паходжання: хлеб, капуста, гарох, боб, рэпа, буракі. Варылі кашы, боршч, зацірку, крупнік. Стравы прыпраўлялі алеем, зрэдку ўжывалі мёд.



*Літоўскія сяляне. Мастак Ф. Смуглевіч*



Правообладатель Издательский центр БГУ

Найпершай сялянскай ежай быў хлеб. У бяднейшых сем'ях яго выпякалі, дадаючы да мукі мякіну. Хлеба часта не хапала, таму ён вельмі шанаваўся. Малака сяляне спажывалі мала, мяса елі толькі ў святочныя дні. Пілі ваду, хлебны квас, бярозавы сок. З прадуктаў куплялі галоўным чынам соль, селядцы, піва, гарэлку.

**3. Паўсядзённае жыццё.** Сялянскія дзеці раслі ў голадзе, холадзе і брудзе. Дзяцінства ў вёсцы было бязрадаснае і кароткае. У пяць гадоў дзеці ўжо пасвілі свойскую птушку, даглядалі малодшых. У сем гадоў яны працавалі пастухамі, у дзесяць — баранавалі ворыва. Хадзілі дзеці ў палатняных кашулях, босыя. Цацак яны не ведалі. Раслі непісьменнымі, у лепшым выпадку ўмелі крыху чытаць і лічыць.

Селянін быў вольны ад працы толькі ў нядзелю і святочныя дні. У такія дні ён спачатку наведваў храм, а пасля набажэнства накіроўваўся ў карчму.

У сярэдзіне XVIII ст. корчмы былі амаль у кожнай беларускай вёсцы. Карчмар быў патрэбным чалавекам для шляхты і сялян. Ён пастаўляў інфармацыю, пасрэднічаў у куплі-продажы, ведаў амаль усё і пра ўсіх. На начлег і харчаванне ў карчме спыняліся праезджыя. Яны расказвалі пра гарады, дзяржавы, традыцыі і звычаі іншых народаў, цікавыя здарэнні.

Але карчма была злом для вёскі, бо прывучала сялян да п'янства. Праз арандатара памешчык збываў тут сялянам вырабы свайго бровара.

**4. Побыт мяшчан.** Цэнтрам культурнага жыцця заўсёды быў горад. З сярэдзіны XVIII ст. у беларускіх гарадах назіралася агульнае ажыўленне. На карце Беларусі з'явіліся новыя культурныя цэнтры (Шклоў), павысілася роля традыцыйных (Нясвіж).

Тагачасныя беларускія гарады, асабліва невялікія, мелі даволі непрывабны выгляд. Пераважалі драўляныя жылыя дамы. Двух-, трохпавярховыя будынкі былі рэдкасцю. Магнацкія палацы і дамы багатых купцоў перамяжоўваліся са сціплымі хатамі гарадской беднаты. Крытае саломай жыллё рамеснікаў і чэлядзі мала чым адрознівалася ад сялянскіх хат. Побач з жылымі дамамі стаялі хлявы і гумны, таму што многія мяшчане займаліся сельскай гаспадаркай.



*Тыпавыя будынкі ў Гродне. Рэканструкцыя*



Правообладатель Издательский центр БГУ

У другой палове XVIII ст. пачалася рэгулярная забудова гарадоў. Напрыклад, Антоній Тызенгаўз загадаў у Гродне і Паставах узвесці для майстроў мясцовых мануфактур першыя тыпавыя будынкі, спраектаваныя архітэктарамі.

Гарадскія вуліцы брукаваліся толькі ў цэнтры — каля ратушы і гандлёвых радоў. Афіцыйных назваў яны не мелі. На сваіх майстэрнях рамеснікі вывешвалі замест шыльдаў розныя знакі: каваль — падкову, шавец — бот, кравец — нажніцы, цырульнік — таз. Ноччу горад не асвятляўся, таму прахожыя карысталіся ліхтарамі і паходнямі. Затое ўсюды адкрываліся корчмы і шынкі.


*Калядаванне*

**5. Светапогляд і абраднасць.** Духоўная культура сялян і мяшчан вызначалася традыцыяй. З пакалення ў пакаленне пераходзілі звычаі і абрады. Вясну селянін сустракаў песнямі-заклінаннямі, маладую рунь — траецкімі песнямі, летам святкавалі Купалле. На пераломе лета на заходзе сонца кожная вёска ў ваколіцы раскладвала вогнішча. Вакол яго збіралася моладзь і спявала. Прыкметай гэтага свята з'яўляліся кветкі. Іх збіралі з вечара, затыкалі ва ўсе шчыліны ў хаце, плялі вянкі, а ў купальскую ноч варажылі, пускалі іх па вадзе, наладжвалі скокі праз агонь, шукалі папараць-кветку.

На Дажынках ушаноўвалі сабраны ўраджай. Сноп калосся, з якім звязвалі дабрабыт і згоду, ставілі ў куце хаты. Ён стаяў да таго часу, пакуль не было асвечана абмалочанае зерне.

На Каляды хадзілі з песнямі і з «казой» ад хаты да хаты, наладжвалі цэлыя прадстаўленні. Уся вёска збіралася разам, калі прыходзілі скамарохі, мядзведнікі.

Светлымі днямі ў жыцці селяніна былі сямейныя святы: хрэсьбіны і вяселле. Народжанае дзіця адразу ж «далучалі» да зямлі і сям'і: клалі на падлогу, падносілі да печкі ці парога, узнімалі на руках. Суседкі прыходзілі ў адведкі, прыносілі падарункі і ежу. Хрэсьбіны праводзілі пышна: земляроб імкнуўся забіць парсючка, купіць бочку піва. Імя дзіцяці даваў святар, выбіраючы яго пераважна з календара, радзей называлі імем бацькі ці дзеда.

Вяселле сяляне звычайна святкавалі паміж Пакровам і Калядамі, калі заканчваліся палявыя работы і можна было больш шчодра накрыць стол. Сяляне спадзяваліся, што такое ж багацце будзе і ў доме маладых. Сялянскае вяселле цягнулася два-тры дні. У ім удзельнічала ўся вёска. На «дзявочым вечары» нявеста развітвалася з сяброўкамі, а тыя плялі вянкі і спявалі песні


Правообладатель Издательский центр БГУ



*Купалле*

пра смутак дзяўчыны, што не той будзе яе мужам, каго кахала, што яна мусіць ужо расставацца з дзявочымі забавамі. Назаўтра з'яўляўся з сябрамі жаніх. Атрымаўшы благаславенне бацькоў, маладыя ехалі ў царкву або касцёл браць шлюб. Там яны мяняліся пярсцёнкамі, якія ў тыя часы толькі ўваходзілі ў моду. Вярнуўшыся ў дом нявесты, госці дзялілі каравай, уручалі падарункі. Моладзь ішла танцаваць у карчму, а старэйшыя працягвалі святочную вячэру. Назаўтра замужнія жанчыны прымалі маладую ў свой асяродак. Яе садзілі на пасудзіну для заквашвання цеста (дзяжу), абразалі косы, пакрывалі галаву чапцом або наміткай. Затым адбывалася развітанне, пасля чаго малады вёз жонку да сваіх бацькоў, якія сустракалі іх на парозе свайго дома.

Такім чынам, народная культура з'яўлялася крыніцай захавання беларускай мовы і нацыянальных традыцый.

МАТЭРЫЯЛЫ ГІСТАРЫЧНЫХ І ЛІТАРАТУРНЫХ КРЫНІЦ

**З «Падарожжа па Палессі і беларускім краі» П. Шпілеўскага**

Мінскія пасяляне ў большасці сярэдняга росту; адзін толькі Пінскі і часткова Слуцкі паветы вядомы даволі рослымі мужчынамі. Што датычыцца жанчын, то самыя прыгожыя... сустракаюцца болей у Рэчыцкім і Бабруйскім паветах... Дажынкі, хрэсьбіны, імяніны і вяселлі складаюць у іх усе радасці...: яны задавальняюцца чаркай гарэлкі, кавалкам свіного сала..., яечняй і мядовымі каржамі (засушаныя бліны); свежыя ягады і грыбы летам, сушаныя плады, пражаныя арэхі і гарбузныя семкі зімой складаюць іх ласунак і дэсерт.

? Якім вам бачыцца жыццё беларускіх сялян?



Издательский центр БГУ
Правообладатель Издательский центр БГУ

### Пытанні і заданні

1. Які характар захоўвала народная культура?
2. Чаму вёска заставалася асяродкам беларускай мовы і народных традыцый?
3. Як шляхта ўспрымала селяніна? Ці адпавядаў гэты вобраз сапраўднасці?
4. Што сабой уяўляла сялянскае жыллё?
5. Ахарактарызуйце народнае адзенне і ежу. Чаму працягласць жыцця заставалася нізкай?
6. Апішыце жыццё сялянскіх дзяцей.
7. Дзе праводзілі сяляне вольны час?
8. Параўнайце побыт мяшчан і сялян.
9. Раскажыце пра святы і абрады сялян і мяшчан.

## УРОК АБАГУЛЬНЕННЯ ДА РАЗДЗЕЛА III

**1.** Складзіце тэзісны план ці план-канспект адказу па адным з наступных пытанняў з выкарыстаннем тэарэтычнага і факталагічнага матэрыялу:

а) рэфармаванне Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст.;
б) падзелы Рэчы Паспалітай;
в) дзейнасць А. Тызенгаўза;
г) магнацкае прадпрымальніцтва ў другой палове XVIII ст.;
д) новыя з’явы ў эканамічным развіцці беларускіх зямель у другой палове XVIII ст.;
е) уплыў Асветніцтва на духоўнае развіццё беларускіх зямель у другой палове XVIII ст.;
ж) народная культура ў XVIII ст.

**2.** Пакажыце на карце тэрыторыі, якія атрымала Расія:

а) па першым падзеле Рэчы Паспалітай;
б) па другім падзеле Рэчы Паспалітай;
в) па трэцім падзеле Рэчы Паспалітай.

**3.** Вызначце гістарычныя падзеі па наступных датах:
1765 г., 1772 г., 1788—1792 гг., 1791 г., 1793 г., 1794 г., 1795 г.

**4.** Вызначце перадумовы заняпаду і крызісу Рэчы Паспалітай.

**5.** Параўнайце падзелы Рэчы Паспалітай.

| Крытэрыі для параўнання | Першы падзел | Другі падзел | Трэці падзел |
|---|---|---|---|
| Зачэпка да падзелу | | | |

Правообладатель Издательский центр БГУ


Издательский центр БГУ

| Крытэрыі для параўнання | Першы падзел | Другі падзел | Трэці падзел |
| --- | --- | --- | --- |
| Удзельнікі падзелу | | | |
| Беларускія землі, якія атрымала Расія | | | |

**6.** Вызначце асаблівасці наступных гістарычных падзей другой паловы XVIII ст.

| Рэфарматарская дзейнасць 1764—1768 гг. | Барская канфедэрацыя 1768—1772 гг. | Таргавіцкая канфедэрацыя 1792 г. | Паўстанне 1794 г. |
| --- | --- | --- | --- |
| | | | |

**7.** Правядзіце сістэматызацыю наступных тэрмінаў і паняццяў і занясіце іх у адпаведныя слупкі табліцы.

| Палітычныя працэсы на тэрыторыі Беларусі | Сацыяльна-эканамічныя працэсы на тэрыторыі Беларусі | Культурныя працэсы на тэрыторыі Беларусі |
| --- | --- | --- |
| | | |

«Рэспубліка», тракт, касінеры, Каралеўскі канал, прыгонны тэатр, алейня, класіцызм, другі «нямы» сойм, рудня, «альбанская банда», бровар, «камунальныя магазіны», «камунальныя касы», фізіякраты, «вайна фрака і жупана», дысідэнты, Кардынальныя правы, «Вялікі сойм», Стража правоў, фолюш, «віленскія якабінцы», Адукацыйная камісія, «Кур’ер Літэўскі», Асветніцтва, «фамілія», «Газэта Гродзеньска».

**8.** Вызначце прычыны і наступствы адной з гістарычных з’яў:

а) прыняцце Канстытуцыі 3 мая 1791 г.;
б) паўстанне Т. Касцюшкі;
в) арганізацыя мануфактурнай вытворчасці ў другой палове XVIII ст.;
г) правядзенне аграрнай рэформы Антоніем Тызенгаўзам;
д) стварэнне і дзейнасць Адукацыйнай камісіі.

**9.** Растлумачце падыходы навукоўцаў да адной з наступных праблем:

а) гістарычны лёс Рэчы Паспалітай;
б) узаемаадносіны паміж апошнім каралём і магнатамі;
в) Расійская імперыя і Рэч Паспалітая ў другой палове XVIII ст.;
г) дысідэнцкае пытанне ў Рэчы Паспалітай.

**10.** Правядзіце краязнаўчыя даследаванні па адной з наступных тэм:

а) «Развіццё вашага горада (вёскі) у другой палове XVIII ст.»;
б) «Помнікі ваенных падзей другой паловы XVIII ст.»;
в) «Мясцовыя помнікі архітэктуры і мастацтва другой паловы XVIII ст.».


Правообладатель Издательский центр БГУ

## НАШ КРАЙ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI — КАНЦЫ XVIII ст.

Гісторыя беларускіх зямель у другой палове XVI — канцы XVIII ст. звязана не толькі з Рэччу Паспалітай, але і з мінулым кожнага беларускага рэгіёна, горада, вёскі. Ведаць айчынную гісторыю — значыць быць патрыётам і «малой радзімы». Прапануем вам, паважаныя вучні, адкрыць для сябе мінулае свайго роднага краю.

Найперш раім звярнуцца да дадатковай літаратуры абагульняючага характару («Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» ў 6 тамах, энцыклапедыя «Вялікае Княства Літоўскае» ў 3 тамах, энцыклапедычны даведнік «Архітэктура Беларусі», гісторыка-дакументальныя хронікі «Памяць» і іншыя выданні), што дазволіць атрымаць навуковую інфармацыю аб гісторыі вашага населенага пункта. Далей — краязнаўчая літаратура (кнігі, прысвечаныя канкрэтным гістарычным мясцінам Беларусі, артыкулы ў мясцовых перыядычных выданнях і інш.). У ёй вы атрымаеце больш шырокую і цікавую з пазнавальнага пункта гледжання інфармацыю аб вашай «малой радзіме».

Раскрыць гісторыю свайго краю ў другой палове XVI — канцы XVIII ст. можна на падставе наступнага плана:

1. Адміністрацыйны статус населенага пункта (воласць, павет, ваяводства).

2. Статус населенага пункта (дзяржаўны ці прыватнаўладальніцкі).

3. Агульнадзяржаўныя падзеі на тэрыторыі вашага краю ў другой палове XVI — канцы XVIII ст.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

4. Славутыя ўраджэнцы вашай «малой радзімы».

5. Архітэктурныя і іншыя помнікі ў вашым населеным пункце другой паловы XVI — канца XVIII ст.

6. Побыт і традыцыі насельніцтва вашай «малой радзімы».

Пералік крытэрыяў вывучэння гісторыі роднага краю можна дапаўняць асабіста распрацаванымі палажэннямі.

Жадаем поспехаў на шляху пазнання мінулага роднага краю!

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

## ВЫНІКОВАЕ АБАГУЛЬНЕННЕ

**1.** Складзіце тэзісны план ці план-канспект адказу па адным з наступных пытанняў з выкарыстаннем тэарэтычнага і фактычнага матэрыялу:

а) эвалюцыя палітычнага ладу Рэчы Паспалітай;
б) валочная памера Жыгімонта II Аўгуста;
в) Рэфармацыя на беларускіх землях;
г) усталяванне ўніяцтва на беларускіх землях;
д) казацка-сялянская вайна 1648—1651 гг. на беларускіх землях;
е) вайна 1654—1667 гг. на беларускіх землях;
ж) ваенныя падзеі Паўночнай вайны 1700—1721 гг. на беларускіх землях;
з) эканамічны заняпад сярэдзіны XVII — пачатку XVIII ст.;
і) арганізацыя мануфактурнай вытворчасці на беларускіх землях;
к) барока ў культуры беларускіх зямель;
л) рэформы ў Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст.;
м) падзелы Рэчы Паспалітай;
н) Асветніцтва ў культуры беларускіх зямель другой паловы XVIII ст.

**2.** Пакажыце на карце тэрыторыі, якія атрымала:

а) Рэч Паспалітая па Ям-Запольскім перамір'і;
б) Рэч Паспалітая па Дэулінскім перамір'і;
в) Расія па Андросаўскім перамір'і;
г) Расія па першым падзеле Рэчы Паспалітай;
д) Расія па другім падзеле Рэчы Паспалітай;
е) Расія па трэцім падзеле Рэчы Паспалітай.

**3.** Вызначце гістарычныя падзеі па наступных датах:

1557 г., 1558—1583 гг., 1569 г., 1579 г., 1581 г., 1588 г., 1596 г., 1600—1629 гг., 1609—1618 гг., 1632—1634 гг., 1648—1651 гг., 1649 г., 1654—1667 гг., 1655—


Правообладатель Издательский центр БГУ

1660 гг., 1655 г., 1697 г., 1700—1721 гг., 1708 г., 1717 г., 1733—1739 гг., 1740—1744 гг., 1754—1756 гг., 1765 г., 1772 г., 1788—1792 гг., 1791 г., 1793 г., 1794 г., 1795 г.

**4.** Суаднясіце ў табліцы знешнепалітычныя адносіны беларускіх зямель у другой палове XVI — канцы XVIII ст.

| **Узаемаадносіны ВКЛ з Польшчай** | **Узаемаадносіны ВКЛ з Расійскай дзяржавай** | **Узаемаадносіны ВКЛ са Швецыяй** | **Узаемаадносіны ВКЛ з Турцыяй** |
| --- | --- | --- | --- |
| | | | |

**5.** Правядзіце сістэматызацыю тэрмінаў і паняццяў і занясіце іх у адпаведныя слупкі табліцы.

| **Палітычныя працэсы на тэрыторыі Беларусі** | **Сацыяльна-эканамічныя працэсы на тэрыторыі Беларусі** | **Рэлігійныя працэсы на тэрыторыі Беларусі** | **Культурныя працэсы на тэрыторыі Беларусі** |
| --- | --- | --- | --- |
| | | | |

Рэч Паспалітая, аграрная рэформа, шляхецкія вольнасці, госці, Пасольская Ізба, куніца, арыянства, Генрыкавы артыкулы, чопавае, канфедэрацыя, батлейка, «ліберум вета», рокаш, валока, мястэчка, кальвінізм, калегіум, гвалты, клерыкалізацыя, уніяцтва, мануфактура, дыярыуш, партачы, сармацкі партрэт, школьны тэатр, прасалы, інтэрмедыя, цівун, староства, казакі, рэйтаршчына, «хатняя» вайна, «фамілія», шарваркі, «Лоеўская брама», жарнавое, барока, падымнае, гіберна, эканомія, загоны, начная варта, піяры, акадэмія, угайнае, цэх, атэізм, віленскае барока, кірмаш, «Полацкі сшытак», касінеры, прыгонны тэатр, алейня, класіцызм, бровар, «камунальныя магазіны», фізіякраты, фальварак, «вайна фрака і жупана», дысідэнты, гасцінцы, Кардынальныя правы, рудня, «Вялікі сойм», «віленскія якабінцы», гута, Адукацыйная камісія.

**6.** Вызначце прычыны і наступствы адной з гістарычных з’яў:

а) заключэнне Люблінскай уніі;
б) аграрная рэформа Жыгімонта II Аўгуста;
в) рэфармацыйны рух у ВКЛ;
г) Брэсцкая царкоўная унія;


Правообладатель Издательский центр БГУ

д) войны сярэдзіны XVII ст. на беларускіх землях;
е) Кейданская унія 1655 г.;
ж) Паўночная вайна 1700—1721 гг. на тэрыторыі Беларусі;
з) Канстытуцыя 3 мая 1791 г.;
і) паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі;
к) аграрная рэформа Антонія Тызенгаўза;
л) Адукацыйная камісія.

**7.** Растлумачце падыходы навукоўцаў да адной з наступных праблем:
а) дзяржаўны характар Рэчы Паспалітай;
б) нацыянальны характар уніяцкай царквы;
в) пачатак капіталізму на беларускіх землях;
г) гістарычны лёс Рэчы Паспалітай;
д) Расія і Рэч Паспалітая ў XVII—XVIII стст.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

## АСНОЎНЫЯ ПАДЗЕІ Ў ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI — КАНЦЫ XVIII ст.

**1548—1572 гг.** — княжанне ў ВКЛ Жыгімонта ІІ Аўгуста.

**1557 г.** — пачатак аграрнай рэформы — валочнай памеры.

**1558—1583 гг.** — Лівонская (Інфлянцкая) вайна.

**1563 г.** — віленскі прывілей Жыгімонта ІІ Аўгуста аб ураўнаванні ў правах усёй шляхты краіны незалежна ад веравызнання.

**1564 г.** — бітва на рацэ Уле.

**1566 г.** — прыняцце ІІ Статута ВКЛ.

**1569 г., 1 ліпеня** — Люблінская унія і ўтварэнне Рэчы Паспалітай.

**1573 г.** — акт Варшаўскай канфедэрацыі аб свабодзе веравызнання.

**1576—1586 гг.** — кіраванне ў Рэчы Паспалітай Стафана Баторыя.

**1579 г.** — заснаванне Віленскага ўніверсітэта (езуіцкай акадэміі).

**1581 г.** — утварэнне Трыбунала Вялікага Княства Літоўскага.

**1588 г.** — прыняцце ІІІ Статута ВКЛ.

**1595 г.** — казацкі рух пад кіраўніцтвам С. Налівайкі.

**1596 г.** — падпісанне Брэсцкай царкоўнай уніі.

**1600—1629 гг.** — вайна паміж Рэччу Паспалітай і Швецыяй.

**1605 г.** — Кірхгольмская бітва.


Правообладатель Издательский центр БГУ
Издательский центр БГУ

**1609—1618 гг.** — вайна паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй.

**1623 г.** — выступленне жыхароў Віцебска супраць уніяцкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча.

**1632—1634 гг.** — Смаленская вайна.

**1648—1651 гг.** — казацка-сялянская вайна на Беларусі.

**1649 г.** — першая Лоеўская бітва.

**1654—1667 гг.** — вайна паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай.

**1655—1660 гг.** — Паўночная вайна паміж Швецыяй і Рэччу Паспалітай.

**1655 г.** — падпісанне Кейданскай уніі.

**1697—1702 гг.** — феадальная вайна ў ВКЛ.

**1697 г.** — прыняцце пастановы «Ураўнаванне правоў», паводле якой велікакняжацкая шляхта ўраўноўвалася ў правах з польскай, уводзілася польская мова ў справаводства ВКЛ.

**1700—1721 гг.** — Паўночная вайна паміж Паўночным саюзам і Швецыяй.

**1708 г.** — разгром расійскімі войскамі шведскага корпуса пад камандаваннем А. Левенгаўпта каля вёскі Лясная.

**1717 г.** — першы «нямы» сойм у Рэчы Паспалітай.

**1733—1739 гг.** — вайна за «Польскую спадчыну».

**1740—1744 гг.** — паўстанне сялян пад кіраўніцтвам В. Вашчылы ў Крычаўскім старостве.

**1754—1756 гг.** — паўстанне сялян Камянецкай воласці на Мазыршчыне.

**1764—1766 гг.** — эканамічныя рэформы ў Рэчы Паспалітай.

**1765 г.** — аграрная рэформа А. Тызенгаўза.

**1767 г.** — стварэнне дысідэнцкіх канфедэрацый.

**1768 г.** — ураўнаванне правоў дысідэнцкай шляхты з каталіцкай; стварэнне антыдысідэнцкай Барскай канфедэрацыі.

**1772 г.** — першы падзел Рэчы Паспалітай паміж Прусіяй, Аўстрыяй і Расіяй.

**1773 г.** — заснаванне Адукацыйнай камісіі.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

**1788—1792 гг.** — Чатырохгадовы («Вялікі») сойм у Рэчы Паспалітай.

**1791 г., 3 мая** — прыняцце соймам Рэчы Паспалітай Канстытуцыі.

**1792 г.** — утварэнне Таргавіцкай канфедэрацыі.

**1793 г.** — другі падзел Рэчы Паспалітай паміж Прусіяй і Расіяй.

**1793 г.** — Гродзенскі (другі «нямы») сойм.

**1794 г.** — паўстанне ў Польшчы, Беларусі і Літве пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі.

**1795 г.** — трэці падзел Рэчы Паспалітай паміж Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

## УНУТРАНАЯ І ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА ВЯЛІКІХ КНЯЗЁЎ ЛІТОЎСКІХ І КАРАЛЁЎ ПОЛЬСКІХ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI — КАНЦЫ XVIII ст.

| Князь | Гады кіравання | Паходжанне | Асноўныя кірункі ўнутранай і знешняй палітыкі |
|---|---|---|---|
| Жыгімонт Аўгуст, адначасова кароль польскі Жыгімонт II Аўгуст | 1548—1572 гг. | Сын Жыгімонта I Старога | Завяршыў дынастыю Ягелонаў; быў ініцыятарам Люблінскай уніі; зацвердзіў Статут ВКЛ 1566 г.; удзельнічаў у Лівонскай вайне; правёў аграрную рэформу; вялікі князь каталіцкага веравызнання |
| Генрык Валезы, адначасова кароль польскі | 1573—1574 гг. | Сын Генрыха II Валуа | Першы выбарны кароль Рэчы Паспалітай (прыняты Пакта канвента і Генрыкавы артыкулы) |
| Стафан Баторый, адначасова кароль польскі | 1576—1586 гг. | З венгерскага роду Баторыяў Шомліа | Прызнаў раўнапраўе Польшчы і ВКЛ у складзе федэратыўнай дзяржавы; вярнуў ВКЛ Полацк; падтрымліваў каталіцкую царкву і езуітаў; заснаваў Віленскі ўніверсітэт (акадэмію) |



Правообладатель Издательский центр БГУ

| Князь | Гады кіравання | Паходжанне | Асноўныя кірункі ўнутранай і знешняй палітыкі |
|---|---|---|---|
| Жыгімонт IV Ваза, адначасова кароль польскі Жыгімонт III Ваза | 1587—1632 гг. | Сын караля Швецыі Яна III Вазы | Зацвердзіў Статут ВКЛ 1588 г.; падтрымаў Брэсцкую унію 1596 г., паходы Лжэдзмітрыя І і Лжэдзмітрыя ІІ; пачаў войны Рэчы Паспалітай са Швецыяй і Расіяй; праводзіў актыўную паўднёвую палітыку |
| Уладзіслаў, адначасова кароль польскі Уладзіслаў IV Ваза | 1632—1648 гг. | Сын Жыгімонта III Вазы | Вярнуў Смаленск у склад ВКЛ; праводзіў талерантную палітыку ў адносінах да праваслаўнай царквы Рэчы Паспалітай; імкнуўся авалодаць шведскім тронам |
| Ян Казімір, адначасова кароль польскі Ян II Казімір Ваза | 1648—1668 гг. | Сын Жыгімонта III Вазы | Правёў некалькі паходаў ва Украіну; адбыліся разбуральныя войны з Расіяй і Швецыяй; прапанаваў план рэформы дзяржаўнага ладу; зрывы сoймаў сталі звычайнай з'явай. Адмовіўся ад трона |
| Міхал Вішнявецкі, адначасова кароль польскі | 1669—1673 гг. | З княжацкага роду Вішнявецкіх | Узмацнілася магнацкая анархія; пацярпеў паражэнне ў вайне з Турцыяй |
| Ян Сабескі, адначасова кароль польскі Ян III Сабескі | 1674—1696 гг. | Са старажытнага шляхецкага роду герба «Яніна» | Нанёс паражэнні турэцкім і татарскім войскам ва Украіне; заключыў «вечны мір» 1686 г. з Расіяй; увайшоў у гісторыю як выдатны палкавадзец, мецэнат, апякун навукі і мастацтва |



Правообладатель Издательский центр БГУ

| Князь | Гады кіравання | Паходжанне | Асноўныя кірункі ўнутранай і знешняй палітыкі |
|---|---|---|---|
| Аўгуст Моцны, адначасова кароль польскі Аўгуст II Моцны | 1697—1706, 1709—1733 гг. | З саксонскай дынастыі Вецінаў | Удзельнічаў у Паўночнай вайне 1700—1721 гг.; імкнуўся да абсалютнай улады; пачалося актыўнае ўмяшанне Расіі ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай |
| Станіслаў Ляшчынскі, адначасова кароль польскі | 1704—1709, 1733 гг. | Са старажытнага польскага шляхецкага роду | Прыхільнік саюзу са Швецыяй; адзін з ініцыятараў стварэння Варшаўскай канфедэрацыі |
| Аўгуст III, адначасова кароль польскі | 1733—1763 гг. | Сын Аўгуста II | Заняў трон пры дапамозе расійскіх і саксонскіх войскаў; пашырылася феадальная анархія, пачаўся глыбокі палітычны крызіс, знізіўся міжнародны прэстыж Рэчы Паспалітай |
| Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, адначасова кароль польскі | 1764—1795 гг. | Са шляхецкага роду Панятоўскіх | Праводзіў палітыку памяркоўных рэформ дзяржаўнага ладу; ураўнаваў у правах дысідэнцкую шляхту з каталіцкай; зацвердзіў Кардынальныя правы; адбылося паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі; праведзены падзелы Рэчы Паспалітай |

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

## ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК

**Адраджэ́нне** — эпоха станаўлення духоўнай культуры Новага часу ў Еўропе, у тым ліку ў ВКЛ.

**Адукацы́йная камі́сія** — свецкая ўстанова па арганізацыі і кіраўніцтве сістэмай школьнай асветы ў Рэчы Паспалітай.

**Ако́ліца** — тып сельскага паселішча ў ВКЛ з другой паловы XVI ст.

**Арыя́нства** — плынь у хрысціянстве, прыхільнікі якой адмаўлялі догмат пра трыадзінства Бога.

**Аса́дныя сяля́не** — адна з асноўных катэгорый феадальна-залежных сялян у ВКЛ у XVI ст., галоўнай павіннасцю якіх быў чынш.

**Асве́тніцтва** — грамадска-палітычны і культурны рух, накіраваны на ўсталяванне буржуазнай культуры і ліквідацыю феадальнага ладу. Характарызаваўся пашырэннем асветы, ідэй дабра, справядлівасці, гуманізму, развіццём навук. У Беларусі Асветніцтва распаўсюдзілася ў другой палове XVIII ст.

**Базылья́не** — манахі ўніяцкага ордэна Святога Васіля Вялікага.

**Баро́ка** — вызначальны стыль у еўрапейскім мастацтве канца XVI — сярэдзіны XVIII ст., які ўзнік на аснове традыцый Позняга Адраджэння.

**Бі́скуп** — духоўны сан у каталіцкай царкве, які адпавядае сану епіскапа ў праваслаўнай царкве.


Правообладатель Издательский центр БГУ

**Бра́цтвы** — рэлігійныя арганізацыі гарадскога насельніцтва ВКЛ у XV—XVIII стст.

**Вало́ка** — асноўная зямельная мера і адзінка абкладання сялян павіннасцямі ў ВКЛ.

**Вало́чная паме́ра** — аграрная рэформа ў ВКЛ у XVI — першай палове XVII ст.

**Ваяво́дства** — адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў ВКЛ у XV—XVIII стст.

**Войт** — кіраўнік мясцовай адміністрацыі ў гарадах і вёсках ВКЛ.

**Во́тчына** — галоўная форма зямельнай уласнасці ў сярэдневякоўі, якая перадавалася ў спадчыну.

**Гасці́нец** — упарадкаваная вялікая дарога.

**Гва́лты** — адработачная феадальная павіннасць сялян ВКЛ; тое ж, што згоны.

**Ге́нрыкавы арты́кулы** — акт, які вызначаў асновы дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай і паўнамоцтвы караля польскага і вялікага князя літоўскага.

**Ге́тман** — галоўны начальнік над узброенымі сіламі дзяржавы ў ВКЛ і Польшчы ў XV—XVIII стст.

**Го́сці** — прадстаўнікі буйнога купецтва ў ВКЛ, якія займаліся пераважна знешнім гандлем.

**Грамада́** — сялянская абшчына ў ВКЛ.

**Грош** — грашовая адзінка ў ВКЛ.

**Дзя́кла** — прадуктовая рэнта за зямельны надзел, якая збіралася на карысць землеўладальніка з сялян ВКЛ.

**Дым** — сялянская гаспадарка ў ВКЛ у XIV—XVIII стст. і адзінка абкладання сялян павіннасцямі.

**Дысідэ́нты** — вернікі-хрысціяне, якія не прытрымліваюцца пануючага веравызнання, пераважна ў краінах, дзе дзяржаўнай ці пануючай рэлігіяй з'яўляецца каталіцызм або пратэстантызм.

**Езуі́ты** — члены каталіцкага манаскага ордэна Таварыства Ісуса.

**Засце́нак** — тып сельскага паселішча на Беларусі ў XVI—XX стст.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Зго́ны** — адработачная феадальная павіннасць сялян ВКЛ у XV—XVIII стст.

**Зло́ты** — грашовая адзінка ў ВКЛ, роўная 30 грошам.

**Інвентары́** — апісанні феадальных уладанняў у Беларусі, Літве, Украіне, Польшчы ў XVII — першай палове XIX ст.

**Інкарпара́цыя** — уключэнне ў склад, далучэнне.

**Інфля́нты** — Лівонія, назва зямель Усходняй Прыбалтыкі.

**Кааліцыя** — палітычны і ваенны саюз дзвюх і больш дзяржаў.

**Кале́гіумы** — навучальныя ўстановы ў ВКЛ у XVI—XVIII стст. Найбольш пашыранымі былі калегіумы ордэна езуітаў, з канца XVII ст. — і ордэна піяраў.

**Кальвінізм** — адна з найбуйнейшых плыней пратэстантызму.

**Кантрыбу́цыя** — грашовыя сумы, якія выплачваюцца пераможанай дзяржавай дзяржаве-пераможцы пасля завяршэння вайны.

**Канфедэра́цыя** — у Рэчы Паспалітай часовы палітычны саюз шляхты для дасягнення пэўнай мэты.

**Ка́нцлер** — службовая асоба ў ВКЛ у XV—XVIII стст. Спачатку кіраўнік канцылярыі ВКЛ, трымальнік вялікай дзяржаўнай пячаткі, у далейшым атрымаў паўнамоцтвы міністра юстыцыі.

**Кардына́льныя правы́** — сістэма фундаментальных нормаў дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай у XVI—XVIII стст.

**Каро́на** — назва ўласна Польшчы.

**Касіне́ры** — у час паўстання 1794 г. сяляне, якія былі ўзброены косамі, насаджанымі вертыкальна.

**Кірма́ш** — форма правядзення гандлю ў выглядзе перыядычных з’ездаў гандляроў у пэўнай мясцовасці на працягу вызначанага тэрміну.

**Класіцы́зм** — кірунак у еўрапейскай мастацкай культуры другой паловы XVII — пачатку XIX ст. Заснаваны на антычнай класіцы як дасканалым узоры для пераймання.

**Клерыкаліза́цыя** — узмацненне ўплыву царквы на грамадскае і культурнае жыццё.


Правообладатель Издательский центр БГУ

**Контррэфарма́цыя** — рэлігійна-палітычны рух у Еўропе ў другой палове XVI—XVII ст., узначалены папствам і накіраваны супраць Рэфармацыі. Меў на мэце аднаўленне пазіцый, страчаных каталіцызмам у шэрагу краін.

**Куні́ца** — 1) апрацаваная шкурка куніцы, якая да XVI ст. у ВКЛ выкарыстоўвалася як сродак плацяжу; 2) адзін з пашыраных відаў чыншу ў XV—XVII стст. за арэнду зямлі, пчальнікі і г. д.; 3) плата нявесты-сялянкі, якая выходзіла замуж у чужую воласць.

**«Лі́берум ве́та»** — у XVI—XVIII стст. у Рэчы Паспалітай права дэпутата сойма спыніць пасяджэнне і адмяніць усе прынятыя на ім пастановы сваім вусным пратэстам.

**Магдэбу́ргскае пра́ва** — гарадское права, якім кіраваліся гарады ВКЛ. Вызначала арганізацыю і прынцыпы дзейнасці гарадскога самакіравання.

**Магістра́т** — выбарны адміністрацыйны і судовы орган гарадскога самакіравання ў гарадах, якія мелі магдэбургскае права.

**Магна́ты** — буйныя феадалы-землеўладальнікі, прадстаўнікі радавітай знаці, арыстакратычныя вярхі класа феадалаў, нашчадкі ўдзельных князёў.

**Мануфакту́ра** — прадпрыемства прамысловай вытворчасці, заснаванае на падзеле працы і ручной рамесніцкай тэхніцы.

**Морг** — зямельная мера.

**Мы́та** — грашовы збор, які бралі ў ВКЛ з мясцовых купцоў за ўвоз з-за мяжы або вываз за мяжу тавараў і з іншаземцаў за продаж тавараў на мясцовых рынках ці правоз іх па тэрыторыі дзяржавы.

**Място́чка** — у ВКЛ у XV—XVIII стст. драбнейшы населены пункт гарадскога тыпу, малы горад.

**Мяшча́не** — гарадское падатковае саслоўе ў ВКЛ у XIV—XVIII стст.

**Найвышэ́йшая літо́ўская ра́да** — часовы рэвалюцыйны ўрад у ВКЛ (Літве і Заходняй Беларусі) у час паўстання 1794 г.

**Паве́т** — адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў ВКЛ.

**Пады́мнае** — асноўны дзяржаўны зямельны падатак у Рэчы Паспалітай у XVII—XVIII стст.

**Па́кта канве́нта** — пагадненне публічна-прававога характару паміж шляхтай Рэчы Паспалітай і новаабраным каралём.

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Паме́сце** — форма феадальнага зямельнага ўладання, пры якім уладальнік абавязаны несці ваенную ці іншую службу дзяржаве.

**Па́ншчына** — дармавая прымусовая праца сялян з уласнымі прыладамі працы ў гаспадарцы феадала.

**Партачы́** — на Беларусі ў XVI—XVIII стст. рамеснікі, якія жылі ў горадзе або паблізу яго і не ўваходзілі ў рамесныя цэхі.

**Пасо́льская Ізба́** — ніжэйшая палата сойма Рэчы Паспалітай.

**Паспалі́тае рушэ́нне** — шляхецкае апалчэнне ў ВКЛ, у якое землеўладальнік павінен быў выставіць пэўную колькасць воінаў.

**Пастая́нная Ра́да** — вышэйшы орган дзяржаўнай улады Рэчы Паспалітай у 1775—1794 гг., першы пастаянна дзеючы паміж сесіямі сойма цэнтральны ўрад.

**Пе́нязь** — адзінка грашовага ліку і манета ў ВКЛ у XV — пачатку XVII ст.

**Пія́ры** — манахі каталіцкага манаскага ордэна, мэтай якіх было выхаванне і навучанне моладзі праз стварэнне шырокай сеткі калегіумаў, а не палітычная ці місіянерская дзейнасць.

**Пра́сал** — у XVII—XIX стст. дробны гандляр, які гандляваў сваім таварам па вёсках і мястэчках.

**Прыго́ннае пра́ва** — асабіста-пазямельная залежнасць сялян ад феадалаў.

**Ракако́** — стыль у еўрапейскай архітэктуры і мастацтве XVIII ст. Яго асаблівасць — перавага дэкаратыўнасці над іншымі аспектамі мастацтва.

**Ра́туша** — будынак, у якім размяшчаліся органы гарадскога самакіравання.

**Рэе́стр** — спісы, вопісы, а таксама кнігі ў судах ВКЛ.

**Рэфарма́цыя** — рэлігійны і грамадска-палітычны рух у Еўропе ў XVI — першай палове XVII ст.

**Сена́т** — дзяржаўная рада манарха і вышэйшая палата сойма Рэчы Паспалітай.

**Скарбо́вая камі́сія Вялі́кага Кня́ства Літо́ўскага** — цэнтральны калегіяльны орган улады ВКЛ па кіраванні фінансамі і дзяржаўным скарбам.

**Сойм** — саслоўна-прадстаўнічы орган у Рэчы Паспалітай у другой палове XVI—XVIII ст.


Правообладатель Издательский центр БГУ

**Со́ймік** — сход шляхты павета.

**Старо́ста** — у ВКЛ у XVI—XVIII стст. службовая асоба, якая кіравала адміністрацыйнай акругай (паветам), намеснік вялікага князя.

**Талака́** — даўні народны звычай калектыўнай дапамогі ў гаспадарчых работах у беларусаў і іншых славянскіх народаў.

**Трыбуна́л Вялі́кага Кня́ства Літо́ўскага** — вышэйшы апеляцыйны суд ВКЛ.

**Універса́л** — від прававога акта ў Рэчы Паспалітай.

**У́нія** — аб’яднанне, саюз.

**Фальва́рак** — від феадальнага зямельнага ўладання ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай; феадальная гаспадарка (двор феадала з комплексам будынкаў і зямельных угоддзяў), заснаваная на працы прыгонных сялян і арыентаваная на вытворчасць прадукцыі на продаж.

**Федэра́цыя** — форма дзяржаўнага ўладкавання, пры якой федэральныя адзінкі, што ўваходзяць у склад дзяржавы, валодаюць пэўнай юрыдычнай і палітычнай самастойнасцю.

**Ціву́н** — кіраўнік феадальнага двара-маёнтка.

**Цэ́хі** — аб’яднанні рамеснікаў адной ці некалькіх прафесій у феадальных гарадах.

**Ця́глыя сяля́не** — у ВКЛ у XV—XVIII стст. феадальна-залежныя сяляне, галоўнай формай зямельнай рэнты якіх была паншчына.

**Чынш** — грашовая рэнта ў Беларусі і Літве ў XV — першай палове XIX ст.

**Чы́ншавыя сяля́не** — феадальна-залежныя сяляне ў ВКЛ у XV — першай палове XIX ст., галоўнай формай павіннасці якіх былі грашовыя плацяжы (чынш). Ва «Уставе на валокі» 1557 г. называліся асаднымі сялянамі.

**Шко́льны тэа́тр** — тэатр пры духоўных навучальных установах (акадэміях, брацкіх школах, калегіумах).

**Шляхе́цкія во́льнасці** — комплекс правоў і прывілеяў шляхты Рэчы Паспалітай XVI—XVIII стст., на падставе якіх сфарміравалася ідэалагічная дактрына «залатой вольнасці» — культу павагі свабод кожнай асобы шляхецкага стану.

**Шпіта́ль** — у ВКЛ у XV—XVIII стст. установа для апекі над састарэлымі, бяздомнымі, беднымі і хворымі.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ 

**Шышы́** — назва людзей, што ваявалі супраць царскай улады, у афіцыйных дакументах Расійскай дзяржавы з сярэдзіны XVII ст.

**Экано́мія** — сталовы маёнтак, від дзяржаўнага зямельнага ўладання, прыбыткі з якога шлі на патрэбы манарха Рэчы Паспалітай і дзяржаўнага скарбу.

**Юрыды́кі** — у ВКЛ адміністрацыйна адасобленыя часткі гарадоў ці прадмесцяў, якія былі пад уладай феадала, царквы або манастыра і на жыхароў якіх не пашыралася судовая і адміністрацыйная ўлада гарадскога самакіравання.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

## СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Архітэктура Беларусі: энцыкл. давед. — Мінск, 1993.

Асветнікі зямлі Беларускай. — Мінск, 2001.

Беларускі фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. — Мінск, 2005—2006.

Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя: у 3 т. — Мінск, 2005—2010.

Гісторыя беларускага тэатра: у 3 т. — Мінск, 1983. — Т. 1.

*Ігнатоўскі, У. М.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У. М. Ігнатоўскі. — 5-е выд. — Мінск, 1991.

Ілюстраваная храналогія гісторыі Беларусі: Ад старажытнасці да пачатку XX ст. — Мінск, 1995.

*Ластоўскі, В. Ю.* Кароткая гісторыя Беларусі / В. Ю. Ластоўскі. — Мінск, 1992.

*Лыч, Л. М.* Гісторыя культуры Беларусі / Л. М. Лыч, У. І. Навіцкі. — 2-е выд. — Мінск, 1997.

*Мялешка, В.* І ўзняўся люд просты / В. Мялешка, П. Лойка. — Мінск, 1992.

Народная культура Беларусі: энцыкл. давед. — Мінск, 2002.

*Орлов, В. А.* Тайны полоцкой истории / В. А. Орлов. — Минск, 1995.

Праз смугу стагоддзяў / уклад. М. Багадзяж. — Мінск, 1993.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

*Прокошина, Е. С.* Казимир Лыщинский / Е. С. Прокошина, В. Ф. Шалькевич. — Минск, 1986.

Рэлігія і царква на Беларусі: энцыкл. давед. — Мінск, 2001.

*Саверчанка, І.* Апостал яднання і веры: Язэп Руцкі / І. Саверчанка. — Мінск, 1994.

*Саверчанка, І. В.* Канцлер Вялікага княства: Леў Сапега / І. В. Саверчанка. — Мінск, 1992.

*Сагановіч, Г.* Невядомая вайна, 1654—1667 / Г. Сагановіч. — Мінск, 1995.

*Тарасаў, К.* Памяць пра легенды: постаці беларускай мінуўшчыны / К. Тарасаў. — Мінск, 1990.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. — Мінск, 1993—2003.

Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. — Мінск, 1984—1987.

Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя. — Мінск, 1989.

*Юхо, Я. А.* Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / Я. А. Юхо. — Мінск, 1992.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

## ЗМЕСТ

**Прадмова** ........ 3
**РАЗДЗЕЛ I. Беларусь у сярэдзіне XVI — першай палове XVII ст.** ........ 5
§ 1. Лівонская вайна ........ 5
§ 2. Утварэнне Рэчы Паспалітай ........ 11
§ 3. Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай ........ 17
§ 4. Палітычнае становішча Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVI — пачатку XVII ст. ........ 21
§ 5. Знешняя палітыка Рэчы Паспалітай у першай палове XVII ст. ........ 26
§ 6. Сельская гаспадарка ў другой палове XVI — першай палове XVII ст. ........ 33
§ 7. Гарадское жыццё ў другой палове XVI — першай палове XVII ст. ........ 40
§ 8. Рэфармацыя ў Беларусі ........ 47
§ 9. Контррэфармацыя ў Беларусі ........ 52
§ 10. Брэсцкая царкоўная унія ........ 56
§ 11. Пашырэнне Адраджэння ў Беларусі ........ 61
Урок абагульнення да раздзела I ........ 67

**РАЗДЗЕЛ II. Беларусь у другой палове XVII — першай палове XVIII ст.** ........ 69
§ 12. Казацка-сялянская вайна 1648—1651 гг. на беларускіх землях ........ 69
§ 13. Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг. ........ 74

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

§ 14. Беларусь у гады Паўночнай вайны 1700—1721 гг. ........................ 81
§ 15. Барацьба магнацкіх груповак................................................... 87
§ 16. Беларуская вёска ў другой палове XVII — першай палове XVIII ст. ................................................................................................ 92
§ 17. Сялянскі рух ........................................................................... 97
§ 18. Гарады Беларусі ў другой палове XVII — першай палове XVIII ст. .......................................................................102
§ 19. Адукацыя і навука......................................................................108
§ 20. Літаратура і грамадска-палітычная думка ..................................113
§ 21. Архітэктура і мастацтва .............................................................119
Урок абагульнення да раздзела II ......................................................125

**РАЗДЗЕЛ III. Беларусь у другой палове XVIII ст.**.....................................127
§ 22. Эканамічная стабілізацыя ў другой палове XVIII ст. ...................127
§ 23. Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай............................................134
§ 24. Спробы рэфармавання Рэчы Паспалітай.....................................139
§ 25. Паўстанне 1794 г. у Беларусі .....................................................145
§ 26. Адукацыя і навука......................................................................151
§ 27. Літаратура і мастацтва ..............................................................157
§ 28. Народная культура.....................................................................162
Урок абагульнення да раздзела III......................................................167
**Наш край у другой палове XVI — канцы XVIII ст.** ..................................169
**Выніковае абагульненне** ...................................................................171
**Асноўныя падзеі ў гісторыі Беларусі ў другой палове XVI — канцы XVIII ст.** ..........................................................................................174
**Унутраная і знешняя палітыка вялікіх князёў літоўскіх і каралёў польскіх у другой палове XVI — канцы XVIII ст.** .....................177
**Тэрміналагічны слоўнік** ...................................................................180
**Спіс рэкамендаванай літаратуры** .......................................................187


Правообладатель Издательский центр БГУ

(Назва і нумар школы)

| Вучэбны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 /20 | | | |
| 20 /20 | | | |
| 20 /20 | | | |
| 20 /20 | | | |
| 20 /20 | | | |
| 20 /20 | | | |

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Белазаровіч, В. А.**

Б43 Гісторыя Беларусі, другая палова XVI — канец XVIII ст. : вучэб. дапам. для 8-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. мовай навучання / В. А. Белазаровіч, І. П. Крэнь, Н. М. Ганушчанка. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2010. — 191 с. : іл.

ISBN 978-985-476-806-9.

Вучэбнае выданне

**Белазаровіч** Віктар Аляксандравіч
**Крэнь** Іван Платонавіч
**Ганушчанка** Надзея Мікалаеўна

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ
**Другая палова XVI — канец XVIII ст.**

Вучэбны дапаможнік для 8 класа агульнаадукацыйных устаноў
з беларускай мовай навучання

Рэдактар *М. І. Рэменіца*
Дызайн вокладкі *М. Я. Шкурпіт*
Тэхнічны рэдактар *К. У. Хвагіна*
Камп'ютарная вёрстка *Н. Я. Бацюковай*
Карэктары *Н. Б. Кучмель, Т. І. Рыбакова, А. В. Семенчукова*

Падпісана ў друк 14.06.2010. Фармат 70×90 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная № 1.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 12,0.
Ул.-выд. арк. 9,97. Тыраж 27 000 экз. Заказ .

У афармленні вокладкі выкарыстана выява гарадской пячаткі Магілёва, 1596—1654 гг.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
ЛИ № 02330/0494361 ад 16.03.2009.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.

Вытворчае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Мінская фабрыка каляровага друку».
ЛП № 02330/0494156 ад 03.04.2009.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ